Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

В. І. Мішына

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА
## (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XVI стст.)

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта
спецыяльнасцей 1-21 03 01-01 “Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)”,
1-02 01 02 “Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць”

У дзвюх частках

**Частка 1**

Наваполацк
ПДУ
2010

УДК 94(476)″12/15″(075.8)
ББК 63.3(4 Бел)я73
М71

Рэкамендавана да выдання метадычным саветам гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці вучэбна-метадычнага комплекса
(пратакол № 11 ад 12.06.2008)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

канд. гіст. навук, дац. каф. эканам. гісторыі УА “БДЭУ”
У. А. ПАДАЛІНСКІ;
канд. гіст. навук, дац., заг. каф. айчыннай і ўсеагульнай гісторыі
УА “ПДУ” Д. В. ДУК

М71 **Мішына, В. І.**
Гісторыя Беларусі. Перыяд Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XVI стст.) : вучэб.-метад. комплекс. У 2 ч. Ч. 1 / В. І. Мішына. – Наваполацк : ПДУ, 2010 г. – 264 с.

ISBN 978-985-418-990-1.

Вучэбна-метадычны комплекс пабудаваны ў адпаведнасці са зместам рабочай праграмы па дысцыпліне “Гісторыя Беларусі”. Частка 1 утрымлівае базавую вучэбную і даведачную інфармацыю па кожнай з тэм праграмы. Прыведзены спісы літаратуры і даведачных крыніц да ўсяго курса і асобна да кожнай тэмы.

Прызначаны для студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання.

**УДК 94(476)″12/15″(075.8)**
**ББК 63.3(4 Бел)я73**

**ISBN 978-985-418-990-1 (Ч. 1)**
**ISBN 978-985-418-989-5**

© Мішына В. І., 2010
© УА “Полацкі дзяржаўны універсітэт”, 2010

# УВОДЗІНЫ

Эпоха Вялікага княства Літоўскага – адзін з самых складаных і супярэчлівых перыядаў у гісторыі Беларусі. На сучасны момант выдадзены шматлікія зборы дакументаў, апублікаваны наратыўныя крыніцы, створана вялікая колькасць навуковых прац, прысвечаных разнастайным аспектам існавання Вялікага княства Літоўскага.

Дадзены вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) мае на мэце перш за ўсё прадастаўленне базавай інфармацыі для паспяховага засваення курса гісторыі Беларусі перыяду ВКЛ, а таксама метадычных рэкамендацый, якія павінны садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці самастойнай працы студэнта.

ВМК складаецца з дзвюх частак. У першай частцы прадстаўлены інфармацыйныя блокі, якія адпавядаюць асноўным тэмам рабочай праграмы. Кожны такі блок уключае змест адпаведнай тэмы, кароткую інфармацыю па асноўных пытаннях тэмы, а таксама даведачную інфармацыю, якая ўдакладняе і дапаўняе змест вучэбнага матэрыялу. У канцы кожнага блока даецца даволі аб’ёмны пералік крыніц і навуковых даследаванняў, якія могуць быць выкарыстаны студэнтамі падчас самастойнай працы над матэрыялам (у залежнасці ад ступені іх даступнасці і інфарматыўнасці).

Другая частка ВМК утрымлівае планы семінарскіх заняткаў, тэматыку дакладаў і рэфератаў да кожнага занятку, метадычныя парады для студэнтаў, прыкладны спіс пытанняў да іспыту, тэматыку курсавых работ. Таксама ў ёй змешчаны пытанні і заданні для самаправеркі і творчай працы (адпаведна кожнай з тэм праграмы), якія павінны садзейнічаць больш глыбокаму засваенню вучэбнага матэрыялу. Дадзеныя пытанні і заданні прадугледжваюць працу студэнта з тэкстамі навуковых даследаванняў і гістарычных крыніц, фрагменты якіх таксама прыводзяцца ў другой частцы ВМК.

Ніжэй прыведзены фрагмент рабочай праграмы, які змяшчае размеркаванне гадзін па відах заняткаў і формай кантролю ведаў пры вывучэнні дадзенай дысцыпліны.

## РАБОЧАЯ ПРАГРАМА

### Віды заняткаў і формы кантролю ведаў

| Віды заняткаў,<br>формы кантролю ведаў | Дзённая форма | Завочная форма |
|---|---|---|
| Курс | 1 | 1 |
| Семестр | 2 | 2 |
| Лекцыі, г | 36 | 10 |
| Залікі (семестр) | 2 (спецыяльнасць 1-02 01 02) | – |
| Экзамен (семестр) | 2 (спецыяльнасць 1-21 03 01-01) | 2 |
| Семінарскія, г | 18 | 6 |

# ЛЕКЦЫЙНЫ КУРС

| Назва раздзелаў і тэм лекцый і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | **Д** | **З** |
| **II СЕМЕСТР**<br>**УТВАРЭННЕ І СТАНАЎЛЕННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (другая палова XIII – XV стст.)**<br>**Тэма 1. Утварэнне і ўмацаванне Вялікага княства Літоўскага**<br>Асноўныя падыходы да праблемы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага ў гістарыяграфіі. Агляд асноўных крыніц. Першыя звесткі пра Літву. Працэсы аб'яднання ў балта-ўсходнеславянскім рэгіёне ў пачатку XIII ст. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ. Роля Навагрудка ў заснаванні дзяржавы. Міндоўг і яго палітыка. Княжанне Войшалка, Трайдзеня, Віценя, Гедзіміна і Альгерда. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель. Супрацьстаянне з Ордэнам. Давыд Гарадзенскі. Бітва на Сініх Водах. Значэнне Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі беларускага народа. | **6** | **2** |
| **Тэма 2. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага**<br>Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства. Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Вялікі князь. Гаспадарская рада. Узнікненне вялікага ("вальнага") сойма і сфера яго кампетэнцыі. Вышэйшыя службовыя асобы: маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбій земскі, гетманы. Дворныя ўраднікі. Сістэма мясцовага кіраўніцтва дзяржавай: удзельныя князі, ваяводы, кашталяны, старосты і дзяржаўцы. Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV – XV стст. | **4** | **2** |
| **Тэма 3. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны**<br>Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы. Феадальнае землеўладанне: дзяржаўнае, свецкае і царкоўнае. Магнаты, шляхта, баяры, зямяне. Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан. "Дымы" і "дворышчы". Вёскі, сёлы і валасці. Мясцовая адміністрацыя.<br>Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва. Рамяство і гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў. | **4** | **–** |
| **Тэма 4. Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XIV ст.**<br>Дынастычная барацьба ў 70-я гг. XIV ст. Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт. Умовы пагаднення паміж вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам Данскім і маці Ягайлы Ульянай цвярской. Падрыхтоўка, заключэнне, змест і вынікі Крэўскай уніі. Агульназемскі прывілей 1387 г. і яго сутнасць. Пачатак распаўсюджвання каталіцтва на Беларусі. | **6** | **2** |

| | | |
|---|---|---|
| Узмацненне палітычных супярэчнасцей паміж феадаламі каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў. Польска-ліцвінскія канфлікты і практычнае скасаванне Крэўскай уніі. Востраўскае пагадненне. | | |
| **Тэма 5. Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка**<br>Ліквідацыя буйных княстваў і ўмацаванне пазіцый цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне. Бітва на рацэ Ворскла і яе значэнне. Пашырэнне агрэсіі нямецкіх феадалаў на ўсход. Чарговае збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польскай Каронай. “Вялікая вайна”. Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Гарадзельскі прывілей 1413 г. Рэлігійная палітыка Вітаўта.<br>Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 30-я гг. XV ст. і змены ў кіраўніцтве дзяржавай. Прывілеі вялікіх князёў літоўскіх праваслаўнай знаці 1432 і 1434 гг. | **2** | **–** |
| **Тэма 6. Казімір IV і яго палітыка**<br>Абранне Казіміра вялікім князем. Паўстанне “чорных людзей” у Смаленску, хваляванні ў Віцебску, Полацку, на Валыні, Жмудскай зямлі. Агульназемскі прывілей 1447 г. і яго значэнне. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. “Судзебнік” Казіміра IV 1468 г. Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Усходняя палітыка Казіміра. “Змова князёў” 1480 – 1481 гг. Спробы аддзялення ад Вялікага княства Літоўскага часткі беларускіх зямель. | **2** | **–** |
| **Тэма 7. Культура Беларусі ў XIV – XV стст.**<br>Этнічныя працэсы на беларускіх землях, складванне адметных рыс беларускага народа (мова, звычаі, традыцыі, характар). Этнічная самасвядомасць.<br>Пытанне аб паходжанні назвы “Белая Русь”.<br>Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Дойлідства, жывапіс, скульптура. Кніжная справа. Летапісанне. Арыгінальная і перакладная літаратура. | **2** | **–** |
| **БЕЛАРУСЬ У XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII стст[1].**<br>**Тэма 8. Знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага ў першай палове XVI ст.**<br>Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Ідэалагічнае абгрунтаванне прэтэнзій Вялікага княства Маскоўскага на валоданне беларускімі землямі. Войны паміж суседнімі княствамі канца XV – першай паловы XVI стст., іх вынікі. Бітва на Вядрошы, абарона Смаленска, бітва пад Оршай. Паспалітае рушанне (усеагульнае апалчэнне) як аснова вайсковай арганізацыі ВКЛ у XVI ст. Узбраенне войска. Пачатак пераходу ад паспалітага рушання да наёмнага прафесійнага войска. Набегі крымскіх татар і барацьба з паўднёвым агрэсарам. Бітва пад Клецкам. Мяцеж Міхаіла Глінскага. Асоба М. Глінскага і яго роля ў кіраўніцтве дзяржавай. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны, мэта выступлення Глінскага. Галоўныя падзеі | **4** | **2** |

[1] У межах другога семестра разглядаецца толькі частка дадзенага раздзела.

| | | |
|---|---|---|
| мяцяжу, яго сувязь з маскоўскім дваром. Непасрэдныя і далёкасяжныя вынікі мяцяжу. Мерапрыемствы па ўмацаванні дзяржаўнай абароны ў 40-я – 50-я гг. XVI ст. | | |
| **Тэма 9. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага княства Літоўскага** Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне правоў паноў-рады. Увядзенне павятовага сойміка і рэформа вялікага вальнага сойма. Мясцовае кіраванне: ваяводскі, павятовы, і валасны ўзроўні. Адметныя рысы мясцовага кіравання ў Полацкай і Віцебскай землях. Суды і заканадаўства. Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага. | **2** | **2** |
| **Тэма 10. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага княства Літоўскага** Утварэнне першых ваяводстваў. Іх колькасць і прыкладныя межы. Віленскі сойм 1565 – 1566 гг. і яго рашэнні. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і вайсковая рэформы. Адміністрацыйныя функцыі ваяводскіх і павятовых цэнтраў (гаспадарчыя, вайсковыя, судовыя). | **2** | **–** |
| **Тэма 11. Змены ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы ў 20-я – 60-я гг. XVI ст.** Пераўтварэнне шляхты ў карпаратыўнае саслоўе і вылучэнне шляхецкай палітычнай праграмы. Палітыка верацярпімасці ў практыцы палітычнага жыцця ВКЛ. Афіцыйная адмена Гарадзельскага прывілея. Супярэчнасці паміж магнатэрыяй і асноўнай часткай шляхецкага саслоўя ў барацьбе за шляхецкія вольнасці. Рэформы сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. і Статут 1566 г. як вынік рэалізацыі шляхецкай палітычнай праграмы. | **2** | **–** |
| **Усяго за семестр:** | **36** | **10** |

## СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ

| Назва тэм семінарскіх заняткаў і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | **Д** | **З** |
| **II СЕМЕСТР** **Тэма 1. Утварэнне і ўмацаванне Вялікага княства Літоўскага** Асноўныя падыходы да праблемы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага ў гістарыяграфіі. Агляд асноўных крыніц. | **2** | **–** |
| **Тэма 2. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага** Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Вялікі князь. Гаспадарская рада. Узнікненне вялікага “вальнага” сойма і сфера яго кампетэнцыі. Вышэйшыя службовыя асобы: маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбій земскі, гетманы. Дворныя ўраднікі. Сістэма мясцовага кіраўніцтва дзяржавай: удзельныя князі, ваяводы, кашталяны, старосты і дзяржаўцы. Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV – XV стст. | **4** | **–** |

| | | |
|---|---|---|
| **Тэма 3. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны**<br>Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы. Феадальнае землеўладанне: дзяржаўнае, свецкае і царкоўнае. Магнаты, шляхта. Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан. “Дымы” і “дворышчы”. Вёскі, сёлы і воласці. Мясцовая адміністрацыя.<br>Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва. Рамяство і гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў. | **4** | **2** |
| **Тэма 4. Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка**<br>Ліквідацыя буйных княстваў і ўмацаванне пазіцый цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне. Бітва на рацэ Ворскла і яе значэнне. Пашырэнне агрэсіі нямецкіх феадалаў на ўсход. Чарговае збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польскай Каронай. “Вялікая вайна”. Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Гарадзельскі прывілей 1413 г. Рэлігійная палітыка Вітаўта. | **2** | **–** |
| **Тэма 5. Культура Беларусі ў XIV – XV стст.**<br>Этнічныя працэсы на беларускіх землях, фарміраванне адметных рыс беларускага народа (мова, звычаі, традыцыі, характар). Этнічная самасвядомасць. Пытанне аб паходжанні назвы “Белая Русь”.Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Дойлідства, жывапіс, скульптура. Кніжная справа. Летапісанне. Арыгінальная і перакладная літаратура. | **2** | **2** |
| **Тэма 6. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага княства Літоўскага**<br>Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне правоў паноў-рады. Увядзенне павятовага сойміка і рэформа вялікага вальнага сойма. Мясцовае кіраванне: ваяводскі, павятовы, гарадскі і валасны ўзроўні. Адметныя рысы мясцовага кіравання ў Полацкай і Віцебскай землях. Суды і заканадаўства. Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага. | **2** | **2** |
| **Тэма 7. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага княства Літоўскага**<br>Утварэнне першых ваяводстваў. Колькасць і прыкладныя межы. Віленскі сойм 1565 – 1566 гг. і яго рашэнні. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і вайсковая рэформы. Адміністрацыйныя функцыі ваяводскіх і павятовых цэнтраў (гаспадарчыя, вайсковыя, судовыя). | **2** | **–** |
| **Усяго за семестр:** | **18** | **6** |

# РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА ДА ЎСЯГО КУРСА[2]

## Публікацыі крыніц

1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Беларусь у Вялікім княстве Літоўскім: стэнагр. пасядж. Міжнар. круглага стала, якія адбыліся ў Мінску 6 – 7 крас. 1992 г. / АН Беларусі. Аддз. навук. інфарм. па гуманіт. навукам. Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Фр. Скарыны, Міжнар. асац. беларусістаў; рэд. І. Бродка [і інш.]. – Мінск, 1992. – 123 с.

3. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост. З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

4. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / склад. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

6. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

7. Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Архіў Канцылярыі вялікага князя літоўскага; падрыхт.: В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. Кн. запісаў 28 (1522 – 1552). (Копія канца XVI ст.). – Мінск : Athenaeum, 2000. – 311 с.

8. Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Архіў Канцылярыі вялікага князя літоўскага, Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі; падрыхт. В. Мянжынскі; рэдкал.: Г. Я. Галенчанка [і інш.]. Кніга запісаў 43 (1523 – 1560). (Копія канца XVI ст.). – Мінск : Бел. навука, 2003. – 167 с.

9. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44 (1559 – 1566): Кніга запісаў 44 / падрыхт. А. І. Груша. – Мінск : Арты-Фэкс, 2001. – 229 с.

10. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 46 (1562 – 1565). Кніга запісаў 46 (копія канца XVI ст.) / падрыхтаваў В. С. Мянжынскі. – Мінск : БелЭн, 2006.

[2] У дадзены спіс уключаны даследаванні і публікацыі крыніц агульнага характару. Да кожнай тэмы дадаецца спіс спецыяльных даследаванняў, а таксама асноўных апублікаваных крыніц.

11. Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; падрыхт. А. І. Дзярновіч. – Кн. № 560 (1542). Кніга перапісаў № 3 (копія канца XVI ст.). – Мінск : Бел. навука, 2007. – 156 с.

12. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / Изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

13. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники : Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи : Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р исторических наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

14. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980, – 306 с.

15. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв. / АН СССР, Ин-т истории СССР / сост. А. Л. Хорошкевич. – М. : Ин-т истории СССР. – Вып. 1 – 5. – 1977 – 1985.

16. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / уклад., уступ. арт. і камент. А. Ф. Коршунава; рэд. Ю. С. Пшыркоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 246 с.

17. Сведкі беларускай мінуўшчыны: зб. дак. і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI – XV стст. / пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск , 1996. – 167 с.

18. Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. В 3 т. Т. 1 / Центр. гос. ист. арх. БССР в г. Минске, АН БССР, Ин-т истории; сост. З. Ю. Копысский [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1988. – 300 с.

19. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Текст, перевод и словарь-комментарий / под. ред. академика К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 253 с.

20. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 250 с.

21. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

22. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – 207 с.

23. Уния в документах: сборник / сост. В. А. Теплова, З. И. Зуева. – Минск : Лучи Софии, 1997. – 520 с.

### Даследаванні, навучальныя дапаможнікі

1. Антонович, В. Б. Очерк истории Великого княжества Литовского до половины XV столетия. Вып. 1 / В. Б. Антонович. – Киев : Унив. тип., 1878. – 24 с.

2. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. / Ю. Бардах; пер. М. Раманоўскага, А. Істоміна; прадм. Г. Сагановіча. – Мінск : часоп. “Беларускі гістарычны агляд”, 2002. – 459 с. (Бібліятэка часопіса “Беларускі гістарычны агляд”)

3. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Некаторыя пытанні і адказы / А. Ф. Вішнеўскі, І. А. Саракавік. – Мінск : Веды, 1997. – 108 с.

4. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі. – М : Экаперспектыва, 2000. – 313 с.

5. Владимирский-Буданов, М. Ф. Очерки по истории Литовского государства / М. Ф. Владимирский-Буданов. – Киев, 1889. – 407 с.

6. Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991 – 2003 : матэрыялы міжнароднага круглага стала г. Гродна, 16 – 18 мая 2003 г. / рэдкал.: С. Каўн (адказ. рэд.) [і інш.]. – Минск : Медисонт, 2006. – 540 с.

7. Вялікае княства Літоўскае: метадалогія і метады даследавання / Я. Бак, М. Вайтовіч, В. Голубеў [і інш.]; пад. рэд. С. Каўна; Гродзенскае абласное грамадскае аб’яднанне маладых навукоўцаў “ВІТ”. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. – 140 с. (Гістарычная бібліятэка “ВІТ”)

8. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.: вучэб. дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

9. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск : Экоперспектива, 2008. – 688 с.

10. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. Т. 1: Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / рэд. кал.: К. І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 632 с.

11. Греков, Б. Д. Золотая Орда и её падение / Б. Д. Греков. – М. : Богород. печатник, 1998. – 364 с.

12. Греков, И. Б. Восточная Европа и упадок Золотой Орды (на рубеже XIV – XV вв.) / И. Б. Греков. – М. : Наука, 1975. – 521 с.

13. Греков, И. Б. Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV – XVI вв. / И. Б. Греков; отв. ред. И. И. Смирнов. – М. : Наука, 1963. – 374 с.

14. Гришин, Я. Я. Татарский след в истории Литвы и Польши (XIV – XIX вв.) / Я. Я. Гришин. – Казань : Казан. гос. ун-т, 2005. – 155 с.

15. Гудавичюс, Э. С. Крестовые войны в Прибалтике и Литва в XIII веке / Э. С. Гудавичюс. – Вильнюс : Мокслас, 1989. – 190 с.

16. Гудавичюс, Э. С. История Литвы: с древнейших времен до 1569 г. / Э. С. Гудавичюс; пер. Г. И. Ефремова. – М. : Фонд им. И. Д. Сытина : Baltrus, 2005. – 679 с.

17. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Другая палова XIII – першая палова XVII стст.: вучэб. дапаможнік для студ. гіст. спец. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / П. Ф. Дзмітрачкоў. – Магілеў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 312 с.

18. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 679 с.

19. Ермаловіч, М. І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае // М. І. Ермаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Беллітфонд, 2003. – 435 с.

20. Ермаловіч, М. І. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд / М. І. Ермаловіч. – Мінск : Выдавецкі цэнтр “Бацькаўшчына”: МП “Бесядзь”, 1994. – 91 с.

21. Ермаловіч, М. І. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды / М. І. Ермаловіч; прадм. М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с.

22. Иванов, Н. История Литовско-Русского государства в именах и датах (Держава Гедиминовичей). Историко-генеалогическое исследование-обобщение. В 2 кн. / Н. Иванов. – СПб. : Книга, 2003.

23. История Беларуси: Вопросы и ответы / сост. Г. Я. Голенченко, В. П. Осмоловский; лит. обраб. И. М. Акшевского. – Мінск : Беларусь, 1993. – 208 с.

24. Ігнатоўскі, У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі; уступ. арт. А. П. Грыцкевіча; камент. і заўвагі Э. Н. Гнеўкі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь,1992. – 190 с.

25. Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. – М. : тип. Бахметева, 1864. – 44 с.

26. Краўцэвіч, А. К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч.; навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Бел. навука, 1998. – 206 с.

27. Краўцэвіч, А. К. Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда / А. К. Краўцэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

28. Ластоўскі, В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 126 с.

29. Леонтович, Ф. И. Очерки истории литовско-русского права: Образование территории Литовского государства / Ф. И. Леонтович. – СПб. : тип. В. С. Балашева и К°, 1894. – 393 с.

30. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч., У. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

31. Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – СПб. : Наука, 2004. – 311 с.

32. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. Ч. 1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.

33. Насевіч, В. Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы / В. Л. Насевіч. – Мінск : Полымя, 1993. – 160 с.

34. Насевіч, В. Л. Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў 12 – 18 стагоддзяў / В. Л. Насевіч; рэд. І. П. Хаўратовіч. – Мінск : БелЭн, 1993. – 49 с.

35. Пашуто, В. Т. Образование Литовского государства / В. Т. Пашуто. – М. : Изд-во АН, 1959. – 531 с.

36. Пашуто, В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси / В. Т. Пашуто. – М. : АН СССР, 1950. – 333 с.

37. Пилипенко, М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция / М. Ф. Пилипенко. – Минск : Беларусь, 1991. – 142 с.

38. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва XV – XVI вв. Сборник трудов / В. И. Пичета. – М. : Изд-во АН БССР, 1961. – 813 с.

39. Піваварчык, С. Археалогія Беларусі: вучэб. дапам. У 2 ч. Ч. 2: Эпоха сярэднявечча / С. Піваварчык, Г. Семянчук. – Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы. – Гродна, 1997. – 190 с.

40. Рябцевич, В. Н. Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцевич. – Минск : Полымя, 1995. – 685 с.

41. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.

42. Семянчук, А. А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: вучэб. дапам. для студэнтаў гуманітарных факультэтаў вну / А. А. Семянчук. – Гродна : ГрДУ, 2000. – 160 с.

43. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін. У 2 ч. Ч. 1: Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2003. – 280 с.

44. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – 2-е выд. – Мінск : Полымя, 1994. – 270 с.

45. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н. Н. Улащик; отв. ред. В. И. Буганов. – М. : Наука, 1985. – 261 с.

46. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэб. дапам. – Мінск : БДУ, 1999. – 193 с.

47. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых заводаў / В. А. Чамярыцкі. – АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 191 с.

48. Чаропка, В. Імя ў летапісе / В. Чаропка. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларусь, 2003. – 638 с.

49. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў экан. спецыяльнасцей вну / пад рэд. В. І. Галубовіча. – 3-е выд., дап. і перапрац. – Мінск : ВП “Экаперспектыва”, 1999. – 446 с.

50. Этнаграфія беларусаў: Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / АН БССР. Ін-т мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 214 с.

51. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. Ч. 1 / Я. А. Юхо. – Рэсп. ін-т выш. шк. Бел. дзярж. ун-та. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 349 с.

52. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

53. Юхо, Я. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо; рэд. Т. Ф. Есіпенка. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

## Навукова-даведачныя выданні

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с.

2. Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 1 – 18 / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1996 – 2004.

3. Беларуская ССР: кароткая энцыкл. – У 4 т. Т. 1 – 4 / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Минск : БелСЭ, 1976 – 1981.

4. Беларусь: энцыкл. давед. / рэдкал. Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск, 1995.

5. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Т 1 – 2 / рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005 – 2006.

6. Мысліцелі і асветнікі Беларусі X – XIX стагоддзі: энцыкл. давед. / склад. Г. А. Маслыка. – Мінск : БелЭН, 1995. – 670 с.

7. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – 365 с.

8. Францыск Скарына і яго час: энцыкл. даведнік. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.). [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1988. – 608 с.

9. Храналогія гісторыі Беларусі / склад. В. В. Гетаў [і інш.]; навук. рэд. М. А. Ткачоў [і інш.]. – 3-е выд. перапрац. і дап. – Мінск : БелЭн, 1992. – 193 с. (Энцыклапедычная бібліятэчка “Беларусь”)

10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1 – 6 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993 – 2003.

11. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

# ТЭМА 1. УТВАРЭННЕ І ЎМАЦАВАННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Змест праграмы.** Асноўныя падыходы да праблемы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага ў гістарыяграфіі. Агляд асноўных крыніц.

Першыя звесткі пра Літву. Працэсы аб'яднання ў балта-ўсходнеславянскім рэгіёне ў пач. XIII ст. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ. Роля Навагрудка ў заснаванні дзяржавы.

Міндоўг і яго палітыка. Княжанне Войшалка, Трайдзеня, Віценя, Гедыміна і Альгерда. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель. Супрацьстаянне з Ордэнам. Давыд Гарадзенскі. Бітва на Сініх Водах. Значэнне Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі беларускага народа.

## 1.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 1.1.1. Асноўныя працы, прысвечаныя праблеме ўтварэння ВКЛ[3]

**Антановіч, Уладзімір Баніфатавіч. Нарыс гісторыі Вялікага княства Літоўскага да сярэдзіны XVI ст.** Кіеў, 1878 (на рускай мове).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Літоўцы ў сярэдзіне XIII ст. яшчэ не мелі дзяржавы, а былі раз'яднанай масай невялікіх валасцей, якімі кіравалі незалежныя правадыры, без усялякай палітычнай сувязі аднаго з адным.

2) Паскарэнне палітычнай эвалюцыі адбылося пад уплывам знешніх абставін (пагроза заваёвы тэўтонамі).

3) Войскі Літвы прайшлі "загартоўванне" ў шматлікіх набегах на рускія землі, і таму напад Ордэна быў сустрэты дастойна.

4) Факт канчатковага ўтварэння Літоўскага княства даследчык датуе часам увакняжання Міндоўга ў Наваградку.

**Любаўскі, Мацей Кузьміч. Нарыс гісторыі Літоўска-Рускай дзяржавы да Люблінскай уніі уключна.** Санкт-Пецярбург, 1910 (на рускай мове).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Гісторыя Літоўска-Рускай дзяржавы з'яўляецца ў пэўным сэнсе прамым працягам, далейшым развіццём гісторыі Кіеўскай Русі.

[3] Падрабязная характарыстыка прац, прысвечаных дадзенай праблеме, змешчана ў даследаванні А. К. Краўцэвіча "Стварэнне Вялікага княства Літоўскага" (гл. № 26 у агульным спісе літаратуры).

2) Працэс утварэння ВКЛ ёсць злучэнне 2 этнічных кампанентаў: рускага і літоўскага.

3) Міндоўг і яго бліжэйшыя пераемнікі сфарміравалі першае дзяржаўнае ўтварэнне, калі Міндоўг ад простага старшынства ў ваенных аперацыях перайшоў да агрэсіўнай палітыкі ў адносінах да суседніх князёў (з 1248 г.), захапіў Чорную Русь з галоўным горадам – Навагрудкам, скарыстаўшы пагрозу з боку мангола-татар.

4) Новая дзяржава з самага пачатку была не проста літоўскай, а літоўска-рускай, падпарадкаваныя славянскія землі былі апорай першых літоўскіх князёў і крыніцай сродкаў улады, узорам для ўсталявання ў Літве палітычных парадкаў.

**Пашкевіч, Генрык. Літва да Міндоўга.** Львоў, 1930 (на польскай мове).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Міндоўг быў не стваральнікам, а аднавіцелем дзяржавы, якая склалася ўжо ў апошняй чвэрці XII ст.

2) Верагодна, першым аб'яднальнікам дзяржавы быў бацька Міндоўга – Рынгольд, які згадваецца ў летапісных крыніцах.

3) Далей улада зноў была падзелена паміж некалькімі князямі, а Міндоўг у 20-я – 30-я гг. XIII ст. зноў дабіўся адзінаўладдзя.

4) Літоўскія князі, каб умацаваць сваё становішча, карысталіся дапамогай войска залежных ад іх рускіх земляў.

**Лаўмяньскі, Генрык. Вывучэнне пачаткаў літоўскага грамадства і дзяржавы.** Вільня, 1931 – 1932 (на польскай мове).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Манархія узнікла не ў выніку эвалюцыі племянных саюзаў, як гэта амаль паўсюдна прынята лічыць у гістарыяграфіі, а на іх руінах; стваральнымі сіламі былі дружыны – плод рабаўнічай экспансіі, якія знаходзіліся за межамі тэрытарыяльнага ўстрою.

2) Пераход ад племяннога ладу да дзяржавы быў вынікам паскарэння ўнутранай эвалюцыі літоўскага грамадства, выкліканага знешнімі прычынамі (у першую чаргу – экспансіяй на Русі).

3) Менавіта інстытут дружын выступае асноўным фактарам утварэння дзяржавы. Патрэбны былі сродкі на ўтрыманне дружын, і таму яны ажыццяўлялі экспансію на Русь і паступова сталі асядаць у яе гарадах замест звергнутых нашчадкаў Рурыка. Аднак адбылася хуткая асіміляцыя дружыннікаў, у выніку чаго яны сталі прадстаўнікамі інтарэсаў перш за ўсё тых земляў, якімі кіравалі. Такая сітуацыя ўстрывожыла арганізатараў экспансіі – старшых князёў, у выніку чаго і ўзнікла неабходнасць ства-

рэння дзяржаўна-фіскальнага апарату для падтрымання дружыннай арганізацыі і папярэджання пераўтварэння дружыннікаў у самастойных правіцеляў.

**Пашута, Уладзімір Цярэнцьевіч. Утварэнне Літоўскай дзяржавы.** Масква, 1959 (на рускай мове).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Палітычны лад Літвы прайшоў наступныя этапы развіцця: канфедэрацыя земляў, потым іх саюз, узначалены князямі Аўкштоты, і, нарэшце, адносна цэласная раннефеадальная манархія.

2) Канфедэрацыя выступае пераходнай формай ад патрыярхальна-абшчынннага ладу да дзяржаўнага; саюз – ужо дзяржава, якой кіруюць пяць князёў (у Літве), а манархія – гэта ўласна ВКЛ, калі і адбылося заваяванне беларускіх земляў.

3) Захоп Беларусі літоўскімі феадаламі паклаў пачатак пераўтварэнню невялікай Літоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае.

**Ермаловіч, Мікалай Іванавіч. Па слядах аднаго міфа.** Мінск, 1989 (4-е выд. 2002), **Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды.** Мінск, 1990 (2-е выд. 2001).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Утварэнне ВКЛ было ініцыявана наваградскімі феадаламі, якія запрасілі на свой княжацкі пасад князя-перабежчыка Міндоўга, што пацярпеў паражэнне ў міжусобнай барацьбе ў Літве.

2) Стаўшы наваградскім князем, Міндоўг заваяваў Літву – востраў балцкага насельніцтва ў беларускім абшары, што і стала пачаткам утварэння ВКЛ.

3) Летапісная Літва знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі і займала прастору паміж Мінскам, Наваградкам, Маладзечнам і Слонімам.

**Насевіч, Вячаслаў Леанідавіч. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: падзеі і асобы.** Мінск, 1993.

***Асноўныя тэзісы:***

1) Літва – сукупнасць некалькіх роднасных плямёнаў, якімі кіравалі самастойныя дынастыі. Напачатку XIII ст. гэтыя ўтварэнні аб'ядноўваюцца ў агульналітоўскі палітычны саюз, лідэрам якога ў сярэдзіне 1230-х гг. становіцца Міндоўг.

2) Славянскія землі далучаюцца да гэтага саюзу добраахвотна, каб пазбегнуць залежнасці ад татараў. Прыняўшы літоўскіх князёў, яны парываюць з дынастыяй Рурыкавічаў, залежных ад Залатой Арды.

3) У біэтнічнай дзяржаве, якой з'яўлялася ВКЛ, меў месца славяна-балцкі сімбіёз, прычым балты дамініравалі ў палітычнай сферы, славяне – у культурнай.

**Краўцэвіч, Аляксандр Канстанцінавіч. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага.** Мінск, 1998 (2-е выд. Жэшаў (Польшча), 2000).

***Асноўныя тэзісы:***

1) Тэрыторыя Панямоння – кантактная зона паміж балцкім і славянскім насельніцтвам, якая і стала ядром будучай дзяржавы – ВКЛ.

2) У гэтай кантактнай зоне адсутнічалі ўзброеныя канфлікты, а наадварот, разгортваўся працэс мірнага ўзаемадзеяння.

3) Утварэнне дзяржавы стала заканамерным вынікам дадзенага працэсу, непазбежным ва ўмовах росту знешняй небяспекі.

### 1.1.2. Асноўныя пісьмовыя крыніцы па гісторыі ВКЛ далюблінскага перыяду

**І. Дакументальныя крыніцы:**

а) ***акты і граматы*** (*прыватна-прававыя*: дадзеныя, купчыя, менавыя, духоўныя, пазыковыя, ільготныя; *публічна-прававыя*: граматы, што зацвярджалі правы і прывілеі феадалаў, акты феадальнага суда, прывілеі вялікакняжацкай адміністрацыі, прывілеі на дзяржаўныя пасады, дыпламатычныя дакументы);

б) ***матэрыялы заканадаўства***[4] (*агульназемскія* прывілеі, *абласныя* прывілеі, *гарадскія* прывілеі, прывілеі *асобным групам насельніцтва*, *Судзебнік* 1468 г., *Статуты* ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.);

в) ***матэрыялы справаводства*** (*Метрыка* Вялікага княства Літоўскага: кнігі данін, кнігі судовых спраў, кнігі арэнд, кнігі пасольстваў, рэестры адпраў і інш.);

д) ***эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні, статыстычныя матэрыялы*** (*попісы* войска ВКЛ, *рэвізіі і інвентары* дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх уладанняў (у тым ліку гарадоў і мястэчак), *пісцовыя кнігі*).

**ІІ. Апавядальныя (наратыўныя) крыніцы:**

а) ***летапісы і хронікі*** (І, ІІ і ІІІ беларуска-літоўскія летапісныя зводы, хронікі польскіх і нямецкіх аўтараў XV – XVI стст.);

б) ***мемуарная літаратура, запіскі падарожнікаў*** (*Жылібер дэ Ланаа, Сігізмунд Герберштэйн*);

[4] Адносна пісьмовых крыніц XII – XVI стст. даволі складана правесці падзел на заканадаўчыя і актавыя матэрыялы, так як яны маюць прыкметы як першых (замацоўваюць пэўныя юрыдычныя нормы), так і другіх (рэгулююць дагаварныя адносіны).

в) ***творы літаратуры і публіцыстыкі*** (*Я. Вісліцкі* “Пруская вайна”, *М. Гусоўскі.* “Песня пра зубра”; *М. Літвін* “Пра норавы татараў, ліцвінаў і маскавіцян” і інш.);

г) ***эпісталярныя творы*** (*“Пасланні Гедзіміна”, “Эпісталярны кодэкс Вітаўта”* і інш.).

### 1.1.3. Першыя звесткі пра Літву. Праблема месцазнаходжання летапіснай Літвы

Першае датаванае паведамленне пра Літву адносіцца да пачатку XI ст, а яшчэ раней яна ўпамінаецца ў недатаванай частцы ***Аповесці мінулых гадоў*** як біблейскі народ і як племя, што плаціла даніну Русі, прычым без пазначэння геаграфічных каардынат. Дзесьці каля 1009 г. на старонках Кведлінбурскіх аналаў паведамляецца аб смерці каталіцкага місіянера Бруна ад язычнікаў на памежжы Літвы і Русі. Літва таксама ўпамінаецца ў некаторых еўрапейскіх хроніках, а з канца XII ст. гэтая назва трывала замацоўваецца на старонках усходнеславянскіх летапісаў.

Прынцыпова важным з’яўляецца пытанне аб лакалізацыі Літвы, якое цікавіла даследчыкаў яшчэ з XIX ст. Ад вырашэння гэтага пытання залежыць, уласна кажучы, трактоўка паходжання самога Вялікага княства Літоўскага. Аўтары прац, прысвечаных генезісу ВКЛ, непазбежна сутыкаліся з гэтай праблемай і прапаноўвалі свае версіі яе вырашэння.

Так, ***Мацей Любаўскі*** прыйшоў да высновы, што “ўласна Літва” першапачаткова займала вобласць правых прытокаў Нёмана, пераважна ракі Віліі, населенай г. зв. верхняй Літвой (“Auxtote”). Напачатку XVI ст. назва “Зямля Літоўская” распаўсюдзілася і на г. зв. Чорную Русь – вобласць на левых прытоках Нёмана з ракой Свіслач уключна, з гарадамі: Наваградкам, Ваўкавыскам, Слонімам, Здзітавам і Гародняй. Такім чынам, уласна Літва ўяўляла сабой тэрыторыю, складзеную як з балцкіх, так і са славянскіх земляў.

Выснову Любаўскага аб “Літве ўласнай” як тэрыторыі, складзенай з этнічна балцкіх і этнічна ўсходнеславянскіх земляў, падтрымала пераважная большасць гісторыкаў. Аднак ***Генрык Лаўмянскі*** лічыў, што першапачаткова Літва размяшчалася выключна на балцкіх землях. ***Мікола Ермаловіч***, як было пазначана вышэй, лічыў, што летапісная Літва знаходзілася на тэрыторыі Беларусі. ***Вячаслаў Насевіч*** сцвярджае, што тэрыторыя летапіснай Літвы супадала з арэалам распаўсюджання культуры ўсходнелітоўскіх курганоў (усходняя палова сучаснай Літвы і прылеглыя часткі Беларусі – да возера Нарач, Налібоцкай пушчы і правабярэжжа Немана ў раёне Ліды).

### 1.1.4. Перадумовы фарміравання ВКЛ

1. ***Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рамяства, гандлю, рост гарадоў, іх размяшчэнне на важных гандлёвых шляхах*** (па Дняпру, Заходняй Дзвіне, Нёману). Гэта садзейнічала ўзбагачэнню мясцовай эканамічнай і палітычнай эліты, якая стала ініцыятарам утварэння новай дзяржавы, каб абараніць сваю маёмасць і статус. Акрамя таго, назапашаныя і новыя рэсурсы дазвалялі арганізаваць абарону і пашырэнне дзяржавы.

2. ***Паглыбленне сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства, сацыяльных супярэчнасцей паміж саслоўямі.*** Сацыяльныя супярэчнасці і сілавыя спосабы іх вырашэння выклікалі патрэбу ў грамадскім парадку. У самім феадальным саслоўі таксама абвастраецца барацьба за ўладу. Узнікае грамадская патрэба ва ўтварэнні дзяржавы, якая б заканадаўча абмежавала сацыяльна небяспечныя разбуральныя працэсы, якія праяўляліся ў знішчэнні людзей і матэрыяльных каштоўнасцей.

3. ***Неабходнасць барацьбы са знешняй небяспекай.*** Такая небяспека сыходзіла найперш ад мангола-татараў і крыжакоў, а таксама галіцка-валынскіх і польскіх князёў. Некаторыя даследчыкі лічаць, што менавіта знешняя пагроза з боку Арды і рыцарскіх ордэнаў была асноўным штуршком да ўтварэння дзяржавы.

### 1.1.5. Прычыны ўзвышэння Наваградка (сярэдзіна XIII ст.)

1. ***Спрыяльнае геаграфічнае становішча рэгіёна***, ўрадлівыя глебы абумовілі высокі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, інтэнсіўнае развіццё рамёстваў (перш за ўсё апрацоўкі жалеза, каштоўных металаў, ювелірнага мастацтва), што ў сваю чаргу паспрыяла павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва.

2. ***Параўнальна спакойнае ўнутрыпалітычнае развіццё***, адсутнасць значных міжусобных канфліктаў у Наваградскай зямлі.

3. ***Прыток эканамічна актыўнага насельніцтва*** з іншых абласцей, што знаходзіліся пад пагрозай заваёвы мангола-татарамі і нямецкімі рыцарамі.

4. Высокі ўзровень развіцця ***матэрыяльнай і духоўнай культуры***.

### 1.1.6. Утварэнне ВКЛ і яго палітычная гісторыя ў сярэдзіне XIII – 70-я гг. XIV стст.

Утварэнне ВКЛ з цэнтрам у Наваградку датуецца 1240-мі гадамі, калі мясцовыя баяры запрасілі на княжанне літоўскага князя ***Міндоўга***. Ён вымушаны быў весці амаль няспынную барацьбу з кааліцыяй Лівонскага ордэна, Галіцка-Валынскага княства, яцвяжскіх, жамойцкіх, літоўскіх князёў. Для ўмацавання свайго становішча ён прыняў хрышчэнне паводле ката-

ліцкага абраду (1251 г.) і ў 1253 г. каранаваўся ў Наваградку каралеўскай каронай, прысланай ад імя папы Інакенція IV. У 1254 г. Міндоўг заключыў мір з галіцка-валынскім князем ***Данілам Раманавічам***. Сын Міндоўга, ***Войшалк***, перадаў князю Раману Данілавічу "Новагародак ад Міндоўга", а Слонім, Ваўкавыск і іншыя гарады – "ад сябе". Другі сын Данілы, ***Шварн***, узяў шлюб з дачкою Міндоўга. У 1258 г. Войшалк пакінуў манастыр і вярнуўся на княжанне ў Наваградку. Пасля паўстання жамойтаў, куршаў і земгалаў Міндоўг разарваў саюз з Лівонскім ордэнам, адрокся ад каталіцызму, ваяваў супраць крыжакоў, але ў 1263 г. быў забіты ў выніку змовы літоўскай знаці на чале з князямі ***Даўмонтам*** і ***Транятам***. Транята стаў княжыць "ува ўсёй зямлі Літоўскай і Жамойці", аднак у 1264 г. быў забіты слугамі Міндоўга. Вялікім князем стаў Войшалк. Карыстаючыся падтрымкай беларускіх баяр і галіцка-валынскіх князёў, ён здолеў заваяваць Нальшчаны, Дзяволтву, аб'яднаў Навагарадскую, Пінскую, Полацкую і Віцебскую землі. У 1267 г. Войшалк перадаў уладу свайму швагру Шварну Данілавічу, які працягваў аб'яднаўчы працэс і ўмацаванне дзяржавы. Вялікі князь ***Трайдзень*** змагаўся супраць Нальшчанаў і Галіцка-Валынскага княства, якое імкнулася падпарадкаваць сабе Палессе і Панямонне. У1274 – 1277 гг. ён вёў узброеную барацьбу з Галіцка-Валынскім княствам і яго саюзнікамі – татарамі. У 1279 г. літоўскае войска нанесла паражэнне лівонскім рыцарам (*Ашэрадэнская бітва*), а ў 1281 г. захапіла г. Герцыке (былую полацкую крэпасць), вымусіўшы Лівонскі ордэн абмяняць яго на г. Дынабург.

Вялікі князь ***Віцень*** умацоўваў дзяржаву, абапіраючыся на Новагародскае, Гарадзенскае, Полацкае і іншыя княствы. У 1294 г. ён задушыў паўстанне ў Жамойці, а ў 1298 г., выкарыстаўшы супярэчнасці паміж Лівонскім ордэнам і рыжскім арцыбіскупам, заключыў мірны дагавор з Рыгаю. У 1298 і 1305 гг. беларуска-літоўскія войскі адбівалі напады крыжакоў на Жамойць, а ў 1314 г. абаранілі ад іх беларускія землі. У 1315 г. вялікі князь са значным войскам уварваўся ў Прусію і ўзяў у аблогу замак Хрыстамемель. У час княжання Віценя да ВКЛ было далучана Полацкае княства (1307 г.).

Пры вялікім князі ***Гедзіміне*** адбылося значнае пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. У 1320 г. у склад дзяжавы увайшла Віцебская зямля, у 1320-я – 1330-я гг. – Берасцейская зямля, Менскае княства і Турава-Пінская зямля. Гедзімін заключыў саюз з мазавецкім князем Вацлавам (1322 г.) і з польскім каралём Уладзіславам I Лакатком (1325 г.). Выкарыстаўшы супярэчнасці паміж Рыгай і Лівонскім ордэнам, ён нанёс некалькі паражэнняў крыжакам і распаўсюдзіў свой палітычны ўплыў на Кіеў, Пскоў і Ноўгарад. У 1323 г. сталіца ВКЛ была перанесена ў Вільню. Яшчэ пры жыцці Гедзімін

раздзяліў свае землі паміж сынамі, а вялікакняжацкі трон завяшчаў малодшаму сыну ***Яўнуту*** (вялікі князь у 1341 – 1345 гг.). У выніку змовы ***Альгерда і Кейстута Гедзімінавічаў*** Яўнут быў скінуты. Вялікім князем стаў Альгерд, Кейстут жа ўладарыў у заходняй частцы ВКЛ (яго рэзідэнцыя знаходзілася ў Троках) і вёў барацьбу супраць Тэўтонскага ордэна і Польшчы.

За час княжання Альгерда ў склад ВКЛ у сярэдзіне XIV ст. увайшло беларускае Падняпроўе, у 1355 г. – Бранскае княства, у 1360-я – 70-я гг. – Кіеўская зямля, Мазырская і Брагінская воласці, Чарнігава-Северская, Падольская і Валынская землі, было падначалена Смаленскае княства. Барацьба супраць Тэўтонскага ордэна адбывалася з пераменным поспехам. У 1345 – 1382 гг. беларуска-літоўскае войска зрабіла 30 паходаў на тэрыторыю ордэна і 10 паходаў на Лівонію. Гэта некалькі стрымлівала агрэсію крыжакоў, якія неаднаразова даходзілі да Полацка, Навагародка, Гародні, Ліды, Крэва, Берасця, Ваўкавыска, Браслава, Дзісны і іншых гарадоў і замкаў, штурмавалі іх і руйнавалі. Альгерд праводзіў актыўную палітыку на Усходзе, намагаючыся аб’яднаць пад сваёй уладай усе рускія землі, спрабаваў падпарадкаваць сабе Пскоў і Ноўгарад. Жыхары Пскова прынялі на княжанне сына Альгерда Андрэя. Альгерд падтрымліваў вялікіх князёў цвярскіх у іх барацьбе супраць Масквы. У 1368 – 1372 гг. ён вёў вайну з Маскоўскім княствам, падчас якой ажыццявіў тры паходы на Маскву. У 1349 – 1352 гг. і 1350-я – 1360-я гг. Альгерд таксама змагаўся з Польшчай за Валынь і Падляшша. За час княжання Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася ўдвая, амаль усе беларускія землі былі ўключаны ў склад дзяржавы.

## 1.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Палемон**, легендарны князь літоўска-беларускіх летапісаў, паданне пра якога стала асновай шляхецкай ідэалогіі ВКЛ. Паводле асноўнай версіі, Палемон быў сваяком рымскага імператара Нерона (“рымскім князем”), але з-за жоракасці імператара ўзначаліў у I ст. н. э. уцёкі 500 сем’яў знатных рымлян. У працах гісторыка XVI ст. М. Стрыйкоўскага, які абапіраўся на больш раннія летапісы, гэта падзея датавана 401 г., а прычынай уцёкаў названы зверствы правадыра гунаў Атылы. (...). Паводле легенды, уцекачы прыбылі морам у Жамойць, падняліся па Нёмане да р. Дубіса “и назвали тую землю Жомойт, от розмноженя”. (...) Палемон меў сыноў Борка, Кунаса і Сперу, якія пасля смерці бацькі падзялілі яго ўладанні, збудавалі гарады Юрбарг і Коўна. Ад Кунаса пайшоў род літоўскіх князёў, якія панавалі ў Жамойці, Літве, Полацку (Мінгайла, Гінвіл-Барыс, Глеб, Рагвалод-Васіль), Навагародку (Ердзівіл-Скірамант, Мінгайла, Шкварн-Ямант, Скіргайла,

Альгімант, Рынгальт; паводле іншага варыянта падання, нашчадкамі Мінгайлы былі Скірмант, Тройнат, Альгімант, Рынгальт, Міндоўг, Войшалк). На Рынгальце род Палемона скончыўся, і новагародцы запрасілі на пасад князя літоўскага і жамойцкага Швінтарога (Швінтарагайлу), сына Уценуса герба "Кітаўрас". Пасля смерці бацькі Швінтарог стаў гаспадаром аб'яднанай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага, Жамойцкага, Новагародскага, Рускага. Яго нашчадкі ўтварылі род вялікіх князёў (Герант, Трабус, Гілігін, Нарумунт, Даўмонт, Гольша, Гедрус, Трайдзень). На Трайдзені гэты род згас, і на пасад быў абраны Віцень герба "Калюмны", да якога ўзведзены рэальна існуючыя вялікія князі ВКЛ. [1][5]

**Рынгольд** (Рынгальт), міфічны князь беларуска-літоўскіх летапісаў. Сын новагародскага князя Альгімунта. Паводле храніста М. Стрыйкоўскага, у 1200 г. са згоды ўсіх станаў заняў трон у Новагародку. Першы прыняў тытул князя літоўскага, бо княжыў не толькі "на Новегородцы и на иншых городех руских", але і ў Жамойці і Літве. "*Хроніка Літоўская і Жамойцкая*" называе яго князем літоўскім, жамойцкім і новагародскім. Атрымаў перамогу над кааліцыяй татараў і рускіх князёў у *Магільнянскай бітве* 1284 г. Памёр у Новагародку, паводле адной з версій, без нашчадкаў, на ім скончыўся род князя ***Палемона***. Паводле іншых звестак, меў трох сыноў, адным з якіх быў ***Войшалк***. Хроніка Быхаўца называе сынам Рынгольда князя ***Міндоўга***. [2]

**Міндоўг** (1195 (?) – 1263 гг.), заснавальнік і першы вялікі князь ВКЛ. Паводле крыжацкіх крыніц, быў сынам аднаго з вярхоўных уладароў Літвы пачатку XIII ст. (магчыма, Даўгерда, неаднаразова названага ў хроніцы Генрыха Латвійскага). Упершыню ўпамінаецца разам са старэйшым братам Даўспрункам сярод "старшых князёў" Літвы, якія падпісалі *дагавор 1219 г.* з Уладзіміра-Валынскім княствам. Да сярэдзіны 1230-х гг. Міндоўг дасягнуў аднаасобнай вярхоўнай улады ў Літве або значнай яе часткі. Каля 1238 г. "Литва Мендога" знаходзілася ў саюзных або васальных адносінах з галіцка-валынскім князем ***Данілам Раманавічам***, які выкарыстоўваў яе ваенную моц супраць князя Конрада Мазавецкага. У 1245 г. Міндоўг зноў дапамагаў Данілу ў яго барацьбе з прэтэндэнтамі на Галіцка-Валынскае княства. Неўзабаве ён далучыў да сваіх уладанняў Новагародскую зямлю і ўладкаваў свайго стаўленіка ў Полацку, што фактычна дало пачатак утварэнню ВКЛ. Пасля гэтага адносіны Міндоўга з Данілам сталі варожымі. У познім Густынскім

[5] Спіс выкарыстаных даведачных матэрыялаў прыводзіцца ў канцы кожнай тэмы.

летапісе (XVII ст.) паведамляецца пра хрышчэнне Міндоўга ў праваслаўе ў 1246 г., аднак гэта не пацвярджаецца больш раннімі крыніцамі. Каля 1248 г. Міндоўг захапіў уладанні сваіх пляменнікаў ***Эдзівіда*** і ***Таўцівіла***, што выклікала іх мяцеж, да якога далучыліся жамойцкі князь Выкінт, Даніла Раманавіч, Лівонскі ордэн і Рыжскае арцыбіскупства. Каб разбурыць гэтую небяспечную кааліцыю, Міндоўг пайшоў на прамыя зносіны з Рымам, у канцы 1250 або пачатку 1251 г. прыняў каталіцтва, а ў 1253 г. каранаваўся ў Навагародку каралеўскай каронай, якую даслаў рымскі папа Інакенцій IV. Гэта дазволіла Міндоўгу выйсці з вайны з мінімальнымі стратамі, хоць ён быў вымушаны часова аддаць крыжакам частку Жамойці, а сыну Данілы Раману – Навагародак (на ўмовах васальнай залежнасці ад Міндоўга).

Каля 1254 г. Міндоўг выдаў сваю дачку замуж за ***Шварна***, другога сына Данілы. Каля 1257 г. супраць Літвы быў арганізаваны сумесны паход мангола-татарскага ваяводы Бурундая і галіцка-валынскіх князёў, аднак Міндоўг здолеў не толькі захаваць уладу, але і аднавіць поўны кантроль над Навагародскай зямлёй. У 1261 г. ён разарваў мір з Лівонскім ордэнам і адмовіўся ад каталіцтва. У канцы жыцця карыстаўся неабмежаванай уладай у Літве, што выклікала змову супраць яго князёў жамойцкага ***Траняты***, полацкага Таўцівіла, нальшчанскага ***Даўманта***. У выніку Міндоўг быў забіты разам з сынамі ***Рупекам*** і ***Руклем***. [3]

**Даніла Раманавіч** (1201 – 1264 гг.), князь галіцкі і валынскі. Сын Рамана Мсціславіча. З 1211 г. княжыў у Галічы (у 1212 г. выгнаны), з 1221 г. – на Валыні. У 1229 г. завяршыў аб'яднанне валынскіх зямель, у склад якіх былі ўключаны беларускія гарады Бярэсце, Кобрын, Камянец і падляшскія Бельск і Дарагічын; яму падпарадкоўваліся таксама тураўскія і пінскія князі. У 1223 г. удзельнічаў у бітве супраць мангола-татараў на р. Калка, быў паранены. Разбіў войска крыжакоў у *Дарагічынскай бітве 1237 г.* У 1238 г. канчаткова авалодаў Галічам, у 1239 г. – Кіевам, стаў вялікім князем кіеўскім. Заснаваў гарады Львоў, Холм (зрабіў яго сталіцай княства), Угровеск і інш. Ваяваў супраць Польшчы і Венгрыі (1245 г.), літоўскіх феадалаў, прымусіў яцвягаў плаціць яму даніну, канфліктаваў з навагародскімі князямі ***Міндоўгам*** і ***Войшалкам***. Сын Данілы Раманавіча ***Шварн*** быў жанаты з дачкой Міндоўга, а другі сын – Раман – атрымаў ад Міндоўга Навагародскае, Ваўкавыскае і Свіслацкае княствы. Каб стварыць кааліцыю для барацьбы з мангола-татарамі, у 1254 г. прыняў ад рымскага папы карону караля галіцкага, каранаваўся ў Дарагічыне. Выступаў супраць пашырэння каталіцтва. У 1259 г. вымушаны быў прызнаць залежнасць ад татараў і ў 1260 – 1261 гг. знішчыць гарадскія ўмацаванні ў княстве. У перыяд княжання Данілы Рама-

навіча Галіцка-Валынскае княства дасягнула значнага эканамічнага і палітычнага росквіту, пашырыўся яго ўплыў на беларускія землі. [4]

**Войшалк** (1225 (?) – 1268 гг.), вялікі князь літоўскі (1264 – 1266 гг.). Сын Міндоўга. Відаць, упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1253 г. (фактычна 1252 г.) як не названы па імені сын Міндоўга, якога той накіраваў у набег супраць галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васількі Раманавічаў у ваколіцы Турыйска. Каля 1257 г. Войшалк ад імя бацькі заключыў мір з ***Данілам***, сасватаў за ***Шварна Данілавіча*** сваю сястру і саступіў ***Раману Данілавічу*** Новагародак, Слонім і Ваўкавыск, прычым два апошнія – ад свайго імя, што сведчыць пра іх папярэдняе ўваходжанне ва ўдзел Войшалка. Пасля разрыву міру ў 1258 г. Войшалк разам з Таўцівілам захапіў Рамана Данілавіча ў Новагародку і, напэўна, забіў яго. З таго часу, найбольш верагодна, пачалося княжанне Войшалка ў Новагародку, пра якое летапіс паведамляе рэтраспектыўна пад 1263 г. Войшалк, застаючыся язычнікам, быў выключна жорсткі да сваіх падданых, але потым прыняў праваслаўную веру і радыкальна змяніўся. Ён пакінуў княжацкі пасад і пастрыгся ў манахі, тры гады жыў у Палонскім манастыры на Валыні, а потым пасля няўдалай спробы паломніцтва ў Палесціну заснаваў уласны манастыр каля Новагародка (Лаўрышаўскі манастыр). У гэты час яго адносіны з Міндоўгам былі напружанымі. Пасля забойства Міндоўга (1263 г.) Войшалк уцёк у Пінск. Паводле Наўгародскага Першага летапісу, ён даў клятву адпомсціць за бацьку і на тры гады адмовіўся ад манаства. У 1264 г., пасля забойства новага вялікага князя ***Траняты***, якое, магчыма, было арганізавана Войшалкам, ён атрымаў ваенную дапамогу ад пінскіх князёў і захапіў Новагародак, дзе да яго далучыліся бацькавы прыхільнікі, а затым дамогся ўлады над бацькоўскай вотчынай у Літве, дзе пакараў смерцю сваіх ворагаў. Пры гэтым ён абапіраўся на падтрымку швагра ***Шварна,*** а сябе прызнаў васалам галіцка-валынскага князя Васількі Раманавіча. З дапамогай валынскага войска Войшалк заваяваў Дзяволтву і Нальшчаны, зноў аб'яднаўшы асноўныя літоўскія княствы і Новагародскую зямлю пад адной уладай. У залежнасці ад яго знаходзіліся Полацк і Віцебск, пра што сведчыць грамата полацкага князя Ізяслава каля 1265 г. Прыблізна да 1266 г. Шварн заставаўся суправіцелем Войшалка, а затым Войшалк цалкам перадаў яму ўладу, вярнуўся ў манаства і пасяліўся ва Угроўскім манастыры на Валыні. Прыблізна ў красавіку 1268 г. старэйшы брат Шварна Леў Данілавіч паклікаў Войшалка да сябе ва Уладзімір Валынскі, дзе забіў яго ў час бяседы. Летапіс тлумачыць забойства тым, што Леў меў крыўду на Войшалка, які перадаў уладу над Літвой і Новагародкам не яму, а Шварну. [5]

**Раман Данілавіч (**каля 1230 – 1258 (?) гг.), князь навагародскі ў 1250-х гг. Сын галіцка-валынскага князя ***Данілы Раманавіча***. Дапамагаў бацьку ў вайсковай і дыпламатычнай дзейнасці. Вызначыўся ў баях з мангола-татарамі, удзельнічаў у паходах на яцвягаў. У 1252 г. ажаніўся з герцагіняй Гертрудай, пляменніцай і спадкаемніцай апошняга аўстрыйскага герцага з дынастыі Бабенбергаў Фрыдрыха ІІ, але ў барацьбе за аўстрыйскі трон пацярпеў паражэнне і пакінуў Аўстрыю. Паводле дагавора, заключанага каля 1255 г. Данілам Раманавічам з ***Міндоўгам*** пры пасрэдніцтве яго сына ***Войшалка***, Раман Данілавіч атрымаў ад літоўскіх князёў Навагародскае княства з гарадамі Навагародак, Слонім, Ваўкавыск як знак іх залежнасці і тады ж ажаніўся з Аленай, дачкой ваўкавыскага князя Глеба. У адказ на паход галіцка-валынскіх і мангола-татарскіх войск на літоўскія уладанні ***Войшалк*** і ***Таўцівіл*** у 1258 г. адбілі Навагародак, захапілі Рамана Данілавіча ў палон і, відаць, забілі. [6]

**Транята** (? – 1264 гг. ), вялікі князь літоўскі (1263 – 1264 гг.). Пляменнік (сын сястры) ***Міндоўга.*** Упершыню згадваецца ў лівонскай “Старэйшай рыфмаванай хронiцы” ў сувязі з падзеямі 1260 – 1261 г., калі Жамойць пазбавілася часовай залежнасці ад крыжакоў і перайшла пад уладу Міндоўга. Транята быў яго намеснікам у Жамойці і адным з бліжэйшых дарадцаў, ідэолагам сумеснай барацьбы ўсіх балцкіх народаў супраць Тэўтонскага ордэна. Адзін з арганізатараў забойства Міндоўга ў 1263 г., пасля якога атрымаў велікакняжацкую ўладу. Сутыкнуўшыся з прэтэнзіямі на ўладу з боку полацкага князя ***Таўцівіла***, забіў яго. Неўзабаве сам быў забіты змоўшчыкамі – прыхільнікамі Міндоўга. [7]

**Таўцівіл** (? – 1264 гг.), літоўскі князь. Пляменнік ***Міндоўга***, верагодна, сын яго старэйшага брата Даўспрунка (упамінаецца ў 1219 г.). Каля 1249 г. Міндоўг накіраваў Таўцівіла і яго брата Эдзівіла ў паход на Смаленскае княства, а сам захапіў іх вотчыны і арганізаваў няўдалую спробу іх забойства. Таўцівіл уцёк у Галіцка-Валынскае княства, а потым у Рыгу, дзе прыняў хрышчэнне ў каталіцтва. Палітычныя праціўнікі Міндоўга – галіцка-валынскі князь ***Даніла Раманавіч***, Лівонскі ордэн, рыжскі арцыбіскуп і князь Жамойці Выкінт (дзядзька Таўцівіла па маці) – падтрымалі Таўцівіла як прэтэндэнта на пасад вялікага князя літоўскага і аказалі яму ўзброеную дапамогу. Аднак нанесці Міндоўгу ваеннае паражэнне не ўдалося. Пасля хрышчэння Міндоўга ў каталіцтва ў 1253 г. накіраваная супраць яго кааліцыя на чале з Таўцівілам распалася. Пэўны час Таўцівіл заставаўся ў Галіцка-Валынскім княстве і ў 1253 г. удзельнічаў у паходзе Данілы Галіц-

кага ў Чэхію. Пазней ён, відаць, прымірыўся з Міндоўгам. Магчыма, ужо ў 1258 г. Таўцівіл быў полацкім князем і ўдзельнічаў у сумесным паходзе палачан і літоўцаў на Смаленскую зямлю і Таржок, але яго імя ў сувязі з гэтымі падзеямі не згадваецца. У час татарскага паходу на Літву зімой 1258 – 1259 гг. Таўцівіл дзейнічаў разам з сынам Міндоўга ***Войшалкам*** супраць Данілы Раманавіча, саюзніка татар. У 1262 г. Таўцівіл узгадваецца як князь полацкі. Відаць, быў адным з арганізатараў забойства Міндоўга ў 1263 г. Неўзабаве паміж Таўцівілам і пераемнікам Міндоўга ***Транятам*** пачалася барацьба за ўладу, у выніку якой Таўцівіл быў забіты. [8]

**Шварн** (? – 1270 (?) гг.), князь галіцкі, вялікі князь літоўскі з 1267 г. Сын галіцка-валынскага князя Данілы Раманавіча. Каля 1253 г. ажаніўся з дачкою вялікага князя літоўскага ***Міндоўга***. У 1256 г. з бацькам, братамі Львом і Раманам і ваўкавыскім князем Глебам хадзіў на яцвягаў. У наступныя гады ўдзельнічаў у вызваленні некаторых гарадоў з-пад мангола-татарскай улады. У 1262 г. дапамагаў Міндоўгу ў нападзе на мазавецкага князя Земавіта (забіў яго ў Яздаве пад Варшавай). Пасля смерці бацькі (1264 г.) валодаў усходняй Галіччынай з горадам Галіч, Забужжам з гарадамі Белз, Чэрвен, Холм, Мельнік, Дарагічын. У 1264 г. дапамог Войшалку захапіць трон ВКЛ, адпомсціць Траняту за забойства Міндоўга, заваяваць Нальшчаны і Дзяволтву. Быў прыхільнікам аб’яднання сіл ВКЛ і Галіцка-Валынскага княства для барацьбы з яцвягамі і Польшчай. Неаднаразова нападаў на Польшчу. У 1267 г. атрымаў ад Войшалка велікакняжацкую ўладу ў ВКЛ. Пасля яго смерці вялікім князем літоўскім стаў ***Трайдзень***. [9]

**Трайдзень**, Трайдзен (? – 1282 (?) гг.), вялікі князь літоўскі прыкладна з 1270 г. Уладу атрымаў пасля смерці галіцка-валынскага князя ***Шварна***, які, дзякуючы шлюбу з дачкой ***Міндоўга***, некалькі гадоў быў вялікім князем ВКЛ. Прыход да ўлады Трайдзеня прывёў да разрыву сувязі Літвы з Галіцка-Валынскім княствам і, відаць, суправаджаўся рэпрэсіямі супраць хрысціянства. Тым не менш, пад уладай Трайдзеня, апрача этнічна літоўскіх зямель, засталіся землі і гарады беларускага Панямоння. Яго галоўнай рэзідэнцыяй стаў замак Кернаў. Пры ім да ВКЛ канчаткова далучаны прылеглыя землі яцвягаў, земгалаў і селаў, аднавіліся далёкія набегі на эстонскія ўладанні крыжакоў (востраў Саарэмаа і інш.) і на Польшчу. Каля 1274 г. Трайдзень спрабаваў захапіць у галіцка-валынскага князя Льва Данілавіча падляшскі горад Дарагічын. Трайдзень супрацьдзейнічаў спробам экспансіі галіцка-валынскіх князёў у Панямонне і ваенным паходам татар на Літву (каля 1275 г. і ў 1277 г.). Даваў прытулак уцекачам з Прусіі, дзе ў 1276 г.было задушана ан-

тыкрыжацкае паўстанне, рассяляў іх у ваколіцах Гародні і Слоніма. Нанёс цяжкае паражэнне войскам Лівонскага ордэна ў *Ашэрадэнскай бітве 1279 г.* У 1281 г. Трайдзень дамогся пераходу пад кантроль ВКЛ новапабудаванага замка крыжакоў у Дынабургу (Даўгаўпілс). Дзякуючы шлюбу дачкі Трайдзеня Гаўдэмунды з князем Мазовіі Баляславам Плоцкім значна пашырыўся знешнепалітычны ўплыў ВКЛ. [10]

**Даўмонт** (? – 05.08.1285 гг.), мяркуемы вялікі князь літоўскі ў канцы XIII ст. Упамінаецца ў Троіцкім летапісе (і пазнейшых летапісах, якія на яго абапіраліся) як князь, што камандаваў буйным нападам літоўцаў на воласць Алешня і інш. цвярскога епіскапа Сімяона (паўднёвы захад Цвярскога княства) і загінуў там у бітве з аб'яднаным войскам з Цверы, Масквы, Волака Ламскага, Таржка, Дзмітрава, Зубцова і Ржэвы. Васкрасенскі летапіс сцвярджае, што Даўмонт быў захоплены ў палон. Паходжанне Даўмонта невядома. Гісторыкі мяркуюць, што Даўмонт мог быць сынам і непасрэдным наступнікам вялікага князя ***Трайдзеня***. (...). Наступнікам Даўмонта ў ВКЛ быў, магчыма, ***Бурдзікід***. [11]

**Бурдзікід,** вялікі князь літоўскі ў канцы XIII ст. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1289 г., калі ён са сваім братам ***Будзівідам*** аддаў горад Ваўкавыск валынскаму князю Мсціславу Данілавічу, каб захаваць з ім мір. Даследчыкі атаясамліваюць Бурдзікіда з "каралём" Бутэгейдэ, які ўпамінаецца ў лісце магістра Лівонскага ордэна ў лістападзе 1290 г. Адсутнасць іншых звестак выклікала розныя меркаванні пра характар улады Бурдзікіда. Згодна з адным пунктам погляду, Бурдзікід правіў у Жамойці, а ***Будзівід*** – у Аўкштайціі. Існуе меркаванне, што Бурдзікід стаў вялікім князем Літвы пасля гібелі ў 1285 г. вялікага. князя ***Даўмонта***, памёр каля 1290 – 1292 г., пасля чаго гаспадаром Літвы стаў яго брат ***Будзівід***. [12]

**Будзівід,** вялікі князь літоўскі ў канцы XIII ст. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1289 г., калі ён са сваім братам ***Бурдзікідам*** аддаў г. Ваўкавыск валынскаму князю Мсціславу Данілавічу, каб захаваць з ім мір. Гісторыкі атаясамліваюць Будзівіда з "літоўскім каралём" ***Пукуверам*** (Путувер, Лютувер), які ўпамінаецца ў крыжацкіх хроніках пад 1291 г. Недахоп пэўных звестак выклікаў розныя меркаванні пра Будзівіда. Існуе думка, што Будзівід быў уладаром Аўкштайціі, а яго брат кіраваў Жамойціяй. Пашыраны погляд, што Будзівід стаў вялікім князем Літвы пасля смерці Бурдзікіда (пасля 1290 г.). Мяркуецца, што ён памёр у 1294 або 1295 г.; меў сыноў ***Віценя***, ***Гедзіміна***, Воіня і Фёдара. [13]

**Путувер** (? – каля 1292 гг.), літоўскі князь. Упамінаецца нямецкім храністам Пятром з Дусбурга ў "Хроніцы зямлі Прускай" пад 1291 г. як "літоўскі кароль", які накіраваў свайго сына ***Віценя*** з вялікім войскам у набег на Польшчу. Гатычны шрыфт рукапісу дазваляе чытаць імя князя як Лютувер (Lutuwerus) або, больш дакладна, Путувер (Putuwerus). Гэтая звестка пра Путувера правакавала даследчыкаў на домыслы. Т. Нарбут звяртаў увагу на познія звесткі Хронікі Быхаўца пра паходжанне Віценя "з именя держачого в Жомойти реченного Айрагойла" і прыводзіў паданне пра Лютавора – марскога пірата, заснавальніка Эйраголы, які пасля смерці Траняты ў 1264 г. нібыта атрымаў Полацкае княства. Пры гэтым Нарбут спасылаўся на "Раўданскі рукапіс" – польскамоўны твор, вядомы толькі яму, які, відаць, быў прыдуманы самім Нарбутам або кімсьці з яго знаёмых. Ю. Пузына прыводзіў імя Путувера ў форме "Пукувер" і выказваў меркаванне, што яго можна атаясаміць з адным з літоўскіх князёў, узгаданых Іпацьеўскім летапісам у 1289 г., – ***Будзікідам*** або, хутчэй, яго братам ***Будзівідам.*** Е. Ахманскі звяртаў увагу на рускі твор канца XIV ст. "Задоншчыну", у якой Гедзімінавічы названы "праўнукамі Скаламендавымі", на падставе чаго меркаваў, што іх родапачынальніка (бацьку Путувера) звалі Скаламендам. [14]

**Віцень** (? – 1316 гг.), вялікі князь літоўскі [1295 – 1316 гг.]. Звесткі пра паходжанне Віценя супярэчлівыя. Паводле "Хронікі зямлі Прускай" Пятра з Дусбурга, Віцень быў сынам князя ***Пукувера*** (інакш Лютувера), родапачынальніка Гедзімінавічаў. Братам ***Віценя*** быў ***Гедзімін.*** У 1291 г. Пукувер паслаў Віценя з вялікім войскам у Польшчу ваяваць Куяўскую зямлю. У 1294 г. Віцень камандаваў літоўскім войскам, якое напала на Лянчыцкую зямлю ў Польшчы, у 1295 г. – на Малую Польшчу, у 1300 г. – на Добжынскую зямлю, у 1306 г. – на Каліш. Яшчэ адзін паход на Польшчу адбыўся ў 1307 г. Арганізоўваў адпор наступу нямецкіх рыцараў-крыжакоў на ВКЛ. Пад яго кіраўніцтвам адбыліся ваенныя паходы на тэрыторыю Тэўтонскага ордэна. Скарыстаў супярэчнасці паміж лівонскімі рыцарамі і Рыжскім арцыбіскупствам і ў 1298 г. заключыў саюзны дагавор з Рыгай і рыжскім арцыбіскупам, што дало магчымасць адбіць крыжацкі наступ на Жамойць. Тады ж Віцень захапіў крыжацкі замак Каркхаўз. Саюз ВКЛ з Рыгай дзейнічаў да канца панавання Віценя. У 1307 г. Віцень дапамог жыхарам Полацка выгнаць крыжакоў, якія праніклі ў горад у 1305 г. і пачалі там панаваць. Пры гэтым у Полацку былі перабіты амаль усе немцы, а пабудаваны імі касцёл разбураны. Для барацьбы з крыжакамі на правым беразе Нёмана Віцень пабудаваў некалькі замкаў, у якіх пастаянна знаходзіліся зменныя гарнізоны. На левым беразе Нёмана былі пабудаваны замкі крыжакоў.

Тут пастаянна адбываліся ваенныя сутычкі. Ва ўнутранай палітыцы Віцень намагаўся ўмацаваць палітычнае адзінства ВКЛ. Сяліў на сваіх землях на Гарадзеншчыне прусаў, якія ўцякалі ад крыжакоў з заваяванай Прусіі. За гэта крыжакі рабілі жорсткія напады на Гарадзенскую зямлю. У 1294 г. Віцень задушыў паўстанне жамойцкіх князёў, якіх схіляў да саюзу Тэўтонскі ордэн. Паводле позняга Васкрасенскага летапісу, Віцень далучыў да сваёй дзяржавы тэрыторыю да Заходняга Буга, Берасцейскую зямлю (1315 г.). Пра абставіны смерці Віценя дакладных звестак не захавалася. Апошні раз упамінаецца ў крыніцах пад 1315 г., калі ў верасні гэтага года кіраваў аблогай крыжацкага замка Хрыстмемеля. Супярэчліва выглядаюць паведамленні хронік пра яго гібель у баі з крыжакамі ці смерці ад удару маланкі. Паводле Густынскага летапісу, Віцень прыняў дзяржаўны герб ВКЛ: “Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему князству Литовскому печать: рыцер збройны на коне з мечем, еже ныне наричут Погоня”. [15]

**Давыд** (каля 1283 – 1326 гг.), палкаводзец і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, стараста гарадзенскі. Сын нальшчанскага князя ***Даўмонта***, які ў 1266 г. ад’ехаў разам з дваром і 300 баярамі з Крэва ў Пскоў пасля крывавай міжусобнай барацьбы з ***Міндоўгам***, і княжны Марыі Дзмітрыеўны, унучкі Аляксандра Неўскага. Пасля смерці бацькі ў 1299 г. перайшоў у Гародню, дзе паступіў на службу да князя ***Гедзіміна***. Быў кашталянам Гарадзенскага замка. Ажаніўся з дачкою Гедзіміна Бірутай і атрымаў права на карыстанне асобным удзелам. У 1305 г. разам з Гедзімінам разбіў каля Гародні войскі каменданта Брандэнбурга комтура Конрада Ліхтэнхагена. У 1306 г. узначаліў паспяховую абарону Гарадзенскага замка, абложанага шасцю тысячамі лёгкіх коннікаў і сотняй цяжкаўзброеных рыцараў пад камандаваннем комтура Караляўца (Кёнігсберга) Эберхарда Вірненбурга. У 1314 г. разбіў крыжакоў, што аблажылі Навагародак, і знішчыў увесь варожы абоз, захапіў 1500 коней і ваенную амуніцыю. У 1318 (1319 ?) г. узначаліў паход гарадзенцаў на Прусію, у веснавую паводку заваяваў вобласць Вагенштоф, якую абаранялі комтуры Ульрых Дрымбе і Фрыдрых Квітц. У 1322 г. дапамог Пскову ў барацьбе з Лівонскім ордэнам, у 1323 г. разбіў пад яго сценамі дацкае войска і дайшоў да Рэвеля. У тым самым годзе яшчэ раз адкінуў ад Пскова нямецкіх рыцараў, якія асаджалі горад 18 дзён, а потым разбіў іх. У 1324 г. арганізаваў паход войск ВКЛ на Мазовію. У 1326 г. на чале атрада з 1200 коннікаў, сярод якіх былі і палякі, зрабіў кінжальны рэйд на Брандэнбург і Франкфурт-на-Одэры. У час гэтага пераможнага пахода немцы падкупілі мазавецкага рыцара Андрэя Госта, і той па-здрадніцку забіў Давыда. Пахаваны ля сцен Барысаглебскага манастыра ў Гародні. [16]

**Гедзімін, Гедымін** (каля 1275 – 1341 гг.), вялікі князь літоўскі прыблізна з 1316 г. Позняя традыцыя, зафіксаваная ў беларуска-літоўскіх летапісах, лічыла Гедзіміна сынам ***Віценя***, аднак у дыпламатычнай перапісцы Гедзіміна з рыжскім магістратам ён называецца братам Віценя. Некаторыя аўтары (Т. Васілеўскі, М. Ермаловіч) выказвалі меркаванне, што пры перапісванні дакумента былі пераблытаны блізкія па напісанні словы frater (брат) і pater (бацька), таму роднасныя сувязі паміж Віценем і Гедзімінам нельга лічыць дакладна высветленымі. Ужо ў другой палове XV ст. існавала і тэндэнцыйная версія, зафіксаваная ў польскай хроніцы Я. Длугаша і ў маскоўскіх радаводах (Чудаўская аповесць, Пасланне Спірыдона-Савы), якая абвяшчала Гедзіміна конюхам Віценя, які нібыта забіў свайго гаспадара і захапіў яго ўладу. Гэта версія, відаць, была створана з мэтай дыскрэдытацыі пануючай дынастыі ВКЛ. Панаванне Гедзіміна пачалося паміж кастрычнікам 1315 г. (апошняя згадка Віценя) і чэрвенем 1317 г., калі аб’ектам нападу Тэўтонскага ордэна стаў замак Гедзіміна, названы ў гонар свайго заснавальніка. Не пазней за 1320 г. Гедзімін заснаваў мураваны замак у Вільні, які стаў яго галоўнай рэзідэнцыяй. Пачатак панавання Гедзіміна вызначыўся стварэннем у ВКЛ самастойнай Літоўскай праваслаўнай мітраполіі, падпарадкаванай непасрэдна канстанцінопальскаму патрыярху (існавала ў 1317 – 1330 гг., цэнтр – Навагародак), і спробай нармалізаваць адносіны з каталіцкім Захадам. Каля 1321 г. Гедзімін пабудаваў у Вільні касцёл для манахаў-францысканцаў і аднавіў іх касцёл у Навагародку, спалены ў выніку нападу крыжакоў. У маі 1323 г. Гедзімін праз Рыгу звярнуўся з шэрагам лістоў да рымскай курыі, Ганзейскага саюза, саксонскіх рэзідэнцый францысканскага і дамініканскага ордэнаў. У гэтых лістах Гедзімін, тытулаваны “каралём Літвы і Русі, уладаром і князем Жамойці”, выказваў намер прыняць каталіцкае хрышчэнне, запрашаў у ВКЛ манахаў і майстроў розных спецыяльнасцей, гарантаваў ім розныя льготы і прывілеі. 02.10.1323 г. Гедзімін заключыў мір з рыжскім ацыбіскупам і магістратам Рыгі (гл. ***Дагавор 1323***). Межы ВКЛ і Лівонскага ордэна абвяшчаліся адкрытымі для гандлю і вольнага перамяшчэння людзей. Адносіны з Тэўтонскім ордэнам на прускай мяжы засталіся варожымі, у пачатку 1324 г. адбыўся шэраг нападаў на Жамойць, у ліпені – аблога літоўцамі ордэнскага замка Хрыстмемель. У кастрычніку 1324 г. рымскі папа Іаан XXII накіраваў сваіх легатаў, упаўнаважаных ахрысціць Гедзіміна. Аднак у апошні момант Гедзімін адмовіўся ад хрышчэння, задаволіўшыся мірам з Тэўтонскім ордэнам, заключаным у лістападзе 1324 г. з дапамогай легатаў.

У тыя ж гады Гедзімін разгарнуў экспансію на Русі. Першымі яе праявамі сталі ўвакняжанне ў Віцебску на пачатку 1320-х гг. сына Гедзіміна ***Аль-***

***герда***, які незадоўга да таго ажаніўся з дачкой апошняга віцебскага князя з роду Рурыкавічаў, і саюз з Цвярскім княствам, замацаваны шлюбам дачкі Гедзіміна Марыі з цвярскім князем Дзмітрыем Міхайлавічам (1320 г.). У 1322 г. другі зяць Гедзіміна і яго намеснік у Гародні ***Давыд*** стаў на кароткі час князем Пскова, што прывяло да выхаду Пскова з-пад кантролю Вялікага Ноўгарада. У 1323 г.адбыўся набег літоўскага войска на наўгародскую воласць Лукі (Вялікія Лукі). Каля 1322 г. пад уладу ВКЛ перайшлі Берасцейшчына і Падляшша, аб чым паведамляюць познія беларуска-літоўскія летапісы. (...) Відаць, далучэнне Берасця адбылося ў выніку ваеннай акцыі Гедзіміна. Актывізацыя палітыкі на Русі выклікала канфлікт з Залатой Ардой. У час візіту папскіх легатаў Гедзімін быў моцна заняты татарскімі справамі, а ў 1325 г. адбыўся татарскі паход на ВКЛ. Тым не менш сфера ўплыву Гедзіміна на Русі няўхільна пашыралася. Менскі князь Васіль быў васалам Гедзіміна і ў 1326 г. удзельнічаў у яго пасольстве ў Ноўгарад, вынікам якога стала заключэнне міру з Ноўгарадам і аднаўленне міру з Лівоніяй. У Полацку княжыў брат Гедзіміна Воінь, які ўзначаліў гэтае пасольства. У Пскове пасля Давыда княжыў цвярскі князь Аляксандр Міхайлавіч (1327 – 1329 гг.), які абапіраўся на падтрымку Гедзіміна. Пад непасрэдную ўладу Гедзіміна адышлі ў 1320-я гг. Таропецкае і Ржэўскае княствы на поўначы Смаленскай зямлі (ржэўскія гарады Асечан і Расна на верхняй Волзе згадваюцца як “літоўскія” ў 1335). Адначасова Гедзімін завязаў цесныя адносіны з Польшчай і ў 1325 г. аддаў сваю дачку Альдону (Ганну) за Казіміра, сына караля Уладзіслава Лакатка. У 1326 г. Гедзімін накіраваў войска з 1200 коннікаў на чале з Давыдам Гарадзенскім, якое спустошыла зямлю варожага Польшчы Брандэнбургскага маркграфства.

У 1328 г. Гедзімін умяшаўся ў канфлікт паміж рыжскім магістратам і Лівонскім ордэнам, напэўна, спадзеючыся, што гэта прывядзе да ліквідацыі ордэна. Восенню 1329 г. ён па просьбе рыжан спустошыў уладанні ордэна, а вясной 1330 г. – уладанні рыжскага арцыбіскупа. Аднак канфлікт скончыўся паражэннем гараджан і заключэннем імі міру з ордэнам (30.03.1330 г.), што прывяло да аднаўлення вайны паміж ВКЛ і крыжакамі. Сумесны напад прускай і лівонскай галін ордэна на Жамойць адбыўся ўжо ў сакавіку 1330 г. У адказ у верасні 1330 г. Гедзімін паслаў войска на дапамогу польскаму каралю, які ажыццявіў напад на Прусію. У далейшым напады ордэнскіх рыцараў на ВКЛ сталі рэгулярнымі: яны адбываліся ў 1332, 1333 гг. (лівонскае войска на ладдзях дасягнула Полацка), 1334 г. (да Полацка), 1339, 1340 гг.

Аднаўленне вайны на захадзе не спыніла ўплыву ВКЛ на ўсходнія справы, але ўскладніла яго. Саюзнік Гедзіміна цвярскі князь Аляксандр у 1329 г. страціў Пскоў, але ў 1331 г. паўторна атрымаў яго “из литовскыя

рукы" і заставаўся пскоўскім князем да 1337 г. У 1331 г. Гедзімін зрабіў няўдалую спробу правесці на вакантную пасаду наўгародскага епіскапа свайго стаўленіка Арсенія. (...) Саюзнікамі Гедзіміна былі ў той час смаленскі князь Іван Аляксандравіч, казельскі князь Аляксандр Мсціславіч (жанаты з дачкой Гедзіміна). У 1331 г. Гедзімін. аддаў сваю дачку Яўфімію за галіцка-валынскага князя Баляслава-Юрыя. У 1333 г. сын Гедзіміна Нарымонт (Глеб) быў запрошаны князем у Ноўгарад, што было праявай палітычнага саюзу паміж ВКЛ і Ноўгарадам, накіраванага супраць маскоўскага князя Івана Каліты. Аднак Гедзімін пазбягаў адкрытага канфлікту з Масквой і ў 1333 г. аддаў дачку Аўгусту за Сямёна, сына Каліты. Да 1338 г. Нарымонт з'ехаў з Ноўгарада і стаў княжыць у Полацку і, магчыма, Пінску, але захаваў сваіх намеснікаў у шэрагу валасцей, падараваных яму наўгародцамі (Ладазе, Арэшку, Карэле і палове Капор'я). Беларуска-літоўскія летапісы паведамляюць пра заваяванне Гедзімінам Кіеўскай зямлі, але гэты сюжэт большасць даследчыкаў лічыць міфічным. У 1331 – 1363 гг. Кіевам валодаў князь Фёдар, які падпарадкоўваўся татарскаму баскаку. Часам яго атаясамліваюць з Фёдарам, братам Гедзіміна, але больш верагодна, што кіеўскі князь не меў дачынення да літоўскага княжацкага роду, хаця часам дзейнічаў у саюзе з Гедзімінам. Магчыма, спробы пашырыць уплыў ВКЛ на Кіеў выклікалі новы татарскі паход у 1338 г. У 1340 г. памёр апошні галіцка-валынскі князь Баляслаў-Юрый, што дазволіла ўладкавацца на Валыні малодшаму сыну Г. Любарту. Канчатковы падзел галіцка-валынскай спадчыны паміж ВКЛ, Ардой і Польшчай адбыўся ўжо пасля смерці Гедзіміна. Ен загінуў, напэўна, зімой 1341 г. пры аблозе ордэнскага замка Баербург. Існуе версія пра атручэнне Гедзіміна. Пад панаваннем Гедзіміна ВКЛ ператварылася ў моцную ўсходнееўрапейскую дзяржаву, тэрыторыя якой павялічылася ўдвая. Апрача сталіцы Вільні, мураваныя замкі былі ўзведзены ў Медніках, Лідзе, Крэве, Віцебску. Пачалося запазычанне першых элементаў заходнееўрапейскай культуры. Адначасова Гедзімін паклаў пачатак шырокай экспансіі на Русі, якая прадоўжылася ў наступныя дзесяцігоддзі. Яго шматлікія нашчадкі ўтварылі дынастыю Гедзімінавічаў. [17]

**Ліздзейка**, легендарны язычніцкі жрэц вялікага. князя ***Гедзіміна.*** Паводле легенды пра заснаванне Вільні, зафіксаванай у беларуска-літоўскіх летапісах, вялікі князь Віцень пры паляванні знайшоў у арліным гняздзе (літ. ludas гняздо, адсюль імя Ліздзейка) немаўля. Паводле іншага варыянта падання, хлопчык быў знойдзены ў кошыку ў зарасніках. Знайдзеныш атрымаў імя Ліздзейка, быў выхаваны пры велікакняжацкім двары і стаў вярхоўным жрацом пры сыне Віценя Гедзіміне. Калі ў час палявання Гедзімін

заснуў на Туравай гары над р. Вільня, то сасніў жалезнага воўка, што стаяў на Крывой гары і выў, як сто ваўкоў. Ліздзейка так патлумачыў сон Гедзіміна: “Волкъ железный знаменует город столечный тут будет, а што в нем оунутри ревет, то слава его будет слынути на вес свѣт”; пасля гэтага Гедзімін заклаў Вільню. Паводле аднаго з паданняў, Ліздзейка быў родапачынальнікам Радзівілаў. [18]

**Яўнут**, Яўнуцій, у праваслаўі Іван (каля 1308 – пасля 1366 гг.), вялікі князь літоўскі (1341 – 1345 гг.). Сын вялікага князя ***Гедзіміна*** і палачанкі Евы (Еўны). Атрымаў ад бацькі ва ўдзел Ашмяны, Браслаў і Вількамір. Паводле завяшчання Гедзіміна пасля яго смерці ў канцы 1341 г. стаў вялікім князем. Падтрымлівалі Яўнута вялікая княгіня Ева і брат, пінскі князь. Нарымонт. Астатнія браты ігнаравалі яго правы і праводзілі самастойную палітыку. Яўнут не здабыў прыхільнасці беларускага і літоўскага баярства. Паступова ўзмацнялася ўлада віцебскага і крэўскага князя ***Альгерда*** і троцкага, гарадзенскага, берасцейскага і жамойцкага князя ***Кейстута***. Адносіны паміж імі і Яўнутам пагоршыліся пасля смерці бяздзетнага старэйшага брата Монвіда, калі Яўнут перадаў яго спадчыну – Кернаў і Слонім – свайму прыхільніку Нарымонту. Пасля смерці ў пачатку 1345 г. вялікай княгіні Евы Альгерд і Кейстут арганізавалі змову супраць Яўнута. Аднак у вызначаны дзень Альгерд са сваім войскам не паспеў да Вільні, і сталіцу заняў Кейстут. Яўнут уцёк з замка ў бліжэйшыя да Вільні ўзгоркі (Турава гара), дзе прастудзіўся і адмарозіў ногі, а затым трапіў у палон. Згодна з папярэдняй дамовай, Кейстут абвясціў Альгерда вялікім князем ВКЛ. Фактычна яны падзялілі дзяржаву. Яўнут уцёк з-пад варты і праз Смаленск прыбыў у Маскву да свайго швагра, вялікага князя Сямёна Іванавіча Гордага, дзе ў 1346 г. прыняў праваслаўе. (...) У 1347 г. паміраўся з Альгердам і Кейстутам, вярнуўся і атрымаў ва ўдзел Заслаўскае княства, у склад якога некаторы час уваходзіў Менск. У далейшым Яўнут і яго сыны не прэтэндавалі на велікакняжацкую ўладу. [19]

**Альгерд** (каля 1296 – май 1377 гг.), вялікі князь ВКЛ (1345 – 1377 гг.). Сын ***Гедзіміна***. Атрымаў ад бацькі Крэўскае княства. У 1318 г. ажаніўся з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай, дачкой апошняга віцебскага князя, і пасля смерці цесця ў 1320 г. стаў і віцебскім князем. Удзельнічаў у вайсковых паходах супраць крыжакоў. Пасля смерці Гедзіміна ў 1341 г. некаторы час падпарадкоўваўся малодшаму брату, вялікаму князю ***Яўнуту***, аднак, незадаволены яго праўленнем, разам з братам ***Кейстутам*** арганізаваў змову супраць Яўнута. З войскам пайшоў з Віцебска на Вільню, ад-

нак Кейстут паспеў захапіць Вільню раней. Яўнут уцёк з горада, але хутка трапіў у палон. Вялікім князем літоўскім і рускім стаў Альгерд, а Кейстут атрымаў частку заходніх і ўсходніх зямель ВКЛ (з падпарадкаваннем Альгерду). Альгерд праводзіў унутраную і знешнюю палітыку дзяржавы ў цесным саюзе з Кейстутам, але асноўны кірунак усходняй палітыкі вёў Альгерд, а заходняй – Кейстут. Альгерд паспяхова змагаўся з крыжакамі ў бітвах 1345, 1347, 1348 (каля Трокаў), 1352, 1365, 1370 (Рудаўская бітва) гг., аказваў дапамогу Пскову. Асабліва актыўна дзейнічаў на ўсходнім напрамку. Паспяхова вёў палітыку, накіраваную на палітычнае і культурна-этнічнае аб'яднанне беларускіх і ўсходнеславянскіх зямель у адной дзяржаве пад эгідай Вільні. Да ВКЛ былі далучаны Мсціслаў і Белы (Смаленская зямля), Чарнігава-Северскае княства. У палітычную залежнасць ад Альгерда трапіла Смаленскае княства. З 1351 г. вёў барацьбу з Залатой Ардой. У *бітве каля Сініх Вод* 1362 г. разбіў войска трох татарскіх ханаў. У выніку гэтай перамогі з-пад татарскага панавання была вызвалена Кіеўская зямля, дзе князем быў пасаджаны Уладзімір Альгердавіч, Валынь і Падолле. Украінскія землі надоўга ўвайшлі ў склад ВКЛ. У 1349 – 1351 і 1366 гг. Альгерд вёў барацьбу з Польшчай за Валынь і Падляшша. Альгерд імкнуўся пашырыць свой уплыў на Цвярское княства і замацаваў саюз з ім у 1350 г. шлюбам з цвярской князёўнай Ульянай Аляксандраўнай. Адносіны з Маскоўскім вялікім княствам былі напружанымі. У *вайне Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай* 1368 – 1372 гг. не дамогся перамогі, аднак тэрыторыі на Поўдзень ад Масквы (Вярхоўскія княствы) былі далучаны да ВКЛ. За час панавання Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася больш чым у 2 разы, а беларускія землі занялі цэнтральнае месца ў дзяржаве. Гэта забяспечыла рост іх эканомікі, развіццё культуры, замацаванне беларускай мовы ў якасці афіцыйнай, пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы. (...) [20]

**Кейстут** (1297 – 15.08.1382 гг.), вялікі князь літоўскі (1381 – 1382 гг.). Сын вялікага князя ***Гедзіміна*** ад першага шлюбу. У 1330-х гг., у час панавання бацькі, быў князем у Троках. У склад яго княства ўваходзілі Гародня, Падляшша і частка Жамойці, якую яшчэ не захапілі крыжакі. Вёў паспяховую барацьбу з рыцарамі Тэўтонскага ордэна, абараняючы ад іх літоўскія і беларускія землі. У 1341 г. Гедзімін перад смерцю падзяліў дзяржаву на ўдзелы паміж сынамі, пакінуўшы велікакняжацкі пасад малодшаму сыну ***Яўнуту***. Кейстут вёў самастойную палітыку, зблізіўся з братам ***Альгердам***, князем віцебскім і крэўскім. У пачатку 1345 г. яны арганізавалі змову супраць Яўнута і кожны са сваім войскам рушылі да Вільні. Аднак Альгерд не паспеў да сталіцы ў вызначаны дзень, і Кейстут са сваім вой-

скам заняў Вільню. Кейстут абвясціў старэйшага брата Альгерда вялікім князем літоўскім і рускім. Атрымаўшы велікакняжацкі пасад, Альгерд фактычна падзяліў дзяржаву, аддаўшы Кейстуту яе заходнюю частку, якой Кейстут самастойна кіраваў і вёў барацьбу супраць Тэўтонскага ордэна. Удзел Кейстута складаўся з невялікай часткі літоўскіх зямель (Трокі і Коўна), часткі Жамойці, а таксама з беларускіх зямель, якія складалі больш за палову княства Кейстута (Падляшша, Гародня, Слонім, Ваўкавыск, Камянец, Берасцейская зямля, Кобрын, Пінск, Тураў, "троцкая палавіна" Бабруйскай, Любашанскай і Свіслацкай валасцей, Горваль, Грэск). У беларуска-літоўскіх летапісах Кейстута называлі вялікім князем, а ў нямецкіх хроніках – каралём. Гэта сведчыць пра яго палітычную ролю ў дзяржаве. Валодаючы землямі ў Літве і Жамойці, прадстаўляў іх інтарэсы ў палітыцы ВКЛ. Кейстут і Альгерд разам разграмілі войска крыжакоў у *Рудаўскай бітве* 1370 г. Са свайго боку, Кейстут удзельнічаў у паходах Альгерда на Маскву, падтрымліваў брата ў яго знешняй і ўнутранай палітыцы.

Пасля смерці Альгерда ў 1377 г. Кейстут прызнаў вялікім князем свайго пляменніка ***Ягайлу***, якога спачатку падтрымліваў і разам з якім ваяваў супраць крыжакоў. Аднак у 1380 г. адносіны паміж імі пагоршыліся. Кейстут быў супраць шлюбу сястры Ягайлы Марыі з Вайдылам, баярынам нязнатнага роду. У 1381 г. Кейстут даведаўся аб патаемнай дамове Ягайлы з крыжакамі Тэўтонскага ордэна і, адчуваючы вялікую пагрозу для сябе, раптоўна выступіў супраць Ягайлы. У ліпені 1381 г. Кейстут знянацку захапіў Вільню і абвясціў сябе вялікім князем літоўскім і рускім. Ягайла быў пераведзены ў вызначаны яму ўдзел – Крэва і Віцебск. Кейстут працягваў барацьбу з крыжакамі ў 1382 г. У час яго адсутнасці Ягайла ў ліпені 1382 г. захапіў Вільню і аднавіў сваё панаванне ў дзяржаве. Кейстут пачаў вайну супраць Ягайлы, але поспеху не меў. У пачатку жніўня 1382 г. Кейстут сабраў пяцітысячнае войска – гарадзенскія і падляшскія палкі, жамойцкія і валынскія атрады – і пайшоў да Трокаў, непадалёк ад якіх сустрэўся са значна мацнейшым войскам Ягайлы. Атрымаўшы запрашэнне на перагаворы, Кейстут прыехаў да Ягайлы, быў затрыманы і заключаны ў Крэўскі замак. Паводле загаду Ягайлы, там і быў задушаны. [21]

**Дагавор 1219 г.**, мірнае пагадненне, заключанае паміж Уладзіміра-Валынскім княствам і Літвой па ініцыятыве літоўскіх князёў у канцы 1219 ці пачатку 1220 г. У Валынскім (Іпацьеўскім) летапісе пад 6723 г. "ад стварэння свету" (дата памылковая) прыведзены пералік князёў, што падпісалі дагавор, які, напэўна, быў узяты складальнікам летапісу з арыгінала. Пералік каштоўны тым, што адлюстроўвае палітычны стан літоўскіх зямель.

У ім фігуруюць пяць груп князёў – уладальнікаў асобных, але ўжо нераўнапраўных княстваў. 5 прадстаўнікоў 1-й групы названы “старэйшымі”, прычым парадак пераліку дазваляе меркаваць пра роднасныя сувязі паміж імі. Відаць, гэта былі прадстаўнікі аднаго княжацкага роду, які на той час палітычна дамінаваў над іншымі. Узначальваў яго Жывінбуд, пасля якога пералічаны дзве пары братоў: Даўят (ці Даўял) з Вілікайлам і Даўспрунк з Міндоўгам. Магчыма, гэта былі маладыя сыны двух старэйшых братоў Жывінбуда, якія на той момант памерлі і пасля якіх ён стаў старэйшым у родзе. 2-ю групу ўтвараюць два князі, названыя жамойцкімі (Эрдзівіл і Выкінт); гэта сведчыць пра ўваход Жамойці ў склад Літвы і яе палітычную залежнасць ад Жывінбуда і яго суродзічаў. 3-ю групу ўтвараюць шэсць князёў, названых Рушкавічамі: Кінцібут, Вакібут, Бутавіт, Віжэйк з сынам Вішліем, Кіценій, а таксама Плікосава – напэўна, удава памерлага Плікосы. Яны належалі да іншага роду, які таксама падпарадкоўваўся роду Жывінбуда. Шматлікасць гэтых князёў паказвае, што іх уладанні былі моцна раздробненымі, напэўна, у выніку падзелу вотчын па бацькоўскай лініі, як гэта адбывалася і ў рускіх князёў. Разам з тым наяўнасць у спісе жанчыны сведчыць пра пэўныя асаблівасці спадчыннага права літоўцаў: удава да паўторнага шлюбу кіравала мужавай вотчынай і лічылася роўнай з мужчынамі. 4-я група князёў, якія таксама знаходзіліся ў сваяцкіх адносінах, выступае пад імем Булевічы. З іх названы Вішымут, пасля імя якога складальнік летапісу зрабіў прыпіску пра больш познія падзеі: “его же уби Миндовг и жену его поял и братью его побил Едивила, Спрудейка”. Трэба меркаваць, што браты Вішымута таксама былі ўдзельнікамі дагавора. Іх лёс сведчыць, якім чынам адбывалася ўзвышэнне Міндоўга. Апошнюю групу ўтвараюць чатыры князі, што сумесна валодалі Дзяволтвай (пазнейшы Вількамірскі павет ВКЛ), і таксама, напэўна, былі суродзічамі: Юдзькі, Пукеік, Бікы, Лікіік. Непасрэдным вынікам дагавору стаў напад Літвы на польскія княствы, з якімі варагавалі галіцка-валынскія князі – удзельнікі дагавору: Даніла і Васілька Раманавічы і іх маці Ганна. Магчыма, Літва ініцыіравала дагавор з мэтай адкрыць шлях да рабаўнічых набегаў на Польшчу, ад якой яе аддзялялі прыналежныя Уладзіміра-Валынскаму княству Падляшша і Берасцейшчына. Падобная палітыка Літвы пазней працягваецца ў яе адносінах з Полацкім княствам (праз яго тэрыторыю ішлі набегі на Уладзіміра-Суздальскую і Наўгародскую землі), а таксама з пінскім князем (тады ахвярай набегаў станавілася Уладзіміра-Валынскае княства). [22]

**Саўлеская бітва 1236 г.** Адбылася 22 верасня паміж войскам жамойтаў і земгалаў з аднаго боку і крыжаносцамі з другога. У 2-й палове лета 1236 г.

быў арганізаваны крыжовы паход на Жамойць, у якім удзельнічалі Лівонскі ордэн і шмат рыцараў з Заходняй Еўропы. У крыжацкім войску былі таксама хрышчаныя эсты, лівы, латгалы, 200 ваяроў з саюзнага Пскова, а таксама воіны з Ноўгарада. Калі ўдзельнікі паходу са здабычай вярталіся назад, на іх напалі жамойты і земгалы. Бітва адбылася каля населенага пункта Саўле (так яго называюць у нямецкіх хроніках; часта атаясамліваюць з сучасным г. Шаўляй у Літве або з в. Вецсаўле ў Латвіі). У балоцістай мясцовасці цяжкая конніца рыцараў не змагла супрацьстаяць лёгка ўзброенаму праціўніку. Быў забіты магістр Фолькевін, 48 рыцараў, шмат іншых крыжакоў. У выніку паражэння ордэна супраць яго паўсталі куршы, земгалы і селы, ён фактычна страціў заваяваныя раней землі на левым беразе Дзвіны. У 1237 г. Лівонскі ордэн быў вымушаны далучыцца да Тэўтонскага. Жамойць часова пазбавілася крыжацкіх нападаў. [23]

**Бітва на Дурбе 1260 г.** Адбылася 13 ліпеня на рацэ Дурбе (цяпер заходняя Латвія) паміж жамойтамі і злучанымі войскамі Лівонскага і Тэўтонскага ордэнаў. Жамойцкае войска, якое налічвала каля 4 тыс. чал., абложыла стратэгічна важны замак св. Георгія на Нёмане на захад ад вусця Мітувы і ўзвяло побач з ім сваё ўмацаванне. Магістр Лівонскага ордэна Бурхард фон Горнгаўзен выехаў па вайсковую дапамогу ў Прусію. На чале сабраных сіл ён накіраваўся да Мемеля (Клайпеды) на злучэнне з лівонскай арміяй, каб разам зняць аблогу з замка і даставіць абаронцам харч. Ордэнскія сілы складаліся з некалькіх сотняў рыцарскай конніцы абодвух ордэнаў, добраахвотнікаў-крыжакоў з Германіі і рэвельскіх датчан, а таксама некалькіх тысяч пяхоты з ордэнскіх кнехтаў, падуладных куршаў, эстаў і прусаў. Жамойцкае войска адступіла ад замка св. Георгія і спустошыла Куронію, вымусіўшы крыжакоў перанесці туды ваенныя дзеянні. Перад пачаткам бітвы, паводле лівонскай “Старэйшай рыфмаванай хронікі”, куршы дэзерціравалі з поля бою (паводле звестак Пятра з Дусбурга, у пачатку бітвы ўдарылі крыжакам у спіну). Раптоўная змена суадносін сіл выклікала масавыя ўцёкі эстаў і многіх прусаў. Пакінутыя большай часткай сваёй пяхоты, рыцары былі поўнасцю акружаны жамойтамі і знішчаны. У бітве загінуў Бурхард фон Горнгаўзен, маршал Прусіі Генрых фон Ботэль, 150 ордэнскіх братоў і шмат іншых рыцараў, кнехтаў і прусаў. Толькі нямногім удалося прабіцца з акружэння і схавацца ў лясах. Па колькасці загінуўшых бітва была самай значнай у XIII ст. у Прыбалтыцы. Вялікія людскія страты прывялі да значнага паслаблення магутнасці абодвух ордэнаў і падзення іх аўтарытэту. Гэта выклікала масавыя паўстанні супраць ордэнскага панавання ў Куроніі і Прусіі, разрыў вялікага князя літоўскага Міндоўга з крыжакамі і ўтварэння антыордэнскай кааліцыі Літвы, Жамойці і княстваў Русі. [24]

**Каруская бітва 1270 г.** Адбылася 16 лютага паміж войскамі ВКЛ і Лівоніі каля в. Карусе (на захадзе Эстоніі) і на лёдзе праліва Муху ў Балтыйскім моры, калі літоўскае войска вярталася з нападу на востраў Саарэма. Яму заступіла шлях лівонскае войска, у склад якога ўваходзілі сілы Лівонскага ордэна, дорпацкага і леальскага біскупаў, мясцовае сялянскае апалчэнне (пад агульным камандаваннем магістра Лівонскага ордэна Атона фон Лютэнберга), сілы дацкага каралеўскага намесніка ў Таліне Зіферыты. Лівонскія рыцары ў цэнтры клінам урэзаліся ва ўмацаваны санямі строй літоўцаў. Дацкае войска на правым флангу і біскупскае на левым адсталі. Гэта дазволіла літоўцам разбіць асноўныя сілы праціўніка. Калі падышлі сілы біскупаў, бітва аднавілася, але іх войскі таксама былі разбіты. Літоўцы зберaглі здабычу, але страцілі каля 1600 чалавек. У бітве загінулі магістр Лівонскага ордэна, 52 рыцары, 600 радавых воінаў-немцаў, вялікая колькасць апалчэнцаў. Каруская бітва лічыцца трэцяй па значнасці перамогай войска ВКЛ, атрыманай у XIII ст. над нямецкімі рыцарамі (пасля *Саўлескай бітвы* 1236 г. і *бітвы на Дурбе* 1260 г. [25]

**Ашэрадэнская бітва 1279 г.,** бітва войск ВКЛ на чале з вялікім князем ***Трайдзенем*** з аднаго боку і рыцараў Лівонскага ордэна і іх саюзнікаў з другога. Адбылася 05.03.1279 г. на левым беразе Дзвіны насупраць Ашэрадэна (цяпер Айзкраўкле, Латвія). У сярэдзіне лютага магістр Лівонскага ордэна Эрнст фон Расбург разам з дацкім намеснікам у Рэвелі (Таліне) Эйлардам фон Обергам уварваўся з войскам у Літву, у Кернаўскую зямлю. “Зямля караля Трайдзеня” была спустошана, і лівонскае войска з вялікай здабычай пайшло назад. Трайдзень хутка склікаў войска і адправіўся ў пагоню. Эрнст фон Расбург ужо распусціў частку апалчэння (мабыць, куршаў), калі даведаўся пра пагоню. Ён умацаваўся ў сваім лагеры і не адважваўся ўступіць у бой. Гэта дапамагло літоўцам згуртаваць свае сілы. Калі сабралася дастаткова ваяроў, літоўцы пачалі бітву. Сутыкнуўшыся з шалёным супраціўленнем, частка літоўцаў адступіла і ўцягнула за сабой у пагоню датчан. Між тым асноўныя літоўскія сілы пачалі граміць войска Эрнста фон Расбурга. Земгалы з войска рыцараў перайшлі на літоўскі бок. Лівонскія рыцары былі цалкам разбіты. Датчане, якія вярнуліся з пагоні, убачылі, што бітва прайграна, а літоўцы адрэзалі шлях да адступлення. Толькі частка дацкіх рыцараў здолела вырвацца з акружэння. У бітве загінулі магістр Эрнст фон Расбург, Эйлард фон Оберг і 71 лівонскі рыцар. Ашэрадэнская бітва – буйнейшая перамога войск ВКЛ над крыжакамі ў XIII ст. пасля *бітвы на Дурбе* 1260 г. Яшчэ ў час бітвы земгалы ў апошні раз пачалі паўстанне супраць улады Лівонскага ордэна. Паўстанне ўзначаліў князь Намей-

сіс. Трайдзень падтрымаў яго, а Намейсіс прызнаў вярхоўную ўладу правіцеля Літвы. Толькі ў 1290 г. Ордэн здолеў канчаткова пакарыць Земгалію, пасля чаго шмат земгалаў перасялілася ў Літву. [26]

**Крутагорская бітва**, Койданаўская бітва, міфічная бітва, якая, паводле некаторых крыніц, адбылася ў XIII ст. паміж войскам ВКЛ і татарамі каля Крутагор'я (Койданава, цяпер г. Дзяржынск) на паўднёвы захад ад Менска. У саюзе з татарамі выступілі галіцкія князі Даніла і Васілька Раманавічы, якія помсцілі князю Міндоўгу за набегі і рабаванні Галіцка-Валынскага княства. Розныя гісторыкі датуюць бітву 1241, 1249, 1272 і 1276 гг. Татары і іх саюзнікі былі разбіты. Паводле padання, татарскімі войскамі камандаваў хан Койдан (Кайдан). Тут ён нібыта быў забіты і пахаваны; татары, якія былі з ім, пасяліліся на гэтай зямлі, а іх нашчадкі жывуць тут і цяпер. Пасля бітвы Крутагор'е было перайменавана ў Койданава. Аднак летапісы Археалагічнага таварыства (XVII ст.), Рачынскага (XVI ст.), Еўраінаўскі (канец XVII ст.), якія апавядаюць пра XIII ст., не ўпамінаюць Койдана. Хроніка Быхаўца (XVI ст.), "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі" (1582 г) М. Стрыйкоўскага сведчаць, што паход на Навагародак арганізаваў хан Заволжскай арды Балаклай (Булаклай) – міфічная асоба. У бітве пад Крутагор'ем ён нібыта быў разбіты войскам вялікага князя ВКЛ Скірмунта (таксама міфічная асоба). Іпацьеўскі, Супрасльскі, Нікіфараўскі і Слуцкі летапісы (XVI ст.) упамінаюць імя Койдана пры пераліку самых вядомых татарскіх военачальнікаў, але не звязваюць яго з бітвай пад Крутагор'ем. "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" называе Койдана ўнукам Батыя, але сцвярджае, што татарамі камандаваў Балаклай. Позні час напісання гістарычных крыніц (праз 3 – 4 стагоддзі пасля падзеі), упамінанне міфічных асоб, шмат супярэчнасцей – усе гэта дае падставу меркаваць, што Койданаўская бітва, відаць, міф, створаны ў XVI ст. [27]

**Магільнянская бітва 1284 г.** Паводле беларуска-літоўскіх летапісаў, адбылася каля в. Магільна (Уздзенскі р-н) на р. Нёман паміж вялікім князем літоўскім Рынгольтам і кааліцыяй рускіх князёў (Святаславам кіеўскім, Львом уладзімірскім, Дзмітрыем друцкім), якія ў саюзе з татарамі хацелі "знову Литву под ярмо першое... привести". На баку Рынгольта, акрамя літоўцаў, удзельнічала і "свая Русь". Войскі Рынгольта знянацку і "з великим окриком" напалі на праціўніка. Бітва працягвалася з ранку да вечара і скончылася на карысць Рынгольта. Кааліцыя рускіх князёў і татараў панесла страты ў 40 тыс. чалавек, у палон трапіла 1 тыс. чалавек. Страты войска Рынгольта склалі 700 чалавек забітымі і 200 параненымі. Звесткі пра Ма-

гільнянскую бітву адносяцца да паўлегендарных. Існаванне князёў, якія ўдзельнічалі ў бітве, іншымі крыніцамі не пацвярджаецца. Але, прымаючы пад увагу, што ў XIII – XIV стст. татары неаднаразова хадзілі "на Літву" і пры гэтым разам з імі ўдзельнічалі ўладзіміра-валынскія князі, можна дапусціць, што летапісны аповед абапіраецца на рэальныя падзеі. Праўдападобна выглядае прывязка бітвы да в. Магільна. Тут Нёман мае шырокую абалонь і мелкае дно, спрыяльныя для пераправы войка. У XIII ст. тут існавала паселішча, што зафіксавана археалагічна. У XV – пач. XVI стст. Насупраць гэтага паселішча каля пераправы збудаваны Магільнянскі замак. [28]

**Медніцкая бітва 1320 г.** Адбылася 27 ліпеня паміж літоўскім (жамойцкім) і тэўтонскімі войскамі ў Медніцкай воласці Жамойці. Маршал Тэўтонскага ордэна Генрых фон Плоцк з 40 рыцарамі, а таксама коннікамі з Самбіі і Клайпеды (Мемеля) ўварваўся ў Медніцкую воласць. Калі пярэднія палкі пачалі спусташаць воласць, жамойты, якія загадзя падрыхтаваліся да бітвы, нечакана напалі на асноўныя сілы Тэўтонскага ордэна. У бязлітаснай барацьбе загінуў Генрых фон Плоцк, 29 яго рыцараў і каля 200 іншых ваяроў; некаторым удалося ўратавацца ўцёкамі. У палон быў узяты фогт Самбіі Герхард Рудэ, якога літоўцы потым спалілі як ахвяру багам – у даспехах, на баявым кані. Перамога літоўцаў значна аслабіла ваенны націск Тэўтонскага ордэна на Жамойць і дазволіла Літве ў 1320-я гг. ўзяць ваенную ініцыятыву ў свае рукі. [29]

**Дагавор 1323 г.** пагадненне паміж вялікім князем літоўскім ***Гедзімінам*** з аднаго боку і магістрам Лівонскага ордэна, дацкім намеснікам Рэвельскай зямлі, біскупамі Рыгі, Эзеля, Дорпата і грамадой г. Рыга з другога боку. Заключаны 2 кастрычніка ў Вільні. Устанаўліваў мірныя адносіны паміж бакамі, абвяшчаў пра свабодны гандаль паміж імі па сухапутных і водных шляхах. Прадугледжваў устанаўленне справядлівага судовага разбору спрэчак, вяртанне свавольна адабранай маёмасці купцоў, выдачу збеглых халопаў. Гедзімін у дагаворы выступае як "кароль Літвы", пад уладай якога знаходзяцца Аўкштайція, Жамойць і рускія землі. У 1324 г. дагавор быў зацверджаны рымскім папам. Дагавор засведчыў выхад ВКЛ на міжнародную арэну і яго прызнанне іншымі дзяржавамі. (...) [31]

**Дагавор 1325 г.**, мірнае пагадненне паміж вялікім князем літоўскім ***Гедзімінам*** і каралём польскім Уладзіславам I Лакатком. Быў скіраваны супраць Нямецкага ордэна, у барацьбе з якім ВКЛ і Польшча абавязаліся аказваць адно аднаму ваенную дапамогу. На заключэнне дагавора паўплы-

вала таксама небяспека з боку Залатой арды і сумесныя інтарэсы пры падзеле ўладанняў Галіцка-Валынскага княства: напярэдадні Гедзімін далучыў да сваёй дзяржавы Падляшша. Прызнаўшы гэта, Уладзіслаў I разлічваў на ваенную дапамогу з боку ВКЛ і вяртанне ліцвінамі польскіх палонных. Дагавор быў замацаваны заключэннем шлюбу паміж дачкой Гедзіміна Альдонай і сынам Уладзіслава I Казімірам (будучы кароль Казімір III Вялікі). Вынікам дагавору стаў удзел ліцвінаў на чале з гарадзенскім старастам ***Давыдам*** у паходзе Уладзіслава I на Брандэнбург. Выконваючы ўмовы дагавору, у час крыжацкага нападу на ВКЛ у 1329 г. войскі Уладзіслава I увайшлі ў Хэлмінскую зямлю, хоць паміж Польшчай і крыжакамі быў заключаны часовы мір. Крыжакі ў адказ напалі на Куяўскую зямлю і захапілі Добжынскую зямлю. Сумесны паход войск ВКЛ і Польшчы на Хэлмінскую зямлю ўвосень 1330 г. скончыўся няўдачай. Пасля саюзныя адносіны паміж ВКЛ і Польшчай спыніліся. [31]

**Дагавор 1338 г.**, пагадненне паміж Лівонскім ордэнам і ВКЛ. Заключаны ад імя лівонскага магістра і вялікага князя літоўскага (“караля”) ***Гедзіміна.*** Паводле дагавора, на сумежжы абедзвюх краін устанаўлівалася паласа зямлі, на якой заўсёды павінен захоўвацца мір, і войска кожнага з бакоў павінна было ўстрымлівацца ад забойстваў і рабаванняў. Купцам ВКЛ і Лівоніі дазвалялася свабодна ездзіць па тэрыторыі абедзвюх дзяржаў, па ўсёй Дзвіне, а таксама па абодвух берагах на адлегласць кінутага кап’я. Дагаворам рэгуляваўся судовы парадак разгляду цывільных і крымінальных спраў. Тое, што дагавор заключаўся са згоды “епіскапа Полацка, караля і горада Полацка і караля Віцебска і горада Віцебска” сведчыла, што гэтыя княствы дзейнічалі як самастойныя феадальныя дзяржавы ў супольнасці з ВКЛ. Пра гэта сведчыў і аднолькавы з Гедзімінам каралеўскі тытул полацкага і віцебскага князёў. Дагавор 1338 г. працягваў традыцыі дагавораў Полацкага і Віцебскага княстваў з Рыгай і Лівоніяй, якія былі заключаны ў 1229, 1263, 1265, 1309 гг. [32]

**Бітва на Стрэве 1348 г.** Адбылася 2 лютага на р. Стрэва (правы прыток Нёмана) каля Коўна паміж войскамі ВКЛ і Нямецкага ордэна. Кіраўніцтва ордэна сабрала моцны кантынгент, папоўнены французскімі і англійскімі рыцарамі, каб адпомсціць “паганцам” за іх ранейшыя паходы ў Прусію. Войска ўзначаліў сам вялікі магістр Генрых фон Дуземер, аднак ён з часткай рыцараў застаўся ў Істэрбургу, а галоўныя сілы павялі далей вялікі маршал Зігфрыд фон Дагенфельд і вялікі комтур Вінрых фон Кніпродэ. Іх армія 26.01.1348 г. уварвалася ў ВКЛ на поўдзень ад Коўна і

больш за тыдзень бесперашкодна спустошвала панямонскія землі Літвы. Паводле загаду вялікага маршалка, рыцары не давалі літасці ні старым, ні малым. Толькі 2 лютага перад імі з’явілася армія Альгерда і Кейстута. Разам з літоўцамі яе складалі вялікія сілы русінаў – “Ruteni de Lademar, de Brisik, Witenberge, de Smalentze”, г. зн. палкі з Уладзіміра, Берасця, Віцебска, Смаленска, а па іншых звестках і з Полацка. Бітву пачаў Альгерд, і яна доўжылася шмат гадзін. Галоўныя сілы Альгерда спрабавалі прабіцца і захапіць штандар ордэна, аднак не здолелі, а атака цяжкаўзброеных рыцараў парушыла іх баявыя лініі і прымусіла адступаць. Пад вечар армія ВКЛ пакінула поле бою. Абодва бакі панеслі цяжкія страты. З боку ВКЛ, паводле розных крыніц, загінулі дзесяткі тысяч ратнікаў, у т. л. князь Нарымонт. Многія ў момант адступлення патанулі ў Стрэве, слабы лёд якой не вытрымаў масы коннікаў. Непрыяцель таксама страціў тысячы ваяроў, у т. л. 8 (паводле іншых звестак, 15) рыцараў, аднак вынік бітвы быў расцэнены ў Ордэне як трыумф. Пасля завяршэння паходу ў гонар перамогі на Стрэве вялікі магістр заклаў у Караляўцы касцёл св. Дзевы Марыі. [33]

**Бітва каля Сініх Вод 1362 г.** Адбылася паміж войскамі ВКЛ і аб’яднаным войскам Крымскай, Перакопскай і Ямбалукскай ордаў на р. Сінія Воды (Сінюха; левы прыток Паўднёвага Буга). Бітва была галоўнай падзеяй у наступленні ВКЛ на падпарадкаваныя татарам землі паўднёва-заходняй Русі. У 1362 г. вялікі князь літоўскі Альгерд, выкарыстаўшы паляпшэнне адносін з Польскім каралеўствам і Нямецкім ордэнам, выступіў супраць ардынскага панавання ў міжрэччы Дняпра і Дуная. Войска было сабрана на Беларусі і значна папоўнена апалчэнцамі з Валыні і Кіеўшчыны. Восенню Альгерд з войскам рушыў з Кіева на заходняе Падолле. Войска татараў пад началам князеў Кутлубуга, Качубея (Качыбея, Хачыбея) і Дзімітра (“отчычы і дзедзічы Падольскай зямлі”) дзялілася на тры палкі. Альгерд паставіў “шэсць палкоў” у лінію глыбокай абароны ў некалькі радоў, што не давала магчымасці варожай конніцы зайсці ў тыл. Татарскае войска вымушана было распачаць франтальны бой. Лёгка адбіўшы націск татараў, войскі Альгерда нанеслі ўдары ў цэнтр фронту і па флангах. Пасля нядоўгага бою супраціўленне татараў было зламана, і яны ратаваліся ўцёкамі. У час пагоні быў захоплены абоз ардынцаў. Асабліва вызначыліся ратнікі з Навагародка, якімі камандавалі Карыятавічы. Пасля бітвы рэшткі татарскай конніцы падаліся на Дунай і далей у Дабруджу, а Альгерд пайшоў у глыб іх уладанняў да вусцяў Дняпра і паўднёвага Буга. У выніку гэтай перамогі падуладныя татарам землі зменшыліся, ВКЛ пашырыла сваю тэрыторыю да вусцяў Дняпра і Днястра, замацавала ў сваім складзе Чарнігава-Северскія землі, Падолле, Валынскае

і Кіеўскае княствы. Пачалося вызваленне ўсходнеславянскіх зямель ад ардынскага панавання. [34]

**Дагавор 1366 г.** Заключаны ў канцы жніўня – верасні паміж вялікім князем літоўскім ***Альгердам***, яго братамі ***Кейстутам***, Яўнутам і Любартам з аднаго боку і польскім каралём Казімірам III Вялікім з другога пасля паходу Казіміра на землі Галіцка-Валынскага княства. Бакі размежавалі свае ўладанні. Любарту пацверджана валоданне Луцкай зямлёй, да якой Казімір далучыў некаторыя ўладзімірскія воласці (Ветлы, Любязь, Мельніца і інш.). Казімір заставаўся валадаром г. Уладзіміра з ваколічнымі валасцямі (Гарадло, Любомль, Турыйск, Ратна і інш.). Альгерд і Любарт саступілі Казіміру воласці Крэменец, Пярэмыль, Алеска, Белз, Грабавец, Холм, Шчабрэшын, Лапацін. Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на гарады Кейстута Берасце, Камянец, Дарагічын, Мельнік, Бельскі, горад Альгерда Кобрын. Бакі ўзялі на сябе абавязак ваеннай узаемадапамогі. У Гарадле меў збірацца сумесны суд для вырашэння пагранічных спрэчак. Хоць дагавор быў заключаны як “вечны мір”, бакі прадугледжвалі наступны з’езд для ўдакладнення яго ўмоў. Пасля быў заключаны асобны дагавор паміж Казімірам і Любартам (яго заключэнне М. Грушэўскі адносіць да кастрычніка 1366 г., М. Доўнар-Запольскі – да 1368 – 1369 г.). Былі ўдакладнены граніцы ўладанняў Любарта як луцкага князя, распрацаваны ўмовы ўзаемнага гандлю, удакладнены ваенныя абавязацельствы: Любарт не павінен быў дапамагаць Казіміру ці літоўскім князям у выпадку канфлікту паміж імі. Дагавор быў парушаны ў 1368 г., калі Кейстут напаў на г. Пултуск. [35]

**Вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1368 – 1372 гг.** Выклікана суперніцтвам паміж дзвюма буйнейшымі дзяржавамі Усходняй Еўропы за палітычную гегемонію ў рэгіёне, у першую чаргу за ўплыў на Вялікае княства Цвярское. У жніўні 1368 г. вялікі князь маскоўскі Дзмітрый Іванавіч (Данской) не прызнаў пераход вялікакняжацкай улады да князя Міхаіла Аляксандравіча (брата Ульяны, жонкі Альгерда), прыхільніка ўмацавання дзяржаўнай самастойнасці Цверы і збліжэння яго з ВКЛ. Гэта вымусіла князя ўцячы ў ВКЛ. Увосень 1368 г. войска ВКЛ на чале з Альгердам пры падтрымцы Смаленска разбіла маскоўскія войскі ў *Тросненскай бітве* 1368 г. і падступіла да Масквы, аблога якой была беспаспяховай. У выніку першага паходу Альгерда ўлада Міхаіла Аляксандравіча над Цвярскім княствам была адноўлена, у склад ВКЛ вярнуўся Ржэў. Не змірыўшыся з вынікамі кампаніі 1368 г., Масква ў жніўні 1370 г. напала на Цвер, імкнучыся далучыць заходнюю частку княства, якая межавала з

ВКЛ, каб прадухіліць магчымасць кантактаў паміж дзвюма дзяржавамі. Міхаіл Аляксандравіч зноў уцёк у ВКЛ, але Альгерд, заняты канфліктамі з Ордэнам і Польшчай, не здолеў аказаць яму падтрымку. Тады Міхаіл накіраваўся ў Арду і дамогся перадачы яму ярлыка на вялікае княжанне Уладзімірскае, якім традыцыйна валодалі маскоўскія князі. Жадаючы захаваць Цвер як процівагу Маскве, Альгерд вырашыў дапамагчы Міхаілу, і ў ліпені 1370 г. пачаў другі паход на Маскву, аблога якой (8 – 16 снежня) зноў была няўдалай. У выніку заключана перамір'е да 29.06.1371 г. У час перамір'я бакі спрабавалі атрымаць ваенную і дыпламатычную падтрымку Арды і канстанцінопальскай патрыярхіі. Маскве ўдалося не дапусціць стварэння асобнай праваслаўнай мітраполіі ВКЛ, чаго дамагаўся Альгерд. У чэрвені 1371 г. Альгерд накіраваў у Маскву пасольства з прапановай заключыць трывалы мір. Пасольства дамовілася пра заручыны дачкі Альгерда Алены з серпухаўска-бароўскім князем Уладзімірам Андрэевічам, бліжэйшым саюзнікам Дзмітрыя, і працяг перамір'я да 26.10.1371 г. Аднак вясной 1372 г. Масква пачала падрыхтоўку да паходу на Цвер. Каб прадухіліць яго, 07.04.1372 г. адначасова з выступленнем Міхаіла Аляксандравіча на Дзмітраў войскі ВКЛ на чале з Кейстутам і Андрэем Альгердавічам напалі на Пераяслаў-Залескі. Кампанія 1372 г. працягвалася паходамі літоўска-цвярскога войска на спрэчныя паміж Цвер'ю і Масквой гарады Кашын і Таржок. 12.07.1372 г. цвярское і літоўскае войскі на чале з Альгердам злучыліся каля г. Любуцк для трэцяга паходу на Маскву. Туды ж падышлі асноўныя сілы маскоўскага войска. Не маючы дастатковых сіл, каб схіліць ваенны поспех на свой бок, у сярэдзіне ліпеня ВКЛ, Цвер і Масква падпісалі *Любуцкі мір* 1372 г. У выніку паходаў Альгерда было праведзена размежаванне сфер уплыву паміж ВКЛ і Масквой. Ваенныя дзеянні паміж імі не вяліся да *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім* 1406 – 1408 гг. [36]

**Тросненская бітва 1368 г.** Адбылася ў час *вайны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай* 1368 – 1372 гг. на р. Тросна 21 лістапада паміж войскам ВКЛ на чале з вялікім князем Альгердам і вартавым атрадам Вялікага княства Маскоўскага. Кампанія 1368 г. (паводле маскоўскіх летапісаў, "первая литовщина") распачата Альгердам у падтрымку саюзнага ВКЛ Вялікага княства Цвярскога. Раптоўнае з'яўленне войска ВКЛ "в силе тяжце" з паўднёвага захаду (яно чакалася з боку г. Ржэва), забяспечанае поўнай сакрэтнасцю руху, заспела маскоўскага вялікага князя Дзмітрыя Іванавіча і яго саюзнікаў знянацку. Першую перамогу войска ВКЛ атрымала над князем С. Дз. Старадубскім-Крапівой на р. Хоўхла (левы прыток Протвы), потым – над князем К. Ю. Абаленскім і наблізілася да Масквы, дзе на р. Тросна (левы

прыток Нары) яго сустрэла застава на чале з ваяводамі Дз. Мініным і А. Шубам. Цяжкаўзброеная конніца ВКЛ ушчэнт разграміла легкую, дрэнна ўзброеную і тактычна недасведчаную маскоўскую, абодва ваяводы і амаль усе ратнікі былі забітыя ці патанулі ў Тросне. Перамога ў Тросненскай бітве адкрыла Альгерду шлях на Маскву, трохдзённая аблога якой была, аднак, беспасяховай (за год да гэтага быў пабудаваны мураваны Маскоўскі Крэмль). [37]

**Любуцкі мір 1372 г.** Заключаны ў сярэдзіне ліпеня 1372 г. каля г. Любуцк на р. Ака (побач з сучасным г. Алексін Тульскай вобл. Расіі) паміж вялікімі князямі літоўскімі Альгердам і Кейстутам з аднаго боку і вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам (Данскім) і серпухаўска-бароўскім князем Уладзімірам Андрэевічам Храбрым (мужам дачкі Альгерда Алены) – з другога. З боку ВКЛ удзельнічаў таксама вялікі князь цвярскі Міхаіл Аляксандравіч. Дагавор завяршыў *вайну Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай* 1368 – 1372 гг. Заключаны пасля няўдалай для літоўска-цвярскога войска сутычкі перадавых атрадаў каля Любуцка і некалькіх дзён стаяння на процілеглых баках глыбокага яра. Як паведамляе Супрасльскі летапіс, гэта быў па сваім характары “вечны” мір, які пацвердзіў пратэктарат ВКЛ над Цвер’ю і даваенныя межы дзяржаў. [38]

**Рудаўская бітва 1370 г.** Адбылася 17 лютага каля замка Рудаў (ням. Rudau) у Самбіі (Прусія) паміж войскамі ВКЛ і Тэўтонскага ордэна. Паход у Прусію быў прадпрыняты вялікімі князямі Кейстутам і Альгердам у адказ на наступальную ваенную дзейнасць Ордэна ў 1360-я гг., якая завяршылася ўзяццем і разбурэннем трох замкаў. (...) Высланы тэўтонцамі ў разведку атрад пад камандаваннем галоўнага маршала Хёнікга Шындэкопфа 02.02.1370 г. сустрэў і разбіў авангард войска ВКЛ, выведаўшы ад палонных планы галоўных сіл. Войска ВКЛ, якое складалася з літоўцаў і русінаў, авалодала замкам Рудаў, але 17 лютага было перахоплена сіламі ордэна пад камандаваннем вялікага магістра Вінрыха Кніпродэ, якія складаліся з ордэнскіх братоў, іншаземных рыцараў і прусаў. Тэўтонцы рассеклі войска ВКЛ напалам, вымусілі атрады Кейстута адысці з поля бою, а Альгерда адступіць у лес, дзе і нанеслі яму канчатковае паражэнне. Страты войска ВКЛ на полі бою склалі каля 5500 чалавек, пераважна русінаў. Шмат воінаў загінула ад марозу пры адступленні. У тэўтонцаў загінула каля 300 чалавек, у т. л. Шындэкопф, брандэнбургскія комтур і замкавы комтур, рэдэнскі комтур, 20 іншых братоў і 3 іншаземныя рыцары. Нягледзячы на паражэнне, Рудаўская бітва дазволіла кіраўніцтву ВКЛ нанесці ўдар па ваеннай магутнасці Ордэна і не дапусціць пагаршэння стратэгічнага балансу сіл. [38]

## 1.3. ХРАНАЛОГІЯ

**1219 г.** – дагавор літоўскіх князёў з Галіцка-Валынскім княствам. Першая летапісная згадка пра князя Міндоўга.

**1236 г.** – Саўлеская бітва. Разгром войска Лівонскага ордэна войскамі жамойтаў і земгалаў.

**1237 г.** – аб’яднанне Лівонскага і Тэўтонскага ордэнаў.

**1240-я гг.** – пачатак княжання Міндоўга ў Наваградку і падпарадкаванне ім Літвы.

**1251 г.** – хрышчэнне Міндоўга паводле каталіцкага абраду.

**1253 г.** – каранацыя Міндоўга ў Наваградку.

**1251 – 1254 гг.** – вайна з Галіцка-Валынскім княствам.

**1254 г.** – заключэнне міру паміж Міндоўгам, яго сынам Войшалкам з аднаго боку і галіцка-валынскім князем Данілам з другога. Перадача Наваградка Раману, сыну Данілы.

**1254 – 1258 гг.** – знаходжанне Войшалка, сына Міндоўга ў манастыры.

**1258 г.** – захоп Наваградка Войшалкам і пачатак яго княжання там. Вяртанне Міндоўга ў Літву.

**1258 – 1263 гг.** – княжанне Войшалка ў Наваградку.

**1260 г.** – бітва на Дурбе. Перамога жамойцкага войска над злучанымі войскамі Лівонскага і Тэўтонскага ордэнаў.

**1261 г.** – разрыў міру з Лівонскім ордэнам, адмова Міндоўга ад каталіцтва.

**1263 г.** – забойства Міндоўга ў выніку змовы літоўскай феадальнай знаці. Пачатак княжання Траняты.

**1264 г.** – забойства Траняты. Вяртанне Войшалка ў Наваградак.

**1264 – 1266 гг.** – падпарадкаванне Войшалкам Літвы; балцкіх тэрыторый Нальшаны і Дзяволтва, стварэнне тэрытарыяльнага ядра новай дзяржавы.

**1267 г.** – перадача Наваградка Шварну Данілавічу.

**1268 г.** – забойства Войшалка Львом Данілавічам, князем Галіцкім.

**1267 – 1270 гг.** – княжанне Шварна Данілавіча. Пераадоленне сепаратызму літоўскіх племянных сіл, працяг працэсу аб’яднання і ўмацавання дзяржавы.

**1270 г.** – Каруская бітва. Перамога войска ВКЛ над войскамі Лівоніі.

**1270 – 1281 гг.** – княжанне Трайдзеня.

**1274 г**. – захоп Драгічына Надбужскага, які належыў Галіцка-Валынскаму княству. У адказ – паход Льва Данілавіча на Наваградак.

**1273 – 1279 гг.** – барацьба з Польшчай.

**1277 г**. – захоп і рабаўніцтва Наваградка татарамі – саюзнікамі Льва Данілавіча. Перамога Трайдзеня пад Гародняй ў бітве з войскам татарскім і галіцка-валынскім войскам.

**1279 г.** – Ашэрадэнская бітва, перамога войск Трайдзеня над войскамі Лівонскага ордэна.

**1279 г. –** заключэнне мірнага дагавору з Польшчай і шлюбу паміж дачкой Трайдзеня Гайдэмундай (Соф'яй) і мазавецкім князем Баляславам.

**1281 г.** – захоп г. Герцыке і абмен яго на г. Дынабург.

**1281 – 1295 гг.** – маладаследаваны перыяд у гісторыі ВКЛ. У якасці правіцеляў гэтага часу называюца Даўмонт, Бурдзікід, Будзівід, Путувер.

**1295 – 1316 гг.** – княжанне Віценя.

**1294 г**. – падаўленне паўстання літоўскіх феадалаў, якія схіляліся да саюзу з крыжакамі.

**1296-1299 гг.** – паходы на Лівонію.

**1298 г.** – заключэнне мірнай дамовы з Рыгай.

**1307 г.** – далучэнне да ВКЛ Полацкага княства паводле дагавору.

**1314 г.** – напад крыжакоў на Наваградак. Першая згадка пра Давыда Гарадзенскага.

**1315 г.** – далучэнне да ВКЛ Берасцейскай зямлі. Увядзенне дзяржаўнага герба "Пагоня".

**1316 г.** – смерць Віценя пры нявысветленых абставінах.

**1316 – 1341 гг.** – княжанне Гедзіміна.

**Каля 1318 г.** – заключэнне дамовы з віцебскім князем Яраславам аб шлюбе яго дачкі Марыі з Альгердам, сынам Гедзіміна.

**1320 г., 27 ліпеня** – Медніцкая бітва, перамога жамойцкіх войск над тэўтонскімі рыцарамі.

**1322 – 1324 гг.** – захады да хрышчэння ў каталіцтва язычніцкага насельніцтва; хрышчэнне не здзейснілася з-за адмоўнага стаўлення язычнікаў і праваслаўных.

**Каля 1322 г.** – далучэнне да ВКЛ Берасцейшчыны і Падляшша.

**Каля 1323 г.** – перанос сталіцы ВКЛ у Вільню.

**1323 г., 2 кастрычніка** – заключэнне Гедзімінам міру з рыжскім арцыбіскупам і магістратам Рыгі.

**1324 г.** – заключэнне міру з Тэўтонскім ордэнам.

**1325 г.** – заключэнне мірнага дагавору з польскім каралём Уладзіславам I Лакатком і шлюб яго сына Казіміра з дачкой Гедзіміна Альдонай (Ганнай).

**1320-я гг.** – пачатак будаўніцтва мураваных замкаў на заходніх межах дзяржавы.

**1326 г.** – заключэнне мірнай дамовы з Ноўгарадам і Лівоніяй.

**1326, 1327 гг.** – паходы войск ВКЛ на чале з Давыдам Гарадзенскім і Альгердам на Брандэнбург.

**Перш. пал. 1330-х гг.** – заключэнне мірных дамоваў з Цвярскім і Маскоўскім княствамі, падмацаваных шлюбамі дачок Гедзіміна: Марыі з Дзмітрыем Міхайлавічам (цвярскі князь) і Аўгусты Анастасіі – з Сямёнам (маскоўскі князь).

**1338 г.** – дагавор паміж Лівонскім ордэнам і ВКЛ.

**1330-я – пач. 1340-х гг.** – абвастрэнне адносін з Лівонскім і Тэўтонскім ордэнамі, аднаўленне ваенных дзеянняў.

**Пач. 1340-х гг.** – пераход слуцкага, менскага, друцкага, лукомльскага князёў у васальную залежнасць ад Гедзіміна.

**1341 г.** – дапамога Пскову у барацьбе з Лівоніяй. Уключэнне Пскова і Ноўгарада ў сферу ўплыву ВКЛ.

**1341 – 1345 гг.** – княжанне Яўнуція.

**1345 г.** – звяржэнне Яўнуція Альгердам і Кейстутам.

**1345 – 1377 гг.** – супольнае княжанне Альгерда з Кейстутам.

**1348 г., 2 лютага** – разгром войска ВКЛ крыжакамі на р. Стрэва.

**1349 – 1351, 1366 гг.** – барацьба з Польшчай за Валынь і Падляшша.

**1350 г.** – заключэнне пагаднення з Маскоўскім княствам і шлюб Альгерда з Уллянай цвярской, сястрой жонкі маскоўскага князя Сімяона Гордага.

**1340-я – 1370-я гг.** – імклівы тэрытарыяльны рост ВКЛ (далучэнне Беларускага Падняпроўя, Бранскага княства, Кіеўскай, Чарнігава-Северскай, Падольскай і Валынскай земляў, падначаленне Смаленскага княства.

**1362 (1363) г.** – перамога войска ВКЛ над татарамі на р. Сінія Воды.

**1366 г.** – заключэнне дагавору паміж літоўскімі князямі і польскім каралём Казімірам III. Берасцейшчына прызнана тэрыторыяй ВКЛ.

**1368 – 1372 гг.** – вайна ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай.

**1368 г., 21 лістапада** – Тросненская бітва. Перамога войск Альгерда над войскам Маскоўскага княства.

**1370 г.** – Рудаўская бітва, разгром крыжацкага войска войскамі Альгерда і Кейстута.

**1372 г., ліпень** – заключэнне Любуцкага дагавору паміж Альгердам і Кейстутам з аднаго боку і маскоўскім князем Дзмітрыем Іванавічам з другога. Мір пацвердзіў пратэктарат ВКЛ над Цвярскім княствам і замацаваў даваенныя межы ВКЛ.

**1377 г.** – смерць Альгерда.

## 1.4. КРЫНІЦЫ


1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Беларусь у Вялікім княстве Літоўскім: стэнагр. пасяджэнняў Міжнар. круглага стала, якія адбыліся ў Мінску 6 – 7 крас. 1992 г. / АН Беларусі. Аддз. навук. інфарм. па гуманіт. навукам. Нац. навук.-асвет.цэнтр імя Фр. Скарыны, Міжнар. асац. беларусістаў; рэд. І. Бродка [і інш.]. – Мінск, 1992. – 123 с.

3. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: канд. ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

4. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / склад. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

6. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

7. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

8. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р истор. наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

9. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

10. Полоцкие грамоты XIII – нач. XVI вв. / составитель А. Л. Хорошкевич. – Институт истории СССР АН СССР. – Вып. 1 – 5. – 1977 – 1985.

11. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / уклад., уступ. арт. і камент. А. Ф. Коршунава, рэд. Ю. С. Пшыркоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 246 с.

12. Сведкі беларускай мінуўшчыны: зб. дак. і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI – XV стст. / пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск, 1996. – 167 с.

## 1.5. ДАСЛЕДАВАННІ


1. Балты и Великое княжество Литовское: историко-лингвистический взгляд: памяти Эгидиюса Банёниса: сборник / Посольство Литовской Респ. в Российской Федерации, Дом Юргиса Балтрушайтиса, Российская акад. наук, Ин-т всеобщей истории; редкол.: Е. Л. Назарова (отв. ред.) [и др.]. – М. : Новое издательство, 2007. – 19 п. л.

2. Баніеніс, Э. З гісторыі Літоўскай метрыкі / Э. Баніеніс // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1. – С. 8 – 23.

3. Баранаускас, Т. Новогрудок в XIII в.: история и миф / Т. Баранаускас // Castrum, urbis et bellum: зб. навук. прац / навук. рэд.: Г. Семянчук, А. Мяцельскі. – Баранавічы : РУПП “Баранав. узбуйн. друк”, 2002.

4. Белы, А. Полацк у нямецкіх “лятучых лістах” XVI ст. / А. Белы // Спадчына. – 1997. – № 6. – С. 213 – 219.

5. Бережков, Н. Литовская Метрика как исторический источник. В 2 ч. Ч. 1: О первоначальном составе книг Литовской Метрики по 1522 год / Н. Бережков. – М. – Л. : Изд-во АН СССР, 1946. – 179 с.

6. Бычкова, М. Е. Родословные книги XVI – XVII вв. как исторический источник / М. Е. Бычкова. – М. : Наука, 1975. – 216 с.

7. Галенчанка, Г Я. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: гісторыя і стан захавання / Г. Я. Галенчанка // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання: матэрыялы да Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты, Мінск, 23 – 24 красавіка 1998 г. / Бел. дзярж. ун-т., гіст.фак.; рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 1998. – С. 125 – 126.

8. Гуревич, Ф. Д. Древний Новогрудок: Посад – окольный город / Ф. Д. Гуревич. – Л. : Наука: Ленингр. отд-ние, 1981. – 159 с.

9. Гуревич, Ф. Д. Древние города Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич. – Минск : Полымя, 1982. – 47 с.

10. Гуревич, Ф. Д. Об этническом составе населения древнего Новогрудка / Ф. Д. Гуревич // Acta Baltico-Slavica. Białystok, 1969. – R. 6. – S. 219 – 222.

11. Даўгяла, З. Літоўская метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння мінуўшчыны Беларусі / З. Даўгяла // Спадчына. – 1997. – № 4. – С. 85 – 95.

12. Ермаловіч, М. І. Па слядах аднаго міфа / М. І. Ермаловіч – 4-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 96 с.

13. Жлутка, А. Каранацыя Міндоўга і заснаванне першага біскупства ў дакументах XIII ст. / А. Жлутка // Наша Вера. – 2003. – № 2 (24). – С. 36 – 44.

14. Жлутка, А. Кароль Міндоўг і яго дзяржава ў дакументах папскай курыі XIII ст. / А. Жлутка // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 4. – Мінск, 2003. – С. 194 – 241.

15. Забела, Г. Городище Шяйминишкеляй – предполагаемое место замка Ворута // Castrum, urbis et bellum: зб. навук. прац / навук. рэд.: Г. Семянчук, А. Мяцельскі. – Баранавічы : РУПП "Баранав. узбуйн. друк", 2002. – С. 131 – 145.

16. Капыскі, З. Ю. Беларуска-літоўскія летапісы XV – XVI стст. як помнікі гістарычнай думкі / З. Ю. Капыскі // Весці АН БССР. – Сер. грамад. навук. – 1986. – № 4. – С. 80 – 88.

17. Козловская, Н. Документы по истории шляхты Великого княжества Литовского в серийных археографических изданиях России XIX – нач. XX века / Н. Козловская // Архівы і справаводства. – 2000. – № 6. – С. 102 – 109.

18. Копысский, З. Ю. Источниковедение аграрной истории Белоруссии / З. Ю. Копысский – Минск : Наука и техника, 1978. – 136 с.

19. Краўцэвіч, А. К. Міндаўг. Пачатак гаспадарства: нарыс: на бел. і англ. мовах / А. К. Краўцэвіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 163 с. (Жыццяпіс вялікіх князёў літоўскіх)

20. Краўцэвіч, А. К. Фарміраванне канцэпцыі генезісу Вялікага княства Літоўскага ў польскай гісторыяграфіі / А. К. Краўцэвіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 1. – С. 47 – 54.

21. Краўцэвіч, А. К. Да праблемы генезісу Вялікага княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. – Сш. 2 (9). – Снежань, 1998. – С. 448 – 454.

22. Лазутка, С. А. Літоўскія статуты (1529, 1566, 1588), іх стваральнікі і эпоха / С. А. Лазутка // Край. Polonica-Albaruthenica-Lithuanica. – 2001. – № 1, 2.

23. Липатов, А. В. Великое княжество Литовское: исторический феномен симбиоза этнических культур. (К вопросу о национальных путях возвращения в наднациональную Европу) // А. В. Липатов / Этнокультурные и этноязыковые контакты на территории Великого княжества Литовского. Материалы международной научной конференции. – М. : Новое изд-во : Дом Юргиса Балтрушайтиса, 2006. – С. 6 – 19.

24. Місарэвіч, Н. В. Прывілей як крыніца беларускага феадальнага права / Н. В. Місарэвіч // Веснік ГрДУ. Сер. 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія і сацыялогія. – 2002. – № 1 (8). – С. 109 – 114.

25. Мянжынскі, В. С. "Metriciana": Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага / В. С. Мянжынскі // Кантакты і Дыялогі. Беларуска-літоўскае культурнае ўзаемадзеянне. – Інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь. – 2001. – № 9 – 10 (68 – 69). – С. 49 – 50.

26. Насевіч, В. Л. Працэс утварэння Вялікага Княства Літоўскага (XIII – XIV стст.) / В. Л. Насевіч // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск, 1992. – С. 54 – 63.

27. Падокшын, С. Канцэпцыя гісторыі ВКЛ у даследаваннях Мацея Любаўскага (XIII – перш. пал. XVI стст.) / С. Падокшын // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1996. – № 4. – С. 3 – 10.

28. Петрыкаў, П. Гістарыяграфія Вялікага княства Літоўскага / П. Петрыкаў // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1993. – № 3. – С. 51 – 64.

29. Пасталіца, В. Бітва на Сініх Водах / В. Пасталіца // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3. – С. 70 – 75.

30. Рыбакоў, А. Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага у XVI ст. / А. Рыбакоў // Архівы і справаводства. – 1999. – № 2. – С. 70 – 76.

31. Саверчанка, І. Вялікае княства Літоускае: утварэнне дзяржавы / І. Саверчанка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 2. – С. 11 – 17.

32. Сагановіч, Г. Беларусь у інфлянцкіх хроніках XIII – XVI стст. / Г. Сагановіч // Спадчына. – 1996. – № 5. – С. 52 – 57.

33. Сагановіч, Г. Беларусь і Нямецкі ордэн (да Крэўскай уніі) // З глыбі вякоў. Наш край: гіст.-культуралагіч. зборнік. – Вып. 2. – Мінск, 1997.

34. Сасноўскі, Д. Пра ідэнтыфікацыю тэрміна “Літва” ў канцы XII – XIII стст. / Д. Сасноўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 12 – 13.

35. Спиридонов, М. Архивы шляхты Беларуси в XVI веке / М. Спиридонов // Архівы і справаводства. – 2000. – № 4. – С. 101 – 104.

36. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэб. дапаможн. / С. М. Ходзін. – Мінск : БДУ, 1999. – 193 с.

37. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых заводаў / В. А. Чамярыцкі. – АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 191 с.

38. Юхо, Я. А. Міжнародныя дагаворы сярэдневяковай Беларусі / Я. Юхо // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 11. – С. 3 – 10.

39. Юхо, Я. А. Канцэпцыі фарміравання Вялікага княства Літоўскага / Я. А. Юхо // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 9. – С. 10 – 12.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Пазднякоў, Валерый. Палемон / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006[6]. – Т. 2. – С. 390 – 391.

2. Пазднякоў, Валерый. Рынгольд / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 525.

[6] Далей у спісах выкарыстаных даведачных матэрыялаў пазначаецца толькі: Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2.

3. Насевіч, Вячаслаў. Міндоўг / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя, – Т. 2. – С. 312 – 313.

4. Пазднякоў, Валерый. Даніла Раманавіч / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005[7]. – Т. 1. – С. 576.

5. Насевіч, Вячаслаў. Войшалк / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 463.

6. Пазднякоў, Валерый. Раман Данілавіч / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 507.

7. Насевіч, Вячаслаў. Транята / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 666.

8. Насевіч, Вячаслаў. Таўцівіл / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 665.

9. Шварн // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 755.

10. Насевіч, Вячаслаў. Трайдзень / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 666.

11. Пазднякоў, Валерый. Даўмонт / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 582 – 583.

12. Пазднякоў, Валерый. Бурдзікід / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 356.

13. Пазднякоў, Валерый. Будзівід / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 351.

14. Насевіч, Вячаслаў. Путувер / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 476 – 477.

15. Грыцкевіч, Анатоль. Віцень / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя – Т. 1. – С. 457 – 458.

16. Ткачоў, Міхась. Давыд / М. Ткачоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 566.

17. Насевіч, Вячаслаў. Гедзімін / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 519 – 520.

18. Пазднякоў, Валерый. Ліздзейка / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 199.

19. Грыцкевіч, Анатоль. Яўнут / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 786.

20. Грыцкевіч, Анатоль. Альгерд / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 222 – 223.

---

[7] Далей у спісах выкарыстаных даведачных матэрыялаў пазначаецца толькі: Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1.

21. Грыцкевіч, Анатоль. Кейстут / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 86 – 87.
22. Насевіч, Вячаслаў. Дагавор 1219 / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 568.
23. Саўлеская бітва 1236 // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 554.
24. Новікаў, Ягор. Бітва на Дурбе 1260 / Я. Новікаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 335.
25. Пазднякоў, Валерый. Каруская бітва 1270 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 61.
26. Баранаўскас, Томас. Ашэрадэнская бітва 1279 / Т. Баранаўскас // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 269 – 270.
27. Валахановіч, Анатоль. Крутагорская бітва / А. Валахановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 148 – 149.
28. Калядзінскі, Лявон. Магільнянская бітва 1284 / Л. Калядзінскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 254.
29. Баранаўскас, Томас. Медніцкая бітва 1320 / Т. Баранаўскас // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 283.
30. Пазднякоў, Валерый. Дагавор 1323 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 568.
31. Пазднякоў, Валерый. Дагавор 1325 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 568.
32. Юхо, Язэп. Дагавор 1338 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 568 – 569.
33. Сагановіч, Генадзь. Бітва на Стрэве 1348 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 335.
34. Сагановіч, Генадзь. Бітва каля Сініх Вод 1362 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 333.
35. Пазднякоў, Валерый. Дагавор 1366 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 569.
36. Белы, Алесь. Вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1368 – 1372 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 367.
37. Тросненская бітва 1368 // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 668.
38. Белы, Алесь. Любуцкі мір 1372 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 229.
39. Новікаў, Ягор. Рудаўская бітва 1370 / Я. Новікаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 515.

# ТЭМА 2. ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Змест праграмы.** Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства.

Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Вялікі князь. Гаспадарская рада. Узнікненне вялікага “вальнага” сойма і сфера яго кампетэнцыі.

Вышэйшыя службовыя асобы: маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбій земскі, гетманы. Дворныя ўраднікі.

Сістэма мясцовага кіраўніцтва дзяржавай: удзельныя князі, ваяводы, кашталяны, старосты і дзяржаўцы.

Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV – XV стст.

## 2.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 2.1.1. Сталіцы ВКЛ

Першай сталіцай ВКЛ вучоныя лічаць **Навагрудак**. Паводле археалагічных даследаванняў, паселішча на тэрыторыі горада ўзнікла ў канцы X ст., а ўпершыню ён узгадваецца пад 1044 г. у сувязі з паходам князя Яраслава Мудрага на Літву. У XII – XIV стст. Новагародак з’яўляўся цэнтрам удзельнага княства. З сярэдзіны 1240-х гг. тут па запрашэнні мясцовага баярства пачаў княжыць Міндоўг. Гэтая падзея паклала пачатак утварэнню Вялікага княства Літоўскага. У 1253 г. Міндоўг каранаваўся ў Навагрудку як кароль літоўскі, і менавіта таму шэраг гісторыкаў лічыць гэты горад сталіцай ВКЛ.

У часы вялікага князя Тройдзеня сталіцай ВКЛ стаў г. **Кернаў** (зараз мястэчка Кярнаве на тэрыторыі сучаснай Літвы), які ў XIII – XIV стст. уяўляў сістэму ўмацаваных замкаў і з’яўляўся княжацкай рэзідэнцыяй. Верагодна, тут размяшчалася таксама рэзідэнцыя вялікага князя Вітаўта і першапачаткова – вялікага князя Гедзіміна. Паводле беларуска-літоўскіх летапісаў, у другім дзесяцігоддзі XIV ст. Гедзімін перанёс сваю сталіцу ў пабудаваныя ім **Трокі** (зараз горад Тракай у Літве), дзе быў узведзены мураваны замак. Напачатку 1320-х гадоў, паводле летапіснай легенды[8], Гедзімін заснаваў г. **Вільню** і перанёс сталіцу туды. Археалагічныя дадзеныя гавораць аб існаванні ўмацаванага паселішча ў цэнтры Вільні ўжо ў I тысячагоддзі да н. э. У час заключэння мірнага дагавору 1323 г. паміж ВКЛ з аднаго боку, Лівонскім ордэнам і Рыгай з другога Вільня ўжо мела статус сталіцы.

### 2.1.2. Дзяржаўная сімволіка ВКЛ

У якасці дзяржаўных сімвалаў Вялікага княства Літоўскага выступаюць гербавыя выявы “Калюмны” і “Пагоня”.

[8] Гл. частку 2, с. 26.

**“Пагоняй”** прынята называць дынастычны герб Гедзімінавічаў, які адначасова з’яўляўся і дзяржаўным гербам ВКЛ: у чырвоным полі на сярэбраным кані з блакітнай збруяй сярэбраны рыцар з узнятым мячом і шчытом, на якім у блакітным полі змешчаны залаты шасціканцовы крыж. Герб з’явіўся ў выніку працэсу геральдызацыі (з канца XIV па канец XV стст.) выявы вершніка з партрэтных пячатак вялікіх князёў літоўскіх Ягайлы (Уладзіслава II) і Вітаўта.

Спачатку выява на гербе магла мець пэўныя адрозныя элементы: цмока пад капытамі каня, адсутнасць шчыта ў вершніка, дзіду замест мяча або асабістыя гербы Ягайлы ці Вітаўта на шчыце вершніка – “Бойчу” ці “Калюмны”. Менавіта апошні варыянт з “Калюмнамі” зафіксаваны ў заходнееўрапейскіх гербоўніках 1-й пал. XV ст. “Armorial Lyncenich” і “Codex Bergshammar”, дзе герб быў падпісаны “Hertoghe van lettouwen onde van rusen” і “Hertoge lettouwen”. Гэта сведчыць аб познім часе з’яўлення назвы “Пагоня”, бо яе не ведаў і польскі храніст Я. Длугаш, які ў 2-й пал. XV ст. апісваў харугвы ВКЛ з выявай вершніка пад Грунвальдам.

Назва “Пагоня” замацавалася за гербам у канцы XV – 1-й пал. XVI стст. Як вядома, у ВКЛ існавала ваенная павіннасць – пагоня, паводле якой кожны здольны насіць зброю мужчына быў абавязаны ўдзельнічаць у праследаванні ворага. Пад уплывам гэтай павіннасці выява вершніка стала асэнсоўвацца як сімвал абаронцы айчыны. У сувязі з гэтым у беларуска-літоўскіх летапісах 1-й пал. XVI ст. прасочваецца імкненне даказаць старажытнае паходжанне герба. Час стварэння “Пагоні” летапісцы адносілі да XIII ст. і звязвалі з іменем міфічнага вялікага князя Нарымонта Раманавіча. “Хроніка Быхаўца” апісвае выяву наступным чынам: “чалавек на кані з мечам, выяўляючы на тым гербе пана дарослага, які мае бараніць мечам бацькаўшчыну сваю”.[9]

Паводле Густынскага летапісу, дзяржаўны герб быў прыняты князем Віценем: “Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему князству Литовскому печать: рыцер збройны на коне з мечем, еже ныне наричут Погоня”.[10]

**“Калюмны”** ўяўляюць сабой тры белыя слупы, злучаныя ўнізе, размешчаныя на чырвоным полі. Паводле летапіснай легенды, гэты герб прывёз с сабою з Рыма Палемон, ім карысталіся яго нашчадкі з роду літоўскіх князёў. Існуе меркаванне, што “Калюмны” былі першапачаткова гербавым знакам Полацкага княства, а з уваходжаннем яго ў склад ВКЛ выява стала ўжывацца ў дзяржаўнай сімволіцы побач з “Пагоняй”.

---

[9] Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 88.

[10] Грыцкевіч, Анатоль. Віцень / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. – С. 457 – 458.

### 2.1.3. Мова дзяржаўнага справаводства

**Беларуская мова**, мова беларускага народа, пераважнага ў ВКЛ славянскага этнасу. Сярод айчынных мовазнаўцаў для яе прынята назва "старабеларуская". На мову пераважнага славянскага этнасу разам з прыняццем праваслаўя перайшлі стваральнікі ВКЛ, вялікія князі літоўскія.

Аб стылявым багацці беларускай мовы сведчыць развіццё трох разнавіднасцей пісьменнасці – рэлігійнай, свецка-мастацкай і дзелавой. Найбольшую колькасць беларускамоўных тэкстаў складаюць дзелавыя (Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588, "Трыбунал", Метрыка ВКЛ і інш.), у якіх яна дасягнула асабліва высокай ступені ўнармаванасці і апрацоўкі. Ва ўмовах адсутнасці граматык і слоўнікаў іх ролю выконвалі ўзоры пісьмовых тэкстаў. Беларуская мова як афіцыйная (акрамя справаводства) ужывалася пры дыпламатычных зносінах, асабліва з Вялікім княствам Маскоўскім. На беларускай мове ствараліся арыгінальныя свецка-мастацкія творы: летапісы, мемуары, паэтычныя творы (Баркулабаўскі летапіс, мемуары Ф. Еўлашоўскага, вершы Скарыны, Буднага, А. Рымшы, С. Рысінскага і інш.), перакладалася свецка-мастацкая літаратура – легендарныя аповесці пра Аляксандра Македонскага, Трыстана і Ізольду, Баву.[11]

## 2.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 2.2.1. Органы дзяржаўнай улады і кіравання ў ВКЛ у XIV – XV ст.

**Вялікі князь**, гаспадар, найвышэйшы княжацкі тытул у ВКЛ. Вялікі князь быў кіраўніком дзяржавы. Яму былі падначалены князі, магнаты, якія кіравалі асобнымі княствамі, землямі, вотчынамі. Выбіраўся феадаламі звычайна з сыноў ці блізкай радні папярэдняга вялікага князя. Меў шырокія паўнамоцтвы: весці міжнародныя справы, уступаць у саюзы, абвяшчаць вайну і заключаць мір, распараджацца ўзброенымі сіламі дзяржавы, дзяржаўнай маемасцю, даходамі і скарбам, дараваць дзяржаўную маемасць, тытулы і званні, ажыццяўляць вышэйшы суд і памілаванне асуджаных. Яму належала заканадаўчая ініцыятыва, усе асноўныя законы і прававыя акты выдаваліся за яго подпісам. ***Прывілей 1447 г.*** і ***Прывілей 1492 г.*** юрыдычна абмежавалі ўладу вялікага князя. Паводле іх, ен не меў права самастойна вырашаць найбольш важныя пытанні знешняй і ўнутранай палітыкі. Нягледзячы на тое, што заканадаўчыя акты, у т. л. ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.***, падкрэслівалі, што ўлада вялікага князя ад Бога, яго становішча было тыповым для абмежаванага феадальнага манарха,

[11] Гл. падрабязней: Свяжынскі, У. Беларуская мова / У. Свяжынскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 300 – 301.

правы яго грунтаваліся на выбарнай аснове. Калі ў XIV ст. ***Рада Вялікага княства Літоўскага*** пры вялікім князі была толькі дарадчым органам, то пазней яе значэнне намнога павысілася, многія мерапрыемствы дзяржаўнага кіравання маглі быць здзейснены толькі з яе згоды. У час адсутнасці вялікага князя рада фактычна была вышэйшым дзяржаўным органам і дзейнічала самастойна. Абмежаванне ўлады вялікага князя прадугледжвалася заканадаўствам ВКЛ у форме клятвы і абяцання вялікага князя захоўваць пэўныя правы і прывілеі, а таксама ў форме прамой забароны. Напрыклад, вялікаму князю забаранялася пачынаць вайну або ўстанаўліваць падаткі на ваенныя патрэбы без дазволу сойма, выдаваць законы, якія пярэчылі б Статуту ВКЛ, раздаваць духоўныя і свецкія пасады, тытулы і землі ВКЛ іншаземцам, у т. л. польскай шляхце. [1]

**Рада Вялікага княства Літоўскага,** паны-рада, вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ у XV – 1-й пал. XVI стст. У Раду ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы (***маршалак***, ***гетман***, ***канцлер***, ***падскарбі***, ***ваяводы***, ***кашталяны***, некаторыя ***старасты*** і інш.), каталіцкія біскупы, найбуйнейшыя феадалы. Узнікла як дапаможны орган пры вялікім князі, у XV ст. набыла большую самастойнасць. Была пастаянна дзеючым выканаўча-распарадчым, заканадаўчым, кантралюючым і судовым органам. У яе кампетэнцыю ўваходзілі: выбранне вялікага князя, абарона дзяржавы, міжнародныя справы, выданне законаў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Для вырашэння гэтых пытанняў рада збіралася ў поўным складзе ці выносіла іх на разгляд ***сойма***. У сваей дзейнасці вымушана была ўлічваць унутранае і знешняе палітычнае становішча дзяржавы. Гэта вымушала яе дзейнічаць з пэўнай асцярогай, даволі часта склікаць агульнадзяржаўныя соймы, каб заручыцца падтрымкай усей шляхты. Найважнейшыя дзяржаўныя справы Рада вырашала сумесна з вялікім князем, а ў час яго адсутнасці, што здаралася даволі часта, – самастойна. Прававое становішча Рады замацавана ў прывілеях 1492 і 1506 гг.; у Статуце ВКЛ 1588 г. яе паўнамоцтвы і парадак іх ажыццяўлення не атрымалі дастатковага замацавання і вызначаліся звычаямі. Штодзенныя справы вырашалі пераважна старэйшыя радныя паны: віленскія біскуп, ваявода і кашталян, троцкія ваявода і кашталян, а таксама службовыя асобы цэнтральнага кіраўніцтва (маршалак земскі, гетман найвышэйшы, канцлер, падскарбі. [2]

**Сойм,** сейм, саслоўна-прадстаўнічы орган у ВКЛ у XV – 1-й пал. XVI стст. і Рэчы Паспалітай у 2-й пал. XVI – XVIII ст. Генезіс сойма мае карані ў перыядзе вечавых сходаў і звязаны з эвалюцыяй саслоўнай сі-

стэмы ВКЛ у XIV – XVI стст., якая прывяла да ўтварэння структур саслоўна-прадстаўнічай дэмакратыі. На месцы агульназемскіх сходаў узніклі звычаі збірання сходаў і з'ездаў, якія рэпрэзентавалі прывілеяваныя саслоўі. У аснове шляхецкіх з'ездаў ляжала паняцце аб роўнасці ўсей шляхты, бо князёў, паноў і іншае рыцарства аб'ядноўвала права ўласнасці на зямлю на рыцарскім праве. Ператварэнне з'ездаў ваеннаслужылых людзей у прадстаўнічы орган шляхецкага саслоўя адбылося ў выніку працяглага гістарычнага працэсу фарміравання правоў і прывілеяў шляхты, пры гэтым пастановы сойма адначасова вызначылі межы ўлады манарха. У выніку *феадальнай вайны 1432 – 1439 гг.* і абрання на прастол юнака Казіміра IV Ягелончыка ў ВКЛ умацаваліся пазіцыі заможнага баярства. У часы панавання Казіміра і Аляксандра, калі адбываліся шматлікія дзяржаўныя нарады, канчаткова аформілася ***Рада Вялікага княства Літоўскага*** (паны-рада). Яе пасяджэнні ў поўным складзе часта называліся соймам. Першапачаткова толькі ад вялікага князя (гаспадара) залежала, будзе ен абмяркоўваць нейкае пытанне ў коле найбліжэйшых дарадцаў ці звернецца да шырэйшага кола асоб, што прыбылі на з'езд па ўласным жаданні або былі пакліканы спецыяльна. Дакладны час ператварэння нарад манарха з саноўнікамі ў пасяджэнні вальнага агульнадзяржаўнага сойма застаецца спрэчным. Як вальныя соймы (у лацінскіх крыніцах "conventio generalis" або "diaeta") даследчыкі вызначаюць: Віленскі сойм 1401 г., на якім вырашалася пытанне пра унію з Польшчай (М. К. Любаўскі); Віцебскі з'езд 1433 г., на якім князі, паны, рыцарства і мяшчане звярнуліся да рымскага папы са скаргамі на вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча (Л. Корчак); Віленскі з'езд у студзені 1446 г., які разглядаў пытанне аб магчымам абранні Казіміра на польскі трон, і з'езд 1452 г., на якім абмяркоўвалася праблема захавання ў складзе дзяржавы Валыні (О. Галецкі); Віленскі сойм 1492 г., скліканы для абрання вялікага князя (М. А. Максімейка). У крыніцах выразы "сойм", "рада" і "conventio generalis" вельмі часта выступаюць як сінонімы.

Даследчыкі вызначаюць момант узнікнення сойма як парламента на аснове розных крытэрыяў: з'яўленне на пасяджэннях у якасці дарадцаў выбарных або прызначаных прадстаўнікоў ад усяго "палітычнага народу" (прывілеяваных саслоўяў), перыядычнасць, рэгулярнасць пасяджэнняў. С. Русоцкі абгрунтавана акрэслівае сойм як з'езд для нарады гаспадара не толькі з панамі-радай, але і з прадстаўнікамі ўсіх станаў, у першую чаргу шляхецкіх мас, прычым не мае значэння, ці падзяляўся сойм на палаты, былі яго ўдзельнікі прызначаны ці абраны. Усе яны павінны былі быць не толькі сведкамі ці прасіцелямі, а менавіта дарадцамі, нават калі іх голас быў

не такім істотным, як голас паноў-рады. З узнікненнем праблем, вырашэнне якіх у новых гістарычных умовах патрабавала ад гаспадара згоды прадстаўнікоў рыцарства, вялікі князь пачаў склікаць агульнадзяржаўны з’езд-сойм. Паводле меркавання Любаўскага, ***Прывілей 1447 г*** Казіміра акрэсліў умовы, калі гаспадар быў павінен склікаць вальны сойм для збору сродкаў на абарону дзяржавы. Максімейка выказаў гіпотэзу, што ўзнікненне агульнадзяржаўнага сойма ў канцы XV ст. стала вынікам “потребы военной”. Прысутнічалі прадстаўнікі баярства і на соймах, на якіх выбіраліся вялікія князі (1492, 1529 гг.). Баяры-шляхта стала заклікаліся на соймы з першай чвэрці XVI ст. Першапачаткова сістэмы прадстаўніцтва не існавала, і, як правіла, на соймы запрашалася ўся шляхта. У 1511 г. Жыгімонт I Стары ўпершыню загадаў намеснікам і дзяржаўцам пагранічных валасцей склікаць шляхту па паветах і прапанаваў выбіраць па 2 прадстаўнікі ад павета для ўдзелу ў сойме. [3]

**Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага,** дзяржаўная ўстанова, якая дакументацыйна забяспечвала дзейнасць цэнтральных органаў улады і кіравання ВКЛ. Утварылася ў канцы XIV ст. як асабістая канцылярыя вялікага князя Вітаўта, знаходзілася ў Вільні.

Прыкладна з сярэдзіны XV ст. у сувязі з распаўсюджваннем пісьмовага дакумента ва ўнутранай палітыцы краіны набыла характар дзяржаўнай установы. На чале канцылярыі стаяў ***канцлер***. У 1566 г. уведзена пасада ***падканцлера***, які замяшчаў канцлера ў час адсутнасці апошняга ў канцылярыі. Канцлер распараджаўся вялікай дзяржаўнай пячаткай, падканцлер – малой, таму абедзве гэтыя асобы атрымалі абагульняльную назву “пячатары”. У канцылярыі працаваў вялікі штат іншых службовых асоб – рэгенты, сакратары, пісары, дзякі. Сярод іх існавала пэўная спецыялізацыя. Асобную групу складалі пісары арабскія і татарскія, чыімі паслугамі карысталіся для сувязяў з мусульманскімі краінамі, у першую чаргу з Крымскім ханствам і Турцыяй. Да працы ў канцылярыі дастаткова часта прыцягваліся асабістыя слугі буйных радных паноў.

Паводле меркавання гісторыка А. І. Грушы, ужо ў пачатку XVI ст. (да сярэдзіны 1540-х гг.) існаваў падзел канцылярыі на 2 аддзелы, сфарміраваныя паводле моўнай прыкметы, – рускі і лацінскі (“руская канцылярыя” і “лацінская канцылярыя”). Кожны з аддзелаў меў свой склад службоўцаў – адпаведна рускіх і лацінскіх пісараў і сакратароў. Пасля ўвядзення пасады падканцлера канцылярыя падзялілася на галоўную (большую) і меншую. Гэты падзел не быў замацаваны арганізацыйна і выяўляўся ў размеркаванні канцылярскіх кніг паміж канцлерам і падканц-

лерам у час іх вядзення і наступнага захоўвання. Па даручэнні пячатара дакумент рыхтаваўся любым з пісараў, які быў у той час пры канцылярыі і замацоўваўся пячаткай адпаведна канцлера ці падканцлера. Копія дакумента запісвалася ў тую кнігу, якая вялася пры адпаведным пячатары. Канцлер і падканцлер павінны былі захоўваць не толькі тыя кнігі, што вяліся пры іх, але і пры іх папярэдніках. Канцылярыя ВКЛ мела свецкі характар, толькі некаторыя выхадцы з Польшчы, якія працавалі ў канцылярыі ў XV – XVI стст. лацінскімі сакратарамі і пісарамі, адначасова займалі пэўныя царкоўныя пасады.

Асноўнай задачай дзяржаўнай канцылярыі было дакументаванне рашэнняў вялікага князя і рады ВКЛ па кіраванні дзяржавай, а таксама сойма, які не меў свайго сакратарыята. Фармальна ў функцыі канцылярыі ўваходзіла падрыхтоўка наогул усіх дакументаў, якія ствараліся ў цэнтральным апараце кіравання ВКЛ, у т. л. звязаных з дзейнасцю вышэйшых службовых асоб краіны. Вялікі аб’ем працы канцылярыі быў звязаны са зваротамі прыватных асоб: тут рыхтаваліся ўсе гаспадарскія даніны, пацвярджэнні, судовыя рашэнні, якія выдаваліся на рукі зацікаўленым асобам. Акрамя таго, канцылярыя выконвала функцыі натарыяту: сведчыла прыватныя здзелкі з маемасцю, заносіла копіі адпаведных дакументаў у спецыяльныя капійныя кнігі (“кнігі канцылярэйскія”), выдавала з іх выпісы. За падрыхтоўку і выдачу дакументаў, капіраванне іх у кнігі з выдачай адпаведных выпісаў канцылярыя брала пошліну. Значны аб’ем працы канцылярыі займала вядзенне судовага справаводства. У канцылярыю паступалі скаргі на супрацьпраўныя дзеянні, праз яе ішла перапіска з асобамі, якія вялі судовую спрэчку. Па даручэнні гаспадара службовыя асобы канцылярыі прымалі ўдзел у судовых пасяджэннях: канцлер і падканцлер – у якасці суддзяў, сакратары і пісары – у якасці судовых засядацеляў. Пісары маглі ўваходзіць у склад камісій, якія праводзілі расследаванне судовых спраў на месцы.

Акрамя абавязкаў справаводства, работнікам дзяржаўнай канцылярыі даручалася выкананне іншых спраў, якія не былі звязаны з працай па дакументацыйным забеспячэнні. З канца XV ст. у канцылярыі выявіліся рысы пасольскай службы, яна выконвала функцыі дзяржаўнай пошты. Служачыя канцылярыі мелі шмат разавых даручэнняў, былі рэвізорамі, мернікамі, камісарамі і інш. Паслугамі канцылярыі карысталіся амаль усе службовыя асобы цэнтральнага апарату кіравання ВКЛ. Пры адсутнасці спецыяльных цэнтральных устаноў па кіраванні дзяржавай канцылярыя была адзіным для ўсіх сфер дзяржаўнай палітыкі цэнтральным выканаўчым органам, але толькі тэхнічным, бо ен не прымаў самастойных кіраўнічых рашэнняў. Служачыя канцылярыі належалі да найбольш адукаваных людзей у краіне, складалі яе інтэлектуальную эліту. Яны рыхтавалі і рэдагавалі статуты, па-

становы соймаў і рады ВКЛ, іншыя заканадаўчыя акты. Канцлер і падканцлер займалі вядучае становішча сярод радных паноў, актыўна ўплывалі на ўнутраную і знешнюю палітыку краіны. Канцылярыя ВКЛ працавала да канца існавання Рэчы Паспалітай. [4]

**Скарб** 1) дзяржаўная ўстанова ВКЛ у XV – XVIII стст., якая адказвала за эканамічнае і фінансавае кіраванне. Мела ўласны штат, куды ўваходзілі ***падскарбі земскі***, ***скарбны***, скарбныя пісары і дваране;

2) сховішча дзяржаўных даходаў ВКЛ: даніны, чыншу, дзякла, мезлева, асадных пенязяў, судовых пошлін, якія паступалі да князя (віны, перасуды), сярэбшчыны і інш. У скарбе зберагаліся таксама дзяржаўныя рэгаліі (“клейноты і аздобы”), арыгіналы агульназемскіх і абласных прывілеяў, міжнародных дагавораў і інш. Да др. пал. XVII ст. на захоўванні ў скарбе знаходзіліся арыгіналы кніг метрыкі ВКЛ. Скарб быў і цэнтральным арсеналам ВКЛ. [5]

### 2.2.2. Кіраўнічы апарат ВКЛ

Кіраўнічы апарат і сукупнасць пасад у цэнтры і на месцах мелі назву **урады** (“вряды”). Урады складаліся з пэўнай колькасці службовых асоб (ураднікаў). Сярод іх вылучалі ***цэнтральных ураднікаў***, якія займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады, ***мясцовых ураднікаў***, якія ажыццяўлялі кіраўніцтва адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ў складзе ВКЛ і ***прыдворных (дворных***) ураднікаў, якія абслугоўвалі разнастайныя патрэбы велікакняжацкага двара.

### Вышэйшыя службовыя асобы ВКЛ (цэнтральныя ўраднікі)

**Канцлер**, службовая асоба ў ВКЛ у XV – XVIII стст. (...) Пасада канцлера прайшла пэўную эвалюцыю. Спачатку канцлер быў службовай асобай велікакняжацкага двара, непасрэдным кіраўніком ***канцылярыі Вялікага княства Літоўскага***, галоўным пісарам, які адказваў за дакументальнае абслугоўванне дзейнасці гаспадара (пераважна ў знешнепалітычнай сферы) і агучванне яго рашэнняў. У далейшым канцлер стаў атрымліваць паўнамоцтвы міністра юстыцыі. З перш. чв. XVI ст. менавіта канцлеру вялікі князь стаў даручаць кантроль за падрыхтоўкай збораў законаў (статутаў) і найбольш важных прававых актаў. (...) У абавязкі канцлера (а таксама яго намесніка – ***падканцлера***) ўваходзіла афіцыйнае прадстаўленне Статутаў і важных актаў і клопат аб іх выданні. Сродкам павышэння значэння і службовага статуса канцлера стала практыка ўключэння яго з сярэдзіны XV ст. у склад ***Рады Вялікага княства Літоўскага*** і асабліва

спалучэнне з др. пал. XV ст. пасады канцлера з вышэйшай свецкай пасадай віленскага ваяводы. (...) Такі парадак з некаторымі выключэннямі захоўваўся да канца існавання ВКЛ. (...) Да 1520-х гг. адносяцца спробы ператварыць канцлера ў вышэйшага кіраўніка гаспадаркі ВКЛ. У некаторых выпадках вялікі князь стаў даручаць канцлеру ажыццяўленне кантролю за паступленнем пэўных відаў гаспадарскіх і дзяржаўных даходаў. (...) Але ўжо з 1531 г. даходы ад мытнікаў, васкаўнічых і салянічых даручалася прымаць земскаму падскарбію. Апошняму ў адсутнасць гаспадара было перададзена таксама і права суда над імі. Як кіраўнік канцылярыі, канцлер захоўваў маястатную пячатку, у далейшым яе разнавіднасць – вялікую маястатную пячатку ВКЛ. (...) Праз канцлера вялікі князь перадаваў разнастайныя загады адносна працы канцылярыі: падрыхтоўкі і выдачы дакументаў, іх ануляванні і г. д. Згодна з прысягай, якую прыносіў канцлер пры заняцці пасады, ён абавязваўся не выдаваць дакументаў без волі, ведама і загаду вялікага князя, акты, якія маглі б нанесці шкоду годнасці і аўтарытэту ВКЛ і парушалі правы дзяржавы. Ужо ў перш. чв. XVI ст. канцлер дамогся значнага ўплыву на дзейнасць канцылярыі. [6]

**Падканцлер,** службовая асоба ў ВКЛ у XV – XVIII стст., намеснік *канцлера*. Падканцлер замяшчаў канцлера ў кіраванні дзяржаўнай канцылярыяй, як і канцлер, вёў замежныя і ўнутраныя справы, кіраваў працай пісараў і сакратароў у канцылярыі ВКЛ, быў хавальнікам малой дзяржаўнай пячаткі. Паводле загаду вялікага князя, падканцлер выдаваў асобам дзяржаўныя дакументы за сваім подпісам і малой пячаткай. (...) Афіцыйна як пастаянная пасада падканцлера была ўведзена ў ВКЛ у 1566 г. (...) Пасада падканцлера была ўведзена ў сувязі з пашырэннем справаводства ў велікакняжацкай канцылярыі і неабходнасцю знаходжання канцлера ў сталіцы для зацвярджэння найважнейшых дзяржаўных дакументаў. Канцлер або падканцлер суправаджалі вялікага князя ў іншыя гарады і мясцовасці або за мяжу, каб зацвярджаць дзяржаўныя дакументы. Падканцлеры прымалі ўдзел у падрыхтоўцы дзяржаўных законапраектаў і іх канчатковым рэдагаванні, кіравалі камісіяй па падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1588 г. На пасаду падканцлера прызначаліся буйныя феадалы, якія спалучалі з ёй іншыя дзяржаўныя пасады, мелі адукацыю і практычны вопыт дзяржаўнай, судовай ці канцылярскай службы. З XVI ст. падканцлер быў хавальнікам дзяржаўных архіўных актаў – Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. Падканцлер уваходзіў у склад Рады ВКЛ. [7]

**Маршалак вялікі** (у XV ст. **земскі**, у XVI ст. **найвышэйшы)** – найвышэйшы ўраднік ВКЛ у пачатку XV – XVIII ст. Кіраваў дваром вялікага

князя, прымаў замежных паслоў, вышэйшыхураднікаў дзяржавы, назіраў за этыкетам, загадваў прыдворнай стражаю і каралеўскай гвардыяй, сачыў за бяспекаю манарха, прызначаў дваран. Разглядаў здарэнні і злачынствы, здзейсненыя пры двары і ў месцы знаходжання вялікага князя (...) [8].

**Падскарбій земскі** (лац. thesaurarius noster) – кіраўнік ***скарба*** ВКЛ. У яго падпарадкаванні знаходзіўся троцкі скарбны, які ўзначальваў аддзяленне скарба ў Троках. Першапачаткова земскі падскарбій быў толькі захавальнікам скарба. Выдачы са скарба ажыццяўляў па вусных загадах вялікага князя і Рады ВКЛ і квітанцыях канцылярыі. У 1530-х гг. узніклі першыя прыкметы пераўтварэння земскага падскарбія ў міністра эканомікі і фінансаў. З 1531 г. адкупшчыкі велікакняжацкіх даходаў – мытнікі, салянічыя і васкаўнічыя – былі падпарадкаваны земскаму падскарбію, якому было дадзена права ануляваць дагаворы на водкупы мыт і прымусова кампенсаваць выдаткі ў выпадку несвоечасовай выдачы даходаў. Земскаму падскарбію даручалася прымаць даходы з адкупшчыкоў. У адсутнасць гаспадара земскаму падскарбію было дадзена і права суда над імі. Расходаванне сродкаў адкупшчыкамі дазвалялася толькі па квітанцыях, якія мелі подпісы вялікага князя і земскага падскарбія. (...) Падчас валочнай памеры 1550-х гг. да земскага падскарбія перайшло вышэйшае кіраўніцтва гаспадаркай ВКЛ. [9]

**Скарбны, скарбнік,** службовая асоба ў ВКЛ у XV – XVIII стст. Скарбны ВКЛ – памочнік *падскарбія* земскага. (...) Скарбныя былі таксама ў ваяводствах і паветах, вялі перапіску па фінансавых пытаннях, складалі інвентары ўладанняў, якія падлягалі абкладанню падаткамі. [10]

**Гетман** (польск. hetman ад ням. Hauptmann), галоўны начальнік над узброенымі сіламі дзяржавы ў ВКЛ і Польшчы ў XV – XVIII ст. У ВКЛ чын гетмана вядомы з канца XV ст., аднак поўнае вызначэнне яго функцый і юрыдычнае афармленне гетманства як дзяржаўнай пасады звязана з менскай ухвалай Жыгімонта І Старога за 1507 г. Вялікі князь як непасрэдны кіраўнік дзяржавы і войска прызначаў замест сябе гетмана, надзеленага дыктатарскімі паўнамоцтвамі; ён мог караць падначаленых за парушэнне дысцыпліны, гвалт над насельніцтвам і г. д. Правы гетмана ў дачыненні да войска канчаткова ўнармавала "Вайсковая ўстава" 1511 г. і ўхвала Сойма 1516 г. Існавалі пасады **гетмана найвышэйшага** (у XVII – XVIII стст. ён называўся **вялікім**) і **польнага**. Паводле Статутаў ВКЛ, іх маглі займаць толькі падданыя ВКЛ. У час Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг. пасада гетмана найвышэйшага стала пажыццёвай. Атрымаўшы дадатковыя абавязкі, гетман набыў функцыі ваеннага міністра: ён мусіў камплектаваць узброеныя сілы, распараджацца ***сярэбшчынай***, назіраць за станам памежных замкаў і інш. [11]

## Прыдворныя ўраднікі[12]

**Маршалак дворны** (надворны) – ураднік у канцы XV – XVIII стст. Загадваў гаспадарчымі справамі велікакняжацкага двара, кіраваў ***маршалкамі гаспадарскімі***. Быў намеснікам ***маршалка вялікага***.

**Маршалак гаспадарскі** – ураднік пры двары вялікага князя ў канцы XIV – пач. XVII стст. Выконваў спецыяльныя даручэнні гаспадара, кіраваў прыдворнымі службамі. На працягу XV – 1-й пал. XVI стст. колькасць маршалкаў гаспадарскіх значна павялічылася і часам дасягала 10 і больш чалавек.

**Падскарбі дворны** (лац. subthesaurarius Magni Ducis Lihuaniae, vicethesaurarius curiae nostrae, thesaurarius curie nostrae) спачатку быў намеснікам земскага падскарбія і, відаць, адказваў за забеспячэнне асабістых матэрыяльных патрэб вялікага князя. З вылучэннем у 1588 г. сталовых маёнткаў (эканомій) – іх фінансавы і эканамічны кіраўнік.

**Падкаморы прыдворны** адказваў за парадак і ўбранства ў пакоях вялікага князя, быў яго дарадчыкам і ўваходзіў у склад ***Рады Вялікага княства Літоўскага***. Прызначаўся з буйных феадалаў.

**Кухмістар,** урад (пасада) у ВКЛ. Вядома з канца XV ст., у 1569 г скасавана, у 1576 г. адноўлена. Да XVII ст. ператварылася ў дыгнітарскую. Першапачаткова загадваў прыдворнай кухняй і кухарамі. Ва ўрачыстых выпадках (элекцыя, прыём паслоў і інш.) асісціраваў за сталом вялікаму князю, распавядаючы пра стравы, што падаваліся. Намінальна кіраваў *стольнікам, падстолім, крайчым, чашнікам, падчашым* і *піўнічым*. У Рэчы Паспалітай існавалі асобныя кухмістры ВКЛ і Польшчы.

**Стольнік**, урад (пасада) у ВКЛ з сярэдзіны XV ст. Загадваў сервіроўкаю велікакняжацкага стала і падачаю страў. Кіраваў ***падстоліямі***. Пазней выконваў функцыі намінальна.

**Крайчы**, урад (пасада) у ВКЛ і Польшчы. Да XIII ст. прыдворны, які павінен быў пасля падрыхтоўкі стала *стольнікам* наразаць пададзеныя стравы для свайго пана. У ВКЛ вядомы з XV ст., у іерархіі ўрадаў займаў высокае месца (звычайна крайчымі прызначаліся маладыя прадстаўнікі магнацкіх родаў).

---

[12] Падрабязней гл. адпаведныя артыкулы ў энцыклапедыі ”Вялікае княства Літоўскае” (т. 1 – 2) і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі (т. 1 – 6).

**Падстолі,** урад (пасада) у ВКЛ. Вядома з сярэдзіны XV ст. Намеснік ***стольніка,*** дапамагаў яму сервіраваць велікакняжацкі стол. З часам яго функцыі сталі намінальнымі.

**Чашнік**, урад (пасада) у ВКЛ. Павінен быў наліваць вялікаму князю ВКЛ напоі ў посуд, што падносіў да гаспадара падчашы. Пасада вядома з 1409 г. (...) З цягам часу пасада ператварылася ў намінальную.

**Падчашы,** урад (пасада) у ВКЛ. У XV – XVI стст. часам тытуляваўся ***чашнікам.*** Павінен быў падаваць вялікаму князю літоўскаму напоі, папярэдне пакаштаваўшы іх сам. Пасада лічылася вельмі ганаровай, яе займалі толькі прадстаўнікі магнацкіх родаў.

**Мечнік,** мечны, урад (пасада) у ВКЛ у канцы XV – XVIII стст. У час вялікіх урачыстасцей мечнік ВКЛ нёс перад манархам аголены меч як сімвал вайсковай улады. Існавалі таксама *павятовыя* мечнікі.

## Мясцовыя ўраднікі[13]

**Намеснік** – у ВКЛ у XIV – XVI стст. прадстаўнік вялікага князя, якому належала адміністрацыйна-гаспадарчая, фінансавая і судовая ўлада на тэрыторыі былых самастойных княстваў.

**Ваявода** – пасада ў ВКЛ, у XIV – XV стст. намеснік князя з судова-адміністрацыйнымі і ваеннымі функцыямі, з XV ст. намеснік манарха ў адміністрацыйна-тэратырыяльнай адзінцы – ваяводстве, вайсковы і цывільны правіцель, да сярэдзіны 1560-х гг. – суддзя. Уваходзіў у склад Рады ВКЛ.

**Падваявода** – службовая асоба ў мясцовай адміністрацыі ВКЛ, намеснік ваяводы, кіраваў яго дварам, назіраў за гандлем і спаганяў падаткі з гандлёвых заняткаў.

**Старóста** – службовая асоба ў ВКЛ, кіраўнік адміністрацыйнай акругі (павета), першапачаткова ажыццяўляў у павеце поўную дзяржаўную і судовую ўладу.

**Падстароста** – службовая асоба, намеснік старосты, фактычна кіраўнік замкавага суда. У час паспалітага рушэння павінен быў заставацца ў замку і на гэты тэрмін канцэнтраваў у сваіх руках судовую і адміністрацыйную ўладу.

[13] Падрабязней гл. адпаведныя артыкулы ў энцыклапедыі ”Вялікае княства Літоўскае” (т. 1 – 2) і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі (т. 1 – 6).

**Маршалак павятовы** – мясцовы ўрад, кіраваў шляхтай у павеце, склікаў і вёў павятовы сеймік.

**Харунжы павятовы** – вайсковы кіраўнік шляхты павета, збіраў шляхту для вайсковых паходаў, праводзіў яе попісы.

**Гараднічы** – загадчык дзяржаўных або прыватнаўласніцкіх пабудоў у пэўным населеным пункце. Клапаціўся пра іх стан, рамонт і пабудову новых.

**Кашталян** – пасада ў ВКЛ і Польшчы, спачатку – загадчык замка, надзелены пэўнымі судовымі функцыямі. Пазней не меў акрэсленых функцый, фактычна з'яўляўся наместнікам ваяводы, уваходзіў у склад паноў-рады.

**Ключнік** – земская пасада ў ВКЛ, намінальна меў ключы ад брамы горада і павінен быў зачыняць іх на ноч.

**Цівун** – у ВКЛ кіраўнік вялікакняжацкага маёнтка з воласцю, вёў дваровую гаспадарку, збіраў даніну (з пачатку XVI ст. – ***дзяржаўца***).

**Дзяржаўца**, службовая асоба ў ВКЛ, кіраўнік, часовы ўладальнік *дзяржавы*. У XVI ст. у дзяржанне аддаваліся гаспадарскія двары або замкі з прылеглай да іх *воласцю*, цэнтрам якой яны звычайна з'яўляліся. Да XVI ст. называўся ***наместнікам*** або ***цівуном***. Дзяржаўца прызначаўся вялікім князем па яго выбары або па хадайніцтве рады з ліку шляхты – "да волі і ласкі гаспадарскай" або "да жывата", г. зн. пажыццёва, пры гэтым дзяржаўцы на карысць вялікага князя плацілі "чалабіцце". У ***Прывілеі 1492 г.*** вялікі князь Аляксандр абяцаў не патрабаваць "чалабіцця" з шляхты пры наданні пасад, але не выключаў яго выплаты па добрай волі. Дзяржаўцу выдаваўся спецыяльны ліст на дзяржаўства. Падскарбі земскі або ваявода ўводзіў яго ў пасаду (знаёміў з абавязкамі). (...) Калі дзяржаўца чыніў шкоды гаспадарскай маёмасці або "крыўды" насельніцтву, яго па велікакняжацкаму прысуду маглі пазбавіць пасады. У сваёй дзейнасці дзяржаўцы кіраваліся агульнадзяржаўнымі нарматыўнымі актамі (прывілеі, Статут ВКЛ 1529), мясцовымі прывілеямі, уставамі, якія ўлічвалі спецыфіку гістарычнага развіцця той ці іншай мясцовасці. Гэта выклікала пэўную разнароднасць у паўнамоцтвах дзяржаўцаў у розных рэгіёнах, пераважна ў падатковай дзейнасці і даходах. Дзяржаўца выконваў гаспадарчыя, адміністрацыйна-судовыя функцыі, збіраў падаткі, наглядаў за станам і рамонтам гаспадарчых пабудоў, інвентару маёнтка або замка, займаўся арганізацыяй польнай або замкавай старожы, адказваў за забеспячэнне гаспадаркі рабочай сілай. З мэтай павелічэння даходаў мог асаджваць вольных людзей на пустках. Да 1529 г. меў права раздаваць пусткі шляхце за вайсковую службу. У абавяз-

кі дзяржаўцы ўваходзіў збор розных натуральных і грашовых падаткаў: *дзякла* – жытам, пшаніцай, аўсом і г. д., *мезлева* – ялавічынай, свінінай і інш., у некаторых паветах збіраў мядовыя, бабровыя, кунічныя даніны, паборы соллю, рыбай і інш. Дзяржаўца збіраў ускосныя падаткі, напрыклад, пенязі карчомныя, падаткі на вайсковыя патрэбы. Падскарбі земскі або ваявода кантралявалі падатковую дзейнасць дзяржаўцы, які павінен быў двойчы ў год трымаць перад імі справаздачу – "лічбы чыніць". Дзяржаўца судзіў гаспадарскіх сялян, мяшчан, якія не падлягалі магдэбургскаму праву, шляхту (да 1564 г.), маёнткі якой знаходзіліся ў межах яго дзяржавы, але яго судовай уладзе не падлягалі асобныя паны, князі і прыватнаўласніцкія падданыя. Дзяржаўца быў кіраўніком мясцовай адміністрацыі. Да сярэдзіны XVI ст. яму падпарадкоўваліся віжы, дзякі, ляснічыя, баброўнічыя, гаёўнікі, падканюшыя і інш. Выкананне пэўных адміністрацыйна-судовых функцый па мясцовым кіраванні забяспечвала стабільныя і разнастайныя даходы. Паводле асабістага распараджэння вялікага князя дзяржаўца мог атрымліваць частку непасрэдна гаспадарскіх даходаў, у Літве і Жамойці – частку ўраджаю азімага збожжа, гародніны і інш. Дзяржаўца атрымліваў грашовыя або натуральныя "паклоны" ад раздачы насення сялянам з гаспадарскіх жытніц, "абвесткі" з купцоў за гандаль на падуладнай тэрыторыі, "вывадныя куніцы" з жаніхоў, якія выводзілі нявест у іншую мясцовасць, у некаторых выпадках – "лоўчае", "сакольнічае". Важнай крыніцай даходаў была судовая дзейнасць. Дзяржаўца атрымліваў працэнт ад сумы за разгляд справы на судзе – "перасуд" з істца, "віны малыя" з адказчыка, а таксама "заклады", "зарукі", "пакалоднае" і інш. Наданне пасады дзяржаўцы ў ВКЛ было адным са сродкаў утрымання ваеннаслужылага саслоўя. У XVI ст. дзяржаўцамі ў пераважнай большасці былі асобы, якія належалі да вышэйшых шляхецкіх колаў і нярэдка займалі пасады ў структуры вышэйшай дзяржаўнай улады. Калі скарб значна пабяднеў у сувязі з выдаткамі на вайсковыя патрэбы, пашыралася практыка аддачы дзяржавы ў заставу за пэўную суму грошай (дзесяткі і сотні коп), пазычаных дзяржаве. У гэтым выпадку дзяржаўца мог трымаць двор або замак з воласцю поўнасцю на сваю карысць да выбрання неабходнай сумы або атрымліваць працэнт ад гаспадарскага даходу да выплаты доўгу скарбам. Пасля выплаты пазыкі зноў дзейнічаў як звычайная службовая асоба. [12]

### 2.2.3. Судовая сістэма ВКЛ у XIV – XV стст.

Судовая сістэма ВКЛ у XIV – XV стст. была прадстаўлена даволі абмежаванай колькасцю судоў і ў многім захоўвала рысы, уласцівыя судаводству папярэдніх перыядаў. На дадзеным этапе яна прадстаўлена такімі судамі, як гаспадарскі (вялікакняжацкі), замкавы, бурмістарска-радзецкі і

войтаўска-лаўніцкі ў гарадах з магдэбургскім правам, а таксама копны суд для сялян. Найбольш дасканалы выгляд судовая сістэма набыла ў XVI ст., асабліва на гэта паўплывала судовая рэформа 1560-х гг. (гл. **тэму 9**).

**Гаспадарскі суд, велікакняжацкі суд**, вышэйшы суд ВКЛ. У яго склад уваходзілі ***вялікі князь*** і ***Рада Вялікага княства Літоўскага*** або толькі Рада. Склад гаспадарскага суда законам не быў рэгламентаваны, але на практыцы ў якасці засядацеляў абавязкова павінны былі прысутнічаць радныя паны. Іх колькасць не вызначалася (2 – 3 чал., 20 – 30 і болей), залежала ад важнасці справы, месца і часу пасяджэння, сацыяльнага і службовага становішча істца і адказчыка. На правах гаспадарскага суда дзейнічалі соймавы суд і камісарскі суд. Першапачаткова соймавы суд праводзіўся вялікім князем і панамі-радай у час соймаў. Паводле Статута ВКЛ, справы ў соймавым судзе разглядалі паны-рада і 8 дэпутатаў сойма. Закон таксама вызначаў справы, падлеглыя гэтаму суду. Камісарскі суд не быў пастаянным, а ўтвараўся вялікім князем і панамі-радаю для разгляду адной ці некалькіх канкрэтных спраў, часцей за ўсё па спрэчках аб зямельнай уласнасці або павіннасцях жыхароў пэўнай мясцовасці. Рашэнне камісарскага суда падлягала зацвярджэнню вялікім князем і панамі-радаю. Да сярэдзіны XVI ст. падсуднасць спраў гаспадарскага суда была даволі шырокай. Першапачаткова кожная справа магла разглядацца ў гэтым судзе па першай або другой інстанцыі. Кожны вольны чалавек меў права звярнуцца ў гэты суд з іскам або скаргай. [13]

**Замкавы суд,** судовая ўстанова ў ВКЛ. У XV – 1-й пал. XVI стст. Замкавыя суды дзейнічалі ў асноўных адміністрацыйных цэнтрах і размяшчаліся ў замках (адсюль назва). Правасуддзе ад імя вялікага князя ажыццяўлялі намеснікі, ваяводы, старасты. Замкавыя суды разглядалі крымінальныя, цывільныя, памежныя справы. [14]

**Бурмістраўска-радзецкі суд,** мясцовы суд для гараджан у ВКЛ. Дзейнічаў адначасова з войтаўска-лаўніцкім судом у гарадах, якія атрымалі прывілей на магдэбургскае права. У склад суда ўваходзілі гарадскія бурмістры і радцы, колькасць якіх залежала ад памераў горада. Суд разглядаў пераважна нязначныя правапарушэнні мяшчан, цяжбы купцоў і рамеснікаў. [15]

**Войтаўска-лаўніцкі суд,** адзін з мясцовых судоў для гарадскога насельніцтва ВКЛ. Дзейнічаў у гарадах, якія мелі магдэбургскае права. Яго юрысдыкцыі падлягалі мяшчане. Справа таксама разглядалася, калі ў су-

довай спрэчцы ў якасці істца выступаў жыхар горада, які не меў прывілея на магдэбургскае права, або феадал ці залежны ад яго чалавек. З’яўляўся асаблівай судовай калегіяй у складзе войта і лаўнікаў. За старшыню на судовых пасяджэннях быў войт, часам яго намеснік – лантвойт. Колькасць лаўнікаў залежала ад памераў горада. (...) Пасяджэнне суда магло адбыцца пры ўмове, што прысутнічае не менш як палавіна лаўнікаў. Разглядаў крымінальныя справы, маёмасныя спрэчкі, сведчыў дагаворы куплі-продажу, завяшчанні маёмасці і інш. Судовыя рашэнні выносіў войт, кіруючыся законамі ВКЛ і меркаваннямі лаўнікаў. За выкананне судовых функцый ён меў немалы прыбытак. [16]

**Войтаўскі суд,** мясцовы суд у гарадах ВКЛ. Войт, які ўзначальваў адміністрацыю горада, меў права “судити, сказывати и карати”. У грамаце 1390 г. на магдэбургскае права Берасцю ўпамінаецца толькі адна крыніца ўлады і суда – войт. У грамаце 1498 г. Полацку гаворыцца: “Теж войт справедливости сказанья оприч бурмистров и радец моцне вчинити может, але бурмистры и радцы без войта або без лентвойта ни одного сказанья сделати не мають”. Войтаўскі суд мог дзейнічаць і ў гарадах, якія яшчэ не атрымалі магдэбургскага права. (...) У многіх прыватнаўласніцкіх гарадах, дзе не было ўведзена магдэбургскае права, таксама дзейнічаў войтаўскі суд або войтаўска-лаўніцкі суд. У XVI ст. былі прызначаны войты з правам уласнага суда ў Сураж, Веліж, Магілёў і іншыя гарады ВКЛ, якія не мелі магдэбургскага права. Поруч з войтаўскімі дзейнічалі бурмістраўска-радзецкія суды. [17]

**Копны суд,** старажытны суд грамады. Узнік як народны суд і да з’яўлення пісанага права быў заснаваны на традыцыі. Да канца XVI ст. характэрны толькі для беларускіх земляў ВКЛ. У XVI ст. копны суд заканадаўча замацаваны як адзін з інстытутаў судовай сістэмы. (...)

Суд грамады ў першую чаргу вырашаў пытанні, звязаныя з праблемамі простых жыхароў воласці, але ў шэрагу выпадкаў у якасці суб’ектаў судовага працэсу маглі выступаць і шляхціцы, калі гэта тычылася іх непасрэдных інтарэсаў. Калі шляхціц ці мешчанін абвінавачваўся ў здзяйсненні злачынства на тэрыторыі, падсуднай копнаму суду, ён таксама падпадаў пад прысуд капы. Звычайна гэта была дробная шляхта, лад жыцця якой мала чым адрозніваўся ад побыту суседняга сялянства. Копны суд мог разглядаць любыя справы аб злачынствах, здзейсненых на падсуднай ім тэрыторыі ў радыусе прыблізна 2 – 3 мілі (15 – 20 км). Найчасцей капа разглядала справы аб крадзяжах, патравах, псаванні борцяў і забранні мёду з

іх, бойках, рабаваннях на дарогах, маёмасныя і межавыя спрэчкі сярод сялян і інш. Судаводства мела звычайную і гвалтоўную формы. Звычайная капа збіралася па ініцыятыве зацікаўленых асоб у загадзя вызначаны тэрмін, найчасцей прымеркаваны да рэлігійнага свята. Гвалтоўная (гарачая) капа збіралася звычайна на месцы злачынства ў выпадку забойства, падпалу, нападу, калі пацярпелы "падымаў гвалт". Капа ажыццяўляла адначасова судовыя і следчыя функцыі. Удзельнікі копнага суда самі праводзілі расследаванне, пры неабходнасці адшуквалі злачынцу ("гналі след"). Следства на капе вялося звычайна на 3 пасяджэннях (у некаторых выпадках, калі справу не ўдавалася расследаваць за гэты час, збіралася і больш). Апошняе пасяджэнне называлася "завітой капой", на якой "завівалася" (завяршалася) справа. Следства абапіралася на матэрыяльныя доказы і паказанні сведкаў. Калі капа не магла знайсці доказаў злачынства і адсутнічалі сведкі, падазронаму прапаноўвалі самому прызнацца ў здзяйсненні злачынства. Калі ён не прызнаваўся, прымянялася катаванне ("проба", "мука"). Першы допыт рабіўся з дубцом. Калі і пасля гэтага абвінавачаны не прызнаваўся, яго маглі катаваць агнём. У некаторых выпадках допыт вёў спецыяльна запрошаны *кат*. Прысуд капы залежаў ад вінаватасці злачынцы, памераў учыненай ім шкоды. Капа магла прыгаварыць і да смяротнага пакарання, звычайна з дапамогай шыбеніцы. Вядомы выпадкі, калі капа прысуджала злачынцаў да чвартавання і спалення. Рашэнні копнага суда абавязкова заносіліся ў актавыя кнігі земскіх альбо гродскіх судоў, лічыліся канчатковымі і, як правіла, выконваліся адразу. [18]

**Суд царкоўны,** суд духоўны. Разглядаў справы ўнутры канфесій, звязаныя са спрэчнымі пытаннямі па скаргах на духоўных асоб, пазбаўленнем іх сану, высвятленнем ступеняў роднасці пры ўзяцці шлюбу, міжканфесіянальнымі адносінамі, парушэннямі шлюбнай вернасці, невыкананнем рэлігійных абавязкаў і інш. Традыцыйна ў праваслаўі, каталіцтве і уніяцтве вышэйшай судовай уладай валодалі *мітрапаліты* і *епіскапы.* У праваслаўнай царкве ВКЛ органам суда царкоўнага (як і кіравання) быў крылас – рада пры *епіскапе,* якая складалася з пастаянных членаў і часова запрошаных, намеснікаў духоўных і свецкіх, якіх выбіралі з мясцовых прыхаджан, пратапопаў і дзесятнікаў. Белае прыходскае духавенства было падпарадкавана судовай уладзе сваіх епіскапаў, а манаскае падпарадкоўвалася ім толькі тады, калі манастыр не меў свайго патрона. Прыхаджане епархіі таксама падлягалі суду царкоўнаму па духоўных справах, асабліва па шлюбных. Царкоўныя суды праваслаўнай царквы ў ВКЛ кіраваліся наступнымі дакументамі:

– кормчымі кнігамі;

– “Скруткам Яраслававым”, вядомым з часоў вялікага князя Вітаўта і пацверджаным з дапаўненнямі ў 1514 г. вялікім князем Жыгімонтам І;

– мясцовымі царкоўнымі звычаямі;

– шматлікімі граматамі, выдадзенымі вялікімі князямі і каралямі, што тычыліся епіскапаў, цэркваў і манастыроў;

– Статутамі ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., якія хоць і тычыліся цывільных і крымінальных спраў, але закраналі і некаторыя духоўныя аспекты.

У 1542 г. Жыгімонт І з панамі-радай выдаў чарговы эдыкт аб неўмяшанні свецкіх улад у духоўныя справы і вырашэнні гэтых спраў епіскапамі. Судовымі справамі ў кальвініцкай царкве ВКЛ займаўся Віленскі сінод. Мусульмане да канца XVIII ст. звярталіся да муфтыя Асманскай імперыі. Духоўнымі судовымі справамі ў іудзеяў займаўся рэлігійны суд *кагалу*. [19]

## 2.3. КРЫНІЦЫ

1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост. З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

3. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

4. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / скл. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

6. Малиновский, И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. Малиновский. – Томск : Паровая типо-литогр. П. И. Макушина, 1901. – XX, 508 CLX.

7. Малиновский, И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского. Добавление / И. Малиновский. – Томск : Типо-лит. СПб. тов. печат. дела, 1912. – 139 с.

8. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

9. Полное собрание русских летописей – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р истор. наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

10. Полное собрание русских летописей – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

11. Сведкі беларускай мінуўшчыны: зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI – XV стст. / пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск, 1996. – 167 с.

## 2.4. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Варонін, В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. / В. Варонін // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. Сш. 1 (8). – Чэрвень, 1998.

2. Дубоніс, А. Да праблемы дзяржаўнай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім / А. Дубоніс // Metriciana: даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. – Мінск : Athenaeum, 2004. – Т. 3. – С. 205 – 219.

3. Канановіч, У. Шляхецкая дэмакратыя / У. Канановіч // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 2. – С. 20 – 22.

4. Леонтович, Ф. И. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства и его причины / Ф. И. Леонтович. – СПб. : тип. В. С. Балашева и К°, 1895. – 56 с.

5. Леонтович, Ф. И. К истории административного строя Литовского государства: I. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства. II. Панский двор в Литовском государстве / Ф. И. Леонтович. – Варшава : тип. Варшавск. учеб. окр., 1899. – 104 с.

6. Леонтович, Ф. И. Областное управление в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Юридические записки, издаваемые Демидовским юридическим лицеем. – Вып. 2, 1908; вып. 1, 2, 1909; вып. 1, 1910.

7. Леонтович, Ф. И. Рада великих князей литовских / Ф. И. Леонтович // Журнал министерства народного просвещения. – 1907. – №№ 9, 10.

8. Леонтович, Ф. И. Суд господарей и их советников в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Журнал Министерства юстиции. – 1909. – №№ 6, 7.

9. Леонтович, Ф. И. Центральные судебные учреждения в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Журнал Министерства юстиции. – 1910. – № 2.

10. Любавский, М. К. К вопросу об удельных князьях и местном управлении в Литовско-Русском государстве / М. К. Любавский. – СПб : тип. В. С. Балашева и К°, 1894. – 49 с.

11. Любавский, М. К. Литовско-Русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства / М. К. Любавский. – М., 1900. – 850, 232, LXXII.

12. Любавский, М. К. О распределении владений и об отношениях между великими и другими князьями Гедиминова рода в XIV и XV вв. / М. К. Любавский // Известия Исторического общества при Московском университете. – М., 1896. – С. 68 – 97.

13. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута: ист. очерки [с карт. Лит.-Рус. государства в конце XV и нач. XVI вв.] / М. К. Любавский. – М. : Унив. тип., 1892. – 998 с.

14. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 / Н. А. Максимейко. – Харьков : тип. А. Дарре, 1902. – 205 с.

15. Малиновский, И. А. Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой древней России / И. А. Малиновский. – Ч. 2: Рада Великого княжества Литовского. – Вып. 1, 2. –Томск : Паровая типо-литогр. П. И. Макушина, 1904, 1912.

16. Матарас, В. Органы ўлады і кіравання ў Вялікім княстве Літоўскім (XIV – XVI стст.) / В. Матарас // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 22 – 27.

17. Смолік, А. Органы ўлады і кіравання ў Вялікім княстве Літоўскім (XV – XVI стст.) / А. Смолік, Б. Сымон // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4. – С. 161 – 175.

18. Свяжынскі, У. М. Праблема ідэнтыфікацыі афіцыйнай мовы Вялікага княства Літоўскага / У. М. Свяжынскі // Metriciana: даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага – Мінск, 2001. – Т. 1. – С. 109 – 136.

19. Свяжынскі, У. М. Аб статусе беларускай і украінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага / У. М. Свяжынскі // Metriciana : даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. – Мінск, 2003. – Т. 2. – С. 132 – 163.

20. Шаланда, А. “Пагоня” – дзяржаўны герб Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў канцы XIV – пачатку XVI стст. / А. Шаланда // Герольд Litherland. – Горадня, 2001. – № 3 – 4. – С. 102 – 106.

21. Шаланда, А. Генезіс “Пагоні” – дзяржаўнага гербу Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага / А. Шаланда // Białoruskie zeszyty historyczne. – № 16. – Białystok, 2001. – S. 152 – 158.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Маслыка, Генадзь. Вялікі князь / Г. Маслыка // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 475.

2. Юхо, Язэп. Рада Вялікага княства Літоўскага / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 483.

3. Пазднякоў, Валерый. Сойм / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 606 – 614.

4. Рыбакоў, Андрэй. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага / А. Рыбакоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 38.

5. Груша, Аляксандр. Скарб / А. Груша // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 571.

6. Груша, Аляксандр. Канцлер / А. Груша // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 37 – 38.

7. Грыцкевіч, Анатоль. Падканцлер / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 384.

8. Вяроўкін-Шэлюта, Уладзіслаў. Маршалак / У. Вяроўкін-Шэлюта // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 273.

9. Груша, Аляксандр. Падскарбі / А. Груша // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 386.

10. Груша, Аляксандр. Скарбны / А. Груша // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 571.

11. Сагановіч, Генадзь. Гетман / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 531.

12. Бельская, Ларыса. Дзяржаўца / Л. Бельская // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 589.

13. Юхо, Язэп. Гаспадарскі суд / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 516.

14. Замкавы суд // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 647.

15. Доўнар, Таісія. Бурмістраўска-радзецкі суд / Т. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 356.

16. Доўнар, Таісія. Войтаўска-лаўніцкі суд / Т. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 462.

17. Доўнар, Таісія. Войтаўскі суд / Т. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 462.

18. Голубеў, Валянцін. Копны суд / В. Голубеў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 132 – 133.

19. Філатава, Алена. Суд царкоўны / А. Філатава // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 640 – 641.

# ТЭМА 3. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ І САЦЫЯЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ

**Змест праграмы.** Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы.

Феадальнае землеўладанне: дзяржаўнае, свецкае і царкоўнае. Магнаты, шляхта, баяры, зямяне.

Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан.

"Дымы" і "дворышчы". Вёскі, сёлы і воласці. Мясцовая адміністрацыя.

Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва.

Рамяство і гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў.

## 3.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 3.1.1. Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы.

Сельская гаспадарка працягвала заставацца галоўнай матэрыяльнай базай развіцця беларускіх земляў у XIV – XV стст. На дадзеным этапе працягвалася асваенне занятых лесам зямель, у чым асабліва былі зацікаўлены феадалы-землеўладальнікі. Паступова ўдасканальвалася культура земляробства, да сярэдзіны XVI ст. пашырыўся трохпольны севазварот. Разам з тым працягвалі існаванне і старажытныя сістэмы земляробства, у прыватнасці, падсечна-агнявая. Асноўнымі прыладамі працы з'яўляліся драўляная двухзубая саха з жалезнымі наканечнікамі і барана. У якасці цяглавай сілы на захадзе Беларусі выкарыстоўваліся пераважна валы, на ўсходзе – коні.

Сярод вырошчваемых культур пераважалі збожжавыя (жыта, авёс, ячмень, пшаніца); вырошчавалі таксама гарох, лён, каноплі, агародніну. Ураджайнасць у разглядаемы перыяд была адносна нізкай (прыкладна сам-3).

Далейшае развіццё атрымала жывёлагадоўля. Акрамя цяглавай жывёлы, разводзілі кароў, авечак, коз, а таксама хатнюю птушку.

У якасці дапаможных сялянскіх заняткаў шырока былі распаўсюджаны промыслы (бортніцтва, паляўніцтва, рыбалоўства) і хатнія рамёствы (цяслярства, бондарства, ткацтва, ганчарства, кавальства).

### 3.1.2. Фарміраванне асноўных форм зямельнай уласнасці.

Галоўным сродкам вытворчасці ў разглядаемы перыяд з'яўлялася зямля. Манапольнае права ўласнасці на яе належала класу феадалаў. Вярхоўным уласнікам усёй зямлі была дзяржава ў асобе вялікага князя літоўскага. Аснову дзяржаўнага землеўладання складалі землі былых удзельных княстваў, якія ў перыяд актыўнай тэрытарыяльнай экспансіі не падпарад-

каваліся добраахвотна ўладзе вялікіх князёў. У склад дзяржаўнага землеўладання ўваходзілі таксама канфіскаваныя, падараваныя, завяшчаныя і вымарачныя маёнткі. Да сярэдзіны XVI ст. не існавала дакладнага падзелу гаспадарскіх зямельных уладанняў на ўласна дзяржаўныя і дамен вялікага князя.

Фонд гаспадарскіх зямель з'яўляўся крыніцай пашырэння зямельнай уласнасці духоўных і свецкіх феадалаў. У XIV – XVI стст. вялікія князі актыўна выкарыстоўваюць дзяржаўны зямельны фонд у якасці асноўнага спосабу ўзнагароды феадалаў за нясенне службы. Існавала некалькі спосабаў надання зямельных уладанняў:

– **"да волі"** – часовае пажалаванне да таго моманту, калі князь пажадае вярнуць яго;

– **"да жывата"** – пажыццёвае ўладанне да смерці трымальніка (ці з правам перадачы ў спадчыну – "да двух жыватоў";

– **"на вечнасць"** – фактычна перадача зямлі ва ўласнаць.[14]

Побач з уласнасцю свецкіх феадалаў на Беларусі развіваецца землеўладанне вышэйшага духавенства, а таксама епіскапстваў, манастыроў і цэркваў. Пасля Крэўскай уніі 1385 г. буйным землеўладальнікам у ВКЛ становіцца каталіцкі касцёл.

На працягу разглядаемага перыяду назіраецца ўмацаванне права ўласнасці феадалаў на зямлю, што фіксуецца ў заканадаўчых актах – абласных і агульназемскіх прывілеях, а пасля і ў Статутах ВКЛ. Адначасова пашыраецца падатковы і судовы імунітэт феадалаў.

Развіццё таварна-грашовых адносін спрыяла ўзнікненню такой формы феадальнай гаспадаркі, як фальварак – сельскагаспадарчы вытворчы комплекс, прадукцыя якога ідзе на рынак. Вядучае месца ў фальварках займала вырошчванне збожжа. Да сярэдзіны XVI ст. фальваркі атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў заходняй частцы Беларусі, непадалёку ад водных шляхоў, якія звязвалі беларускія землі з балтыйскімі партамі (Гданьск, Кралявец, Рыга).

## 3.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 3.2.1. Структура саслоўя землеўладальнікаў

**Князь**, прадстаўнік вышэйшай арыстакратыі ў славян і некаторых іншых народаў, уладар княства. Першапачаткова князь – ваенны і часткова сакральны правадыр племя на протадзяржаўнай стадыі (г. зв. ваеннай дэмакратыі). У гэтым сэнсе славянскі князь адпавядаў германскаму конунгу, балц-

[14] Больш падрабязна пра віды умоўнага трымання зямлі гл. частку 2, с. 40 – 55.

каму кунігасу, цюркскаму хану. Тытул князя перадаваўся ў спадчыну і звычайна не мог набывацца інакш, як праз нараджэнне ў сям'і князя. Улада князя магла быць спадчыннай або выбарнай, але выбар ажыццяўляўся сярод асоб, якія мелі княжацкі тытул. Адносіны паміж князямі маглі будавацца на ўмовах васалітэту. З утварэннем Кіеўскай Русі вярхоўную ўладу манапалізаваў княжацкі род Рурыкавічаў; з утварэннем ВКЛ – літоўскі род ***Гедзімінавічаў***. У ВКЛ нашчадкі Рурыкавічаў і літоўскіх княжацкіх родаў, выхадцаў з татарскіх ханаў і замежнай тытулаванай знаці карысталіся княжацкім тытулам, хоць не заўсёды займалі вышэйшыя месцы ў дзяржаўнай іерархіі і мелі ўласныя княствы. З развіццём феадальнага грамадства на працягу XV – XVI стст. становішча князёў у ВКЛ (за выключэннем кіраўніка дзяржавы – ***вялікага князя***) набліжалася да становішча нетытулаванай феадальнай знаці – паноў і шляхты. Працэс разрастання і драблення княжацкіх родаў вёў да дэвальвацыі тытула. З 1554 г. гэты тытул не даваў сацыяльных і юрыдычных пераваг у параўнанні са шляхтай. Каб вылучыцца з масы князёў, найбольш заможныя з іх, у т. л. родзічы вялікага князя, ужывалі тытул ***княжаты***. [1]

**Княжаты** (адз. л. княжа), нашчадкі ўдзельных князёў, прадстаўнікі феадальнай знаці ў ВКЛ у XV – XVII стст. Многія княжаты захавалі вотчыны з поўным правам распараджэння імі. Частку сваіх зямель яны перадавалі за вайсковую і іншую службу баярам і слугам, якія былі іх васаламі. Некаторыя княжаты павялічвалі свае ўладанні, стварыўшы буйныя маёнткі (князі Друцкія, Друцкія-Горскія, Друцкія-Саколінскія, Заслаўскія, Мсціслаўскія, Свірскія, Талачынскія, Яраславічы і інш.). Разам з іншымі феадаламі выконвалі агульнадзяржаўную вайсковую службу ў апалчэнні (са сваімі васаламі). Ужо ў 2-й пал. XV ст. княжаты разам з панамі-радай склалі магнацкую феадальную групу. Да сярэдзіны XVI ст. захоўвалі некаторую незалежнасць ад вялікага князя. [2]

**Паны** ў ВКЛ у XV – XVI стст., у час юрыдычнага афармлення шляхецкага саслоўя, другая пасля ***князёў*** група феадалаў, нашчадкі знатных і заможных баяр, якія мелі буйныя маёнткі. Тэрмін "паны" стала ўвайшоў у мову актавых матэрыялаў з сярэдзіны XV ст., хоць раўназначны лацінскі тэрмін "бароны" з'явіўся ў граматах раней, у канцы XIV ст. Землі належалі панам паводле вотчыннага права ("з поўным правам і панствам"). У Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., попісах войска ВКЛ 1528 і 1567 гг. і іншых актах згаданы розныя групы паноў. Заможнейшымі былі *паны радныя (паны-рада)* – група найбольш буйных духоўных і свецкіх землеўласнікаў, якія

адпаведна сваім дзяржаўным пасадам засядалі ў ***Радзе Вялікага княства Літоўскага***. *Паны (панове) харугоўныя* – буйныя землеўласнікі, якія выходзілі на вайну не ў складзе павятовай шляхты, а асобна са сваімі атрадамі васалаў і пад сваім сцягам (харугвай). Проста *паны (паняты)* – заможныя землеўласнікі, якія ў войску выступалі асобнай харугвай, не змешваючыся з іншым баярствам (шляхтай). Да сярэдзіны XVI ст. паны радныя і харугоўныя падлягалі не мясцовым судам, а ***гаспадарскаму суду*** або суду велікакняжацкіх камісараў, якія выязджалі на месца. У 2-й пал. XVI ст. паны-рада і князі (княжаты) складалі вышэйшую групу феадалаў ВКЛ – магнатаў. Астатнія паны зліліся з асноўнай масай шляхецкага саслоўя, якое стала юрыдычна аднастайным. [3]

**Магнаты** (позналац. magnatus – багаты, значны чалавек), буйныя феадалы-землеўладальнікі, прадстаўнікі радавітай знаці, арыстакратычныя вярхі класа феадалаў у краінах Еўропы. У ВКЛ магнаты – нашчадкі ўдзельных князёў (***княжаты***), прадстаўнікі знатных феадальных родаў, якія валодалі вялікімі латыфундыямі з гарадамі, мястэчкамі і тысячамі сялянскіх ***дымоў***. Буйныя феадальныя маёнткі пачалі ствараться ў ВКЛ з канца XIV ст. Магнацкія роды існавалі некалькі стагоддзяў. Паводле попісу войска ВКЛ 1528 г., на Беларусі было 23 магнаты, якія мелі больш за 1000 сялянскіх дымоў. Яны сканцэнтравалі ў сваіх руках 1 / 6 усіх уладанняў феадалаў. З іх 11 былі літоўскага паходжання, 10 беларускага, 1 польскага, 1 рускага. (...) Прадстаўнікі магнацкіх сямей займалі вышэйшыя пасады ў ВКЛ (маршалкаў, канцлера, гетманаў, віленскага ваяводы і інш.). (...)

Найбольш вядомыя магнацкія роды, якія адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці: *Агінскія, Алелькавічы, Астрожскія, Бжастоўсткія, Валовічы, Вішнявецкія, Гальшанскія, Гарнастаі, Гаштольды, Глінскія, Глябовічы, Друцкія, Забярэзінскія, Збаражскія, Іллінічы, Кезгайлы, Кішкі, Лукомскія, Масальскія, Осцікі, Пацы, Радзівілы, Саламярэцкія, Сангушкі, Сапегі, Тышкевічы, Хадкевічы, Храптовічы, Чартарыйскія.* [4]

**Баяры,** ваеннаслужылыя людзі ў ВКЛ. Паходзілі з баяр Полацкага, Тураўскага, Смаленскага і іншых княстваў, ад дружыннікаў літоўскіх князёў. У XIII – XVI стст. большасць баяр атрымала саслоўныя прывілеі феадалаў. Частка з іх была прамежкавай групай паміж феадаламі і сялянамі. У юрыдычных дакументах пачынаючы з XV ст. сярод баяр вылучаюцца ***паны*** і знатныя баяры, якія разам з ***князямі*** складалі вярхі феадальнага саслоўя (***Гарадзельскі прывілей 1413 г.***). Гэтыя катэгорыі ўпамінаюцца ў велікакняжацкіх прывілеях да ***Статута Вялікага княства Літоўскага***

***1529***. У XIV – XV стст. і 1-й чвэрці XVI ст. асноўная маса феадалаў (сярэднія і дробныя землеўладальнікі) мелі адну назву – баяры. Пачынаючы з Гарадзельскага прывілея 1413 г. для абазначэння саслоўя феадалаў побач з гэтым тэрмінам у афіцыйных актах усё часцей трапляецца тэрмін “баяры-шляхта” або “шляхта”. Але да 2-й чвэрці XVI ст. асноўным тэрмінам для абазначэння феадалаў заставаўся тэрмін “баяры”. Большасць баяр былі васаламі вялікага князя, частка – васаламі буйных феадалаў-князёў, паноў, буйных баяр. Значная колькасць баяр мела толькі па некалькі або зусім не мела залежных сялян. Іх называлі “конныя баяры, якія людзей не маюць”, ***пешая шляхта*** (паводле тэрміналогіі попісаў войска ВКЛ 1528 і 1567 гг.). У 1-й пал. XVI ст. побач з тэрмінамі “шляхта”, “баяры-шляхта” ўжываліся тэрміны “паны-баяры”, “паны-***баяры панцырныя***”, “***зямяне***”, “шляхта панцырная” (у1570-я гг. і ў 1605 г. у Давыд-Гарадоцкім маёнтку Радзівілаў), “паны-баяры панцырныя і путныя” (у 1597 г. у Капыскім маёнтку Радзівілаў, у канцы XVI ст. у Капыльскім і Нясвіжскім маёнтках Радзівілаў). [5]

**Зямяне,** зямляне (польск. ziemianie ад ziemia – зямля), катэгорыя ваеннаслужылага насельніцтва ВКЛ, частка феадальнага стану (саслоўя). У XVI – XVI стст. назва зямяне пашырылася сярод ***шляхты*** ў заходніх землях ВКЛ, што тлумачыцца ўжываннем польскай тэрміналогіі і перасяленнем пэўнай часткі польскай шляхты ў ВКЛ. Попіс войска ВКЛ 1528 г. дакладна адрознівае пошты (ваенныя атрады) баярскія ад зямянскіх. Пазней гэтыя 2 катэгорыі насельніцтва атаясамліваюцца – “зямяне або баяры”. Заможная частка зямян злівалася са шляхтаю, бяднейшая, блізкая па становішчы да ***панцырных баяр*** Полаччыны, захавала сваю назву і знаходзілася ў васальных адносінах з вялікім князем ВКЛ ці феадаламі. Зямяне павінны былі плаціць чынш і каняўшчыну, але ў выпадку вайны іх не сплачвалі, а мусілі станавіцца з канём і рыштункам у войска. Зямяне выступалі не пад павятовай харугвай, а толькі ў атрадзе пана. У адрозненне ад шляхты не ўдзельнічалі ў сойміках. [6]

**Конная шляхта** – назва ў попісах войска ВКЛ XVI ст. і іншых афіцыйных дакументах ***шляхты*** (***баяр***), якая выконвала вайсковую павіннасць земскай службы на кані. Складала пераважную большасць войска ВКЛ і магнацкіх войск. Паводле попісу 1567 – 1568 гг., шляхта, якая мела маёнткі да 20 дымоў, складала амаль 80 % усёй шляхты. Яна падзялялася на розныя катэгорыі. Паводле соймавай пастановы 1529 г. адна група коннай шляхты выстаўляла 1 каня ад 8 сялянскіх службаў, другая – ад 1 – 7 службаў (конь і ўзбраенне маглі быць горшыя), трэцяя ўвогуле не мела падданых сялян (“служба сваімі галовамі”). [7]

**Пешая шляхта,** адна з ніжэйшых катэгорый ***шляхты*** паводле попісу войска ВКЛ 1567 – 1568 гг. З-за раздрабнення шляхецкіх маёнткаў пры перадачы зямлі ў спадчыну некалькім сынам, а потым іх нашчадкам да сярэдзіны XVI ст. утварылася група шляхты, якая не мела сялян і апрацоўвала зямлю сама. У яе не было сродкаў, каб у час вайны ісці ў войска з канём, адпаведным рыштункам і ўзбраеннем, таму ёй дазвалялася выступаць у феадальным апалчэнні ў шэрагах пяхоты. У 1567 г пешая шляхта складала невялікую частку войска – у беларускіх паветах ВКЛ 3,6 %. (...) Юрыдычна пешая шляхта і яе нашчадкі мелі ўсе правы і прывілеі, якімі карысталася шляхта; у побыце ж яна ўжо ў XVI ст. па сваім эканамічным становішчы была блізкая да вышэйшай групы сялянства. [8]

### 3.2.2. Асноўныя формы феадальнай рэнты і павіннасці сялян

**Даніна**, павіннасць сялян пераважна натуральнай прадукцыяй, адна з асноўных форм феадальнай эксплуатацыі сялянства ў сярэдневякоўі. (...) На Беларусі ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі прыкладна да канца XV ст. асноўнай формай рэнты была даніна (у заходняй частцы Беларусі звычайна называлася ***дзякла***) – прадукцыя сялянскіх гаспадарак, якая часткова спалучалася з адпрацовачнай і грашовай формамі рэнты. Пераважнай катэгорыяй сялянства ў гэты перыяд былі ***даннікі***, а асноўнай адзінкай іх абкладання з’яўлялася сялянская гаспадарка – ***дым.*** Склад і памеры даніны былі разнастайныя; спачатку ў ёй пераважала прадукцыя промыслаў (мёд, воск, футра), пазней – сельскагаспадарчая прадукцыя (жыта, авёс, гусі, куры, яйкі, лён, каноплі, сена і інш.). Даніна збожжам у выглядзе чацвёртай часткі (***долі***) ураджаю з’яўлялася галоўнай павіннасцю ***сялян-дольнікаў***, якіх было найбольш у Падзвінні. Да сярэдзіны XVI ст. у басейнах сплаўных рэк – Буга, Нёмана і часткова Дзвіны – даніна ў значнай ступені выцеснена пераважна адпрацовачнай і часткова грашовай формай рэнты. У Падняпроўі ў гэты час адбываўся працэс частковай або поўнай замены традыцыйнай даніны натурай, перш за ўсе футрам, на даніну прадукцыяй сельскай гаспадаркі і ў значнай ступені грашамі. Да канца XVI ст. даніна як галоўная павіннасць захавалася толькі ў глухіх лясістых, балоцістых і значна аддаленых ад вялікіх гандлёвых цэнтраў мясцовасцях. У далейшым яна складала толькі частку асноўных павіннасцей паншчынных (гл. ***Цяглыя сяляне)*** і чыншавых (гл. ***Асадныя сяляне***) сялян. [9]

**Доля**, падатак з сялян ВКЛ у XV – XVIII стст. на карысць землеўладальніка, які збіраў чацвёртую частку (***долю***) ураджаю. У XVI – XVIII стст. пашырана на беларускім Падзвінні. Выконвалі гэтую павіннасць сяляне. [10]

**Паншчына**, адпрацовачная рэнта, дармавая прымусовая праца сялян з уласнымі прыладамі працы ў гаспадарцы феадала; форма эксплуатацыі феадальна залежнага сялянства. Прадукцыйнасць паншчыннай працы была нізкая, прадукцыйныя сілы развіваліся марудна. Паншчына пачала складвацца ў Кіеўскай Русі. На Беларусі вядома з XIV ст. з канчатковым усталяваннем феадальнай уласнасці на зямлю, пашырылася ў XV – XVI стст., калі склалася фальваркавая сістэма, якая прывяла да масавага запрыгоньвання сялян. Паводле "Уставы на валокі" 1557 г., за карыстанне валокай зямлі цяглыя сяляне павінны былі працаваць на паншчыне 2 дні на тыдзень, выконваць іншыя феадальныя павіннасці (талокі, згоны); *агароднікі* за надзел абавязаны працаваць на паншчыне 1 дзень на тыдзень. [11]

**Асада**, від феадальнай зямельнай рэнты ў грашовай форме, асноўная павіннасць ***асадных сялян*** у ВКЛ у XVI ст. Узнікла з развіццём таварна-грашовых адносін. Паводле "Уставы на валокі" 1557 г., у велікакняжацкіх (гаспадарскіх) уладаннях складала 30 грошаў з валокі. У маёнтках іншых феадалаў памеры асады перавышалі гэту норму. У канцы XVI ст. асада паступова злілася з *чыншам*. [12]

**Чынш** (польск. czynsz ад лац. census – перапіс), грашовая рэнта ў Беларусі і Літве ў XV – 1-й пал. XIX стст., адна з асноўных форм феадальнай зямельнай рэнты – аброку. Чынш узнік з развіццём таварна-грашовых адносін як асноўная форма рэнты ў XVI – XVIII стст. пераважна на ўсходзе Беларусі. Быў асноўнай павіннасцю ***асадных сялян***, ***чыншавых сялян***, кунічных і аброчных сялян. Як дадатковую павіннасць чынш плацілі і іншыя феадальна залежныя сяляне. [13]

**Згоны**, гвалты, адработачная феадальная павіннасць сялян, часткова і мяшчан у ВКЛ у XV – XVIII стст.; найбольш ранняя форма працоўнай павіннасці. З устанаўленнем у XVI ст. штотыднёвай ***паншчыны*** згоны праводзіліся для тэрміновых сельскагаспадарчых работ звыш цягла. Падзяляліся на вялікія (зганялі ўсіх працаздольных) і малыя (1 – 2 работнікі з гаспадаркі на ворыва і сяўбу), на конныя і пешыя. У адрозненне ад паншчыны, да згонаў прымушаліся працаздольныя з кожнай сям'і, нават ***кутнікі***, якія не мелі зямлі, двара. Колькасць згонаў залежала ад плошчы панскай раллі і патрэб у дадатковай рабочай сіле, з часам колькасць іх павялічвалася. (...) У балансе рабочай сілы фальваркавай гаспадаркі згоны мелі значную ўдзельную вагу. [14]

**Дзесяціна** царкоўная, прынашэнне царкве дзесятай часткі даходаў. Прызначалася для ўтрымання мясцовага храма і свяшчэнніка, але пераважна ішла на карысць вышэйшага духавенства, была спосабам феадальнай эксплуатацыі сялянства. У ВКЛ у XV – XVI стст. была дзесяціна “снаповая” (сяляне аддавалі кожны дзесяты сноп) і агульная (1 / 10 частка збожжа, мёду і інш.). [15]

**Дзякла**, дзякло, прадуктовая рэнта (натуральны аброк) за зямельны надзел, якая збіралася на карысць землеўладальніка з сялян ВКЛ. Дзякла здавалі збожжам (пераважна жытам і аўсом, радзей – ячменем і пшаніцай), іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі або грашыма (па жаданні ўладальніка). У прадуктовую рэнту ўваходзілі свойская птушка або жывёла, яйкі, мёд, арэхі, грыбы. ягады, сена, лён, пянька і інш. Да валочнай памеры адзінкай абкладання былі ***дварышча*** і ***служба***, пазней – ***валока і дым***. Памер дзякла быў неаднолькавы ў розных уладаннях і вызначаўся землеўладальнікам з улікам эканамічнага становішча сялян. Найбольш пашыранае дзякла збожжавае – па 1 – 2 бочкі жыта і аўса. (...) Збожжавае дзякла сяляне найчасцей павінны былі звезці на панскае поле, засеяць, забаранаваць яго (не ў залік паншчыны). [16]

**Куніца**, адзін з пашыраных відаў аброку (чыншу) у XV – XVII стст., які плацілі ***кунічнікі*** за ўзятыя ў арэнду зямлю, пчальнікі, права карыстацца вадаёмамі і інш. Называлася таксама кунічная плата, кунічныя пенязі. Плата мясцовага насельніцтва ў велікакняжацкі скарб за карыстанне паляўнічымі ўгоддзямі называлася на ўсходзе Беларусі кунічнай данінай. Куніца спаганялася ў натуральным выглядзе (“шэрсцю”), а з XVI ст. перакладалася на грошы, звычайна адпавядала 12 грошам. [17]

**Стацыя** (ад лац. statio – стан, месцазнаходжанне), феадальная павіннасць сялян і мяшчан ВКЛ на ўтрыманне вялікага князя і яго світы ў час выканання ім судова-адміністрацыйных функцый на месцах. Вядома з канца XIV ст., паходзіла ад старажытнарускага палюддзя. У час знаходжання вялікага князя ў валасцях яму дастаўлялася стацыя натурай – ялавічына, бараніна, свініна, свойская птушка, авёс, сена, мёд, піва і інш. Пазней стацыя аформілася як пастаянны збор прадуктаў незалежна ад прыездаў вялікага князя (у Віленскім і Троцкім ваяводствах – у пач. XVI ст.), пасля яна пераводзілася на грошы. “Устава на валокі” 1557 г. канчаткова вызначыла памеры стацыі з сялян: 1 ялавіца і 2 бараны з 30 валок, 1 курыца і 30 яек або 2,5 гроша з валокі. У падняпроўскіх і падзвінскіх абласцях стацыя бы-

ла адменена для гарадоў, а ў вёсках заменена іншымі зборамі. Мясцовыя назвы стацыі – ялаўшчына, вепраўшчына, баўкуноўшчына, каняўшчына, мезлева, спіжа, паборы. [18]

**Мезлева**, дзяржаўны натуральны падатак у Літве і Паўднёва-Заходняй Беларусі ў XV – XVI стст., мясцовая разнавіднасць ***стацыі***. Збіралася ў выглядзе мясных прадуктаў (свініна, ялавічына, птушка) на карысць вялікага князя ВКЛ у час яго прыездаў у воласці або адвозілася ў Вільню на вялікія святы (Каляды, Вялікдзень). Накладалася на воласць у цэлым, пры заставе дзяржаўных маёнткаў збор мезлева пераходзіў у рукі дзяржаўцаў. Уставай 1529 г. пераведзена на грошы. [19]

**Баброўшчына**, від аброку ў Полацкай зямлі ў XV – XVI стст. Выплачвалася полацкімі мяшчанамі і валашчанамі вялікаму князю ВКЛ за права карыстацца бабровымі гонамі. Складала 200, пасля дамовы гаспадара з палачанамі ў 1497 г. – 100 руб. на год. Размеркаванне баброўшчыны ажыццяўлялі абшчыны. [20]

**Падводная павіннасць**, бярэма павазовае, феадальная павіннасць у ВКЛ у XVI – XVIII стст., паводле якой сяляне вазілі на сваіх падводах прадукцыю землеўладальнікаў да рачных прыстаней і ў горад. [21]

**Старажоўшчына**, феадальная павіннасць сялян ВКЛ: выкананне розных работ, як правіла, у залік ***паншчыны*** непасрэдна ў панскай сядзібе. Звычайна сяляне вылучалі на старажоўшчыну пачаргова па 2 – 4 чалавекі. [22]

### 3.2.3. Асноўныя катэгорыі сялян паводле суадносін павіннасцей і ролі ў феадальнай гаспадарцы

**Даннікі**, “людзі данныя”, катэгорыя феадальна залежных сялян ВКЛ у XIV – XVI стст., галоўнай павіннасцю якіх была ***даніна*** прадукцыяй сялянскіх гаспадарак. Яна спалучалася з іншымі павіннасцямі ў выглядзе розных работ (касьба, прадастаўленне падвод, будаўніцтва і рамонт замкаў і інш.), а таксама розных плацяжоў грашамі. Асноўнай адзінкай абкладання феадальнымі павіннасцямі служыў ***дым*** (сялянская гаспадарка), але валашчане (члены сельскіх і валасных абшчын) неслі калектыўную адказнасць за спраўнае выкананне ўсіх устаноўленых павіннасцей. Да канца XV ст. даннікі былі пераважнай катэгорыяй сялян, аднак далейшае развіццё таварна-грашовых адносін, рост сувязей сельскай гаспадаркі з унутраным і асабліва са знешнім рынкам абумовілі працэс паступовай рэарганізацыі сістэмы феа-

дальнай эксплуатацыі сялянства. Да сярэдзіны XVI ст. на захадзе і часткова паўночным усходзе тэрыторыі Беларусі даннікі паступова ператварылася ў паншчынных (гл. ***Цяглыя сяляне)*** і чыншавых (гл. ***Асадныя сяляне)*** сялян. У 1-й пал. XVI ст. асноўным рэгіёнам даннікаў па-ранейшаму заставалася Падняпроўе, дзе пераважалі дзяржаўныя (гаспадарскія) уладанні: Бабруйская, Гомельская, Крычаўская, Любашанская, Магілёўская, Мазырская, Прапойская, Рэчыцкая, Свіслацкая. Чачэрская і іншыя воласці. Аднак і тут адбываўся працэс часовай або поўнай замены даніны грашамі. У выніку аграрнай рэформы 1560-х гг. даннікі гаспадарскіх падняпроўскіх валасцей ператвараліся ў ***чыншавых сялян***. [23]

**Дольнікі**, катэгорыя сялян ВКЛ у XV – XVIII стст., галоўнай феадальнай павіннасцю якой была ***доля***. Акрамя гэтага, даннікі выконвалі іншыя асноўныя павіннасці: хадзілі на ***талаку*** да 12 дзён улетку, будавалі і рамантавалі панскія пабудовы, масты, выконвалі таксама ***стацыю, падводную*** павіннасць, ***баброўшчыну.*** У XVI – XVIII стст. найбольш пашыраны ў беларускім Падзвінні. З развіццём таварна-грашовых адносін і ростам сувязей сельскай гаспадаркі з унутраным і знешнім рынкамі даннікі паступова ператвараліся ў паншчынных або ***чыншавых*** сялян. [24]

**Цяглыя сяляне**, у ВКЛ у XV – XVIII стст. феадальна залежныя сяляне, галоўнай формай зямельнай рэнты якіх была паншчына. Цяглыя сяляне на Полаччыне называліся таксама прыгоннымі людзьмі.

Паводле актаў Метрыкі ВКЛ, цяглыя сяляне “с сохою, с серпом, с косою, с топором и иную тягль тянули по тому, как иншие селяне”. Узніклі з развіццём ***фальварка***. Да сярэдзіны XVI ст. у басейне Нёмана і Буга цяглыя сяляне сталі асноўнай катэгорыяй сялянства паводле характару галоўнай павіннасці. Значная колькасць сялян іншых катэгорый (даннікаў, сялян-слуг, баяр) пераведзена ў катэгорыю цяглых сялян. У ходзе валочнай памеры цяглыя сяляне атрымалі надзел у 1 валоку (21,36 га), звычайна на 2 двары, якая служыла адзінкай абкладання рознымі павіннасцямі. За карыстанне валокай зямлі цяглыя сяляне адбывалі 2 дні паншчыны ў тыдзень, плацілі натуральныя і грашовыя падаткі, а таксама выконвалі розныя работы. [25]

**Чыншавыя сяляне**, феадальна-залежныя сяляне ў Беларусі і Літве ў XV – 1-й пал. XIX стст., галоўная форма феадальнай павіннасці якіх – грашовыя плацяжы (***чынш***). Ва “Уставе на валокі” 1557 г. чыншавыя сяляне называліся таксама асаднымі сялянамі. Чыншавыя сяляне выконвалі і дадатковыя павіннасці (***дзякла, талака, згоны***). З развіццём фальваркаў коль-

касць чыншавых сялян мянялася: у выпадку патрэбы феадалы пераводзілі іх у катэгорыю цяглых сялян і наадварот. Павялічваліся і памеры чыншу. [26]

**Асадныя сяляне**, адна з асноўных катэгорый феадальна залежных сялян у ВКЛ у XVI ст., галоўнай павіннасцю якіх была ***асада***. Паводле "Уставы на валокі" 1557 г., яны, як і цяглыя сяляне, плацілі чынш, давалі дзякла і стацыю натурай або грашамі, адбывалі талокі і згоны. Вартасць усіх асноўных павіннасцей асадных сялян складала 106 грошаў з валокі добрай зямлі і 66 грошаў з валокі вельмі дрэннай зямлі. Асадныя сяляне пераважалі ў дзяржаўных уладаннях і складалі значную колькасць у маёнтках буйных феадалаў. З развіццём фальварка доля асадных сялян змяншалася. На ўсходзе Беларусі, дзе фальваркаў было мала, асадныя сяляне складалі большасць сялянства. [27]

**Агароднікі**, сяляне, якіх сялілі на невялікіх дзялянках зямлі і абавязвалі выконваць пэўныя павіннасці. (...) За надзелы агароднікі адпрацоўвалі на землеўладальніка 1 дзень на тыдзень без каня, а іх жонкі – 6 дзён за лета. [28]

**Халупнікі**, беззямельныя і малазямельныя сяляне на Беларусі ў XVI – XIX стст. Маёмасць халупнікаў найчасцей складалася з хаты (халупы) і невялікай колькасці жывёлы. У ВКЛ халупнікі не адраблялі паншчыны і не плацілі аброку, але штогод плацілі пану, на зямлі якога жылі, г. зв. паседзінкі (2 – 4 злотыя). [29]

**Сяляне-слугі,** катэгорыя сялян у ВКЛ у XV – XVIII стст., асноўнай павіннасцю якіх было выкананне спецыяльных службаў – вайсковай і тых, якія патрабавалі большай кваліфікацыі, чым службы ***даннікаў***, ***цяглых сялян*** і ***чыншавых сялян***. Да сялян-слуг належалі вайсковыя сяляне (***панцырныя баяры, путныя баяры, выбранцы, служкі*** і інш.), адміністрацыйна-гаспадарчыя службовыя асобы (***старцы, войты, цівуны*** і інш.), прыслуга (***кухары, піваварыі*** і інш.), прамыславікі (***асочнікі, баброўнікі, конюхі, рыбаловы, стральцы*** і інш.), вясковыя рамеснікі (***кавалі, цесляры, ганчары, калёснікі, кушняры*** і інш.). Сяляне-слугі былі ў дзяржаўных, прыватных і царкоўных уладаннях. Да 1-й пал. XVI ст. яны часта жылі цэлымі вёскамі. Зыходзячы са спецыфікі павіннасцей мелі больш высокі сацыяльны статус, чым іншыя катэгорыі сялян. Гэта выяўлялася ў большай набліжанасці да пануючага класа – шляхты, у большых памерах штрафаў за злачынствы супраць сялян-слуг. (...) Службовыя абавязкі некаторых катэгорый сялян-слуг (путных баяр, стральцоў, цівуноў і інш.) маглі вы-

конваць шляхціцы. Але асобы статус не вызваляў сялян-слуг ад прыгоннага стану. Яны мелі такое ж права пераходу, як і іншыя сяляне, маглі быць як з ***людзей пахожых***, так і з ***людзей непахожых***. Пытанні пра змену іх становішча (замена аб'ёму павіннасцей, перавод у стан ці са стану сялян-слуг) канчаткова вырашаў уласнік. Павіннасці сялян-слуг насілі комплексны характар, у іх уваходзіла асноўная служба і дадатковыя. Сяляне-слугі, што выконвалі спецыяльную.службу, поўнасцю ці часткова вызваляліся ад іншых сялянскіх павіннасцей. Пэўная служба спаганялася з пэўнага памеру зямельнага надзелу; калі сяляне-слугі мелі больш зямлі, то ў асноўным за лішак яны плацілі толькі чынш, калі ж зямельны надзел быў недастатковы, то прапарцыянальна змяншаўся аб'ём павіннасцей. [30]

**Панцырныя баяры**, ваеннаслужылыя людзі ў ВКЛ у 1-й пал. XV – XVIII стст. Рэкрутаваліся з ***зямян***, сельскіх мяшчан і вольных людзей, частку якіх вялікія князі і каралі сялілі на свабодных землях уздоўж граніцы ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай (віцебска-пскоўскае і смаленскае парубежжа). На ўмовах бясплатнага карыстання зямлёю і іншымі правамі яны прысягалі спраўна несці вайсковую службу (памежную варту), падпарадкоўваліся ўраду мясцовага замка. Паводле дакументаў XVI ст, панцырныя баяры абавязваліся заўсёды быць гатовымі да вайны, мець добрага каня з сядлом, панцыр, шлем-прылбіцу з забралам, меч або корд, кап'ё, каляровае адзенне, сагайдак, шчыт-павезу і шпоры. (...) Панцырныя баяры мелі прывілеі: судзіць іх мог толькі суд; захоўваліся маёнткі, дараваныя папярэднімі каралямі; удава да ўступлення ў другі шлюб валодала ўсёй маёмасцю мужа, а пасля шлюбу толькі тым, што ёй выдзеліў і перадаў у спадчыну муж (рэшта аддавалася дзецям, братам ці іншым блізкім родзічам); забаранялася браць у панцырных баяр падводы і коней, выкарыстоўваць іх на іншай службе, акрамя ваеннай; ім дазвалялася займацца рамёствамі, промысламі і гандлем на роўных з купцамі і мяшчанамі. [31]

**Путныя** баяры, путныя слугі, катэгорыя *сялян-слуг* у ВКЛ у XV – XVIII стст. Былі ў дзяржаўных, прыватных і царкоўных уладаннях. У XV – 1-й пал. XVI стст. павіннасці путных баяр у асноўным заключаліся ў нясенні ваеннай і кур'ерскай службы, выкананні талок падчас жніва і інш. У гэты час дзяржава раздавала путных баяр прыватным асобам, а стан путных баяр купляўся цяглымі людзьмі ("бояры вкупные"). (...) Па забяспечанасці зямлёй путныя баяры знаходзіліся ў лепшым становішчы ў параўнанні з іншымі катэгорыямі сялянства. У сацыяльным плане вылучаліся з асноўнай

масы сялянства (мелі свае абшчыны, часта выступалі асобна ад іншых сялян і інш.) і імкнуліся захаваць сваё становішча. [32]

**Служкі**, катэгорыя *сялян-слуг* у ВКЛ у дзяржаўных уладаннях, якія выконвалі кур’ерскія і інкасатарскія абавязкі: перавозілі лісты і суправаджалі да Вільні грошы, сабраныя як падаткі з насельніцтва ўладання. Камплектаваліся з путных баяр, іх колькасць вызначалася патрэбамі ўладання. У сярэдзіне XVI ст. службу выконвалі з 2 валок зямлі. У сярэдзіне XVII ст. з-за злоўжыванняў адміністрацыі ўладанняў, а таксама па просьбах саміх служак іх пераводзілі на чынш. У 2-й пал. XVII ст. служкі, якія працягвалі выконваць кур’ерскую службу, дадаткова абцяжарваліся выплатай чыншу і абавязкам транспартаваць сельскагаспадарчыя грузы. У XVIII ст. інстытут служак фактычна перастаў існаваць. Яны захаваліся толькі ў некаторых уладаннях (Берасцейская эканомія); у іншых іх функцыі выконвалі путныя баяры або ўся воласць. З XVII ст. назва “служкі” ўжывалася рэдка і замянялася назвай “путныя баяры”. У прыватных уладаннях абавязкі служак выконвалі ў асноўным путныя баяры і зямяне. Для баяр гэта была асноўная павіннасць, а для зямян – другасная, пасля абавязкаў ваеннай службы. [33]

**Цівуны-гуменнік**і – катэгорыя *сялян-слуг*, якія кіравалі вядзеннем панскай дваровай гаспадаркі. Яны адказвалі за зберажэнне і расход зерня, гадоўлю жывёлы пры двары і інш. Як прадстаўнік уласніка маёнтка, цівун прысутнічаў на судзе трымальніка ўладання, судзіў простых людзей, сачыў за працай сялян у маёнтку і інш. Цівуна прызначаў уласнік маёнтка ці яго прадстаўнік з сялян, чэлядзі дворнай, часам са шляхты. За выкананне абавязкаў цівуну даваўся вольны ад павіннасцей надзел зямлі або яго надзел вызваляўся ад іншых павіннасцей. [34]

**Асочнікі**, *сяляне-слугі* ў ВКЛ у XIV – XVIII стст., галоўным абавязкам якіх была ахова пушчаў вялікага князя ці буйных феадалаў, падрыхтоўка палявання і ўдзел у ім. Жылі ў асобных вёсках ці на хутарах каля пушчаў, вызваляліся ад паншчыны і грашовых падаткаў, удзельнічалі ў ваенных паходах. [35]

**Баброўнікі**, катэгорыя сялян-слуг у ВКЛ у XIV – XVIII стст. Асноўнай павіннасцю баброўнікаў быў догляд і ахова бабровых гонаў, паляванне на баброў. Акрамя асноўнай службы, баброўнікі маглі выконваць дадатковыя павіннасці: плаціць чынш, хадзіць на талокі, нарыхтоўваць сена, даваць дзякла. Комплекс павіннасцей залежаў ад велічыні бабровых гонаў,

традыцыі, волі пана. У XVI ст. за службу бяброўнікі атрымлівалі пятага здабытага бабра, або падчарэўе кожнага здабытага звера, або 1 – 3 грошы. (...)

Падпарадкоўваліся ***баброўнічаму***, службоўцу са шляхты. Часам баброўнікі аб'ядноўваліся ў асобныя абшчыны на чале са сваім старцам. З 2-й пал. XVI ст. колькасць баброўнікаў памяншаецца. Пры скасаванні баброўнічай службы баброўнікаў пераводзілі на выплату чыншу. [36]

**Стральцы,** катэгорыя *сялян-слуг* у ВКЛ у XV – XVIII стст. У дзяржаўных уладаннях іх асноўнай павіннасцю была арганізацыя і ўдзел у паляванні вялікага князя (егерская служба), акрамя таго, стральцы былі ваеннаабавязанымі. З сярэдзіны XVI ст. у той год, калі не выконвалі сваіх прамых абавязкаў, то плацілі *чынш*. (...) У прыватных і царкоўных уладаннях стральцы выконвалі ў асноўным толькі егерскую службу. Колькасць і памер зямельнага надзелу, з якога спаганялася такая павіннасць, залежалі ад велічыні маёнтка. У прыватных уладаннях стральцы захавалі на больш працяглы час вольныя ад выплат зямельныя надзелы ў параўнанні з дзяржаўнымі ўладаннямі. [37]

### 3.2.4. Асноўныя катэгорыі сялян паводле іх маёмасна-прававога становішча

**Людзі пахожыя**, людзі вольныя, феадальна залежныя сяляне ў ВКЛ у XV – 1-й пал. XVII ст., якія карысталіся правам вольнага пераходу ад аднаго феадала да другога і не былі прымацаваны да зямлі, як ***айчызныя людзі*** або ***чэлядзь нявольная***. Лічыліся асабіста вольнымі. Тэрмін "людзі пахожыя" або "людзі вольныя" часта ўжываецца ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. У актах XVI ст. людзі пахожыя называюцца таксама людзьмі прыбылымі, прыхожымі. У XV ст. людзі пахожыя складалі найбольшую групу сялянства. Пераходзячы да іншага землеўладальніка, людзі пахожыя павінны былі выплаціць грашовы эквівалент усіх павіннасцей, выканаць умовы выхаду і папярэдзіць пра гэта землеўладальніка. Людзі пахожыя маглі ўзяць з сабой сваю маёмасць. Феадал не меў права затрымліваць выхад людзей пахожых ці прысвойваць іх рухомыя рэчы ("дамовыя статкі"). Наяўнасць у XVI – 1-й пал. XVI стст. вялікай колькасці людзей пахожых тлумачыцца намаганнем буйных феадалаў схіляць вольных людзей да перасялення ў свае маенткі, каб папаўняць рабочую сілу. Гэты працэс быў найбольш пашыраны ў раёнах менш гаспадарча асвоеных. Дробныя феадалы, для якіх права пераходу сялян было нявыгадным, змагаліся за яго забарону. Колькасць людзей пахожых скарачалася па меры ўзмацнення палітычных правоў шляхты. У Статутах ВКЛ 1529 і 1566 гг. тэрмін даўнасці,

паводле якога пахожы селянін траціў права пераходу і станавіўся непахожым, не быў агавораны, хоць у Статуце ВКЛ 1529 г. прыводзіцца дзесяцігадовы тэрмін земскай даўнасці. Гэты артыкул Статута феадалы і дзяржаўны апарат выкарыстоўвалі, каб запрыгоніць людзей пахожых, што пражылі ў панскіх маёнтках больш за 10 гадоў. У асобных ваяводствах Беларусі ўсё часцей прымаліся агульныя для ваяводства пастановы, што рэгулявалі адносіны з людзьмі пахожымі, прадугледжвалі прыцягненне іх да ***паншчыны***. (..) Статут ВКЛ 1588 г. канстатаваў узмацненне працэсу запрыгоньвання людзей пахожых. Пахожы селянін мог пайсці ад феадала толькі адпрацаваўшы льготныя гады або заплаціўшы па 6 грошаў за льготны тыдзень. Калі ж пахожы селянін прабыў у пана 10 гадоў, то незалежна ад таго, атрымліваў ен ад шляхціца дапамогу ці не, ён пазбаўляўся права пераходу і разам з дзецьмі пераводзіўся на становішча ***отчыча***. Ен мог адкупіцца, аддаўшы пану 10 коп грошаў і заплаціўшы за атрыманую ад пана дапамогу. Але заплаціць такія грошы селянін фактычна не меў магчымасці. Збеглых людзй пахожых феадалы адшуквалі ўжо як отчычаў. [38]

**Людзі непахожыя**, феадальна залежныя сяляне ў ВКЛ, пазбаўленыя права на пераход ад аднаго феадала да другога. Юрыдычнае афармленне прыгоннага становішча людзей непахожых пачалося з ***прывілея 1447 г.*** Складалі асноўную катэгорыю сельскага насельніцтва. У залежнасці ад павіннасцей падзяляліся на цяглых, чыншавых і інш. У некаторых дакументах ВКЛ называліся ***отчычамі***. У XV ст. складалі ўжо значную частку сельскага насельніцтва, але яшчэ не большасць яго. Некаторыя дакументы XV ст. разглядаюць людзей непахожых як уласнасць феадальных маёнткаў. Яны з пакалення ў пакаленне жылі ў адной мясцовасці і выконвалі феадальныя павіннасці па спадчыне (адсюль з пач. XVI ст. пашырылася назва іх “отчычы”, “атчызныя людзі”). Дзяржаўная ўлада прызнавала за панамі права ўласнасці на людзей непахожых. Паводле ***прывілея 1447 г.***, забаранялася прымаць на велікакняжацкія (дзяржаўныя) землі такіх сялян, якія здаўна жылі ў адным месцы. ***Судзебнік 1468 г.*** строга забараняў выводзіць людзей непахожых з тых паселішчаў, дзе яны жылі. Так людзі непахожыя пазбаўляліся свабоды перамяшчэння з адной мясцовасці ў другую, ад аднаго феадала да другога. У XVI ст. феадалы розных ваяводстваў і паветаў пачалі заключаць паміж сабой дагаворы аб непрыняцці ў свае маёнткі людзей непахожых з іншага ваяводства і павета і вяртанні іх з сем’ямі назад свайму пану. Людзі непахожыя станавіліся ўласнасцю феадалаў, якія, замацаваўшы юрыдычна правы на іх, маглі прадаць, купіць, абмяняць, падараваць, закласці іх узамен узятай грашовай пазыкі. Але перадача

людзей непахожых адбывалася разам з іх зямельнымі надзеламі, бязвыезна. Гэта катэгорыя залежнага сялянства папаўнялася рознымі шляхамі, найперш за кошт неаплатных даўжнікоў, якія не маглі разлічыцца з панам. Яшчэ адной крыніцай папаўнення людзей непахожых было закладніцтва. Паступова ў XVI ст. феадалы пашыралі права дзесяцігадовай земскай даўнасці на ***людзей пахожых,*** якія, "засядзеўшы земскую даўнасць", пазбаўляліся права пераходу ў іншую мясцовасць. Так, катэгорыя людзей непахожых пашыралася за кошт скарачэння пахожых людзей. Калі паншчына стала асноўнай павіннасцю прыгоннага сялянства, людзі непахожыя ўсё часцей у дакументах называюцца "людзьмі цяглымі", "людзьмі прыгоннымі". [38]

**Чэлядзь нявольная**, у ВКЛ у XIV – XVI стст. найбольш бяспраўная катэгорыя залежнага і эксплуатуемага сельскага насельніцтва, якая звычайна не мела зямлі і іншых сродкаў вытворчасці, жыла ў дварах феадалаў, утрымлівалася імі і была іх поўнай уласнасцю. Сацыяльны статус чэлядзі нявольнай амаль цалкам адпавядаў статусу рабоў. Асноўнымі прычынамі няволі былі нараджэнне ад бацькоў-чэлядзі нявольнай, шлюбы вольных з нявольнымі, самапродаж у вечную няволю, некаторыя крымінальныя злачынствы і палон. Чэлядзь нявольная выконвала галоўным чынам разнастайныя сельскагаспадарчыя работы, рэдка – адміністрацыйна-гаспадарчыя абавязкі (цівуны, рыкунні). Пад уздзеяннем сацыяльна-эканамічных фактараў у XVI ст. чэлядзь нявольная паступова трансфармавалася ў прыгонных сялян. (...) Статут ВКЛ 1588 г. паскорыў гэты працэс: згодна з ім, захоўвалася толькі адна прычына няволі – палон, уся астатняя чэлядзь нявольная, у т. л. дзеці палонных, павінна была надзяляцца зямлёй і лічыцца ***отчычамі,*** г. зн. прыгоннымі сялянамі. (...) Працэс трансфармацыі чэлядзі нявольнай у прыгонных быў адным з асноўных шляхоў фарміравання класа прыгоннага сялянства Беларусі. [39]

**Закупы,** у ВКЛ у XIV – XVI стст. збяднелыя сяляне, якія пазычалі ў феадала грошы і за гэта закладвалі сваю асобу ў няволю да крэдытора на час, пакуль не адпрацуюць доўг у гаспадарцы пана або пакуль не вернуць яго. Закупамі станавіліся таксама злачынцы, што прыгаворваліся судом да штрафаў, але былі неплацёжаздольнымі і таму выдаваліся пацярпелым "галовой", "шеей", або "горлом" у часовую няволю "на выробок" (да адпрацоўкі доўгу-штрафу), і іншыя неплацёжаздольныя даўжнікі незалежна ад прычын паходжання доўгу. Закуп да разліку не меў права пайсці ад крэдытора. У выпадку адмовы працаваць, плаціць доўг або ўцёкаў закуп выдаваўся крэдытору да поўнага разліку. Пры гэтым сума доўгу, якая пагашалася працай

(“выпуст”), спачатку вызначалася дагаворам, а потым – Статутамі ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. З сярэдзіны XVI ст. з запрыгоньваннем асноўнай масы сялянства і істотным абмежаваннем яго правоздольнасці закупніцтва як форма часовай няволі паступовa знікла. [41]

**“Гарадскія” сяляне**, катэгорыя сельскага феадальна залежнага насельніцтва, прыпісанага да маёнткаў, што належалі гарадам; існавала ў XV – XIX стст. пераважна ў заходняй частцы Беларусі. Гарадское землеўладанне склалася ў XV – XVI стст. шляхам куплі магістратамі маёнткаў у прыватных асоб, што пацвярджалася прывілеямі вялікага князя ВКЛ. Такія правы атрымалі Берасце (1408 г.), Гародня (1502 і 1506 гг.) і інш. [42]

**Манастырскія сяляне**, сяляне, якія былі ўласнасцю пэўнага манаскага ордэна або манастыра. Звычайна жылі і працавалі на зямлі, якая належала манастыру. Былі часткай ***царкоўных сялян***. Манастырскія сяляне станавіліся ўласнасцю манастыроў пасля падараванняў апошнім з боку вялікіх князёў, магнатаў і шляхты зямельных надзелаў разам з сялянамі. З’явіліся на Беларусі, мабыць, у XII ст., разам з заснаваннем першых праваслаўных манастыроў. Колькасць манастырскіх сялян пачала рэзка павялічвацца з XV ст., калі на тэрыторыі ВКЛ пачало адкрывацца шмат каталіцкіх кляштараў, пачаўся рост манастырскіх уладанняў. Адзінай сістэмы падаткаабкладання ў манастырах не існавала. У пэўных выпадках манастыр дапамагаў сялянскім сем’ям умацаваць гаспадарку, але часам адбывалася рэзкае павелічэнне павіннаснага ўціску, каб выправіць цяжкае эканамічнае становішча манастыра або атрымаць прыбытак. У манастырах, дзе было ўведзена правіла складаць інвентары і ўставы, сяляне звычайна выконвалі толькі вызначаныя ў іх павіннасці. [43]

**Дзяржаўныя сяляне**, сельскае феадальна-залежнае насельніцтва, якое жыло на дзяржаўных землях у ВКЛ. Узнікла ў XIV ст. з асабіста вольных сялян-абшчыннікаў і ***чэлядзі нявольнай***, пасаджанай на зямлі вялікага князя. У склад дзяржаўных сялян уваходзілі таксама сяляне-слугі, асочнікі, бортнікі, конюхі і інш. Запрыгонены пры ажыццяўленні валочнай памеры. У XIV – XV стст. на Беларусі велікакняжацкія землі з дзяржаўнымі сялянамі шырока раздаваліся асобным феадалам і царкве. Адначасова ў вялікага князя канцэнтраваліся землі ў выніку ліквідацыі ўдзельных княстваў. У канцы XVI ст. зямельныя ўладанні вялікага князя (дамен) з дзяржаўнымі сялянамі падзелены на староствы і эканоміі. (...) Асноўнымі феадальнымі павіннасцямі дзяржаўных сялян у XV ст. былі натуральны і грашовы аброк, у XVI – 1-й пал. XVII стст. – паншчына. (...) [44]

### 3.2.5. Асноўныя этапы запрыгоньвання сялян[15]

**1) Прывілей Казіміра 1447 г.** перадаваў феадалам правы вотчыннага суда над сялянамі і абмежаваў абшчынныя правы. У дакуменце таксама зафіксаваны дагавор вялікага князя з феадаламі аб забароне прымаць у свае маёнткі збеглых сялян і аб вяртанні ўцекачоў да свайго пана.

**2) Судзебнік 1468 г.** прадугледжваў смяротнае пакаранне тым, хто садзейнічаў уцёкам чэлядзі нявольнай і феадальна залежных сялян.

**3) Статут ВКЛ 1529 г.** замацаваў права ўласнасці на зямлю за феадальным саслоўем; сяляне страцілі права распараджацца зямлёй без згоды феадалаў.

**4) “Устава на валокі” 1557 г.** фактычна замацавала сялян, “прыняўшых валокі”, за гэтымі надзеламі.

**5) Статут ВКЛ 1566 г.** увёў дзесяцігадовы тэрмін вышуку збеглых ці ўкрадзеных сялян і прадугледжваў пакаранне таму, хто садзейнічаў уцёкам сялян.

**6) Статут ВКЛ 1588 г.** павялічыў тэрмін вышуку да 20 год; таксама ў разрад “непахожых” залічваліся тыя сяляне, што пражылі на землях феадалаў больш за 10 год.

### 3.2.6. Сістэма тэрытарыяльна-адміністрацыйнай і сацыяльнай арганізацыі сялянства

**Воласць**, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка на Русі і ў ВКЛ, населеная ***сялянамі-даннікамі***, якія ўтваралі тэрытарыяльную абшчыну. Воласць звычайна ахоплівала 10 – 30 і больш сельскіх паселішчаў і складалася з тэрыторый сельскіх абшчын (у крыніцах ВКЛ іх звычайна называюць **сёламі**). Акрамя земляў сельскіх абшчын, пэўныя тэрыторыі (сенажаці, бабровыя гоны, лясы) звычайна знаходзіліся ў карыстанні ўсёй воласці. Яна мела двайную сістэму кіравання. З сялян для кіравання выбіраўся ***соцкі*** (у XV – XVI стст. – ***старац***). Ён выступаў пасрэднікам паміж воласцю і ўладай, пры дапамозе ***дзесяцкіх*** размяркоўваў павіннасці, збіраў падаткі. Інтарэсы дзяржавы прадстаўляў намеснік (***цівун***) з баяр (шляхты). Ён знаходзіўся ў валасным цэнтры (у час Кіеўскай Русі такім цэнтрам быў горад ці пагост, у ВКЛ – горад ці замак) і не меў права вольна ездзіць па воласці з мэтай збору падаткаў. У абавязкі намесніка ўваходзілі прыём падаткаў ад старца, перасылка іх уладальніку воласці, суд па справах, якія не падлягалі кампетэнцыі абшчыннага ***копнага суда***, а таксама арганізацыя будаўніцтва і рамонту замка сіламі насельнікаў воласці. З канца XIV ст. на

[15] Тэксты дакументаў гл. ў частцы 2, с 27 – 36.

заходніх землях ВКЛ (у сучаснай Літве, апрача Жамойці, Верхнім Панямонні, на Меншчыне, Берасцейшчыне) пачалося разбурэнне валасці. Асобныя сёлы са складу валасці перадаваліся ў вотчыну шляхце, там узнікалі феадальныя двары, сяляне-даннікі ператварыліся ў ***цяглых сялян***. Да сярэдзіны XVI ст. амаль некранутыя шляхецкім землеўладаннем валасці захаваліся толькі на ўсходзе Беларусі, на землях, якія ў той час яшчэ называліся "Русь" (таму часам вялікакняжацкія валасці Падняпроўя ў дакументах называліся "рускімі валасцямі"). [45]

**Вёска**, невялікае паселішча, жыхары якога займаліся пераважна сельскай гаспадаркай; асноўны тып паселішча ў ВКЛ. У функцыянальных адносінах вёска супрацьпастаўлялася ***мястэчку***, якое было месцам правядзення лакальнага гандлю і мела большую колькасць рамеснікаў, і ***гораду*** – значнаму населенаму пункту з развітым рамяством і гандлем. Асноўным тэрмінам, які абазначаў вёску ў ВКЛ, было слова "сяло", зрэдку ўжываўся тэрмін "весь". Невялікае сяло называлася "сяльцо", "прыселак". У значэнні "населены пункт" маглі ўжывацца тэрміны "пагост", "след", "служба", "дворышча", "зямля", "селішча". (...) Вёскі, якія ўзнікалі на новааселеных землях і насельніцтва якіх было часова вызвалена ад павіннасцей, атрымлівалі назву "воля", "волька", "слабада".

У XIV – XVI стст. пераважалі невялікія, не болей за 20 двароў, вёскі. Некаторыя з іх мелі па 1 – 3 двары. У асобных месцах існавалі вялікія вёскі, напрыклад, у 1560 г. у Магілёўскай валасці былі вёскі па 100 і болей двароў. Аднак часта бывала, што буйную вёску складалі раскіданыя на многія кіламетры асобныя двары і гнёзды двароў, якія, па сутнасці, былі самастойнымі вёскамі. Гаспадарчым асваеннем да XVI ст. былі ўжо ахоплены не толькі даліны рэк, але і водападзелы, дзе ўзнікалі малыя вёскі. [46]

**Грамада**, абшчына ў ВКЛ, устойлівая форма сацыяльнай арганізацыі, якая характарызуецца пэўнай ступенню калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, асаблівасцямі працэсу вытворчасці і сацыяльна-грамадскага жыцця. Узнікла як арганізацыя крэўных родзічаў (родавая, сямейная абшчына) у першабытна-абшчынную эпоху. Паступова трансфармавалася ў суседскую (тэрытарыяльную) абшчыну, дзе кожная сям'я атрымлівала права карыстацца асобным зямельным надзелам, але напачатку не мела магчымасці распараджацца ім. У ВКЛ грамада звычайна аб'ядноўвала насельніцтва асобнай вёскі. Некалькі грамад звычайна ўваходзілі ў склад больш шырокай арганізацыі – ***валасці***. У шэрагу рэгіёнаў, асабліва ў гаспадарскіх (вялікакняжацкіх) уладаннях на ўсходзе Беларусі грамада адыгрывала значную ролю ў арганізацыі сялянскага землекарыстання і выплаты феадаль-

най рэнты. Сяляне гаспадарскіх падняпроўскіх і падзвінскіх валасцей самастойна збіралі даніну, якая накладвалася на воласць цалкам, і здавалі яе ў велікакняжацкі скарб. У 1-й пал. XVI ст. грамада, як правіла, не праводзіла перадзелаў зямлі. (...) Лясы, выганы, пусткі і інш. заставаліся ў агульным карыстанні. На чале грамады стаяў ***старац***, які кіраваў раскладам даніны па асобных гаспадарках, яму дапамагалі ***дзесяцкія***. Кіраўнікі грамады выбіраліся яе членамі, але зацвярджаліся вярхоўным уласнікам зямлі. З пач. XVI ст. члены грамады (“мужы”, “валашчане”) за захаванне за імі права выбару старца абавязаны былі плаціць феадалу-ўласніку г. зв. “старчэнне”. У некаторыя воласці поруч са старцамі прызначаліся і велікакняжацкія *намеснікі*, да сярэдзіны XVI ст. яны былі ўжо амаль ва ўсіх гаспадарскіх валасцях. У сувязі з тым, што грамада перашкаджала феадалам павялічваць павіннасці, яны імкнуліся прынізіць яе ролю. Таму ў некаторых месцах службовых асоб грамады выбіралі не сяляне, а прызначала феадальная адміністрацыя, што вяло да ператварэння іх з абаронцаў сялян у выканаўцаў волі пана. Грамаду паступова адлучалі ад раскладкі і збору даніны. (...) Сяляне змагаліся за свае правы і працягвалі выбіраць старцаў, гандлявалі ў сваіх сёлах з праезджымі купцамі. Адстойвалі яны і спрадвечнае права грамады збіраць з праезджых гандляроў на сваю карысць пошліну – “мыта вадзяное”. Калі феадалам нават удавалася абмежаваць самастойнасць грамады, яна па традыцыі працягвала рэгуляваць парадак карыстання абшчыннымі ўгоддзямі, выплату падаткаў, чыніла ***копны суд***. [46]

**Старац**, выбарная асоба валаснога самакіравання на тэрыторыі Беларусі да 2-й пал. XVI ст. Існавалі старцы ўсёй ***воласці*** – пасрэднікі паміж яе насельніцтвам і феадальным уласнікам або яго прадстаўніком і старцы асобных вёсак. Старцы разам з ***грамадой*** раскладалі павіннасці на канкрэтных выканаўцаў і сачылі за іх выкананнем, збіралі і адвозілі гаспадару ўладання ***даніну*** (грашовую, мядовую, бабровую, кунічную і г. д.), падтрымлівалі парадак, сачылі за станам дарог, мастоў і інш. Старцы выбіраліся на агульных сходах вёскі, воласці і за выкананне сваіх абавязкаў вызваляліся ад павіннасцей, акрамя мядовай даніны. Удзельнічалі ў ***копных судах***, судзілі межавыя і бортныя справы паміж сялянамі. У спрэчках з трымальнікамі ўладання выступалі як абаронцы грамады. У выніку змен сістэмы гаспадарання ў XVI – пач. XVII стст. старцы замяняліся ***войтамі***. [48]

**Служба**, сялянскі зямельны ўчастак у ВКЛ да аграрнай рэформы Жыгімонта ІІ Аўгуста і правядзення валочнай памеры ў 1557 г. Адна з адзінак абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі (побач з ***дварышчамі***). У XVI ст. захоўвалася як перажытак даўняй тэрытарыяльнай ***грамады***,

аднак была меншая за дварышча. Звычайна служба знаходзілася ва ўладанні і карыстанні 2 і болей двароў. М. В. Доўнар-Запольскі лічыў, што ў службу ўваходзілі 3 – 4 дымы (двары). [49]

**Дварышча**, гаспадарчая адзінка і аб'ект абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі на паўднёвым захадзе Беларусі ў XIV – XVI стст. (у асноўным у Пінскім павеце). Фактычна з'яўляліся мясцовым адпаведнікам пашыранай на астатняй тэрыторыі Беларусі павіннаснай адзінкі і аб'екта землекарыстання – ***службы***. Відаць, першапачатковыя дварышчы мелі прыблізна аднолькавую колькасць зямлі, на якой размяшчалася адна сялянская гаспадарка – ***дым***, таму і сталі аднастайнай, хоць і мясцовай адзінкай абкладання. З цягам часу ў дварышчы павялічвалася колькасць насельніцтва і зямлі, якую яно апрацоўвала. У сярэдзіне XVI ст. у час правядзення валочнай памеры дварышчы на Піншчыне былі захаваны, толькі зямля вымяралася валокамі або больш дробнымі адзінкамі – *маргамі* і *прутамі*, павіннасці і платы прызначаліся з колькасці вымеранай зямлі. (...) Тэрыторыя дварышча была акрэслена пэўнымі межамі, звычайна мела сваю назву, якая не мянялася з прыходам новага гаспадара. Акрамя ворнай зямлі, у склад дварышча ўваходзілі сенажаці, выганы, бортныя і лясныя ўгоддзі, якімі члены дварышча карысталіся супольна. Кожнае дварышча мела сядзібу ці некалькі, дзе сяляне "сядзелі дварамі сваімі". У сядзібу ўваходзілі жылыя будынкі, гаспадарчыя пабудовы і прысядзібныя агароды. [50]

**Дым,** сялянская гаспадарка ў ВКЛ у XIV – XVIII стст. Гэта быў гаспадарчы комплекс малой, іншы раз вялікай (якая не падзялілася), сям'і, складаўся з хаты, гаспадарчых будынкаў, розных сельскагаспадарчых угоддзяў, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, гаспадарчага інвентару. Ступень забяспечанасці розных дымоў рабочай сілай і асноўнымі сродкамі вытворчасці не была аднолькавай, аднак, як правіла, дастатковай для нармальнага функцыяніравання сялянскай гаспадаркі. З'яўляўся адным з асноўных аб'ектаў права ўласнасці феадалаў на зямлю, а таму і адным з асноўных аб'ектаў уліку іх маёмасці. Поруч са службай, дворышчам, жэрабем і валокай служыў таксама адной з асноўных адзінак абкладання дзяржаўнымі падаткамі і феадальнымі павіннасцямі. [51]

### 3.2.7. Развіццё гарадоў

**Горад**, значны населены пункт, які выконвае функцыі эканамічнага (рамеснага, гандлёвага, фінансавага), палітыка-адміністрацыйнага, рэлігійнага, культурнага, ваенна-адміністрацыйнага цэнтра. На Беларусі першыя гарады ўзніклі ў IX – XIII стст. і ўяўлялі сабой агароджанае (адсюль назва

“горад”) умацаванае паселішча. Ва ўсходнеславянскіх летапісах і іншых крыніцах IX – XIII стст. на тэрыторыі Беларусі названа 35 гарадоў, што дакладна ідэнтыфікаваны і даследаваны археалагічна. Умацаваным цэнтрам горада быў дзядзінец – месца сховішча насельніцтва ў час ваенных дзеянняў. У буйных гарадах там былі рэзідэнцыі (двары) князя або яго намесніка, епіскапа, свецкіх і царкоўныхураднікаў і залежнага ад іх насельніцтва. Каля дзядзінца размяшчаўся пасад (места), насельніцтва якога спецыялізавалася на рамесна-гандлёвай дзейнасці. Звычайна на пасадзе каля ўвахода на дзядзінец размяшчалася гандлёвая плошча – торг. У буйных гарадах пасад абводзіўся дрэва-землянымі ўмацаваннямі іператвараўся ў вакольны горад. У 2-й пал. XIII – XV стст. гарады Беларусі перажывалі заняпад. Рэзка зменшылася іх насельніцтва, некаторыя страцілі палітычнае і эканамічнае значэнне або зніклі зусім. (...)

Горадабудаўнічыя працэсы, якія суправаджаліся канцэнтрацыяй рамяства і гандлю, прывялі да ўтварэння ў ВКЛ у XV – XVI стст. вялікай колькасці малых гарадоў – ***мястэчак***. У крыніцах XVI – XVIII стст. Тэрміны *горад* (*места*) і *мястэчка* ўзаемазамяняльныя ў дачыненні да малых і сярэдніх гарадоў. Навукоўцы ў якасці крытэрыя адрознення мястэчка ад горада прапануюць улічваць большую сувязь местачкоўцаў з сельскагаспадарчымі заняткамі і статыстычны крытэрый. Прапануецца лічыць мястэчкамі населеныя пункты гарадскога тыпу, якія маюць менш за 300 дымоў (З. Ю. Капыскі, А. М. Карпачоў, А. П. Грыцкевіч), менш за 200 – 250 дымоў (С. Александровіч) або менш як 100 – 150 дымоў (Е. Ахманскі). Згодна з класіфікацыяй Капыскага, малыя гарады налічвалі больш за 300 дымоў, сярэднія – больш за 500 дымоў і вялікія – больш за 1000 дымоў. (...)

Паводле юрыдычнага статусу большасць гарадоў былі дзяржаўнымі. Некаторыя гарады ў выніку падаравання вялікімі князямі перайшлі ва ўладанне магнатаў (Клецк, Давыд-Гарадок, Слуцк, Капыль і інш.). Некаторыя прыватнаўладальніцкія гарады ўзніклі дзякуючы намаганням магнатаў пры садзейнічанні дзяржаўнай улады (Біржы, Нясвіж і інш.). Да XVI ст. гарады ВКЛ захоўвалі цесную адміністрацыйную і эканамічную сувязь з навакольнай сельскагаспадарчай тэрыторыяй і ўтваралі з ёй адзіную зямлю (воласць). Гарады былі непарыўна звязаны з валасцямі як адміністрацыйны, гаспадарчы і ваенны цэнтр. Гараджане валодалі значнай колькасцю сельскагаспадарчых земляў і неслі дзяржаўную ваенную павіннасць. Істотную ролю ігрconsiderable самакіраванне гарадоў, якое ажыццяўлялася праз веча і абранне мясцовай адміністрацыі. Узмацненне ў XIV – XV стст. цэнтральнай дзяржаўнай адміністрацыі і шляхты прывяло да абмежавання паўнамоцтваў гарадской адміністрацыі, павелічэння ролі мясцовага дзяржаўнага апарату (намеснікі,

дзяржаўцы, старасты), аслабла сувязь гарадоў з іх сельскагаспадарчай акругай. З канца XIV ст. гарадскія абшчыны ВКЛ атрымлівалі права на самакіраванне на ўзор нямецкіх і польскіх гарадоў – ***магдэбургскае права*** (Вільня ў 1387 г., Берасце ў 1390 г.). Пры гэтым новыя нормы гарадскога права спалучаліся з традыцыйнымі, на аснове іх сінтэзу ў некаторых гарадах узнікалі мясцовыя кодэксы гарадскога права – вількеры. [52]

**Прыватнаўладальніцкія (прыватнаўласніцкія) гарады**, гарады ў ВКЛ у XV – XVIII стст., якія ўваходзілі ў склад магнацкіх латыфундый як асяродкі эканамічнага жыцця, адміністрацыйныя і вайсковыя цэнтры. Найбольш значныя прыватнаўладальніцкія гарады: Горкі, Давыд-Гарадок, Друя (Сапежын), Дуброўна, Капыль, Кейданы, Клецк, Копысь, Мір, Нясвіж, Ружаны, Слуцк, Стары Быхаў, Шклоў; менш значнымі былі гарады і мястэчкі Глыбокае, Горы, Докшыцы, Заслаўе, Зэльва, Койданаў, Лагойск, Любча, Ляхавічы, Маладзечна, Новы Быхаў, Петрыкаў, Смаргонь і інш. У XVI – XVIII стст. складалі больш за 40 % ад усіх гарадоў Беларусі. Большая частка іх належала Радзівілам, Сапегам, Чартарыйскім, Хадкевічам і іншым магнатам. Прыватнаўласніцкія гарады знаходзіліся на магнацкай зямлі, якая перадавалася ім “у вечнасць”, таму за гарадскія пляцы, валокі (палявыя надзелы), агароды, сенажаці і выганы мяшчане плацілі чынш уладальніку горада. Насельніцтва прыватнаўласніцкага горада лічылася вольным, але знаходзілася ў юрыдычным падпарадкаванні магнату. Акрамя гродскага суда, які судзіў мяшчан паводле норм магдэбургскага права, у прыватнаўласніцкіх гарадах існаваў як вышэйшая інстанцыя і замкавы суд уладальніка горада. Мяшчане і іншыя жыхары горада, у т. л. яўрэі, выконвалі павіннасці на карысць уладальніка горада і плацілі ў яго скарб розныя грашовыя зборы (у дадатак да дзяржаўных павіннасцей і падаткаў). Сярод іх чынш з крам і свірнаў, маставое (за карыстанне мастамі ў гарадах), падаткі з рамесных цэхаў, грошы на ўтрыманне гарнізонаў магнацкага войска і інш. Натуральнымі і адпрацовачнымі павіннасцямі былі аброкі з суконшчыкаў і шаўцоў, работы па ўмацаванні гарадскіх валоў, аховы горада ноччу, прыём на пастой вайскоўцаў, гвалты (3 дні) па збору ўраджаю ў панскім маёнтку для мяшчан у малых гарадах і г. д. Важнай павіннасцю быў удзел гараджан у гарадскім апалчэнні (міліцыі) пры абароне горада ад непрыяцеля. Такім чынам, гараджане былі падпарадкаваны магнату і эканамічна. Большасць прыватнаўласніцкіх гарадоў мела самакіраванне паводле магдэбургскага права, іх магістрат выбіраўся, але войта прызначаў уладальнік горада. Нормы магдэбургскага права ўводзіліся магнатам, каб заахвоціць гараджан да занятку рамёствамі і гандлем, што давала дадатковы

прыбытак магнацкаму скарбу, і каб зацікавіць перасяленцаў з іншых гарадоў. Увядзенне поўнага магдэбургскага права належала каралю як кіраўніку дзяржавы, да якога з адпаведнай прапановай звярталіся магнаты. У сістэме гарадскога самакіравання ўдзельнічалі рамесныя і купецкія цэхі і царкоўныя брацтвы, кіраўнікі якіх былі ў складзе магістрата. Магістраты падпарадкоўваліся магнацкай адміністрацыі (намесніку, старасту, губернатару, камісару). (...) [53]

**Мястэчка** (ад агульнаслав. “места” – горад), у ВКЛ у XV – XVIII стст. драбнейшы населены пункт гарадскога тыпу, малы горад, эканамічны ўплыў якога абмяжоўваўся невялікімі сельскагаспадарчымі раёнамі – дробнымі вотчынамі, валасцямі, староствамі, якія не мелі, як правіла, іншых гарадскіх пасяленняў і адміністрацыйным цэнтрам якіх ён звычайна з’яўляўся.

Мястэчкі ўзніклі ў XV ст. з распаўсюджаннем таварна-грашовых адносін для стварэння шчыльнай сеткі таргоў і максімальнага ўцягвання ў рыначны зварот сельскага насельніцтва. Яны размяшчаліся побач з замкамі, неўмацаванымі дварамі, ужо існуючымі гарадамі (але не бліжэй чым за 3 мілі ад іх), на “сырым корані” (на новым месцы), на важнейшых камунікацыйных шляхах, каля асяродкаў рэлігійнага культу, на скрыжаваннях дарог, па берагах рэк, азёр, водападзелах і г. д., што ўплывала на іх планіроўку. Найбольш простыя мястэчкі складаліся з адной вуліцы, частка якой часам адводзілася пад рынак, альбо толькі з рынку, трох- ці чатырохвугольнага. У буйнейшых мястэчках існавала рыначна-вулічная структура, прычым некаторыя вуліцы непасрэдна не былі звязаны з рынкам. Мястэчкі маглі мець пасады, прадмесці ці падзяляцца на Старое і Новае Места. Забудова мела рэгулярны пляцавы характар. Для большасці мястэчак была характэрна адсутнасць гарадскіх умацаванняў. Насельніцтва мястэчак папаўнялася за кошт жыхароў вёсак,ператвораных у мястэчкі, уцекачоў і перасяленцаў з іншых маёнткаў і гарадоў, іншаземцаў. Да 1588 г. на заснаванне новага прыватнага мястэчка патрабаваўся дазвол вялікага князя. Статут ВКЛ 1588 г. зняў усе абмежаванні на закладанне феадаламі новых мястэчак, але фарміраванне іх сеткі да гэтага часу было ўжо ў асноўным завершана. Найбольшая канцэнтрацыя мястэчак назіралася ў басейне Нёмана і яго прытокаў, меншая – у Падзвінні і Пабужжы. Мястэчкі можна лічыць першапачатковай стадыяй росту гарадоў, аднак большасць з іх засталіся дробнымі пасяленнямі. Іх узбуйненню перашкаджала канкурэнцыя з боку гарадоў і іншых мястэчак, а таксама запатрабаванасць функцыі па абслугоўванні лакальных рынкаў. [54]

### 3.2.8. Магдэбургскае права

**Магдэбургскае права**, гарадское права, якім кіраваліся гарады ВКЛ. Вызначала арганізацыю і прынцыпы дзейнасці гарадскога самакіравання. Паходзіць ад збору правоў г. Магдэбург XIII ст. Дзейнічала ў гарадах Усходняй Германіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. На тэрыторыі Польшчы магдэбургскае права актыўна ўводзіў кароль Казімір III Вялікі. Пад уплывам Польшчы пачало распаўсюджвацца ў ВКЛ. Тым не менш гэта быў самастойны працэс, і магдэбургскае права ВКЛ адрознівалася ад гарадскога права ў Магдэбургу і Польшчы. На арганізацыю гарадскога самакіравання паводле магдэбургскага права ўплывалі канкрэтныя ўмовы, што існавалі ва ўсім ВКЛ і ў кожным з гарадоў у прыватнасці. Пры развіцці сеткі гарадоў з магдэбургскім правам існавалі гарады-ўзоры як прыклады арганізацыі сістэмы ўлады і справаводства. Для ВКЛ у канцы XIV – 1-й пал. XVI стст. такімі гарадамі былі Кракаў і Вільня, а з 2-й пал. XVI ст. – толькі Вільня. (...) Магдэбургскае права называлася таксама “майдэборскім”, “нямецкім”, “інфлянцкім”, “тэўтонскім”. У ВКЛ існавалі і разнавіднасці магдэбургскага права – хэлмскае права і сродскае права. (...)

У ВКЛ магдэбургскае права надавалася гарадскому паселішчу прывілеем вялікага князя літоўскага (пасля 1569 г. – караля польскага і вялікага князя літоўскага), у прыватных гарадах – прывілеем уладальніка ці па яго хадатайніцтве – вялікім князем. Магдэбургскае права надавалася як заахвочванне для лепшага парадку і развіцця горада і ўзнагарода мяшчанам за іх заслугі. Першы прывілей на магдэбургскае права атрымала Вільня 22.03.1387 г. (...)

Магдэбургскае права афармляла горад як самастойную адміністрацыйную адзінку са сваімі атрыбутамі – тэрыторыяй, грамадзянствам, інстытутамі ўлады і суда, гербам, падатковай сітэмай і г. д. З увядзеннем магдэбургскага права мяшчане вызваляліся з-пад улады ваявод, стараст, дзяржаўцаў, уся ўлада ў горадзе пераходзіла да органаў гарадскога самакіравання. На тэрыторыі горада адмянялася дзейнасць мясцовага права, замест якога ўводзіліся нормы магдэбургскага права. Але пры гэтым не адмаўлялася правамернасць карыстання мясцовымі звычаямі, нормамі права, калі яны не супярэчылі магдэбургскаму праву. На карысць горада ішлі прыбыткі ад крам, ятак,васкабойняў, гасціных двароў, лазняў, важняў і інш. Мяшчане гарадоў з магдэбургскім правам атрымлівалі эканамічныя льготы, вызваляліся ў межах свайго горада ад сплачвання гандлёвых падаткаў, мернага і інш. У межах горада з магдэбургскім правам маглі знаходзіцца дзяржаўныя, прыватныя і царкоўныя (касцельныя) землі, якія не падпадалі

пад гарадскую ўладу – ***юрыдыкі***. Гарады вялі пастаянную барацьбу за пераход пад іх юрысдыкцыю тэрыторый і жыхароў юрыдык.

У аснове сістэмы самакіравання на аснове магдэбургскага права стаяла гарадская абшчына, якая была калектыўным суб’ектам права. Яна вырашала найбольш важныя пытанні гарадскога жыцця: прымала рашэнні, якія датычыліся ўсіх мяшчан, горада ў цэлым, кантралявала дзейнасць органаў гарадскога кіравання. На чале сістэмы магдэбургскага самакіравання стаяў ***войт***, а падчас яго адсутнасці ў горадзе – яго намеснік ***лантвойт***. Непасрэднае кіраванне гарадскімі справамі знаходзілася ў руках ***бурмістраў***, ***радцаў*** і ***лаўнікаў***, якія складалі ***магістрат***. У Вільні, Берасці, Гародні, Дарагічыне, Навагародку, Полацку і некаторых іншых гарадах магістраты падзяляліся на праваслаўную (потым уніяцкую) і каталіцкую палавіну. Бурмістры і радцы стваралі ***раду*** горада, а лаўнікі – гарадскую ***лаву***. На пасяджэннях магістрата і асабліва рады, якія праходзілі ў ***ратушы***, маглі прысутнічаць ***цэхмістры***. Абшчына штогод выбірала бурмістраў, радцаў і лаўнікаў, у некаторых гарадах мяшчане выбіралі войта і лантвойта. Права выбіраць войта паводле прывілеяў вялікіх князёў мелі Камянец (1503 г.), Высокае (1527 г.), Кобрын, Гарадзец, Пружаны (усе 1589 г.), Пінск (1633 г.), Лагішын (1669 г.), Мазыр (1621 г.) і інш. Пры ўступленні ў пасаду ўсе прадстаўнікі гарадскога самакіравання прыносілі прысягу гораду. Дзейнасць магістрата ахоплівала ўсе бакі жыццядзейнасці. Ён выконваў прадстаўнічую, адміністрацыйную, фіскальную, распарадчую, судовую, натарыяльную і іншыя функцыі. Органы самакіравання адказвалі за добраўпарадкаванне тэрыторыі горада, збіралі і размяркоўвалі гарадскія падаткі, распараджаліся гарадской маёмасцю, абаранялі інтарэсы горада і яго грамадзян, вызначалі парадак гандлю, дзейнасці рамесных і гандлёвых аб’яднанняў (брацтваў, цэхаў), адказвалі за абарону горада і інш. [55]

**Наданне некаторым гарадам ВКЛ магдэбургскага права (на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Берасце** | 1390 | **Дзісна** | 1569 |
| **Гародня** | 1496 | **Магілёў** | 1577 |
| **Полацк** | 1498 | **Нясвіж** | 1586 |
| **Менск** | 1499 | **Ліда** | 1590 |
| **Ваўкавыск** | да 1506 | **Віцебск** | 1597, 1641 |
| **Навагародак** | 1511 | **Друя** | 1618 |
| **Слонім** | 1531 | **Орша** | 1620 |

**Магістрат** (ад лац. *magistratus* – начальнік, чыноўнік, улада, кіраўнік), выбарны адміністрацыйны і судовы орган гарадскога самакіравання ў гарадах, якія мелі права на самакіраванне (***магдэбургскае права*** або інш.). У ВКЛ уводзіліся з канца XIV – XV стст. У велікакняжацкіх гарадах Беларусі і Літвы магістрат складаўся з гарадской ***рады*** і ***лавы.*** Рада займалася справамі гарадскога кіравання і суда па маёмасных і цывільных справах мяшчан. Лава выконвала функцыі суда па крымінальмых справах гараджан. Парадак утварэння і кампетэнцыя гарадскіх органаў самакіравання ўстанаўліваліся ў прывілеі на магдэбургскае права. Замест ранейшых улады і суда старасты (намесніка вялікага князя) ўлада і суд у гарадах пераходзілі да ***войта***, ***лаўнікаў***, ***бурмістраў і радцаў*** (райцаў). Найбольш ранняй пасадай у сістэме самакіравання быў войт. Ён выконваў галоўную распарадчую ўладу ў гарадской абшчыне і ўзначальваў ***войтаўскі суд*** або ***войтаўска-лаўніцкі суд*** (лаву). Галоўным органам самакіравання была гарадская рада, якая складалася з бурмістраў і радцаў. Бурмістры па чарзе вялі пасяджэнне рады, радцы выказваліся па розных пытаннях і разам з бурмістрамі прымалі рашэнні. Дзейнічаў ***бурмістраўска-радзецкі суд***. У прыватнаўладальніцкіх гарадах у склад магістрата ўваходзілі войт, бурмістры, радцы, лаўнікі і гарадскі. пісар, якія ўсе засядалі разам, хоць паводле норм магдэбургскага права лаўнікі з войтам складалі асобную калегію і ў склад рады не ўваходзілі. Цвёрда вызначанай колькасці членаў рады не было, звычайна яна набліжалася да 12 (гэта лічба лічылася класічным узорам). [56]

**Ратуша** (польск. ratusz ад ням. Rathaus), будынак, у якім размяшчаліся органы гарадскога самакіравання (*рада*, *магістрат)* у шэрагу еўрапейскіх краін., у т. л. у ВКЛ. З’явіліся ў XII ст. Будавалі іх звычайна на галоўнай (рыначнай) плошчы ці на набярэжнай, у большасці яны завяршаліся шмат’яруснай вежай (з гадзіннікам, звонам, назіральнымі пляцоўкамі) – сімвалам самастойнасці і палітычнай вольнасці горада. Галоўным памяшканнем ратушы была парадная зала для ўрачыстых актаў, пасяджэнняў магістрата, тэатральных паказаў і інш. (...) На Беларусі ратушы пачалі будаваць з увядзеннем гарадскога самакіравання на аснове ***магдэбургскага права.*** Іх ставілі ў гарадах пераважна на рыначных плошчах. У ратушы размяшчаліся канцылярыя самакіравання, гарадскі скарб, архіў з кнігамі адміністрацыйных прадпісанняў рады і яе судовых рашэнняў, граматы з прывілеямі, выдадзенымі гораду. У ратушы праводзіліся і пасяджэнні судоў. Ратушны суд быў у Полацку, Магілёве, Пінску, Менску, Кобрыне і інш. Часам ратушы будавалі разам з крамамі, аўстэрыямі, гасцінымі дварамі; частку памяшканняў (падвалы, першыя паверхі) адводзілі пад хлеб-

ныя крамы, склады тавараў прыезджых купцоў, памяшканні для апрацоўкі сукнаў; у іх захоўвалі гарадскія вагі і бочкі, якімі мералі збожжа (“бочка мерная”). Часам да ратушы прыбудоўвалі арсенал (Магілёў). На Беларусі ратушы былі розныя па памерах і планіроўцы, звычайна простыя, дакладныя і манументальныя па формах. Пераважаў вежавы тып ратушы з шмат’-яруснай вежай, завершанай разнастайнымі купалкамі ці шпілем. У бязвежавых ратушах вертыкальнасць кампазіцыі падкрэслівалася рытмам калон і порцікаў. Найбольш вядомыя Віленская ратуша, Ковенская ратуша, Менская ратуша, Магілёўская ратуша, Нясвіжская ратуша. [57]

**Бурмістр** (ад ням. Bürgermeister), выбарная асоба ў ***магістрат*** гарадоў з магдэбургскім правам, якая ўзначальвала гарадскую ***раду***. У абавязак ***бурмістра*** ўваходзіла загадванне гарадскім скарбам, старшынства на пасяджэннях ***бурмістраўска-радзецкага суда***, які разбіраў маёмасныя спрэчкі гараджан. ***Войт*** і прызначаныя ім выбаршчыкі (12 – 20 чал.) выбіралі на пасаду бурмістра гараджан з заможных вярхоў гарадскога насельніцтва – купцоў, цэхмістраў. (...) Бурмістра выбіралі тэрмінам на 1 год, пасля сканчэння якога ён рабіў справаздачу перад радай. З цягам часу ўстанавіўся прынцып справаздачы бурмістра на агульным сходзе гараджан. [58]

**Лаўнік,** член ***магістрата*** ў гарадах ВКЛ, якія мелі магдэбургскае права. Выбіраліся гарадской абшчынай (грамадой), радай ці прызначаліся ***войтам*** з мяшчан гэтага горада. Разам з войтам складалі ***войтаўска-лаўніцкі суд***, які разглядаў крымінальныя справы гараджан. Паколькі нормы самакіравання ў гарадах паводле магдэбургскага права адрозніваліся, судовыя функцыі часта выконваў увесь магістрат, а не толькі лаўнік. У гарадах, што не мелі магдэбургскага права, разам з войтамі былі і лаўнікі, хоць магістрата (рады) не было. Так, у Клецку (належаў Радзівілам) у 1575 г. былі 3 лаўнікі, якія за выкананне сваіх абавязкаў атрымлівалі вольныя ад падаткаў участкі зямлі ў горадзе. [59]

**Радца,** райца, член адміністрацыйнага органа гарадскога самакіравання (*рады, магістрата*) у ВКЛ у XIV – XVIII стст., выбраны або прызначаны ад багатых гараджан. У раду ўваходзілі 6 – 24 радцы. Напрыклад, у Полацку спачатку было 20 радцаў, з 1511 г. – 24, у Менску – 12, у Навагародку – 6. Са свайго складу радцы выбіралі ***бурмістраў***, былі іх дарадчыкамі. Выбіраліся на год, у прыватнаўласніцкіх гарадах пажыццёва; вызваляліся ад гарадскіх падаткаў. У сваёй дзейнасці кіраваліся нормамі ***магдэбургскага права***, а таксама мясцовага права, якія ўваходзілі ў Статуты

ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. Пасля прыняцця закона ад 17.04.1791 г. "Гарады нашы каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай" у гарадскія магістраты маглі выбірацца не толькі мяшчане, але і шляхта, якая мела нерухомую маёмасць у горадзе. [60]

**Сотнік,** службовая асоба гарадскога самакіравання Беларусі ў XVI – XVIII стст., якая ўзначальвала сотню – частку гарадской абшчыны, вылучаную з вайсковымі і фіскальнымі мэтамі. Пасада сотніка не прадугледжвалася нормамі ***магдэбургскага права***, але існавала і ў гарадах з такім правам. На думку З. Ю. Капыскага, наяўнасць соценнага падзелу ў гарадах Беларусі сведчыць пра існаванне ў дамангольскі перыяд вечавой арганізацыі гарадскога самакіравання. Сотнікі выбіраліся з заможных мяшчан. Паводле ўстаўнай граматы Магілёву 20.02.1561 г., там гарадскую адміністрацыю ўзначальваў войт, якому дапамагалі 4 сотнікі. Яны сачылі, у т. л. праз падначаленых ім дзесятнікаў, за выкананнем мяшчанамі павіннасцей, выплатай падаткаў. Важным абавязкам сотніка было з'яўляцца са сваёй сотняй на замкавыя работы і для абароны замка ад непрыяцеля. Сотнікі прымалі ўдзел у пасяджэннях гарадской рады, хоць і не ўваходзілі ў склад магістрата. Без іх згоды войт не меў права прымаць важныя рашэнні. (...) [61]

**Юрыдыкі** (ад лац. jurisdictio – юрысдыкцыя), у ВКЛ адміністрацыйна адасобленыя часткі гарадоў ці прадмесцяў, якія былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на жыхароў якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада гарадскога самакіравання. Узніклі ў выніку перасялення прыгонных на ўчасткі і ў дамы, якія належалі феадалам у гарадах, ці перасялення саміх гараджан у межах гарадскіх уладанняў феадала. У кожнай юрыдыцы яе ўласнік прызначаў старасту або войта, засноўваў судовы орган на ўзор гарадской рады. Гарадское самакіраванне дамагалася скасавання юрыдыкі, забараняла мяшчанам пад пагрозай выгнання з горада пераход на юрыдыку. У шэрагу выпадкаў магістраты дамагаліся поспехаў, але ў цэлым барацьба гарадоў супраць прыватнаўласніцкіх юрыдык не мела поспеху з-за слабасці вярхоўнай улады, якая не змагла ўстанавіць забарону на юрыдыкі, бо ў іх былі зацікаўлены феадалы і царква. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. пашырэнню юрыдык садзейнічала ўмацаванне пазіцый і рост уладанняў каталіцкай царквы. Юрыдыкі паскорылі працэс канцэнтрацыі ў гарадах рамесніцтва і гандлю, што спрыяла пашырэнню іх ролі як цэнтраў дробнатаварнай вытворчасці і абмену. Адначасова пашырэнне юрыдык узмацняла ўплыў феадальнай анархіі на гарады, што перашкаджала іх эканамічнаму развіццю і працэсу саслоўнай кан-

салідацыі гараджан. У Берасці і Менску юрыдыкі вядомы з XV ст., у Віцебску, Полацку, Гародні, Кобрыне, Пінску, Навагародку і іншых гарадах – з XVI ст. Прывілей Менску на магдэбургскае права 1499 г. пашыраў яго на ўсіх жыхароў горада, але гэты прынцып застаўся нерэалізаваным. Тут буйныя юрыдыкі належалі князям Радзівілам, Друцкім-Горскім, Саламярэцкім, панам Корсакам, а таксама некаторым праваслаўным, уніяцкім і каталіцкім цэрквам і манастырам, пратэстанцкай абшчыне. Невялікія юрыдыкі існавалі і ў прыватнаўласніцкіх гарадах, дзе належалі ўласніку горада (г. зв. замкавыя), шляхце, царкве. Скасаваны соймамі ў 1764 і 1791 гг. [62]

### 3.2.9. Цэхавая сістэма

**Цэхі** (ад ням. Zeiehen – знак), аб’яднанні рамеснікаў адной ці некалькіх прафесій у феадальных гарадах. Ствараліся з мэтай абароны рамеснай вытворчасці ад самавольства феадалаў, канкурэнцыі іншых рамеснікаў ва ўмовах вузкага ўнутранага рынку, манапалізацыі вытворчасці і збыту прадукцыі, абароны агульных і асабістых правоў. Унутраная дзейнасць цэхаў вызначалася статутамі, якія рэгламентавалі выраб і збыт прадукцыі, якасць сыравіны і гатовых вырабаў, тэхналогію вытворчага працэсу, час і ўмовы работы, арганізацыю навучання і інш. Статуты цэхаў у дзяржаўных гарадах ВКЛ зацвярджаліся вялікім князем (каралём), у прыватных гарадах і мястэчках – іх уладальнікамі-феадаламі. Цэхі кантралявалі паводзіны сваіх членаў, наладжвалі ўзаемадапамогу. На Беларусі першыя цэхі ўзніклі ў XV ст., з наданнем гарадам магдэбургскага права (ім папярэднічалі аб’яднанні рамеснікаў – брацтвы, якія не мелі пісьмовых статутаў), пашырыліся ў XVI ст. У цэлым беларускія цэхі развіваліся на заходнееўрапейскі ўзор, аднак мелі некаторыя асаблівасці: яны спалучалі традыцыйныя нормы рамесных аб’яднанняў з новаўвядзеннямі магдэбургскага права; пераважалі мяшаныя цэхі, якія складаліся з работнікаў некалькіх спецыяльнасцей; для іх характэрна канфесіянальная цярпімасць. На чале цэхаў стаялі цэхмістры (старасты), якіх выбіралі штогод; паўнапраўнымі членамі цэхаў былі майстры, ім падпарадкоўваліся падмайстры, чаляднікі (“таварышы”), вучні (“хлопцы”). У некаторых цэхах выбіраліся дапаможныя службовыя асобы – ключнікі, сталовыя, шафоры, пісары, інстыгатары. Цэхавыя рамеснікі знаходзіліся пад юрысдыкцыяй магістрата і феадалаў. Цэхі ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці горада, неслі вайсковую і іншыя павіннасці на карысць дзяржавы і ўладальніка горада. Пераважалі цэхі па апрацоўцы металу; пашыраны цэхі па апрацоўцы скур, вырабе адзення, хатняга начыння, будаўнічыя. Для разбору выпадкаў парушэння цэхавых статутаў, цяжбаў і прэтэнзій паміж майстрамі склікаліся спецыяльныя сходкі цэхаў (праз 2 тыдні або па ме-

ры неабходнасці), у гэтым выпадку цэх ператвараўся ў суд. Права судовага разбору і вызначэння меры пакарання належала цэхмістрам (у некаторых выпадках разам са старэйшымі майстрамі). Апеляцыйным органам для цэхавага суда была гарадская Рада. [63]

**Рамеснікі**, непасрэдныя вытворцы пэўных вырабаў з дапамогай уласных прылад працы. Засяроджваліся пераважна ў гарадах. Спачатку з’явілася рамяство на заказ, потым і на рынак. У XVI – 1-й пал. XVII стст. у дзяржаўных гарадах Беларусі было каля 200 рамесных прафесій, у прыватнаўладальніцкіх – 123. Дыферэнцыяцыя рамяства, адгалінаванне новых прафесій было сведчаннем развіцця рамеснай вытворчасці. З сярэдзіны XVI ст. у гарадах пачалі арганізоўвацца аб’яднанні рамеснікаў – цэхі на заходнееўрапейскі ўзор з іх карпарацыйнасцю і іерархічнай структурай. У цэхах паўнапраўнымі былі ***майстры***; у іх майстэрнях працавалі ***падмайстры*** і вучні. Цэхі актыўна змагаліся супраць няцэхавых майстроў ***(партачоў)***, каб пазбавіцца некантралюемых канкурэнтаў. Дзейнасць цэхавых рамеснікаў рэгулявалася правіламі, запісанымі ў цэхавых статутах. Рамеснікі ў XVI – XVIII стст. складалі да 50 – 65 % насельніцтва вялікіх і да 20 – 30 % малых гарадоў і мястэчак. Кіраўнікі рамесных цэхаў – ***цэхмістры*** – ўваходзілі ў склад ***магістратаў.*** Акрамя гарадскіх, існавала значная група рамеснікаў у маёнтках феадалаў – ***сяляне-слугі.*** Яны надзяляліся зямлёю. Іх адпрацовачнай рэнтай была праца на феадала. Па меры перасялення магнатамі рамесных сялян-слуг у феадальныя ***юрыдыкі*** ў гарадах і пераводу іншых рамеснікаў-слуг у разрад прыгонных сялян катэгорыя рамесных сялян-слуг паступова змяншалася. [64]

**Цэхмістр**, старшы, старшыня аб’яднання рамеснікаў (***цэха***) ў гарадах ВКЛ. Выбіраўся штогод на агульным сходзе майстроў – паўнапраўных членаў цэха са свайго асяроддзя або з больш вузкага іх кола – старэйшых майстроў, што заснавалі цэх, былі найбольш заможнымі і інш. Часта практыкаваліся двухступеньчатыя выбары, калі цэхмістра выбірала вызначанае загадзя кола майстроў. У малых цэхах быў адзін цэхмістр, у вялікіх – некалькі, часам да дзесятка. Цэхмістр наглядаў за выкананнем членамі цэха ўсіх патрабаванняў цэхавага статута, сачыў за вытворчай дзейнасцю членаў цэха, за якасцю прадукцыі. Праводзіў судовы разбор па ўнутрыцэхавых справах і вызначаў меру пакарання. Захоўваў касу, прывілеі і дакументы цэха.

Цэхмістр уваходзіў у склад органа гарадскога самакіравання – магістрата. Цэхмістры буйных цэхаў мелі памочнікаў – падцэхмістраў. [65]

**Майстар цэхавы**, паўнапраўны член рамеснага цэха ў ВКЛ. Каб стаць майстрам ("братам"), прэтэндэнт (рамеснік, які навучаўся спецыяльнасці як ***падмайстар***) павінен быць жанатым, падаць у цэх пасведчанне аб законным нараджэнні, дакумент, які пацвярджаў завяршэнне курса навучання рамяству ў майстра, здаць грашовы ўзнос у касу цэха і зрабіць пробны выраб ("штуку"); пасля наладзіць вячэру для членаў цэха. Рамеснікі, якія перасяляліся з іншых гарадоў, для ўступлення ў цэх павінны былі набыць у горадзе дом і прыняць гарадское грамадзянства. Сыны мясцовага майстра мелі льготы пры пераходзе з падмайстраў у майстры. Толькі майстры са свайго асяроддзя маглі выбіраць галаву цэха – ***цэхмістра***, падцэхмістра, удзельнічаць у пасяджэннях цэха, устанаўліваць цэхавыя падаткі, наймаць падмайстраў. Майстар павінен быў выпускаць прадукцыю ўстаноўленага ўзору і якасці. Яму забаранялася ганьбіць майстэрства іншых майстраў і пераманьваць заказчыкаў; за падобнае парушэнне майстар мог быць аштрафаваны або пазбаўлены права займацца сваім рамяством. Удава майстра магла наследаваць справу мужа і стаць паўнапраўным членам цэха – майстрыхай. [66]

**Падмайстар**, непаўнапраўны член рамеснага цэха, памочнік *майстра*. Статус падмайстра атрымлівалі вучні, якія наймаліся да майстра і праходзілі ў яго курс навучання, сыны майстра. Пры выкананні пэўных патрабаванняў падмайстры пераводзіліся ў паўнапраўныя члены цэха – майстры. [67]

**Чаляднік**, рамеснік у цэхавага майстра ў гарадах ВКЛ. У большасці статутаў цэхаў беларускіх гарадоў чаляднікам называўся работнік, які скончыў курс вучнёўства, але не выканаў усіх патрабаванняў, каб перайсці ў падмайстры. Назва "чаляднік" сведчыла, што работнік займае прамежкавую ступень паміж вучнем і падмайстрам і асабіста залежны ад цэхавага майстра. [68]

**Партачы** (ад лац. a parte fraternitatis – па-за цэхам), на Беларусі ў XVI – XVIII стст. рамеснікі, якія жылі ў горадзе або паблізу яго і не ўваходзілі ў рамесныя цэхі. Партачы выраблялі прадукцыю нелегальна. У некаторых гарадах складалі сур'ёзную канкурэнцыю цэхавым рамеснікам, якія праследавалі партачоў у судовым парадку. Ператварэнне цэхаў у замкнёныя карпарацыі і ўскладненне доступу ў іх выклікала павелічэнне колькасці партачоў. Вырабы партачоў часам былі не горшыя за вырабы цэхавых рамеснікаў і больш танныя, але ў большасці саступалі ім у якасці, таму пазней партачамі называлі рамеснікаў нізкай прафесійнай кваліфікацыі. [69]

## 3.3. КРЫНІЦЫ

1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: канд. ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

3. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1: IX – XVIII стст. / скл. В. К.Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

4. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск: Амалфея, 2000. – 672 с.

## 3.4. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Арэпук, Л. Самакіраванне ў гарадах Беларусі XV – XVI стст. / Л. Арэпук // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2001. – № 2. – С. 28 – 32.

2. Бахрушин, С. В. Княжеское хозяйство XV и первой половины XVI вв. / С. В. Бахрушин // Сборник статей, посвященных В. О. Ключевскому. – Москва : Печатня С. П. Яковлева, 1909. – С. 548 – 565.

3. Бершадский, С. А. Литовские евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии. 1386 – 1569 / С. А. Бершадский. – СПб : тип. М. М. Стасюлевича, 1883. – 431 с.

4. Варонін, В. Унутраны гандаль у Полацкім ваяводстве першай паловы XVI ст. / В. Варонін // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. – Серыя 3. – 1999. – № 1. – С. 15 – 17.

5. Веселовский, С. Б. Исследование по истории класса служилых землевладельцев / С. Б. Веселовский. – М. : Наука, 1969. – 583 с.

6. Вешняков, В. Панцырные бояре / В. Вешняков // Архив исторических и практических сведений. 1860 – 1861. – Кн. IV. 1862. – Отд. I. – С. 79 – 94.

7. Галубовіч, В. У. Кнігі запісаў канцылярыі Вялікага княства Літоўскага пачатку XVII ст. як крыніца па гісторыі гарадоў Беларусі / В. У. Галубовіч // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: Зб. навук. прац / Полац. дзярж. ун-т, Ін-т гісторыі НАНБ; рэдкал.: Г. В. Штыхаў [і інш.]. – Наваполацк, Мінск : ПДУ; Б.в., 2001. – С. 116 – 121.

8. Галубовіч, В. У. Кнігі запісаў метрыкі Вялікага княства Літоўскага першай паловы XVII ст. як крыніца па гісторыі Браслаўшчыны / В. У. Галубовіч // Браслаўскія чытанні-2000: матэрыялы 5-й навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай узгадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. – Браслаў : Браслаўскае музейнае аб’яднанне, Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Гедэмана, 2001. – С. 22 – 25.

9. Гісторыя сялянства Беларусі: са старажыт. часоў да 1996 г. У 3 т. Т. 1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанака, Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў [і інш.]. – Нац. Акадэмія навук, ін-т гісторыі. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 430 с.

10. Голубев, В. Ф. Источники по землевладению крестьян Белоруссии в XVI – XVIII вв. / В. Ф. Голубев // Весці АН БССР. – Сер. гуманітарных навук. – 1987. – № 6.

11. Голубеў, В. Праблемы тэрміналогіі сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі 13 – 18 стст. / В. Голубеў // Гістарычны альманах. – Т. 9. – Гродна, 2004.

12. Голубеў, В. Ф. Сялянскае землеўладанне и землекарыстанне на Беларусі XVI – XVIII стст. / В. Ф. Голубеў; пад. рэд. В. І. Мялешкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 173 с.

13. Грицкевич, А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии в XVI – XVIII вв. / А. П. Грицкевич; науч. ред. В. С. Поссе. – Минск : Наука и техника, 1979. – 152 с.

14. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI – XVII вв. (Социально-экономическое исследование истории городов). – Минск : Наука и техника, 1975. – 428 с.

15. Грыцкевіч, А. П. Шляхта Вялікага княства Літоўскага да Люблінскай уніі 1569 г. / А. П. Грыцкевіч // Годнасьць. – 1993. – № 1. – С. 16 – 27.

16. Дворниченко, А. И. Бояре западнорусских земель в XIII – XV вв. / А. И. Дворниченко // Вестник ЛГУ. – Сер. 2. – Вып. 2. – 1986. – С. 56 – 89.

17. Дворниченко, А. И. О характере социальной борьбы в городских общинах Верхнего Поднепровья и Подвинья в XI – XV вв. / А. И. Дворниченко // Проблемы отечественной и всеобщей истории: межвуз. сб. / ЛГУ им. А. А. Жданова. Вып. 9. Генезис и развитие феодализма в России: Проблемы социальной и классовой борьбы / под ред. И. Я. Фроянова. – С. 127 – 146.

18. Довнар-Запольский, М. В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Т. 1. / М. В. Довнар-Запольский. – Киев : тип. Имп. Ун-та св. Владимира, АО печ. и изд. дела Н. Т. Корчак-Новицкого, 1901. – 806 с.

19. Довнар-Запольский, М. В. Западнорусская сельская община в XVI веке / М. В. Довнар-Запольский. – СПб. : тип. В. С. Балашева, 1897. – 56 с.

20. Копысский, З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII вв. / З. Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1975. – 191 с.

21. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII вв. / З. Ю. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1966. – 227 с.

22. Милованов, В. Беларусь в начале нового времени (первая четверть XVI в.) / В. Милованов // Преподавание истории в школе. – 2001. – № 1. – С. 78 – 85.

23. Місарэвіч, Н. В. Магдэбургскае права на Беларусі: манагр. / Н. В. Місарэвіч. – Гродна : ГрДУ, 2003. – 107 с.

24. Келер, В. Магдэбургскае права / В. Келер // Спадчына. – 1997. – № 5. – С. 90 – 101.

25. Пичета, В. И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии. Ч. 1 / В. И. Пичета. – Минск : Наркомзем БССР, 1927. – 176 с.

26. Пичета, В. И. Феодальное поместье в XV – XVI вв. в Великом княжестве Литовском / В. И. Пичета // Белоруссия и Литва в XV – XVI вв: Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития. – М : Изд-во АН СССР, 1961 г. – С. 183 – 212.

27. Рябцевич, В. Н. К вопросу о денежном обращении западнорусских земель в XIV – XV столетиях / В. Н. Рябцевич // Нумизматика и сфрагистика. – Вып. 2. – Киев, 1965.

28. Смолік, А. Сацыяльная структура грамадства ВКЛ (XV – XVI стст.) / А. Смолік, Б. Сымон // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 3. – С. 160 – 179.

29. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV – XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов; под ред. А. Л. Хорошкевич. – Минск : Наука и техника, 1993. – 222 с.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Насевіч, Вячаслаў. Князь / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 115.

2. Грыцкевіч, Анатоль. Княжаты / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 114.

3. Грыцкевіч, Анатоль. Паны / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 396.

4. Грыцкевіч, Анатоль. Магнаты / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 255.

5. Грыцкевіч, Анатоль. Баяры / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 296 – 297.

6. Вяроўкін-Шэлюта, Уладзіслаў. Зямяне / У. Вяроўкін-Шэлюта // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 660.

7. Грыцкевіч, Анатоль. Конная шляхта / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 129.

8. Грыцкевіч, Анатоль. Пешая шляхта / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 429.

9. Спірыдонаў, Міхаіл. Даніна / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 576 – 577.

10. Доля // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 593.

11. Паншчына // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 395 – 396.

12. Спірыдонаў, Міхаіл. Асада / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 256.

13. Спірыдонаў, Міхаіл. Чынш / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 746.

14. Казлоўскі, Павел. Згоны / П. Казлоўскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 656.

15. Дзесяціна // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 585.

16. Мялешка, Васіль. Дзякла / В. Мялешка // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 588.

17. Куніца // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 165 – 166.

18. Стацыя // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 636.

19. Пазднякоў, Валерый. Мезлева / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 284.

20. Пазднякоў, Валерый. Баброўшчына / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 272.

21. Падводная павіннасць // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 383.

22. Старажоўшчына // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 628.

23. Спірыдонаў, Міхаіл. Даннікі / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 577.

24. Спірыдонаў, Міхаіл. Дольнікі / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 593.

25. Спірыдонаў, Міхаіл. Цяглыя сяляне / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 732.

26. Спірыдонаў, Міхаіл. Чыншавыя сяляне / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 747.

27. Спірыдонаў, Міхаіл. Асадныя сяляне / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 256.
28. Агароднікі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 200.
29. Халупнікі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 712.
30. Доўнар, Аляксандр. Сяляне-слугі / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 649 – 650.
31. Ткачоў, Міхась. Панцырныя баяры / М. Ткачоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 394 – 395.
32. Доўнар, Аляксандр. Путныя баяры / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 476.
33. Доўнар, Аляксандр. Служкі / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 588.
34. Доўнар, Аляксандр. Цівун / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 728.
35. Цярохін, Станіслаў. Асочнікі / С. Цярохін // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 258.
36. Доўнар, Аляксандр. Баброўнікі / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 272.
37. Доўнар, Аляксандр. Стральцы / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 637.
38. Грыцкевіч, Анатоль. Людзі пахожыя / А Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 232 – 233.
39. Грыцкевіч, Анатоль. Людзі непахожыя / А Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 232.
40. Спірыдонаў, Міхаіл. Чэлядзь нявольная / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 748.
41. Спірыдонаў, Міхаіл. Закупы / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 641.
42. Сосна, Уладзімір. "Гарадскія" сяляне / У. Сосна // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 511.
43. Голубеў, Валянцін. Манастырскія сяляне / В. Голубеў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 268 – 269.
44. Казлоўскі, Павел. Дзяржаўныя сяляне / П. Казлоўскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 588 – 589.
45. Насевіч, Вячаслаў. Воласць / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 464.
46. Пазднякоў, Валерый. Вёска / В. Пазднякоў, В. Шаблюк // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 406.
47. Голубеў, Валянцін. Грамада /В. Голубеў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 552.

48. Доўнар, Аляксандр. Старац / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 629.
49. Грыцкевіч, Анатоль. Служба / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 588.
50. Голубеў, Валянцін. Дварышча / В. Голубеў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 584.
51. Спірыдонаў, Міхаіл. Дым / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 610.
52. Пазднякоў, Валерый. Горад / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 544 – 546.
53. Грыцкевіч, Анатоль. Прыватнаўладальніцкія гарады / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 467 – 468.
54. Бохан, Юрась. Мястэчка / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 334 – 335.
55. Доўнар, Аляксандр. Магдэбургскае права / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 241.
56. Грыцкевіч, Анатоль. Магістрат / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 254 – 255.
57. Капыскі Зіновій. Ратуша // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 510.
58. Капыскі, Зіновій. Бурмістр / З. Капыскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 356.
59. Грыцкевіч, Анатоль. Лаўнік / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 186.
60. Юхо, Язэп. Радца / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 505.
61. Пазднякоў, Валерый. Сотнік / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 620 – 621.
62. Капыскі, Зіновій. Юрыдыкі / З. Капыскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 772.
63. Цэхі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 731 – 732.
64. Грыцкевіч, Анатоль. Рамеснікі / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 507.
65. Цэхмістр. // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – т. 2. – с. 732.
66. Пазднякоў, Валерый. Майстар цэхавы / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 262.
67. Падмайстар // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 385.
68. Капыскі, Зіновій. Чаляднік / З. Капыскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 735.
69. Партачы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 400.

# ТЭМА 4. АБВАСТРЭННЕ ЎНУТРАНЫХ СУПЯРЭЧНАСЦЕЙ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У КАНЦЫ XIV СТ.

**Змест праграмы.** Дынастычная барацьба ў 70-я гг. XIV ст. Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт. Умовы пагаднення паміж вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам Данскім і маці Ягайлы Ульянай цвярской. Падрыхтоўка, заключэнне, змест і вынікі Крэўскай уніі. Агульназемскі прывілей 1387 г. і яго сутнасць. Пачатак распаўсюджвання каталіцтва на Беларусі.

Узмацненне палітычных супярэчнасцей паміж феадаламі каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў. Польска-ліцвінскія канфлікты і практычнае скасаванне Крэўскай уніі. Востраўскае пагадненне.

## 4.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 4.1.1. Дынастычная барацьба

Пасля смерці вялікага князя Альгерда ў ВКЛ разгарнулася дынастычная барацьба, асноўнымі ўдзельнікамі якой былі яго брат і суправіцель Кейстут, сыны Ягайла, Свідрыгайла, Скіргайла і Андрэй, а таксама сын Кейстута Вітаўт. У 1377 г. паводле дасягнутай з Кейстутам дамоўленасці велікакняжацкі пасад заняў яго сын Ягайла (старэйшы сын ад другой жонкі, цвярской князёўны Ульяны).

Андрэй, полацкі князь, старэйшы сын Альгерда ад першай жонкі (віцебскай князёўны Марыі), выказаў незадаволенасць такім станам спраў, аднак хутка вымушаны быў пакінуць Полацк і ўцёк у Пскоў, затым у Маскву, дзе дамовіўся з вялікім князем Дзмітрыем Іванавічам аб саюзе, накіраваным супраць Ягайлы.

Спробы Ягайлы прызначыць у Полацку свайго брата Скіргайлу поспеху не мелі. Становішча самога Ягайлы было даволі хісткім, бо акрамя братоў-прэтэндэнтаў на ўладу, небяспеку для яго ўяўляў Кейстут, які таксама мог выступіць у якасці прэтэндэнта на велікакняжацкі пасад. У такіх умовах Ягайла імкнуўся адшукаць саюзнікаў і ў 1380 г. заключыў саюз з ардынскім военачальнікам Мамаем, накіраваўшы свае войскі для ўдзелу ў сумесным паходзе супраць рускіх войск. Аднак у вырашальнай ***Кулікоўскай бітве 1380 г.*** войскі Ягайлы ўдзелу не прымалі. На баку маскоўскага князя ў бітве ўдзельнічалі браты Ягайлы – Андрэй і Дзімітрый (трубчэўскі і старадубскі князі).

У далейшых пошуках саюзнікаў Ягайла заключыў патаемныя дамовы з крыжакамі (1381 – 1382 гг.), паводле якіх абавязваўся не прыходзіць

на дапамогу Кейстуту, калі на яго нападзе ордэн. Аб гэтым становіцца вядома Кейстуту, які раптоўна прыязджае і ў канцылярыі вялікага князя знаходзіць дакументальныя доказы здрады Ягайлы. Кейстут пазбаўляе Ягайлу ўлады і на нейкі час занявольвае. Аднак неўзабаве Ягайла прынёс Кейстуту прысягу *“ніколі супрацiву не стаяці і заўжды ў яго волі быці”* і быў вызвалены.

Аднак неўзабаве з дапамогай віленскіх мяшчан Ягайла, скарыстаўшыся адсутнасцю Кейстута, здолеў ажыццявіць пераварот, захапіў сталіцу і ўдзел Кейстута – Трокі. Кейстут разам з Вітаўтам гатовыя былі распачаць ваенныя дзеянні супраць Ягайлы, але той падманам захапіў іх у палон. Кейстут быў заняволены ў вежы Крэўскага замка і неўзабаве забіты, а Вітаўт здолеў уцячы ў Прусію да крыжакоў, з якімі заключыў саюз супраць Ягайлы.

Ягайла аднавіў велікакняжацкую ўладу, а ўдзел Вітаўта – Трокі – аддаў свайму брату Скіргайлу. Аднак ВКЛ па сутнасці заставалася расшчэпленым на ўдзелы і далёка не ўсе іх уладары прызнавалі Ягайлу за вялікага князя. Падчас міжусобіцы здолеў вярнуцца ў Полацк Андрэй Альгердавіч.

Вітаўт у 1384 г. прызнаў сябе васалам Ордэна і аддаў крыжакам Жамойць, а таксама паабяцаў перадаць ім у ленную залежнасць пакуль яшчэ не вернутыя вотчыны. Разам з крыжацкім войскам Вітаўт ажыццявіў некалькі нападаў на землі ВКЛ.

Ягайла, каб нейтралізаваць небяспеку і ўмацаваць свае пазіцыі ў распачатай ім барацьбе за польскую карону, заключыў з Вітаўтам тайнае пагадненне. Апошні згадзіўся прызнаць уладу Ягайлы пры ўмове вяртання яму ўладанняў Кейстута. Вітаўт спаліў шэраг памежных крыжацкіх замкаў і разам са сваімі паплечнікамі вярнуўся ў Літву. Аднак на справе Ягайла не выканаў сваіх абяцанняў і аддаў Вітаўту толькі Берасцейшыну і Гарадзеншчыну. Трокі так і засталіся пад уладай Скіргайлы.

### 4.1.2.Крэўская унія

Цяжкае становішча Ягайлы вымусіла яго працягваць пошук саюзнікаў. У 1383 – 1834 гг. ВКЛ і Масква перайшлі ад канфрантацыі да супрацоўніцтва. Была дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб жаніцьбе Ягайлы з дачкой маскоўскага князя Соф’яй і хрышчэнні яго ў праваслаўе. Аднак саюз ВКЛ і Маскоўскага княства не адбыўся, бо Ягайла, скарыстаўшы складаную палітычную сітуацыю ў Польшчы, прапанаваў сваю кандыдатуру на каралеўскі трон. Істотная частка польскай эліты палічыла гэтую кандыдатуру найбольш падыходзячай, бо абранне вялікага князя літоўскага польскім каралём дазваляла аб’яднаць сілы ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам, адкрывала магчымасці для вырашэння тэрытарыяльных супярэчнасцей і, нарэшце, вяло да аб’яднання дзвюх дзяржаў.

У ВКЛ праект саюзу падтрымала перш за ўсё літоўская знаць, для якой гэта было сродкам абмежавання ўплыву праваслаўя і магчымасцю дабіцца пашырэння сваіх правоў.

14.08.1385 г. у замку Крэва (сучасны Смаргонскі раён) была падпісана унія паміж Польскім каралеўствам і Вялікім княствам Літоўскім (***Крэўская унія 1385 г.***).

Канчатковае зацвярджэнне уніі адбылося ў студзені – сакавіку 1386 г. Ягайла ахрысціўся пад імем Уладыслаў, пабраўся шлюбам з каралеўнай Ядзвігай і ўрачыста каранаваўся ў Кракаве. Юрыдычна акт уніі азначаў інкарпарацыю ВКЛ у склад Польскага каралеўства, але дэ-факта яе не адбылося. ВКЛ па ранейшаму існавала як самастойны палітычны арганізм, захоўвала ўласную сістэму кіравання і праводзіла самастойную палітыку. Унія адкрыла каталіцызму шлях у ВКЛ, пашырыла правы каталіцкіх феадалаў, аднак не спыніла барацьбы за ўладу, чарговая ўспышка якой адбылася непасрэдна ў час падпісання уніі.

### 4.1.3. Узмацненне ўнутрыпалітычных супярэчнасцей у др. пал. 1480-х – пач. 1390-х гг.

Пасля заключэння Крэўскай уніі Ягайла заставаўся вярхоўным уладаром ВКЛ. Ён атрымаў ад удзельных князёў прысягу на вернасць яму і Польскай кароне і ад’ехаў у Польшчу. За свайго намесніка ён пакінуў троцкага князя **Скіргайлу**, асобым прывілеем ад 27.04.1387 г. пацвердзіўшы яго правы на Троцкае княства і надаўшы яму новыя ўладанні на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Полацкае княства.

Заключэнне уніі выклікала неадназначную рэакцыю сярод пануючага саслоўя ВКЛ. Праваслаўная яго частка была занепакоена ўзвышэннем каталіцкай царквы і баялася пагаршэння свайго становішча. Кансерватыўная частка літоўскага баярства, якое ў большасці захоўвала язычніцкую веру, не жадала здраджваць традыцыям продкаў. Таму правамерна было чакаць абвастрэння барацьбы, што і адбылося вельмі хутка.

У тым жа 1385 г. супраць Ягайлы выступіў **Андрэй Альгердавіч**. Ён заключыў пагадненне з Ордэнам і паабяцаў перадаць “Полацкае каралеўства” на вечнае валоданне інфлянцкаму магістру, за што той гарантаваў апеку ордэна над ім і яго наступнікамі. Фактычна Андрэй станавіўся васалам ордэна, а Полацк – яго ленным уладаннем. Атрымаўшы падтрымку ордэна, Андрэй разам са смаленскім князем Святаславам выступіў супраць Ягайлы (пач. 1386 г.), распачаўшы ваенныя дзеянні на Віцебшчыне. Затым на нейкі час да іх далучаецца інфлянцкі магістр. Аднак гэтае выступленне было вельмі хутка падаўлена войскам Ягайлы. У бітве на р. Віхры (красавік

1386 г) Святаслаў загінуў, Андрэй закрыўся ў Полацку і бараніўся да вясны 1387 г., калі Скіргайлу ўдалося нарэшце захапіць горад. Андрэй быў захоплены ў палон і адвезены ў Кракаў, да Ягайлы, дзе тры гады прасядзеў у вязніцы.

Неўзабаве рух супраць уніі ўзначаліў Вітаўт, якога не задавальняла становішча служылага князя і які не атрымаў (насуперак абяцанням Ягайлы) усе свае спадчынныя валоданні. Узімку 1388 / 1389 гг. Вітаўт паспрабаваў ажыццявіць змову супраць Ягайлы і захапіць Вільню, але няўдала. Пасля гэтага Вітаўт зноў уцёк у Прусію да крыжакоў, заключыў з імі новы саюз, прызнаў сваю васальную залежнасць ад ордэна і перадаў яму Жамойць. У 1389 г. Вітаўт распачаў новыя набегі на тэрыторыю ВКЛ, падтрымку яму аказала Маскоўскае княства. Акрамя гэтага, на баку Вітаўта выступіла значная частка баярства ВКЛ, што дазволіла яму весці даволі паспяховую барацьбу. У 1391 – 1392 гг. Вітаўт захапіў Горадню, Наваградак, а затым атрымаў рашаючую перамогу над Скіргайлам. Ягайла зразумеў, што можа страціць Літву, пайшоў на кампраміс. Ён арганізаваў таемныя перамовы з Вітаўтам і ўвесну 1392 г. той пакінуў крыжакоў, спаліўшы некалькі іх замкаў. 5 жніўня 1392 г. у маёнтку Вострава каля Ліды паміж Вітаўтам і Ягайлам было заключана пагадненне (***Востраўскае пагадненне 1392 г.***).

## 4.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Ягайла** (у праваслаўі Якаў, у каталіцтве Уладзіслаў; 1352? – 01.06.1434 гг.), вялікі князь літоўскі [1377 – 1381 гг., 1382 –1392 гг.], кароль польскі [1386 – 1434 гг.]. (...) Ягайла быў прызначаны Альгердам спадчынным уладальнікам трона ВКЛ. Стаў вялікім князем у маі 1377 г. Адразу ўступіў у канфлікт з уплывовым дзядзькам, князем троцкім ***Кейстутам***, які намагаўся захапіць велікакняжацкі трон. У адрозненне ад Кейстута, які быў прыхільнікам барацьбы на 2 фронты – з крыжакамі і рускімі княствамі, Ягайла намагаўся замацаваць тэрыторыі на ўсходзе нават за кошт часовай уступкі Жамойці крыжакам. У 1380 г. Ягайла заключыў з Залатой Ардой дагавор, накіраваны супраць Маскоўскага княства, і планаваў удзел у ***Кулікоўскай бітве 1380 г.*** Крыжакі выкарысталі дынастычную барацьбу і заключылі перамір’е ў 1379 г. з Кейстутам, а ў 1380 г. – з Ягайлам У 1381 г. Кейстут захапіў уладу ў Вільні, аднак у чэрвені 1382 г. Ягайла вярнуў сабе сталіцу, у час перагавораў захапіў Кейстута, які паводле загаду Ягайлы быў задушаны ў Крэўскім замку. (...) Яго стрыечны брат ***Вітаўт*** увосень 1382 г. уцёк з Крэўскага замка да крыжакоў, з якімі заключыў саюз. У 1383 г. Ягайла вёў вайну з крыжакамі, адбіў у іх Коўна і Трокі. У 1383 – 1384 гг. вёў перагаворы з маскоўскім вялікім князем Дзмітрыем Іванавічам Данскім

аб саюзе супраць крыжакоў, які меркавалася ўмацаваць шлюбам Ягайлы з дачкой Дзмітрыя. Аднак гэты план не быў здзейснены. Ягайла паразумеўся з Вітаўтам, і той вярнуўся ў ВКЛ, атрымаўшы ад Ягайлы Падляшша і Гародню. Дзеля паспяховай барацьбы супраць крыжакоў Ягайла заключыў пагадненне з польскімі панамі – ***Крэўскую унію 1385 г.*** У 1386 г. прыняў каталіцтва, ажаніўся з польскай каралевай ***Ядвігай*** і стаў каралём Польшчы (Уладзіслаў ІІ). У 1387 г. здзейсніў хрышчэнне паводле каталіцкага абраду літоўцаў-язычнікаў і заснаваў Віленскую рымска-каталіцкую епархію для Літвы і Беларусі (для Жамойці пазней утворана ўласнае біскупства). Яго намаганні падпарадкаваць ВКЛ польскай кароне выклікалі незадаволенасць большай часткі беларускіх і літоўскіх феадалаў, якіх узначаліў Вітаўт. Вайна вялася некалькі гадоў і скончылася ***Востраўскім пагадненнем 1392 г.***, паводле якога Вітаўт прызнаваўся пажыццёвым намеснікам караля і вялікім князем літоўскім (фармальна з 1401 г.). Улада Ягайлы ў ВКЛ станавілася намінальнай, хаця ён меў тытул вярхоўнага князя, які, аднак, амаль ніколі не ўжываўся. Пастаянныя канфлікты з Тэўтонскім ордэнам прывялі да стварэння ваеннага саюза паміж Польшчай і ВКЛ. Была заключана новая ***Віленска-Радамская унія 1401 г.*** Саюзнікі атрымалі перамогу ў ***Вялікай вайне 1409 – 1411 гг.*** з Ордэнам. У вырашальнай ***Грунвальдскай бітве 1410 г.*** галоўнакамандуючым быў Ягайла. Пасля разгрому крыжакоў быў падпісаны ***Тарунскі мір 1411 г.***, паводле якога Жамойць перадавалася пажыццёва Вітаўту. ***Гарадзельская унія 1413 г.*** замацавала саюзныя адносіны паміж Польшчай і ВКЛ. У Польшчы Ягайла пацвердзіў ранейшыя прывілеі шляхты (1388 г.), гарантаваў недатыкальнасць шляхецкіх маёнткаў (1422 г.), таксама было забаронена сумяшчаць адміністрацыйныя і судовыя пасады. Каб забяспечыць спадчыннасць трона для свайго старэйшага сына Уладзіслава, у 1430 г. Ягайла яшчэ раз пацвердзіў правы шляхты і забараніў арышт шляхціцаў. У 1400 г. аднавіў Кракаўскі універсітэт. Ягайла вёў актыўную палітыку ў дачыненні да Свяшчэннай Рымскай імперыі, Чэхіі і Венгрыі. Выступаў супраць гусітаў, падтрымліваў ідэю уніі каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. На Канстанцкім саборы 1414 – 1418 гг. дэлегацыя Ягайлы дамагалася дыпламатычнага замацавання перамогі над Тэўтонскім ордэнам. Аднак канчатковае вырашэнне тэрытарыяльнага пытання адбылося пасля новай вайны з крыжакамі на тэрыторыі ордэна. Паводле ***Мельнскага міру 1422 г.*** Жамойць замацавана за ВКЛ, невялікія тэрыторыі атрымала Польшча. У 1429 г. Ягайла падтрымаў план Вітаўта абвясціць ВКЛ каралеўствам, сыходзячы з разліку, што каралеўская карона пасля смерці Вітаўта пяройдзе да яго сына. Аднак пад націскам каралеўскай рады Ягайла адмовіўся ад падтрымкі гэтага плана. Пасля смерці Вітаўта ў 1429 г.

Ягайла прызнаў абранне на велікакняжацкі трон у Вільні свайго брага ***Свідрыгайлы***, што выклікала незадавальненне польскіх паноў. У 1431 г. адбыўся ваенны канфлікт: польскае войска спрабавала захапіць Валынь. У 1432 г. у выніку перавароту вялікім князем літоўскім стаў ***Жыгімонт Кейстутавіч***. Пачалася феадальная вайна 1432 – 1439 гг., у якой Ягайла падтрымаў ***Жыгімонта***. Быў адноўлены дзяржаўны саюз Польшчы і ВКЛ (гл. ***Гарадзенска-Троцкая унія 1432 – 1433 гг.***). ***Прывілеем 1432 г.*** і ***прывілеем 1434 г.*** Ягайла і Жыгімонт ураўнавалі ў маёмасных і асабістых правах праваслаўных феадалаў і феадалаў-католікаў у ВКЛ. [1]

**Вітаўт** (у каталіцтве Віганд і Аляксандр, у праваслаўі Аляксандр; 1350 – 27.10.1430 гг.), вялікі князь літоўскі [1392 – 1430 гг., фармальна з 1401 г.]. Сын ***Кейстута***, стрыечны брат ***Ягайлы***. Адзін з выдатных дзяржаўных дзеячаў ВКЛ, за сваю дзейнасць называўся Вялікім. З маладых гадоў удзельнічаў у войнах супраць Маскоўскага вялікага княства і Тэўтонскага ордэна. У 1374 г. атрымаў у валоданне Гарадзенскае княства. Пасля смерці вялікага князя Альгерда (1377 г.) падтрымаў свайго бацьку ў барацьбе за трон. У 1382 г. Вітаўт з Кейстутам у час перагавораў з Ягайлам у Вільні былі схоплены і адпраўлены ў Крэўскі замак, дзе Кейстут быў задушаны, а Вітаўт, пераапрануўшыся ў жаночае адзенне, здолеў уцячы. Праз Берасце і Мазовію прыбыў у Прусію, стаў саюзнікам Тэўтонскага ордэна ў барацьбе супраць Ягайлы. 23.10.1383 г. прыняў каталіцтва і імя Віганд. Разам з крыжакамі ўдзельнічаў са сваім атрадам у паходзе на Літву. У 1384 г. заключыў з ордэнам пагадненне, абавязаўся быць яго васалам і аддаў крыжакам Жамойць. Не давяраючы крыжакам, Вітаўт прыняў прапанову Ягайлы заключыць мір і выступіў супраць ордэна. Ад Ягайлы ён атрымаў Гарадзенскае княства і Берасцейскую зямлю (Гародня, Берасце, Бельск, Дарагічын, Ваўкавыск, Сураж, Камянец). У 1384 г. перайшоў у праваслаўе і атрымаў імя Аляксандр. Прыняў удзел у заключэнні ***Крэўскай уніі 1385 г.*** і разам з Ягайлам і яго братамі зноў прыняў каталіцтва, захаваўшы імя Аляксандр. Не атрымаўшы ад Ягайлы спадчыны свайго бацькі – Троцкага княства, Вітаўт зноў у 1388 г. уцёк у Прусію і з дапамогай крыжакоў пачаў барацьбу супраць Ягайлы. Паступова на яго бок перайшла значная частка баяр, якія выступілі за захаванне незалежнасці ВКЛ ад Польшчы. Заключыў у 1389 г. саюз з Тэўтонскім ордэнам, зноў аддаўшы крыжакам Жамойць. У выніку заключанага ў 1391 г. саюза з Маскоўскім вялікім княствам Вітаўт выдаў сваю дачку ***Соф'ю Вітаўтаўну*** замуж за вялікага князя маскоўскага Васіля I. Пасля доўгай барацьбы, якая суправаджалася захопам замкаў і гарадоў, абодва бакі пайшлі на замірэнне. Было заключана ***Востраўскае пагадненне 1392 г.***, паводле яко-

га Вітаўт разарваў саюз з крыжакамі і стаў намеснікам Ягайлы ў ВКЛ, прызнаўшы сябе васалам польскага караля. Аднак ВКЛ фактычна захавала сваю самастойнасць, а Вітаўт стаў вялікім князем. [2]

**Андрэй Альгердавіч** (? – 12.08.1399 гг.), князь полацкі, пскоўскі. Верагодна, старэйшы сын вялікага князя літоўскага ***Альгерда*** і яго першай жонкі, віцебскай князёўны. Упершыню ўпамінаецца пад 1342 г., калі Пскоў, спадзеючыся на падтрымку Альгерда, прыняў Андрэя Альгердавіча як князя. Пазбаўлены пскавічамі княжання ў 1349 г. Пасля гібелі князя Нарымонта ў бітве на Стрэве 1348 г. стаў полацкім князем. Мабыць, валодаў і Віцебскам. У цэлым прытрымліваўся знешнепалітычнага курсу бацькі і аказваў яму актыўную дапамогу. Істотна пашырыў межы Полацкага княства на поўнач. У 1350 г. пачаў вайну супраць Пскова. Зімой 1359 – 1360 гг. па загадзе Альгерда захапіў Ржэву на Волзе. У 1368 г. ваяваў цвярскія гарадкі Хорвач і Родню. Вясной 1372 г. разам з Кейстутам, Вітаўтам і Дзмітрыем Альгердавічам па просьбе цвярскога князя Міхаіла Аляксандравіча хадзіў на Пераяслаў-Залескі і Кашын. У 1373, 1374, 1375 (двойчы) і 1376 гг. рабіў выправы на ўладанні Інфлянцкага ордэна. Ва ўнутранай палітыцы абапіраўся на полацкае баярства, даючы яму землі. Пасля смерці ў 1377 г. Альгерда выказаў незадаволенасць прыходам да ўлады ў ВКЛ Ягайлы. Прэтэнзіі на ўладу ў ВКЛ выявіў, сярод іншага, у тым, што прыняў тытул вялікага князя полацкага. Пасля зімовай аблогі войскам Ягайлы 1377 – 1378 гг. быў вымушаны ўцякаць з Полацка. Накіраваўся ў Пскоў, дзе зноў стаў князем, а потым праз Ноўгарад прыбыў у Маскву. Заключыў дагавор аб саюзе з вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам. Зімой 1379 – 1380 гг. хадзіў на гарады Трубчэўск і Старадуб, якія належалі да ўдзела Дзмітрыя Альгердавіча, і пераканаў яго перайсці на бок Масквы. Разам з пскавічамі ўдзельнічаў у ***Кулікоўскай бітве 1380 г.*** на баку рускага войска. У 1381 ці 1382 г. вярнуўся ў Полацк. Пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г. становішча Андрэя Альгердавіча пагоршылася. Шукаючы саюзнікаў, 10.10.1385 г. ён заключыў з магістрам Інфлянцкага ордэна дагавор, паводле якога перадаваў ордэну Полацкае княства і атрымліваў яго назад ужо ў якасці лена. У 1386 г. у саюзе з інфлянцкімі немцамі і смаленскім князем Святаславам Іванавічам пачаў ваенныя дзеянні супраць Ягайлы. Падпарадкаваў Лукомль. Альянс, аднак, хутка распаўся. Адбыўся разрыў Андрэя Альгердавіча з крыжакамі, а Святаслаў пацярпеў паражэнне ад войска братоў Ягайлы ў Мсціслаўскай бітве 1386 г. Вясной 1387 г. войскі ВКЛ на чале са Скіргайлам і інфлянцкія немцы захапілі Полацк. Андрэй Альгердавіч быў узяты ў палон і зняволены ў Хэнцінскім замку ў Польшчы. 18.02.1394 г. па просьбе Ві-

таўта, а таксама Скіргайлы, Уладзіміра і Фёдара Альгердавічаў быў выпушчаны Ягайлам на свабоду. З'ехаў у Пскоў. У тым жа годзе ездзіў разам з пскавічамі ў Ноўгарад для заключэння міру. Загінуў у ***бітве на Ворскле 1399 г.*** Меў сыноў Міхаіла, Сямёна і Івана. [3]

**Ядвіга** (15.02.1374 г., Буда, Венгрыя – 17.07.1399 г.), каралева польская [1384 – 1399 гг.], жонка караля польскага і вялікага князя літоўскага ***Ягайлы***. Малодшая дачка караля Венгрыі і Польшчы Людвіка І. У 1378 г. заручана з Вільгельмам Габсбургам, сынам аўстрыйскага князя Леапольда ІІІ, і выехала ў Вену. Пасля смерці старэйшай сястры Кацярыны (1379 г.) адклікана назад для падрыхтоўкі да заняцця венгерскага трона. Аднак пасля смерці Людвіка І у 1382 г. польскія паны дамагліся, каб Ядвіга атрымала польскі трон (Людвік завяшчаў яго дачцэ Ганне), і 15 або 16.10.1384 г. яна была каранавана ў Кракаве. Польскія паны вырашылі скасаваць мяркуемы шлюб Ядвігі з Вільгельмам, каб забяспечыць незалежнасць Польшчы ад Габсбургаў, і арганізаваць яе шлюб з вялікім князем літоўскім Ягайлам, што, як меркавалася, прывядзе да ўключэння ВКЛ у склад Польскага каралеўства і хрышчэння язычніцкай Літвы ў каталіцтва. Была заключана ***Крэўская унія 1385 г.*** 18.02.1386 г. у Кракаве адбыўся шлюб Ядвігі з Ягайлам. Ядвіга атрымала ад яго ў якасці вена Магілёўскую і іншыя воласці на тэрыторыі Беларусі, Куяўскую і Рускую (Львоўскую) землі. Аказала значную дапамогу ў хрышчэнні Літвы. У 1397 г. пры Пражскім універсітэце заснавала бурсу для літоўскіх клірыкаў. Для падрыхтоўкі царкоўнай уніі паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі заснавала разам з Ягайлам у Кракаве кляштар славян-бенедыкцінцаў з Прагі, садзейнічала ўмацаванню пазіцый Кіпрыяна як мітрапаліта кіеўскага і ўсяе Русі і падтрымлівала яго захады па заключэнні уніі. Завяшчала значныя сродкі на аднаўленне Кракаўскага універсітэта. Садзейнічала ў 1387 г. далучэнню да Польшчы Галіцкай зямлі, занятай венграмі. Выступала за мірнае ўрэгуляванне канфлікту з Нямецкім ордэнам, вяла перагаворы пра вяртанне Польшчы Добжынскай зямлі, што, аднак, не прынесла поспеху. Памерла хутка пасля нараджэння ў яе дачкі. Адразу пасля смерці Ядвіга пачала шанавацца як святая. Афіцыйна кананізавана ў 1997. [4]

**Скіргайла** (у праваслаўі Іван; каля 1354 – 23.12.1394? гг.) князь полацкі, троцкі і кіеўскі ў ВКЛ. Другі сын Альгерда ад Ульяны цвярской, брат ***Ягайлы***. У 1374 – 1375 гг. удзельнічаў у войнах з крыжакамі. Пасля выгнання ў 1377 г. з Полацка князя ***Андрэя Альгердавіча*** вялікі князь Ягайла пасадзіў там княжыць Скіргайлу. У 1379 – 1380 гг. па ініцыятыве Ягайлы

зрабіў падарожжа па некалькіх краінах Еўропы, дзе абмяркоўваў умовы хрышчэння Літвы. Палачане, незадаволеныя язычніцкімі поглядамі Скіргайлы, у 1381 г. выгналі яго з княжання. На чале войска Ягайлы і пры дапамозе Лівонскага ордэна ён аблажыў на некалькі месяцаў Полацк, але горада не ўзяў. У гэты час прыняў праваслаўе. Калі ў канцы 1381 г. велікакняжацкі трон у Вільні захапіў ***Кейстут***, падначаленае Скіргайлу войска прызнала ўладу новага вялікага князя, а Скіргайла ўцёк у Лівонію. Летам 1382 г. Скіргайла далучыўся да войска Ягайлы, удзельнічаў у аблозе Кейстута ў Троках. У час перагавораў з Кейстутам захапіў яго ў палон і адвёз у Крэўскі замак, дзе той быў забіты. Атрымаў ад Ягайлы Троцкае княства. З таго часу Скіргайла стаў другой уплывовай асобай у ВКЛ. У 1385 г. на чале пасольства ВКЛ прыбыў у Кракаў, каб весці перагаворы пра шлюб Ягайлы з польскай каралевай Ядвігай. У час заключэння ***Крэўскай уніі 1385 г.*** забяспечыў сабе права застацца праваслаўным. У Мсціслаўскай бітве 1386 г. на чале войска ВКЛ перамог смаленскага князя Святаслава Іванавіча і падпарадкаваў ВКЛ Смаленскае княства. Вясной 1387 г. узяў Полацк, дзе захапіў у палон Андрэя Альгердавіча. **28.04.1387 г**. Ягайла пацвердзіў права Скіргайлы на валоданне Троцкім і Полацкім княствамі, даў яму Менск, Свіслач, Бабруйск, Рэчыцу, Любеч, Прапошаск, Любашаны, Ігумен, Лагойск. З 1388 г. узброеную барацьбу супраць Скіргайлы вёў Вітаўт, які з дапамогай крыжакоў намагаўся атрымаць уладу ў ВКЛ. У выніку ***Востраўскага пагаднення 1392 г.*** Ягайла фактычна прызнаў Вітаўта сваім намеснікам у ВКЛ і перадаў яму Троцкае княства. Узамен Вітаўт абяцаў Скіргайлу дапамагчы захапіць Кіеў. У пачатку 1393 г. Вітаўт і Скіргайла захапілі Віцебск, дзе ўмацаваўся ***Свідрыгайла***, і ўзялі яго ў палон. Вясной 1393 г. Вітаўт захапіў у кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча Житомір і Оўруч і аддаў іх Скіргайлу, восенню 1393 г. перадаў Скіргайлу Кіеў. У кастрычніку – лістападзе 1393 г. Скіргайла ўдзельнічаў у паходзе Вітаўта на Падолле, захапіў Чаркасы і Звянігарад. Паводле некаторых звестак, Скіргайла быў атручаны ў Кіеве. Пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры. [5]

**Кулікоўская бітва 1380 г.** Адбылася 08.09.1380 г. на Куліковым полі каля р. Няпрадва (правы прыток Дона) паміж войскамі Залатой Арды і вялікага князя маскоўскага Дзмітрыя Іванавіча (Данскога). Мэтай Арды ў паходзе 1380 г. на рускія землі было аднаўленне палітычнага кантролю над Маскоўскай дзяржавай пасля паражэння татараў у 1378 г. ад Дзмітрыя Іванавіча на р. Вожа. Для гэтага ардынскі военачальнік Мамай (фактычна кіраўнік дзяржавы – часткі Залатой Арды на захад ад Волгі) заключыў антымаскоўскі саюз з вялікім князем літоўскім Ягайлам. У 1379 – 1-й пал. 1380 гг.

Мамай сабраў значнае войска (40 – 60 тыс. чал., у асноўным лёгкая кавалерыя). Паход на Маскоўскае княства быў прызначаны на восень 1380 г., на 1 верасня запланавана сустрэча ардынскага і саюзнага войска ВКЛ на р. Ака. У жніўні Дзмітрый Іванавіч даведаўся ад вялікага князя разанскага Алега Іванавіча пра выступленне ардынцаў і разаслаў у саюзныя княствы ганцоў з просьбай аб дапамозе. Да яго прыбылі яраслаўскія, растоўскія, белазёрскія, мурамскія, ялецкія, мяшчэрскія княжацкія і гарадавыя дружыны (усяго каля 70 тыс. чал., у асноўным конніца). Невялікае войска паслаў Ноўгарад. У сярэдзіне жніўня маскоўскія і саюзныя ім войскі рушылі да г. Каломна, дзе былі створаны паходныя палкі і прызначаны ваяводы. (...) 26 – 27 жніўня Дзмітрый Іванавіч пераправіў войска цераз Аку каля вусця Лапасні і рушыў да Дона. 4 верасня ва ўрочышчы Беразуй да яго далучыліся князь ***Андрэй Альгердавіч*** з атрадам палачан і пскавічоў і князь Дзмітрый Альгердавіч са сваёй дружынай. У ноч на 8 верасня маскоўскае войска пераправілася цераз Дон, выйшла на Кулікова поле паміж рэкамі Няпрадва і Смолка і стала ў баявы парадак. Паводле Наўгародскага Чацвертага летапісу (спіс Дуброўскага), рускае войска было падзелена на 6 палкоў: перадавы (тут знаходзіліся Альгердавічы), вялікі, правай рукі, левай рукі, старажавы і засадны. Паводле іншых крыніц, старажавога палка не было, а Дзмітрый Альгердавіч камандаваў часткай рэзерва. Бітва пачалася ў 11 гадзін лабавой атакай ардынцаў на пярэдні маскоўскі полк, які пад моцным націскам адступіў. Галоўны ўдар Мамай скіраваў на цэнтральныя пазіцыі, дзе стаялі палкі вялікі і левай рукі, паколькі атака на полк правай рукі была адбіта. Амаль усе ваяводы палка левай рукі загінулі, а сам ен [полк] падаўся назад да Няпрадвы. Прасоўванне ардынцаў некаторы час стрымліваў рэзерв пад камандаваннем Дзмітрыя Альгердавіча, але і ён быў разбіты. Зыход бітвы вырашыў засадны полк маскоўскага войска, якім камандавалі князь Уладзімір Андрэевіч Серпухаўскі і князь Дзмітрый Міхайлавіч Баброк-Валынскі, паколькі ў Мамая свежых сіл не засталося. Атака рэзерва з крайняй левай пазіцыі маскоўскага войска была нечаканай для ардынскай конніцы. Спачатку яна стрымлівала ўдар, потым падалася назад і ў ходзе адступлення адкінула ўласную пяхоту, што выклікала агульныя ўцекі. Бітва скончылася ў 14 гадзін, але пагоня працягвалася да позняга вечара. Мамай з невялікімі рэшткамі войска ўцек у свае ўладанні, дзе неўзабаве быў забіты. Войска Дзмітрыя Іванавіча страціла 30 тыс. чал. (у т. л. "30 паноў літоўскіх", відаць, з войск Альгердавічаў). Вялікі князь разанскі Алег Іванавіч, якога Мамай прымусіў далучыцца да сябе, у бітве не ўдзельнічаў. Ягайла на бітву спазніўся, паводле рускіх летапісаў, на дзень ці нават менш і пасля Кулікоўскай бітвы напаў толькі на наўгародскі

атрад, які вяртаўся дахаты. Кулікоўская бітва значна паўплывала на рост аўтарытэту Маскоўскага княства, вызначыла яго першынство ў аб'яднанні рускіх зямель. [6]

**Крэўская унія 1385 г.**, дзяржаўны саюз паміж ВКЛ і Польшчай. Заключаны 14.08.1385 г у Крэўскім замку. Акт Крэўскай уніі – дакументальнае зацвярджэнне вялікім князем літоўскім ***Ягайлам*** папярэдне прынятых абавязацельстваў перайсці ў каталіцтва і ахрысціць паводле лацінскага абраду ўсіх язычнікаў-літоўцаў, а таксама стварыць дзяржаўны саюз (унію) ВКЛ і Кароны Польскай. Акт зафіксаваў, што польскія паслы абяцалі Ягайлу ад імя сваёй дзяржавы аддаць у жонкі малалетнюю польскую каралеву ***Ядвігу***, а з ёю і польскую карону. Крэўскай уніі папярэднічалі перагаворы паміж абодвума бакамі, у т. л. і пасольства ***Скіргайлы*** (брата Ягайлы). Заключэнне уніі было аблегчана ўзмацненнем улады Ягайлы і яго прымірэннем з ***Вітаўтам***, які вярнуўся з Прусіі і атрымаў ад Ягайлы ў якасці ўдзельнага княства Гародню і Падляшша. Акт Крэўскай уніі падпісалі Ягайла, князі троцкі Скіргайла, мсціслаўскі Лугвен, ноўгарад-северскі Карыбут, Вітаўт. Агульнымі галоўнымі фактарамі саюзу была барацьба абедзвюх дзяржаў з Тэўтонскім ордэнам, небяспека з боку якога ўзмацнілася і паграўжала стратай зямель Польшчы і ВКЛ. У стварэнні саюзу былі зацікаўлены як літоўскія і беларускія феадалы, так і польская шляхта (найперш малапольская), якая хацела спыніць вайсковыя канфлікты з ВКЛ з-за Валыні, а таксама каталіцкая царква, якая мірным шляхам атрымала магчымасць ахрысціць апошні язычніцкі народ у Еўропе. Абедзве дзяржавы аб'ядноўваў адзін манарх (праўда, ненадоўга), але кожная з іх мела сваю сістэму кіравання, праводзіла самастойную палітыку. Канчатковае зацвярджэнне уніі адбылося ў 1386 г. 11 студзеня прадстаўнікі Польшчы ў Ваўкавыску перадалі Ягайлу акт аб перадвыбранні яго каралём польскім і аддачы яму ў жонкі Ядвігі. 02.02.1386 г. адбыўся з'езд польскай шляхты ў Любліне, дзе Ягайлу аднагалосна абралі каралём Польшчы. 12.02.1386 г. Ягайла прыбыў у Кракаў, праз 3 дні прыняў з братамі Карыгайлам, Свідрыгайлам, Вігантам і сваімі баярамі каталіцтва і атрымаў імя Уладзіслаў. Вітаўт з праваслаўя перайшоў у каталіцтва. 18.02.1386 г. Ягайла ажаніўся з Ядвігай, а 04.03.1386 г. каранаваны польскай каралеўскай каронай як Уладзіслаў II. У 1387 г. утворана каталіцкае Віленскае біскупства, пры ўдзеле Ягайлы ахрышчана літоўскае язычніцкае насельніцтва. Першыя вынікі Крэўскай уніі былі дасягнуты, але ў 1390 г. Вітаўт аднавіў барацьбу за велікакняжацкі трон, якая скончылася кампрамісным ***Астраўскім пагадненнем 1392 г.*** Ягайла абвешчаны "вярхоўным князем" Літвы і Русі, а Вітаўт за-

стаўся фактычным кіраўніком дзяржавы, вялікім князем. Працягам Крэўскай уніі была ***Віленска-Радамская унія 1401 г.*** Аддаленыя вынікі Крэўскай уніі – гэта даволі трывалы дзяржаўны саюз (трымаўся на персанальнай уніі) ВКЛ і Польшчы на працягу XIV – XVI стст., да заключэння Люблінскай уніі 1569 г., якая стварыла ўжо федэратыўную дзяржаву – Рэч Паспалітую, паступовае збліжэнне дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Польшчы, а таксама культурнае збліжэнне вярхоў грамадства. Дзякуючы саюзу ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 г., адкрыць гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе ВКЛ з дапамогай Польшчы ўдалося стрымліваць націск з боку Маскоўскай дзяржавы. Адным з вынікаў уніі быў шырокі дыпламатычны выхад ВКЛ у Еўропу, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі краінамі Еўропы. [7]

**Прывілей 1387 г.**, заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены вялікім князем Ягайлам у Вільні 20.02.1387 г. пасля заключэння **Крэўскай уніі 1385 г**. Зацвярджаў феадальныя правы баяр, якія прынялі і прымалі хрышчэнне па каталіцкім абрадзе ў час хрысціянізацыі язычніцкай Літвы. Прывілей гарантаваў такім баярам поўную ўласнасць на іх родавыя маёнткі з правам свабодна распараджацца імі. Правы баяр-католікаў параўноўваліся з правамі шляхты Польскага каралеўства, што падкрэслівала інтэграцыйную палітыку Ягайлы. Прывілей дазваляў удовам баяр карыстацца маёнткамі мужа; пры іх паўторным выхадзе замуж маёнтак перадаваўся дзецям або бліжэйшым сваякам мужа-нябожчыка. Маёнткі і насельніцтва баяр вызваляліся ад розных работ на карысць дзяржавы, за выключэннем будаўніцтва і рамонту дзяржаўных замкаў. У тэксце няма згадак пра грашовыя і натуральныя павіннасці: іх па-ранейшаму выплачвала і выдавала насельніцтва баярскіх маёнткаў. Прывілей захаваў феадальную павіннасць баяр выходзіць у вайсковы паход за свой кошт. Калі ворага выганялі з тэрыторыі ВКЛ і абвяшчалася “пагоня”, то ў апалчэнні павінны былі ўдзельнічаць усе мужчыны, здольныя насіць зброю. Палітычнай мэтай прывілею было з’яднаць вакол вялікага князя літоўскіх баяр у барацьбе з незалежніцкімі тэндэнцыямі літоўскіх і беларускіх феадалаў ВКЛ. [8]

**Востраўскае пагадненне 1392 г.** Заключана 5 жніўня ў маёнтку Вострава каля Ліды паміж каралём польскім і вялікім князем літоўскім ***Ягайлам*** і князем гарадзенскім і троцкім ***Вітаўтам*** аб перадачы ўлады ў ВКЛ Вітаўту. Беларускія і літоўскія феадалы былі незадаволены ***Крэўскай уніяй 1385 г*** і палітыкай аб’яднання ВКЛ з Польшчай, таму яны аб’ядналіся ва-

кол Вітаўта, якому ў яго барацьбе супраць Ягайлы дапамагалі ваеннымі сіламі Тэўтонскі ордэн, дыпламатычна – яго зяць вялікі князь маскоўскі Васіль Дзмітрыевіч. Атрымаўшы некалькі перамог над войскамі Ягайлы, Вітаўт адмовіўся ад саюзу з Тэўтонскім ордэнам і пайшоў на пагадненне з каралём. У Вострава прыбылі Ягайла са сваёй жонкай Ядвігай – каралевай польскай, Вітаўт, князі з пануючай у ВКЛ дынастыі, беларускія і літоўскія феадалы. Паводле пагаднення, Вітаўт быў прызнаны старэйшым сярод родных і стрыечных братоў Ягайлы ў Літве, на Беларусі і Украіне, пажыццёвым намеснікам караля і фактычным кіраўніком ВКЛ, хоць пакуль што без тытула "вялікі князь", а з тытулам князя Літвы. Вітаўт абавязаўся захоўваць вернасць каралю, каралеве і польскай кароне. Вітаўт, літоўскія і беларускія феадалы, якія яго падтрымлівалі, змянілі знешнепалітычную арыентацыю на Польшчу, а не на Тэўтонскі ордэн. Гэта дало магчымасць узмацніць цэнтральную ўладу ў ВКЛ, пазбавіць сваякоў караля большай часткі іх улады на розных удзелах, а некаторых пазбавіць і ўдзелаў (Скіргайлу – Полацка, Свідрыгайлу – Віцебска, Карыбута – Навагародка, Фёдара Любартавіча – Валыні, Фёдара Карыятавіча – Падоліі, Уладзіміра Альгердавіча – Кіева). Неадназначнымі былі адносіны з Польшчай, якая спрабавала ўзмацніць сваю ўладу ў ВКЛ, што выклікала ў 1398 г. заключэнне тайнага пагаднення ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам (гл. ***Салінскі дагавор 1398 г.***). Але пасля вялікага паражэння ад татараў у ***бітве на Ворскле 1399 г.*** Вітаўт аднавіў ранейшыя адносіны з Польшчай, якія прывялі да заключэння ***Віленска-Радамскай уніі 1401 г.***, што стала юрыдычнай асновай саюзных адносін абедзвюх дзяржаў. [9]

## 4.3. ХРАНАЛОГІЯ

**1377 г.** – пачатак сумеснага праўлення Кейстута і Ягайлы (апошні атрымлівае тытул вялікага князя).

**1377 г.** – выгнанне з Полацка Андрэя Альгердавіча.

**1380 г**. – Ягайла выступае ў якасці саюзніка хана Мамая. Кулікоўская бітва.

**1381 г.** – заключэнне таемных пагадненняў Ягайлы з Тэўтонскім ордэнам.

**1381 – 1382 гг.** – кароткачасовае пазбаўленне Ягайлы ўлады. Пачатак унутрыдзяржаўнага канфлікта, захоп у палон Кейстута і Вітаўта. Забойства Кейстута і ўцёкі Вітаўта да крыжакоў. Вяртанне Андрэя Альгердавіча ў Полацк.

**1381 – 1384 гг.** – барацьба Вітаўта за вяртанне сваёй вотчыны ў ВКЛ.

**1384 г.** – разрыў саюза Вітаўта з крыжакамі, пачатак барацьбы супраць іх (сумесна з Ягайлам).

**1385 г., 14 жніўня** – заключэнне Крэўскай уніі.

**1385 – 1387 гг.** – барацьба Андрэя Полацкага супраць уніі.

**1386 г.** – хрышчэнне Ягайлы, атрыманне ім каралеўскага тытулу і шлюб з Ядзвігай.

**1387 г., 20 лютага** – выданне агульназемскага прывілею, што пашыраў правы каталіцкага насельніцтва.

**1387 г.** – заснаванне Віленскага біскупства.

**1387 г., 27 красавіка** – выданне Ягайлам прывілею князю Скіргайлу.

**1388 – 1392 гг**. – барацьба Вітаўта супраць уніі.

**1392 г., 5 жніўня** – заключэнне Востраўскага пагаднення паміж Ягайлам і Вітаўтам.

## 4.4. КРЫНІЦЫ

1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

3. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / скл. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

4. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

5. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / Изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

6. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р истор. наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

7. Полное собрание русских летописей – (АН СССР, Ин-т истории СССР) – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

## 4.5. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Коль, М. Крэўская унія / М. Коль // Человек. Цивилизация. Культура. VIII межвуз. научно-теоретическая конференция. Тезисы докладов. Минск, 18 апреля 2003. – Минск, 2003.

2. Лойка, П. Ад Крэва да Любліна / П. Лойка // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 4. – С. 9 – 12.

3. Смирнов, М. Ягелло и первое соединение Литвы с Польшей / М. Смирнов // Записки Новороссийского университета. – Одесса, 1863.

4. Цярохін, С. Таямніцы Крэўскай уніі / С. Цярохін // Беларуская мінуўшчына, 1995. – № 3 – С. 7 – 10.

5. Юхо, Я. А. Крэўская унія / Я. А. Юхо // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1985. – № 4.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Грыцкевіч, Анатоль. Ягайла / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 775 – 776.

2. Грыцкевіч, Анатоль. Вітаўт / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 447 – 448.

3. Варонін, Васіль. Андрэй Альгердавіч / В. Варонін // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 228 – 229.

4. Пазднякоў, Валерый. Ядвіга / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 776 – 777.

5. Пазднякоў, Валерый. Скіргайла / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 582.

6. Пазднякоў, Валерый. Кулікоўская бітва / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 164 – 165.

7. Грыцкевіч, Анатоль. Крэўская унія / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 159.

8. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1387 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 468.

9. Грыцкевіч, Анатоль. Востраўскае пагадненне / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 465.

# ТЭМА 5. КНЯЖАННЕ ВІТАЎТА, ЯГО ЎНУТРАНАЯ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

**Змест праграмы.** Ліквідацыя буйных княстваў і ўмацаванне пазіцый цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне.

Бітва на рацэ Ворскла і яе значэнне.

Пашырэнне агрэсіі нямецкіх феадалаў на ўсход. Чарговае збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польскай Каронай. “Вялікая вайна”. Разгром крыжакоў пад Грунвальдам.

Гарадзельскі прывілей 1413 г.

Рэлігійная палітыка Вітаўта.

Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 30-я гг. XV ст. і змены ў кіраўніцтве дзяржавай. Прывілеі вялікіх князёў літоўскіх праваслаўнай знаці 1432 і 1434 гг.

## 5.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 5.1.1. Агульная характарыстыка княжання Вітаўта

Пасля заключэння ***Востраўскага пагаднення 1392 г.*** Вітаўт фактычна стаў вялікім князем і распачаў самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку. Першачарговай палітычнай задачай Вітаўта было пераадоленне сепаратызму ў розных частках ВКЛ, які істотна павялічыўся за час дынастычнай барацьбы. Яго ўнутраная палітыка была накіравана на паступовую ліквідацыю буйных удзельных княстваў і ператварэнне іх у намесніцтвы.

Цэнтралізацыя дзяржавы мела пэўныя сацыяльна-эканамічныя вынікі. Перш за ўсё, павялічылася колькасць даходаў дзяржаўнага скарбу. У яго зараз ішлі ўсе падаткі і плацяжы, якія атрымлівалі раней удзельныя князі (розныя віды даніны грашыма і натураю, мытныя і судзебныя плацяжы). Вырасла таксама колькасць зямельных угоддзяў, якія знаходзіліся ў распараджэнні ўласна князя, што садзейнічала росту яго палітычнай магутнасці.

Разам з тым, Вітаўт не мог не ўлічваць мясцовыя асаблівасці кіравання, якія грунтаваліся на шматвекавых традыцыях. Дзеля забеспячэння лаяльнасці найбольш значных частак дзяржавы Вітаўт выдаваў ім ***абласныя прывілеі.***

Умацаванне ўлады Вітаўта дазволіла яму ўзняць пытанне аб пераглядзе адносін з Польшчай. У 1398 г. паміж дзяржавамі разгарнуўся канфлікт. Вітаўт заключыў з Ордэнам ***Салінскі дагавор***, які прадугледжваў дапамогу апошняга ВКЛ у пашырэнні ўплыву на рускія землі і ў барацьбе супраць

Арды. Неафіцыйна Вітаўт таксама заручыўся падтрымкай Ордэна пры дасягненні незалежнасці ад Польшчы.

Імкнучыся пашырыць свой уплыў на Залатую Арду, Вітаўт умяшаўся ў міжусобную барацьбу татарскіх ханаў і выступіў на баку хана ***Тахтамыша***. Спадзеючыся вярнуць Тахтамыша на цэнтральны пасад у Ардзе, Вітаўт арганізаваў вялікі паход на паўднёвыя стэпы. Аднак у ***бітве на Ворскле 1399 г.*** войска ВКЛ пацярпела сакрушальнае паражэнне.

Гэтае паражэнне значна аслабіла пазіцыі Вітаўта і не дазволіла яму пайсці на канчатковы разрыў з Польшчай. Болей таго, у 1401 г. была заключана ***Віленска-Радамская унія,*** якая прызнала палітычную адасобленасць ВКЛ, але толькі на час жыцця Вітаўта.

Цэнтралізатарскія памкненні Вітаўта і імкненне падпарадкаваць Пскоў, Ноўгарад, Смаленск выклікалі супрацьдзеянне Маскоўскага княства. У выніку ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1406 – 1408 гг.*** Ноўгарад прызнаў вярхоўную ўладу Вітаўта, а таксама яму падпарадкаваліся вярхоўскія княствы (Мцэнскае, Любуцкае, Адоеўскае, Казельскае і інш.). Граніца паміж ВКЛ і Маскоўскім вялікім княствам была вызначана па рацэ Угра. Умовы пагаднення замацаваў ***вечны мір 1408 г.***

У першае дзесяцігоддзе XV ст. абвастраюцца адносіны ВКЛ і Польшчы з Тэўтонскім ордэнам. У 1401 г. Вітаўт падтрымаў паўстанне ў Жамойці, што выклікала разгортванне вайны з ордэнам (скончылася падпісаннем ***Рацёнжскага міру 1404 г.***). Аднак нявырашанасць пытанняў па спрэчных тэрыторыях (Жамойць паміж ВКЛ і Ордэнам, Добжынская зямля паміж Польскім каралеўствам і Ордэнам) прывялі да новага канфлікту (***Вялікая вайна 1409 – 1411 гг.***). У ходзе вайны саюзнае войска Польшчы і ВКЛ атрымала перамогу ў вырашальнай ***Грунвальдскай бітве 15.07.1410 г.*** Вайна завяршылася заключэннем ***Тарунскага міру 1411 г.*** Крыжацкая агрэсія была спынена.

Чарговым этапам у развіцці адносін паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам стала заключэнне ***Гарадзельскай уніі 1413 г.*** Улада Вітаўта ў ВКЛ станавілася спадчыннай.

Умацаванне палітычных пазіцый дазволіла Вітаўту праводзіць самастойную палітыку ў рэлігійнай сферы. У 1416 г. з’езд духавенства ў Навагрудку аб’явіў аб адасабленні праваслаўнай царквы ВКЛ ад маскоўскай мітраполіі і абраў асобнага мітрапаліта – **Рыгора Цамблака**.

У 1420-я гг. Вітаўт дасягнуў піка сваёй магутнасці. У арбіту яго ўплыву былі ўключаны Крымская і Заволжская арда, Маскоўскае княства, Пскоў і Ноўгарад. У саюзе з ім былі Цвярское і Разанскае княствы, а таксама вярхоўскія княствы. Васіль Маскоўскі звяртаўся да яго “Господин и отец

мой”, што фактычна гаворыць аб пратэктараце ВКЛ над Маскоўскім княствам. Калі маскоўскі князь Васіль І памёр (1425 г.), Вітаўт паводле яго завяшчання стаў апекуном свайго ўнука, Васіля ІІ, і Маскоўскай дзяржавы ў цэлым. Уплыў на Маскву захоўваўся аж да смерці Вітаўта.

У 1429 г. Вітаўт узняў пытанне аб сваёй каранацыі ў якасці караля ВКЛ, каб канчаткова замацаваць суверэнітэт дзяржавы. Ён ініцыіраваў скліканне міжнароднага кангрэса ў Луцку, на якім побач з іншымі пытаннямі (барацьба з Турцыяй, гусіцкі рух) абмяркоўвалася і пытанне каранацыі. У жніўні 1430 г. Вітаўт склікаў новы з’езд у Вільні, дзе каранацыя мусіла адбыцца. Аднак жаданне Вітаўта каранавацца выклікала моцнае супрацьдзеянне з польскага боку. Каранацыя фактычна была сарвана (палякі затрымалі паслоў ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі, што везлі карону). Для састарэлага Вітаўта гэта было даволі сур’ёзным дыпламатычным паражэннем. Верагодна, яно пасадзейнічала таму, што ў хуткім часе (27 кастрычніка 1430 г.) вялікі князь памёр.

Такім чынам, перыяд княжання Вітаўта – час найбольшай магутнасці і максімальнага пашырэння тэрыторыі ВКЛ. Вітаўт распачаў працэс цэнтралізацыі дзяржавы, пры ім таксама быў пакладзены пачатак кансалідацыі феадальнага саслоўя ў ВКЛ. У часы Вітаўта беларуская мова, побач з лацінскай, набыла статус афіцыйнай.

### 5.1.2.Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 1430-я гг.

Пасля смерці Вітаўта на велікакняжацкі пасад большасцю галасоў князёў і баяр быў абраны ***Свідрыгайла Альгердавіч.*** Ён падтрымліваў праваслаўную частку феадальнага саслоўя, насуперак умовам ***Гарадзельскай уніі*** на кіруючыя пасады вылучаў праваслаўных баяр. Гэта выклікала незадаволенасць з боку феадалаў-католікаў, якія паспрабавалі арганізаваць супраць вялікага князя змову (1432 г.). Аднак Свідрыгайла быў папярэджаны і здолеў уцячы ў Полацк.

Новым вялікім князем быў абраны ***Жыгімонт Кейстутавіч***, уладу якога прызналі Вільня, Трокі, Коўна, Жамойць, Горадня, Берасце. Полаччына, Віцебшчына, Смаленшчына падтрымалі Свідрыгайлу, якога па-ранейшаму лічылі сваім вялікім князем. Паміж Жыгімонтам і Свідрыгайлам пачалася вайна, якая набыла характар грамадзянскай. Фактычна ўзніклі 2 дзяржавы – Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае. Жыгімонт быў прыхільнікам цесных сувязей з Польшчай і адразу ж узнавіў з ёй унію (***Гарадзенска-Троцкая унія 1432 г.***).

Разам з падпісаннем уніі Ягайла выдаў ***прывілей 1432 г.***, у якім праваслаўныя рускія, украінскія і беларускія баяры ўраўноўваліся ў правах з

феадаламі-каталікамі. Гэта было зроблена з мэтай пазбавіць Свідрыгайлу падтрымкі яго прыхільнікаў, аднак фактычна прывілей дзейнічаў толькі на тэрыторыі ВКЛ, падначаленай Жыгімонту.

Свідрыгайла заключыў саюз з цвярскім князем, Лівонскім ордэнам, яму аказвалі дапамогу добраахвотнікі з Еўропы. Увосень 1432 г. паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам распачаліся баявыя дзеянні. У лістападзе Свідрыгайла наблізіўся да Вільні, пасля бітвы пад Ашмянамі (08.01.1433 г.) вярнуўся ў Полацк. У жніўні 1433 г. ён захапіў Коўна, загадаў спаліць Заслаўе і Менск. Увосень 1433 г. Жыгімонт спрабаваў захапіць прыналежныя Свідрыгайлу Мсціслаў і Віцебск. Паходы Свідрыгайлы ў Літву працягваліся ў канцы 1433 г.

Каб пазбавіць Свідрыгайлу падтрымкі, Жыгімонт у Троках выдаў ***Прывілей 1434 г.***, у якім ужо ад свайго імя абвясціў ураўнаванне правоў праваслаўных баяр з правамі баяраў-католікаў. У тым жа 1434 г. памёр састарэлы Ягайла, і польскім каралём быў абраны яго сын Уладзіслаў.

Паступова прыхільнікі Свідрыгайлы пачалі пераходзіць на бок Жыгімонта. Тайныя перагаворы з ім распачалі смаленскія паны і мітрапаліт Герасім. Свідрыгайла загадаў арыштаваць мітрапалтіта і яго прыхільнікаў і пакараць смерцю, што падарвала яго аўтарытэт. У жніўні 1435 г. Свідрыгайла разам з войскамі Лівонскага ордэна зноў уварваўся ў Літву, аднак 1 верасня гэтае войска было разбіта на р. Швянтоі каля Вількаміра; мноства праваслаўных князёў загінула ці трапіла ў палон. Свідрыгайла вярнуўся ў Полацк, а затым накіраваўся ў Кіеў. Яму ўдалося захапіць усходняе Падолле, на яго бок перайшла і Валынь. Віцебск і Полацк летам 1436 г. перайшлі на бок Жыгімонта.

У жніўні 1437 г. Свідрыгайла прапанаваў польскаму каралю Уладзіславу III перадаць падначаленыя яму ўкраінскія землі ў падпарадкаванне польскай кароне, аднак гэта не задаволіла кіеўскіх і валынскіх баяр. Да канца 1430-х гг. Кіеў, Валынь і Падолле прызналі ўладу Жыгімонта.

Жыгімонт, замацаваўшыся ў ВКЛ, пачаў праводзіць самастойную палітыку адносна Польшчы, што выклікала незадаволенасць польскіх феадалаў. Сярод пануючага саслоўя ВКЛ таксама ўзмацнілася апазіцыя, што было выклікана рэпрэсіямі Жыгімонта, яго падазронасцю і вылучэннем на кіруючыя пасады дробных баяраў. Супраць вялікага князя была арганізавана змова, і ў 1440 г. ён быў забіты ў Троцкім замку.

## 5.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ.

**Тахтамыш** (? – 1406 гг.), хан Залатой Арды [1380 – 1395 гг.]. Сын Туй-Хаджы аглана, нашчадка Джучы. У выніку міжусобнай барацьбы вымушаны быў у 1370-я гг. шукаць прыстанішча ў сярэднеазіяцкага эміра Ці-

мура. Пасля паражэння золатаардынскага цемніка Мамая ў ***Кулікоўскай бітве 1380 г.*** заняў трон у Ардзе. У 1382 захапіў Маскву. У вайне 1389 – 1395 гг. супраць Цімура быў разбіты і ўцёк у ВКЛ. Быў паселены са сваёй дружынай у г. Ліда ў асабняку, які доўгі час называлі Тахтамышавым двором. Прызнаваўся многімі татарскімі феадаламі ханам у выгнанні. Вялікі князь літоўскі Вітаўт разлічваў вярнуць Тахтамышу рэальную ўладу ў Залатой Ардзе і атрымаць ад яго ярлык на Вялікае княства Уладзімірскае з цэнтрам у Маскве (заставалася васалам Арды). У 1397 і 1398 гг. Тахтамыш удзельнічаў разам з Вітаўтам у 2 паходах на Дон і ў Крым супраць Цімур-Кутлука – золатаардынскага стаўленіка Цімура. З гэтых паходаў Вітаўт і Тахтамыш прывялі шмат татарскіх сем'яў (з крымскіх татар – праціўнікаў Цімур-Кутлука), якія добраахвотна перасяліліся ў ВКЛ і былі размешчаны на р. Вака і ў в. Сорак Татар (цяпер у Літве), у Берасцейскім, Лідскім, Менскім, Навагародскім, Троцкім паветах, каля Чаркас і Канева (Украіна). У ***бітве на Ворскле 1399 г.*** войскі Вітаўта, у т. л. дружына Тахтамыша, былі разбіты Цімур-Кутлукам. Тахтамыш уцёк у Сібір, дзе быў забіты ханам Шадыбекам. [1]

**Соф'я Вітаўтаўна (**каля 1371 – 05.07.1453 гг.), вялікая княгіня маскоўская. Дачка вялікага князя літоўскага ***Вітаўта*** і яго другой жонкі, смаленскай княжны Ганны Святаслаўны; жонка маскоўскага вялікага князя Васіля I, маці Васіля II. Сасватана Васілём I у 1390 г., калі Вітаўт з сям'ёй знаходзіўся ў выгнанні ў сталіцы Нямецкага ордэна Мальбарку. Праз Пскоў і Ноўгарад прыбыла ў Маскву, шлюб адбыўся 01.09.1391 г. Соф'я Вітаўтаўна неаднаразова наведвала бацькоў у ВКЛ. Дзякуючы яе шлюбу паміж ВКЛ і Масквой усталяваліся працяглыя мірныя адносіны. У 1417 г. Васіль I у сваім завяшчанні перадаваў трон малалетняму сыну Васілю, апекунамі над ім і Соф'яй Вітаўтаўнай прызначаліся Вітаўт і ўдзельныя рускія князі. Васіль I памёр 27.02.1425 г. і намінальна перадаў уладу сыну Васілю II. На чале маскоўскага ўрада стала Соф'я Вітаўтаўна, якая павяла ўзброеную барацьбу з прэтэндэнтамі на трон Юрыем Дзмітрыевічам (братам Васіля I), яго сынамі Дзмітрыем Шамякам і Васілём Касавокім. Спярша Юрый Дзмітрыевіч быў вымушаны адмовіцца ад сваіх прэтэнзій, але ў 1433 г. захапіў маскоўскі трон. Соф'я Вітаўтаўна ўцякла ў Цвер, пасля ў Кастраму, дзе была зняволена. Пасля смерці Юрыя ў 1434 Васіль II зноў заняў трон. У міжусобную барацьбу былі ўцягнуты і татары. У 1446 г. Соф'я Вітаўтаўна была вымушана за вялізныя грошы выкупіць Васіля II з татарскага палону. Васіль Шамяка ў 1446 г. зняволіў Соф'ю Вітаўтаўну і выслаў яе ў Чухламу, потым у Каргапаль, але па патрабаванні Васіля II адпусціў. У 1451 г. Соф'я Вітаўтаўна ўдзельнічала ў абароне Масквы ад татараў. Перад смерцю прыняла манаства з імем Ефрасіння. [2]

**Свідрыгайла** (у праваслаўі Леў, у каталіцтве Баляслаў; каля 1370 – 10.02.1452 гг.), вялікі князь літоўскі [1430 –1432 гг.]. Сын вялікага князя Альгерда і яго другой жонкі, цвярской князёўны Ульяны, малодшы брат вялікага князя ***Ягайлы***. У лютым 1386 г. перад каранацыяй Ягайлы польскай каронай у Кракаве быў у складзе дэлегацыі ВКЛ і з праваслаўя перайшоў у каталіцтва. Атрымаў ад Ягайлы ва ўдзел Віцебскае княства. Калі гаспадаром ВКЛ стаў ***Вітаўт***, то ў 1393 г. пазбавіў Свідрыгайлу віцебскага пасада. З таго часу Свідрыгайла ў апазіцыі да Вітаўта. Быў высланы ў Кракаў, дзе ўтрымліваўся ў вязніцы. Пазней Ягайла вызваліў яго. У 1396 г. Свідрыгайла накіраваўся па дапамогу да крыжакоў у Лівонію і з лівонскімі атрадамі заняў Віцебск. Вітаўт зноў аблажыў і ўзяў горад. Паланёнага Свідрыгайлу адправілі ў Польшчу да Ягайлы, але Свідрыгайла зноў памірыўся з братам. У складзе войска ВКЛ Свідрыгайла ўдзельнічаў у ***бітве на Ворскле 1399 г.*** У 1400 г. атрымаў княжанне ў Падоллі, прынёс прысягу Вітаўту. Аднак у 1402 г. уцёк у Прусію, каб з дапамогай крыжакоў узысці на велікакняжацкі трон у Вільні; удзельнічаў у паходах крыжакоў на Літву. Пасля прымірэння *з* Вітаўтам у 1407 г. атрымаў Северскае княства (сталіца Бранск). У 1408 г. разам з групай князёў і баяр ад'ехаў да вялікага маскоўскага князя Васіля І, ад якога атрымаў гарады Уладзімір на Клязьме, Юр'еў-Польскі, Волак Ламскі, Ржэў і палову Каломенскага княства. Але яго план захапіць трон у Вільні з дапамогай маскоўскага войска не здзейсніўся. У 1409 г. Свідрыгайла вярнуўся ў ВКЛ, вёў перагаворы з крыжакамі аб звяржэнні Вітаўта. Восенню 1409 г. Свідрыгайла схоплены слугамі Вітаўта і пасаджаны ў замак Камянец. У сакавіку 1418 г. Свідрыгайлу ўдалося ўцячы ў Венгрыю. Ён зноў памірыўся з Ягайлам і Вітаўтам, у 1419 г. атрымаў ад апошняга ва ўдзел Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі і Бранск. Удзельнічаў у паходах Вітаўта, вялікай палітычнай актыўнасці не праяўляў, аднак карыстаўся вялікім аўтарытэтам у праваслаўных баяр ВКЛ. Пасля смерці Вітаўта па дамоўленасці з Ягайлам на з'ездзе паноў і баяр ВКЛ у 1430 г. Свідрыгайла большасцю галасоў быў абраны вялікім князем літоўскім. Адразу адбыўся канфлікт паміж польскімі войскамі і Свідрыгайлам. Польскія войскі ўступілі ў Падолле і захапілі памежныя замкі. Ягайла, які знаходзіўся ў Вільні, быў затрыманы і адпушчаны ў Польшчу пасля згоды вярнуць захопленыя замкі. У 1431 г. Свідрыгайла заключыў саюз з Тэўтонскім ордэнам, Вялікім Ноўгарадам і чэшскімі табарытамі з мэтай дасягнення поўнай незалежнасці ВКЛ ад польскага караля. Ваенныя дзеянні на Валыні і Падоллі працягваліся, Тэўтонскі ордэн таксама пачаў вайну з Польшчай. Каб пашырыць сваю апору ў ВКЛ, Свідрыгайла аддаваў дзяржаўныя пасады пераважна беларускім праваслаўным баярам, што выклікала неза-

давальненне літоўскага баярства. 01.09.1431 г. было падпісана перамір’е з Польшчай на 2 гады, у выніку якога Свідрыгайла быў прызнаны вялікім князем і ўладаром усіх зямель ВКЛ. Вясной 1432 г. у адказ на спробы польскіх феадалаў навязаць ВКЛ новую унію Свідрыгайла фактычна разарваў саюзныя адносіны з Польшчай і пацвердзіў саюз з Тэўтонскім ордэнам. У ВКЛ пры дапамозе польскіх паноў была арганізавана змова супраць Свідрыгайлы. У ноч на 01.09.1432 г. адбыўся дзяржаўны пераварот, змоўшчыкі спрабавалі забіць вялікага князя ў Ашмянах, але папярэджаны Свідрыгайла ўцёк у Полацк. Вялікім князем у Вільні быў абраны ***Жыгімонт Кейстутавіч***, уладу якога прызналі Літва, Жамойць, Падляшша, Берасцейская і Менская землі, прынёманскія валасці. Астатнія беларускія, украінскія і рускія землі падтрымалі Свідрыгайлу, які замацаваўся ў Віцебску. Паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам пачалася ***феадальная вайна 1432 – 1439 г.***, у якой Свідрыгайла пацярпеў паражэнне. Кароль Польшчы Уладзіслаў III (пляменнік Свідрыгайлы) выдзеліў яму невялікае княства ў Пакуцці (на поўдні Галіччыны). У 1440 г. Свідрыгайла спрабаваў вярнуць уладу ў ВКЛ. Пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440 г. вялікі князь ***Казімір IV*** Ягелончык аддаў Свідрыгайлу Валынскае княства, дзе Свідрыгайла панаваў да сваёй смерці. [3]

**Жыгімонт Кейстутавіч** (каля 1365 – 20.3.1440 гг.), вялікі князь літоўскі [1432 – 1440 гг.]. Малодшы сын вялікага князя ***Кейстута*** і Біруты, брат ***Вітаўта***. У час барацьбы за ўладу паміж Вітаўтам і вялікім князем ***Ягайлам*** быў зняволены апошнім (1382 – 1384 гг). У 1384 г. у Прусіі разам з Вітаўтам заключыў дагавор з Тэўтонскім ордэнам супраць Ягайлы, але ў 1386 г. прысягнуў вялікаму князю. У 1389 г. пасланы Вітаўтам у Прусію для перагавораў аб сумесным выступленні з Тэўтонскім ордэнам супраць Ягайлы. Да 1398 г. заложнік вялікага магістра ордэна ў крэпасці Марыенбург. Пасля вяртання атрымаў ад Вітаўта ва ўдзел Старадубскае княства. Удзельнік ***бітвы на Ворскле 1399 г.*** Удзельнічаў у перагаворах і заключэнні мірных дагавораў з Тэўтонскім ордэнам 1398, 1411, 1422 і 1431 гг., уній Польшчы з ВКЛ пачынаючы з 1401 г. Удзельнік ***Грунвальдскай бітвы 1410 г.*** У час панавання Вітаўта меў нязначны палітычны ўплыў на дзяржаўныя справы, цалкам падтрымліваў брата. Пасля смерці Вітаўта і абрання вялікім князем ***Свідрыгайлы*** ў 1432 г. удзельнічаў у змове супраць Свідрыгайлы часткі літоўскіх паноў і польскіх магнатаў, якія намагаліся ўзмацніць дзяржаўную унію Польшчы і ВКЛ і пашырыць польскі ўплыў на палітыку ВКЛ, непрыязна ставіліся да прызначэння на важнейшыя пасады баяр беларускага паходжання. Пасля ўцёкаў Свідрыгайлы ў Полацк Жыгі-

монт Кейстутавіч абвешчаны вялікім князем літоўскім. Яго ўладу прызналі Літва і больш цесна звязаныя з ею Жамойць, Падляшша, Берасцейская і Менская землі, прынёманскія воласці. Астатнія беларускія, украінскія і рускія землі падтрымалі Свідрыгайлу, які замацаваўся ў Віцебску. Паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам пачалася барацьба. Каб залучыць на свой бок беларускіх і ўкраінскіх феадалаў, Жыгімонт Кейстутавіч выдаў ***Прывілей 1434 г.***, паводле якога пашыраў на іх усе правы і прывілеі, дадзеныя Ягайлам літоўскім феадалам-католікам ***Прывілеем 1387 г.*** і ***Гарадзельскім прывілеем 1413 г.*** Але беларускія, украінскія і літоўскія феадалы не падтрымлівалі яго палітыкі падпарадкавання Польшчы. Каб пашырыць сваю сацыяльную апору, Жыгімонт Кейстутавіч пачаў вылучаць на дзяржаўныя пасады дробных літоўскіх і беларускіх баяр, што выклікала незадавальненне буйных феадалаў і князёў. Жыгімонт Кейстутавіч быў занадта падазроным, шукаў уяўных змоўшчыкаў, жорстка караў іх, нягледзячы на свае ж гарантыі, канфіскоўваў маёнткі, выносіў смяротныя прыгаворы. У апошнія гады панавання пачаў аддзяляцца ад Польшчы, страціў яе падтрымку. Супраць Жыгімонта Кейстутавіча была арганізавана змова ўкраінскіх князёў Івана і Аляксандра Чартарыйскіх і літоўскіх паноў – віленскага ваяводы Доўгірда і троцкага ваяводы Лялюша, якія былі звязаны з Свідрыгайлам. У выніку змовы Жыгімонт Кейстутавіч забіты ў Троцкім замку. [4]

**Салінскі дагавор 1398 г**, Залін-Вердэнскі дагавор, дагавор паміж ВКЛ і Нямецкім ордэнам. Тэкст дагавора ўзгоднены 23.04.1398 г. у Гародні. Абмен дагаворнымі граматамі паміж вялікім князем літоўскім Вітаўтам і вялікім магістрам ордэна Конрадам фон Юнгінгенам адбыўся 12.10.1398 г. на востраве Салін на Нёмане, каля вусця р. Нявежыс. Паводле Салінскага дагавора прадугледжвалася дапамога ВКЛ ордэну для заваявання Пскова і ордэнская падтрымка ВКЛ для авалодання Вялікім Ноўгарадам і паходу супраць Залатой Арды. Вітаўт абяцаў саступіць ордэну Жамойць да Нявежыса і палову Судавы (Дайнавы), у сваю чаргу ордэн абавязваўся не падтрымліваць прэтэнзій князя Свідрыгайлы на трон ВКЛ. Неафіцыйна Вітаўт заручыўся згодай ордэна на ажыццяўленне сваіх планаў дабівацца поўнай незалежнасці ад Польшчы. На святкаванні ў гонар падпісання Салінскага дагавора Вітаўт быў аднадушна абвешчаны феадаламі ВКЛ “каралём Літвы і Русі”. Гэта выклікала насцярожанае стаўленне да дагавора польскага караля Ягайлы, а планы захопу Ноўгарада і Пскова прывялі да пагаршэння адносін ВКЛ з гэтымі рэспублікамі, а таксама Маскоўскім і Цвярскім вялікім княствамі. Рэальнай падтрымкі ў рэалізацыі сваіх памкненняў Вітаўт не атрымаў, што, у прыватнасці, прывяло да паражэння войск

ВКЛ у ***бітве на Ворскле 1399 г.*** Умовы Салінскага дагавору былі ўдакладнены ***Рацёнжскім дагаворам 1404 г.***, да якога далучылася і Польшча. [5]

**Бітва на Ворскле 1399 г.** Адбылася 12 жніўня паміж войскамі ВКЛ на чале з вялікім князем Вітаўтам і Залатой Арды на чале з ханам Цімур-Кутлукам і цемнікам Едыгеем каля р. Ворскла (левы прыток Дняпра, відаць, на тым самым полі, дзе ў 1709 г. адбылася Палтаўская бітва). Саюзнікамі Вітаўта былі некалькі тысяч татараў, прыведзеных ханам Тахтамышам. Вітаўт абяцаў Тахтамышу дапамогу ў захопе ханскага трона Залатой Арды, за што Тахтамыш павінен быў выдаць яму ярлык на Маскоўскае вялікае княства, Ноўгарад, Пскоў. Вітаўта падтрымаў і Папа Рымскі, які абвясціў крыжовы паход на Залатую Арду. У войску ВКЛ былі атрады з Польшчы, Тэўтонскага ордэна, Валахіі. Аднак асноўную сілу войска ў 15 – 20 тыс. чал. складалі харугвы прыкладна 50 князёў ВКЛ. Войска Залатой Арды (відаць, па колькасці большае за войска ВКЛ) сустрэла Вітаўта ў межах Залатой Арды каля пераправы цераз р. Ворскла. Спачатку татары зацягвалі час перамовамі, аднак з падыходам асноўных татарскіх сіл войска Вітаўта было акружана і разбіта, тысячы воінаў загінулі ці трапілі ў палон. Загінула не менш за 16 літоўска-беларускіх, шэраг польскіх паноў, у т. л. кракаўскі кашталян Спытка. Вітаўт і Тахтамыш з рэшткамі войска ўцяклі. Перамога ў гэтай бітве дазволіла Цімур-Кутлуку зрабіць спусташальны набег на землі Кіеўшчыны і Валыні. ВКЛ захавала кантроль над паўночным Прычарнамор’ем, хоць правaліліся планы Вітаўта дамагчыся панавання над усёй Руссю. Паражэнне ў бітве стала адной з прычын, якая вымусіла падпісаць ***Віленска-Радамскую унію 1401 г.*** ВКЛ з Польшчай. [6]

**Жамойцкае паўстанне 1401 г.** выклікана незадавальненнем палітыкай улад Нямецкага ордэна, якому Жамойць была перададзена паводле ***Салінскага дагавора 1398 г.*** Жамойты адрэзалі крыжакоў ад асноўных сіл і спалілі іх 2 новыя замкі. Была захоплена Клайпеда (Мемель). Асабліва ўпарта засіллю крыжакоў і ўвядзенню паншчыны супраціўляліся свабодныя сяляне, якія складалі большасць насельніцтва краю. Пасля выгнання крыжакоў Жамойць аб’ядналася з ВКЛ. Аднак на баку ордэна выступіў князь Свідрыгайла, войска якога разам з крыжацкім дайшло да Вільні (1402 г.). Намаганні вялікага князя літоўскага Вітаўта захапіць Жамойць не мелі поспеху. Паводле ***Рацёнжскага даговора 1404 г.*** Жамойць зноў перададзена Нямецкаму ордэну. [7]

**Віленска-Радамская унія 1401 г.**, дзяржаўны саюз ВКЛ і Польшчы. Заключэнню уніі папярэднічаў разгром войска Вітаўта ў ***бітве на Ворскле***

***1399 г.*** і рост уплыву князя Свідрыгайлы, які прэтэндаваў на ўладу ў ВКЛ. У гэтых умовах Вітаўт згадзіўся на заключэнне новага дагавора з польскім каралём Уладзіславам ІІ (Ягайлам). Акт, што заклаў асновы новых узаемадачыненняў паміж ВКЛ і Польшчай, Ягайла выдаў у канцы 1400 г. каля возера Круды паміж Гародняй і Мераччу (не захаваўся). 18.01.1401 г. у Вільні Вітаўт выдаў прысяжны акт Ягайлу, які перадаў яму ў пажыццёвае трыманне ВКЛ разам з рускімі ўдзельнымі княствамі. Ягайла захаваў тытул вярхоўнага князя літоўскага, а Вітаўт афіцыйна набыў тытул вялікага князя літоўскага (фактычна ім быў паводле ўмоў ***Востраўскага пагаднення 1392 г.***). Вітаўт стаў пажыццёвым гаспадаром ВКЛ і атрымаў поўную свабоду ў вырашэнні ўнутраных спраў. Пасля яго смерці ВКЛ павінна было перайсці да Ягайлы і яго нашчадкаў. Польскі бок абяцаў, што ў выпадку смерці Ягайлы і згасання яго дынастыі баяры ВКЛ будуць удзельнічаць у выбарах новага агульнага манарха. 18.01.1401 г. у Вільні біскупы, князі і баяры ВКЛ выдалі акт, у якім абавязаліся не парушаць дагавору паміж Ягайлам і Вітаўтам (да яго было прывешана 40 пячатак). Польскія паны аналагічны акт выдалі 11.03.1401 г. у Радаме (з 49 пячаткамі). Упершыню унія паміж ВКЛ і Польшчай набыла характар дагавора паміж двума “палітычнымі народамі”. Упершыню ў вырашэнні дзяржаўна-прававых спраў ВКЛ з Польскім каралеўствам удзельнічала баярства рускіх зямель (з абодвух бакоў). У выніку заключэння Віленска-Радамскай уніі ВКЛ было адроджана не толькі як тэрытарыяльная адзінка (што адбылося ў 1392 г.), але і як дзяржаўнае ўтварэнне (хоць і падлеглае Польшчы), тым самым адбылося юрыдычнае аднаўленне дзяржаўнасці ВКЛ. [8]

**Рацёнжскі дагавор 1404 г.** Заключаны каля замка Рацёнжак (Куявія, цяпер Куяўска-Паморскае ваяводства, Польшча) 23 мая паміж Тэўтонскім ордэнам, Польшчай і ВКЛ у выніку асабістай сустрэчы вялікага магістра Конрада фон Юнгінгена, караля Ягайлы і вялікага князя Вітаўта. Да заключэння Рацёнжскага дагавору крыжакі, спасылаючыся на невыкананне Вітаўтам умовы ***Салінскага дагавора 1398 г.*** аб перадачы ордэну Жамойці, працягвалі агрэсію супраць ВКЛ, падтрымлівалі Свідрыгайлу як прэтэндэнта на велікакняжацкі трон. Пры гэтым яны ігнаравалі булу папы Баніфацыя IX ад 09.09.1403 г., якая афіцыйна забараняла крыжовыя паходы супраць ВКЛ. Новае пагадненне паміж ордэнам і ВКЛ у асноўным паўтарала ўмовы Салінскага дагавора; ВКЛ прызнавала ўсходнюю частку Жамойці за ордэнам, Вітаўт абавязваўся не прымаць да сябе збеглых жамойтаў і дапамагаць ордэну супраць любых ворагаў, акрамя Польшчы; ордэн мусіў садзейнічаць ВКЛ у здабыцці Смаленска і Ноўгарада. Польшча атрымлівала

права выкупіць у ордэна Дабжыньскую зямлю за 40 тыс. залатых. Паводле дагавора паміж Ягайлам і Вітаўтам апошняму пажыццёва перадавалася Заходняе Падолле, якім у якасці васала Вітаўта мусіў кіраваць Свідрыгайла. За гэта 20.09.1404 г. у Камянцы-Падольскім Вітаўт прынёс Ягайлу новую васальную прысягу. Рацёнжскі дагавор, заключаны на 10 гадоў, дзейнічаў да пачатку ***Вялікай вайны 1409 – 1411 гг.*** [9]

**Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1406 – 1408 гг.** Была выклікана бояззю Масквы перад далейшым ўзмацненнем ВКЛ пасля канчатковага падпарадкавання вялікім князем Вітаўтам у 1404 г. Смаленскага княства. У лютым 1406 г. Вітаўт напаў на Пскоў, што выклікала ў маі беспаспяховы паход вялікага князя маскоўскага Васіля I на Вязьму і Сярпейск. У адказ Вітаўт зрабіў рэйд у глыб маскоўскай тэрыторыі, ваяваў у ваколіцах Мажайска, захапіў Варатынск і Казельск, дзе пасадзіў намеснікаў. На яго баку ваявалі жамойты на чале з крыжацкім галавой Жамойці, атрады комтура Рагнеты і палякаў (жамойты, немцы і палякі былі ў войску Вітаўта і ў наступныя гады). У гэты час пскоўскія ўладанні ваявалі саюзнікі Вітаўта – лівонскія рыцары. У верасні 1406 г. маскоўскае войска з дапамогай татараў і вялікага князя цвярскога Івана Міхайлавіча рушыла да межаў ВКЛ і выйшла да войска Вітаўта на рацэ Ака каля р. Плава. Не пачынаючы бітвы, бакі заключылі перамір’е да 15.05.1407 г. Ужо 20.05.1407 г. Вітаўт спаліў Адоеў, ваяваў на тэрыторыі Навасільскага княства, у маскоўскіх землях. Васіль I у жніўні 1407 г. рушыў з войскам на ўладанні Вітаўта, спаліў г. Дзмітравец і падышоў пад Вязьму, дзе зноў без бою заключана перамір’е да 29.06.1408 г. У ліпені 1408 г. у Маскву збег князь Свідрыгайла з вялікай групай менш значных князёў і баяраў. Увосень 1408 г. праціўнікі сышліся ў вусці р. Угра і пасля некалькіх дзён стаяння “взяша мир вечный”. У летапісах адзначана, што мір быў заключаны “по давному”, г. зн. захавалася старая мяжа паміж Маскоўскім вялікім княствам і смаленскімі ўладаннямі ВКЛ, у т. л. па р. Угра, аднак у час вайны Вітаўт здолеў замацавацца на землях Верхняй Акі, падпарадкаваць сабе Мцэнск, Любуцк, Карачаў, Бялёў і інш. [10]

**Жамойцкае паўстанне 1409 г.** стала працягам ранейшай барацьбы жамойтаў з крыжакамі. Пачалося 31 мая. Яго неафіцыйна падтрымаў Вітаўт, які прыслаў на дапамогу атрад коннікаў. Паўстанцы выгналі крыжакоў з галоўных замкаў і пачалі наступленне на Клайпеду. Вызваленая Жамойць прызнала ўладу Вітаўта. У руках Нямецкага ордэна засталіся прыбярэжныя землі з Клайпедай. Дапамога ВКЛ жамойтам стала адной з прычын ***Вялікай вайны 1409 – 1411 гг.*** і ***Грунвальдскай бітвы 1410 г.*** [11]

**Вялікая вайна 1409 – 1411 гг.,** вайна ВКЛ і Польскага каралеўства супраць Нямецкага ордэна з-за спрэчных тэрыторый (Добжынская зямля, Памор'е, Новая Марка, Жамойць). Непасрэднай падставай развязвання Вялікай вайны стала жамойцкае паўстанне супраць уладаў ордэна, якое пачалося ў канцы мая 1409 г. і было падтрымана вялікім князем Вітаўтам. Калі Польшча ў канфлікце заняла бок Вітаўта, вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген 06.08.1409 г. абвясціў Ягайлу вайну. Ордэнскае войска ўвайшло ў Добжынскую зямлю і паўночныя Куявы і хутка авалодала імі. Польшча прайграла гэты этап вайны. Армія ВКЛ, ваюючы асобна, заняла Жамойць, пакінутую нямецкімі рыцарамі. 08.10.1409 г. Польшча і ордэн падпісалі перамір'е да 26.06.1410 г. (на ВКЛ яно не распаўсюджвалася, дагавор аб перамір'і з Вітаўтам ордэн падпісаў толькі 26.05.1410 г.). Бакі выкарысталі час для актыўнай ваеннай і дыпламатычнай падрыхтоўкі да вырашальнай сутычкі. Адначасова канфлікт спрабавалі вырашыць праз міжнародны суд, аднак рашэнне суддзі чэшскага караля Вацлава IV ад 15.02.1410 г. пакінула ордэну правы на спрэчныя землі, таму Ягайла і Вітаўт не пагадзіліся з такім прысудам і не прызналі яго. 08 – 10.12.1409 г. у Берасці таемна прайшла іх ваенная нарада, на якой быў распрацаваны стратэгічны план летняй кампаніі. Было вырашана аб'яднаць сілы і скіраваць удар на Мальбарк, каб прымусіць ордэн прыняць генеральную бітву ў полі і, карыстаючыся вялікай колькаснай перавагай, разграміць яго армію.

Рыхтуючыся да вайны, Ульрых фон Юнгінген 20.12.1409 г. падпісаў у Будзе антыпольскі дагавор з венгерскім каралём Жыгімонтам Люксембургскім, аднак не атрымаў ад яго ніякай дапамогі. Інфлянцкі ордэн таксама ўхіліўся ад удзелу ў генеральнай бітве і прыслаў свае сілы запозна. Ваенныя дзеянні саюзнікаў пачаліся адразу пасля заканчэння перамір'я (26.06.1410 г.), але па прапанове Ульрыха фон Юнгінгена яго тэрмін быў прадоўжаны да 04.07.1410 г. За гэты час Ягайла і Вітаўт злучылі каля Чэрвіньска свае сілы, пераправіліся цераз Віслу на тэрыторыю ордэна і рушылі ў кірунку Мальбарка. Кіраўніцтва ордэна было дэзарыентавана манеўрамі праціўніка і не чакала з'яўлення яго аб'яднанай арміі на сваёй зямлі. Тым не менш, вялікі магістр паспеў своечасова перавесці сілы на поўдзень Прусіі, каб перакрыць шлях на сталіцу. 10.07.1410 г. ён спаткаў армію саюзнікаў на ўмацаванай пераправе каля Кужэнтніка, але Ягайла ўхіліўся ад бітвы і адвёў сілы назад, каб потым зноў павярнуць на Мальбарк. Ульрых фон Юнгінген пайшоў напярэймы і 15 ліпеня сутыкнуўся з саюзнікамі недалёка ад Стэмбарка (Таненберга) і Грунвальда (Грунфельда), на полі паміж якімі і адбылася генеральная бітва (гл. ***Грунвальдская бітва 1410 г.***). Для ордэна яна скончылася ваеннай катастрофай: загінула ці трапіла ў палон больш за

2/3 яго арміі. Пасля нядоўгага адпачынку на полі бітвы армія Вітаўта і Ягайлы рушыла на Мальбарк, займаючы па дарозе прускія гарады і замкі. 25.07.1410 г. сталіца была ўзята ў аблогу, але Генрых фон Плаўэн паспеў падрыхтаваць яе да абароны, сабраўшы каля 4 тыс. рыцараў. На дапамогу яму паспяшаліся рыцары з Інфлянцкага ордэна і Германскай імперыі. З інфлянцкім маршалам Б. Геельманам, які прывёў да Мальбарка 2 тысячы рыцараў, 08.09.1410 г. Вітаўт заключыў перамір'е, а 19.09.1410 г. зняў аблогу і накіраваў армію ВКЛ дамоў. 22.09.1410 г. пачаў адводзіць польскую армію і Ягайла. Так, нягледзячы на двухмесячную аблогу, Мальбарк выстаяў. Абараніўшы сталіцу, ордэн змог хутка вярнуць усе свае замкі ў Прусіі, занятыя саюзнікамі пасля бітвы пад Грунвальдам, і аднавіць узброеныя сілы. У кастрычніку 1410 г. Вітаўт зноў збіраў войска для далейшых дзеянняў, аднак да новага паходу ў Прусію не дайшло. Перад пагрозай вайны на два фронты (з ордэнам і яго саюзнікам імператарам Жыгімонтам Люксембургскім) Ягайла і Вітаўт пагадзіліся на прымірэнне з ордэнскай дзяржавай. Быў падпісаны ***Тарунскі мір 1411 г.*** Ордэн пайшоў на значныя тэрытарыяльныя саступкі: адмовіўся ад Жамойці і яцвяжскіх земляў на карысць ВКЛ (толькі на перыяд жыцця Ягайлы і Вітаўта), а Польскаму каралеўству вярнуў Добжынскую зямлю і абавязаўся выплаціць 100 тыс. коп чэшскіх грошаў у якасці выкупу за палонных. Пытанне прыналежнасці Дрэздэнка і Сэнтака перадавалася на міжнародны арбітражны разгляд, але Гданьскае Памор'е і Хелмінская зямля заставаліся ў межах ордэнскай дзяржавы. У выніку вайны Нямецкі ордэн страціў сваё дамінуючае становішча ў Балтыйскім рэгіёне, яго ваенны і асабліва эканамічны патэнцыял быў моцна падарваны. [12]

**Берасцейская сустрэча 1409 г.,** перагаворы ў Берасці ў час ***Вялікай вайны 1409 – 1411 гг.*** паміж каралём Польшчы Ягайлам і вялікім князем ВКЛ Вітаўтам. На сустрэчы ў Берасці ў снежні 1409 г. на працягу 9 дзён былі прыняты рашэнні пра план летняй кампаніі 1410 г. супраць Нямецкага ордэна і далейшы ход вайны, час і месца збору аб'яднаных ваенных сіл, пабудову пантоннага моста для пераправы цераз Віслу. На берасцейскай сустрэчы прысутнічаў хан Джэлал-ад-Дзін (сын Тахтамыша), якому падпарадкоўвалася залатаардынская конніца, што была на службе ВКЛ. Паводле дамоўленасці саюзная армія складалася з 91 харугвы (палка), з іх 51 рыхтавала Польшча, 40 – ВКЛ. У склад войска ВКЛ уваходзілі Берасцейская, Віцебская, Ваўкавыская, Дарагічынская, Лідская, Пінская, Полацкая і іншыя харугвы, татарская конніца, а таксама валашскія, чэшска-мараўскія, венгерскія атрады. План, распрацаваны ў час берасцейскай сустрэчы, здзейснены 15.06.1410 г. у ходзе ***Грунвальдскай бітвы***. [13]

**Грунвальдская бітва 1410 г.,** вырашальная бітва ***Вялікай вайны 1409 – 1411 гг.*** паміж ВКЛ і Польшчай з аднаго боку і Тэўтонскім ордэнам з другога. Адбылася 15.07.1410 г. каля населеных пунктаў Грунвальд і Таненберг на тэрыторыі ордэна (цяпер Вармінска-Мазурскае ваяводства, Польшча). З'явілася галоўным этапам вайны, план якой быў распрацаваны польскім каралём Ягайлам і вялікім князем літоўскім Вітаўтам на ***Берасцейскай сустрэчы 1409 г.*** У пачатку ліпеня 1410 г. войскі саюзнікаў (каля 30 – 40 тыс. чал.) злучыліся ў раёне Казініц і рушылі на сталіцу ордэна Мальбарк (Марыенбург). 15 ліпеня яны былі вымушаны прыняць бой на адкрытай мясцовасці з крыжацкім войскам (каля 15 – 20 тыс. чал.). Войска крыжакоў (уваходзілі таксама рыцары з Германіі, Англіі, Францыі, Швейцарыі, Чэхіі і іншых краін) складалася з 51 харугвы, войска ВКЛ і Польшчы (уваходзілі таксама татары саюзнага Вітаўту хана Джэлал-ад-Дзіна і наёмнікі) – з 90 харугваў, 40 з іх належалі ВКЛ (Берасцейская, Ваўкавыская, Віцебская, Гарадзенская, Дарагічынская, Ковенская, Лідская, Мсціслаўская, Навагародская, Пінская, Полацкая, Смаленская, Старадубская, Троцкая і інш.). Крыжакі занялі больш зручную для атакі пазіцыю на ўзвышшы. Перад баявымі парадкамі крыжакоў стаялі гарматы і арбалетчыкі. Войскі саюзнікаў размяшчаліся трыма лініямі на беразе р. Марша. Бітва пачалася атакай 1-й лініі крыла Вітаўта і змешчаных на яе правым флангу татараў. Атакуючых сустрэлі гарматным агнём, потым супраць іх рушыла левае крыло крыжацкага войска, сітуацыя схілілася на іх карысць. Верныя сваёй улюбёнай тактыцы татары арганізавалі прытворныя ўцёкі. Услед за імі пабегла 1-я лінія войска ВКЛ, акрамя 3 харугваў са Смаленскай зямлі (Мсціслаўскай, Смаленскай і няпэўнай прыналежнасці) на чале з мсціслаўскім князем Лугвенем. Націск крыжакоў спынілі 2-я і 3-я лініі войск ***Вітаўта.*** Адначасова 1-я лінія палякаў атакавала правае крыло крыжакоў. Атака была няўдалая, крыжакі ледзь не захапілі вялікі каралеўскі сцяг. Становішча выправілася з увядзеннем 2-й польскай лініі. Пасля 6 гадзін напружанай бітвы сілы ордэна пачалі адкочвацца да свайго лагера. Імкнучыся пераламіць ход бітвы, вялікі магістр ордэна Ульрых фон Юнгінген павёў у наступленне апошнія 16 харугваў рэзерву. Яны прарвалі фронт і выйшлі ў тыл польскага войска, але былі акружаны і знішчаны, загінуў і сам вялікі магістр. У рукі саюзнікаў трапілі ўмацаваны лагер крыжакоў і ўсе іх сцягі. Паражэнне Тэўтонскага ордэна ў Грунвальдскай бітве абумовіла вынік вайны ў цэлым. Паводле ***Тарунскага міру 1411 г.*** ва ўладанне Польшчы і ВКЛ адышлі Добжынская і Жамойцкая землі. Магутнасць ордэна была падарвана. [14]

**Тарунскі мір 1411 г.,** мірны дагавор паміж Нямецкім ордэнам з аднаго боку і ***Польскім каралеўствам*** і ВКЛ з другога, падпісаны 1 лютага ў Торуні. Завяршыў ***Вялікую вайну 1409 – 1411 гг.***, адлюстраваў новую расстаноўку сіл у Цэнтральна-Усходняй. Еўропе. Пасля ***Грунвальдскай бітвы 1410 г.*** Нямецкі ордэн страціў дамінаванне ў Балтыйскім рэгіёне, аднак рыхтаваўся да рэваншу. Кароль польскі Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт перад пагрозай вайны на 2 фронты (з ордэнам і яго саюзнікам германскім імператарам Жыгімонтам Люксембургскім) пагадзіліся на часовае прымірэнне з ордэнскай дзяржавай. У дагаворы ён адмовіўся ад ***Жамойці*** і яцвяжскіх зямель на карысць ВКЛ (праўда, толькі на перыяд жыцця Ягайлы і Вітаўта), а Польскаму каралеўству вярнуў Добжынскую зямлю і абавязаўся выплаціць 100 тыс. коп чэшскіх грошаў. Гданьскае Памор'е і Хелмская зямля заставаліся ў межах ордэнскай дзяржаўнасці. Палавінчаты характар Тарунскага міру абумовіў далейшае нарастанне напружанасці паміж яго ўдзельнікамі і іх падрыхтоўку да новай вайны. [15]

**Гарадзельская унія 1413 г.,** саюз ВКЛ з Польшчай, юрыдычна замацаваны ў 3 граматах (прывілеях) 02.10.1413 г. у замку Гарадло на р. Заходні Буг. Першая грамата выдадзена ад імя 47 польскіх феадалаў, якія надзялялі 47 феадалаў-католікаў ВКЛ сваімі гербамі і тым самым прымалі іх у сваё гербавае брацтва. У другой грамаце (да яе было прывешана 45 пячатак феадалаў ВКЛ) феадалы-католікі прымалі гербы польскіх феадалаў і абяцалі быць з імі ў вечнай дружбе і саюзе. У выпадку смерці вялікага князя Вітаўта яны абяцалі не выбіраць сабе князя без парады і згоды польскіх феадалаў. Тыя, у сваю чаргу, у выпадку смерці караля Ягайлы таксама не павінны былі выбіраць новага караля без парады і згоды вялікага князя Вітаўта і феадалаў ВКЛ. У трэцяй грамаце, якая ўвайшла ў гісторыю як ***Гарадзельскі прывілей 1413 г.***, польскі кароль Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт абяцалі прызначаць на дзяржаўныя пасады феадалаў-католікаў, якія прынялі польскія гербы, і дазволіць ім свабодна распараджацца маёмасцю ў сваіх маёнтках і тым самым павысіць іх грамадскае становішча, даваць ільготы касцёлам, кляштарам і інш., каталіцкім установам. У грамаце абавяшчалася аб'яднанне ВКЛ з Польшчай, аднак гарантавалася захаванне адасобленасці і нязменнасці ўлады вялікага князя, тым самым захоўвалася самастойнасць ВКЛ. Гарадзельская унія ўмацоўвала сілы ВКЛ і Польшчы ў барацьбе з замежнай агрэсіяй, а таксама мела на мэце задобрыць і супакоіць рымскую курыю, якой быў нанесены ўдар у выніку паражэння Тэўтонскага ордэна ў ***Грунвальдскай бітве 1410 г.*** [16]

**Гарадзельскі прывілей 1413 г.,** заканадаўчы акт, які юрыдычна замацоўваў ***Гарадзельскую унію 1413 г.***, выдадзены ад імя караля Польшчы Ягайлы і вялікага князя літоўскага Вітаўта. Меў на мэце ўмацаванне і пашырэнне каталіцызму ў ВКЛ. У прывілеі канстатавалася, што з прыняццем каталіцтва ВКЛ “далучаецца, уключаецца, злучаецца, перадаецца” Польскаму каралеўству. Усе касцёлы і каталіцкі клір забяспечваюцца ўсімі правамі і свабодамі згодна са звычаямі Польскага каралеўства. Паны, шляхта і баяры ВКЛ, якія прымуць каталіцкую веру і атрымаюць гербы, могуць карыстацца прывілеямі і падараваннямі як і польскія паны і шляхта, пацвярджаліся іх правы на свабоднае распараджэнне сваёй маёмасцю і атрыманне спадчыны. Гарантаваліся правы жанчын на валоданне маёнткамі. Паны і шляхта ВКЛ павінны былі захоўваць пастаянства і вернасць каралю Ягайлу і вялікаму князю Вітаўту. Гарадзельскі прывілей прадугледжваў увядзенне пасад ваяводы і кашталяна ў Вільні, Троках і іншых месцах. Асабліва важнае значэнне меў артыкул, у якім замацоўвалася правіла, што пасля смерці Вітаўта паны і шляхта ВКЛ не павінны былі выбіраць сабе вялікага князя без згоды Ягайлы і польскіх феадалаў, а тыя пасля смерці Ягайлы таксама не павінны былі выбіраць новага караля без згоды Вітаўта, паноў і шляхты ВКЛ. Гэты артыкул, які ўпершыню заканадаўча замацоўваў выбранне вялікага князя, супярэчыў і абвяргаў змест першага артыкула, у якім пацвярджалася зліццё ВКЛ з Польшчай, бо калі выбіраўся асобны вялікі князь, то захоўвалася самастойнасць дзяржавы. А канстатацыя факта, што караля Польшчы павінны былі выбіраць толькі са згоды Вітаўта і феадалаў ВКЛ, сведчыць аб раўнапраўным становішчы ВКЛ і Польскага каралеўства. Прывілей прадугледжваў магчымасць склікання агульных соймаў феадалаў Польшчы і ВКЛ. Сцвярджэнне, што ўсе некатолікі, у асноўным праваслаўныя (а яны складалі большасць насельніцтва княства), не павінны былі дапускацца на дзяржаўныя пасады і засядаць у панскай радзе, мела ідэалагічны, а не практычны характар, бо большасць мясцовага кіраўніцтва і значная частка паноў-рады належалі да праваслаўнай веры. А ўсе напышлівыя фразы аб зліцці, злучэнні, далучэнні і ўключэнні ВКЛ у склад Польшчы не мелі ў той час рэальнага значэння, бо традыцыя ўзаемаадносін паміж Польшчай і ВКЛ, якая склалася на аснове асабістай (персанальнай) уніі, не мянялася. [17]

**Мельнскі мір 1422 г.** Заключаны паміж Польшчай і ВКЛ з аднаго боку і Тэўтонскім ордэнам з другога 27 верасня каля воз. Мельна (у сутоках р. Вісла і Аса) пасля няўдалай для ордэна вайны і спроб дамагчыся ад Рымскага Папы Марціна V і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сі-

гізмунда I абвяшчэння несапраўдным ***Тарунскага міру 1411 г.*** Паводле Мельнскага міру крыжакі ўступалі Польшчы частку Куявіі з г. Няшава і канчаткова адмаўляліся ад прэтэнзій на Жамойць, якая паводле ўмоў Тарунскага міру мусіла быць перададзена ордэну пасля смерці вялікага князя літоўскага Вітаўта. Мельнскі мір завяршыў апошнюю вайну паміж Ордэнам і ВКЛ і канчаткова ўсталяваў мяжу паміж імі, якая праіснавала да Першай сусветнай вайны. [18]

**Гарадзенска-Троцкая унія 1432 – 1433 гг.,** дзяржаўны саюз ВКЛ і Польшчы. Са смерцю вялікага князя ВКЛ Вітаўта і абраннем на трон ВКЛ Свідрыгайлы (1430 г.) без захавання ўмоў ***Гарадзельскай уніі 1413 г.*** унія паміж ВКЛ і Польшчай распалася. Каб яе аднавіць, кароль польскі Уладзіслаў II (Ягайла) і польскія паны аказалі падтрымку Жыгімонту Кейстутавічу, прыхільнікі якога абвясцілі яго ў 1432 г. новым вялікім князем літоўскім. 15.10.1432 г. у Гародні паміж Жыгімонтам і яго прыхільнікамі з аднаго боку і 7 польскімі панамі на чале з кракаўскім біскупам Збігневам Алясніцкім падпісаны акт дзяржаўнай уніі. Новая унія паўтарала асноўныя ўмовы ***Віленска-Радамскай уніі 1401 г.*** Жыгімонт абавязваўся трымаць ВКЛ на тых жа ўмовах, што і Вітаўт (з тытулам вялікага князя, падначаленага польскаму каралю) і гарантаваў, што вялікае княства пасля яго смерці пяройдзе да польскага караля і Кароны. У гэтым выпадку абвяшчалася магчымасць выбару новага вялікага князя літоўскага, але зноў толькі з удзелам палякаў і часова. Больш дакладна вызначаны адносіны вялікага князя да польскага караля: ён названы найвышэйшым князем Літвы, панам і старэйшым братам, г. зн. сеньёрам. Падолле павінна было цалкам належаць Кароне Польскай. Жыгімонт атрымліваў Валынь, але не як частку ВКЛ, а як асобнае пажыццёвае ўладанне (як яе трымаў Вітаўт). Спрэчныя валынскія воласці з замкамі Рэтна, Ветлы, Лапацін, Гарадло далучаліся да Польшчы. У асабісты ўдзел Жыгімонт атрымаў спадчыну бацькі – Троцкае княства. Ён браў абавязак дапамагаць Польшчы ў барацьбе супраць крыжакоў, тым самым скасоўвалася перамір’е з крыжакамі, заключанае Свідрыгайлам у Скірстымоне ў 1431 і 1432 гг. Жыгімонт абавязваўся, што ані ён, ані яго наступнік не будзе прэтэндаваць на каралеўскі тытул без ведама і згоды Польшчы. Аналагічны акт з боку баярства ВКЛ не быў выдадзены (відаць, таму што прыхільнікаў Жыгімонта было мала). Сведкамі гарадзенскага акта выступілі 22 асобы, у т. л. віленскі і луцкі біскупы. Ідэнтычны акт Жыгімонт выдаў у Троках 20.01.1433 г., аднак там упамянуты 41 сведка. Сярод іх няма прадстаўнікоў рускіх зямель, якія ў большасці былі на баку Свідрыгайлы, але прысутнічаюць некаторыя князі (упершыню ў дзяржаўных ак-

тах яны ўраўнаваны з баярствам). Сын Жыгімонта Міхал 18.10.1432 г. выдаў у Вільні акт, у якім абавязваўся трымацца абяцанняў бацькі, не прад'яўляць пасля яго смерці сваіх спадчынных правоў на ВКЛ і задаволіцца толькі Троцкім княствам. 05.10.1432 г. у Гародні ад імя Ягайлы было падпісана і пасведчанне інвестытуры Жыгімонта на трон ВКЛ. У актах Гарадзельска-Троцкай уніі пацверджана права ўласнасці паноў на родавыя маёнткі і гаспадарскія наданні (на польскі ўзор), рускія князі і баяры ўраўнаваны ў гэтым праве з літоўскімі. Не было абвешчана ніякіх рэлігійных абмежаванняў. 03.01.1433 г. у Кракаве польскі кароль і каронная рада выдалі 2 акты, у якіх прынялі без змен гарадзенскі акт і абяцалі падтрымку Жыгімонту. Тым самым унія заключана канчаткова. Ягайла і Жыгімонт яшчэ раз пацвердзілі гэта актамі, выдадзенымі 27.02.1434 г. у Корчыне і Гародні. Гарадзенска-Троцкая унія дзейнічала да смерці Жыгімонта Кейстутавіча і абрання на трон ВКЛ Казіміра Ягайлавіча (1440 г). [19]

**Прывілей 1432 г.,** заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены ад імя караля польскага Ягайлы як вярхоўнага князя літоўскага і рускага яго ўпаўнаважанымі пасламі са згоды новага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча ў Гародні 15.10.1432 г., у дзень заключэння новай уніі паміж Польшчай і ВКЛ (гл. ***Гарадзенска-Троцкая унія 1432 – 1433 гг.***). Выдадзены неўзабаве пасля дзяржаўнага перавароту 01.09.1432 г., калі ўладу ў ВКЛ захапіў прыхільны Польшчы Жыгімонт Кейстутавіч, і меў на мэце схіліць на яго бок праваслаўнае баярства, што знаходзілася на баку вялікага князя Свідрыгайлы. Паводле прывілея 1432 г. праваслаўныя беларускія і ўкраінскія князі і баяры ўраўноўваліся ў асабістых і маёмасных правах з феадаламі-каталікамі. Ім гарантавалася недатыкальнасць маёнткаў як спадчынных, так і дадзеных вялікімі князямі, права вольнага распараджэння землямі, дазвалялася займаць дзяржаўныя пасады ў Віленскім і Троцкім ваяводствах, уступаць з літоўскімі баярамі ў гербавае братэрства (набываць гербы). Такім чынам, на праваслаўнае баярства былі пашыраны ***прывілей 1387 г.*** і ***Гарадзельскі прывілей 1413 г.*** Аднак фактычна прывілей 1432 г. дзейнічаў толькі на тэрыторыі заходняй часткі Беларусі. Беларускія і ўкраінскія феадалы ў сваёй масе не падтрымалі Жыгімонта і выступілі супраць падпарадкавання Польшчы. Яны ўступалі ў войска Свідрыгайлы, разгарэлася феадальная вайна 1432 – 1439 гг. Гэта прымусіла Жыгімонта выдаць ***прывілей 1434 г.***, які пашыраў гарантыі ўсяму баярству ў асабістай недатыкальнасці і яго маёмасныя правы. [20]

**Прывілей 1434 г.,** агульнадзяржаўны заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены вялікім князем Жыгімонтам Кейстутавічам у Троках 06.05.1434 г. у

час феадальнай вайны 1432 – 1439 гг., якую вёў за трон князь Свідрыгайла. Прывілей быў накіраваны на з'яднанне ўсіх феадалаў дзяржавы вакол Жыгімонта Кейстутавіча. Складаецца з 8 артыкулаў. Прывілей ураўнаваў саслоўныя, маёмасныя і асабістыя правы літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх князёў і баяр, забяспечваў асабістую свабоду і недатыкальнасць феадалаў, гарантуючы ім разгляд іх спраў у судзе на падставе законаў. Пацвярджалася права князёў і баяр свабодна распараджацца сваімі спадчыннымі маёнткамі з умовай засведчыць перадачу або продаж зямлі перад прадстаўнікамі велікакняжацкай улады. Удаве захоўвалася права карыстацца маёнткам і маёмасцю мужа; у выніку яе паўторнага шлюбу маёнтак пераходзіў да дзяцей ранейшага мужа або яго братоў. Князям і баярам пацвярджалася валоданне маёнткамі, атрыманымі ад вялікага князя Вітаўта і самога Жыгімонта Кейстутавіча. Пацвярджалася вызваленне падданых князёў і баяр ад усіх падаткаў, данін, дзякла і павіннасцей на карысць велікакняжацкага скарбу, акрамя павіннасці будаваць і рамантаваць велікакняжацкія замкі і дарогі ваеннага значэння. Беларускім і ўкраінскім князям і баярам дазвалялася карыстацца гербамі і іншымі знакамі шляхецтва, як і літоўскім баярам, якія атрымалі гэта права паводле ***Гарадзельскай уніі 1413 г.*** Прывілей пашырыў саслоўныя правы ўсіх феадалаў ВКЛ і аб'яднаў іх у адзінае саслоўе з агульнымі саслоўнымі і класавымі інтарэсамі. Праваслаўныя беларускія і ўкраінскія баяры атрымалі магчымасць без абмежаванняў уваходзіць у склад кіруючага органа ўлады – ***Рады Вялікага княства Літоўскага***. (...) [21]

## 5.3. ХРАНАЛОГІЯ

**1393 – 1396 гг.** – барацьба Вітаўта і Свідрыгайлы за Віцебск.

**1390-я гг.** – замацаванне аўтаномнага статуса Полацкай і Віцебскай земляў шляхам выдання ім прывілеяў. Цэнтралізацыя ўлады ў дзяржаве, утварэнне намесніцтваў.

**1397 г.** – паход Вітаўта сумесна з татарскім ханам Тахтамышам на Азоў. Пачатак пасялення татараў у межах ВКЛ.

**1399 г.** – бітва на р. Ворскле. Паражэнне войскаў Вітаўта і Тахтамыша.

**1401 г.** – заключэнне Віленска-Радамскай уніі ВКЛ і Польшчы.

**1406 – 1408 гг.** – вайна ВКЛ з Маскоўскім княствам.

**1409 г., 31 траўня** – пачатак паўстання супраць крыжакоў у Жамойці.

**1409 г., жнівень** – пачатак Вялікай вайны ВКЛ і Польшчы супраць крыжакоў.

**1409 г., снежань** – таемная нарада Вітаўта і Ягайлы ў Берасці, выпрацоўка плану ваенных дзеянняў супраць крыжакоў.

**1410 г., чэрвень** – выступленне вайсковых сілаў Польшчы і ВКЛ у паход супраць Ордэна.

**1410 г., 30 чэрвеня** – аб'яднанне войскаў Польшчы і ВКЛ.

**1410 г., 15 ліпеня** – бітва пад Грунвальдам. Перамога войскаў ВКЛ і Польшчы над войскамі Тэўтонскага ордэна.

**1410 г., ліпень – верасень** – беспаспяховая аблога войскамі ВКЛ і Польшчы сталіцы Тэўтонскага ордэна, Мальбарка.

**1411 г., 1 лютага** – Торуньскі мір паміж ВКЛ, Польшчай і Тэўтонскім ордэнам.

**1413 г.** – заключэнне Гарадзельскай уніі ВКЛ і Польшчы.

**1429 г.** – Луцкі з'езд еўрапейскіх манархаў. Абмеркаванне пытання аб каранацыі Вітаўта.

**1430 г.** – смерць Вітаўта. На пасаду вялікага князя абраны Свідрыгайла.

**1432 г.** – разрыў саюзных адносін ВКЛ і Польскага каралеўства. Замах на Свідрыгайлу і яго ўцёкі ў Полацк. Абранне вялікім князем літоўскім Жыгімонта Кейстутавіча. Пачатак грамадзянскай вайны ў ВКЛ.

**1432 г., 15 кастрычніка** – выданне Ягайлам прывілея, які ўраўноўваў у правах шляхту каталіцкага і праваслаўнага веравызнання.

**1434 г.** – выданне Жыгімонтам аналагічнага прывілея.

**1435 г., 1 верасня** – бітва пад Вількамірам, паражэнне Свідрыгайлы.

**1436 – 1439 гг.** – страта Свідрыгайлам падтрымкі на беларускіх і ўкраінскіх землях, завяршэнне грамадзянскай вайны.

**1440 г.** – змова супраць Жыгімонта Кейстутавіча і яго забойства.

## 5.4. КРЫНІЦЫ

1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

3. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / склалі В. К.Шчарбакоў, К. І.Кернажыцкі, Д. І.Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

4. Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год / изд. В. Антонович и К. Козловский. – Киев, Университ. типогр. – 1868.

5. Законодательные акты Великого княжества Литовского XV – XVI вв. / сб. матер. подг. к печати И. И. Яковкиным. – Л. : Соцэкгиз, 1936. – 55 с.

6. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

## 5.5. ДАСЛЕДАВАННІ


1. Асіноўскі, С. Сумленна прынялі свой лёс... / С. Асіноўскі // Беларуская Мінуўшчына. – 1995. – № 3.

2. Барбашев, А. Витовт и его политика до Грюнвальдской битвы / А. Барбашев. – СПб : тип. И. Н. Скороходова, 1885. – 298 с.

3. Барбашев, А. Витовт, последние двадцать лет княжения. 1410 – 1430 / А. Барбашев. – СПб : тип. И. Н. Скороходова, 1891. – 294 с.

4. Гагуа, Р. Вялікая вайна Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага з Тэўтонскім ордэнам у 1409 – 1411 гг. / Р. Гагуа // Гістарычны альманах. – Т. 8. – Гродна, 2003.

5. Гагуа, Р. О тактическом ходе сражения при Грюнвальде / Р. Гагуа // Свежий ветер: Сб. научных работ студентов ГрГУ им. Янки Купалы. – Гродно, 1999.

6. Грыцкевіч, А. П. Барацьба Вялікага княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы) з Тэўтонскім ордэнам у канцы XIV – першай палове XV стст. / А. П. Грыцкевіч // Адраджэнне. Гістарычны альманах. – Вып. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – С. 36 – 61.

7. Грыцкевіч, А. П. Знешняя палітыка Вітаўта (Заходні накірунак) / А. П. Грыцкевіч // Наш Радавод. – Кн. 2. – Гродна, 1990.

8. Дворниченко, А. И. Князь Свидригайло и западнорусские городские общины / А. И. Дворниченко; под. ред. И. Я. Фроянова // Генезис и развитие феодализма в России. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1988. – С. 146 – 154.

9. Дербов, Л. А. К истории падения Ливонского ордена / Л. А. Дербов // Ученые записки Саратовского гос. ун-та. – 1947. – Т. 17. – С. 157 – 174.

10. Думин, С. В. Татарские князья в Великом княжестве Литовском / С. В. Думин // Acta Baltico-Slavica. – Т. 20. – Wrocław etc., 1991.

11. Думін, С. У., Канапацкі, І. Б. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 204 с.

12. Кирпичников, А. Н. Куликовская битва / А. Н. Кирпичников; под ред. Б. А. Рыбакова. – Л. : Наука : Ленингр. отд-ние, 1980. – 124 с.

13. Лёсік, Я. Бітва пад Грунвальдам у апісанні хронікі Быхаўца, Длугаша, Бельскага і інш. / Я. Лёсік // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 142 – 163.

14. Любы, А. Ул. Абранне вялікага князя літоўскага пасля смерці Вітаўта: знешні і ўнутраны фактары / А. Ул. Любы // Веснік БДУ. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2004. – № 1. – С. 10 – 13.

15. Міхайлоўская, Л. Тэўтонскі ордэн у еўрапейскіх палітычных адносінах канца XIV – першай трэці XV стст. / Л. Міхайлоўская / Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3. – С. 76 – 81.

16. Сагановіч, Г. Ад Крэва да “вялікае вайны”: Вялікае княства Літоўскае і Нямецкі ордэн у 1385 – 1409 гг. / Г. Сагановіч // Спадчына. – 2000. – С. 102 – 115.

17. Сагановіч, Г. Беларусь і Нямецкі ордэн (да Крэўскай уніі) / Г. Сагановіч // З глыбі вякоў. – Наш край: гіст.-культуралагіч. зборнік. – Вып. 2. – Мінск, 1997.

18. Смирнов, М. Ягелло и первое соединение Литвы с Польшей / М. Смирнов // Записки Новороссийского университета. – Одесса, 1863.

19. Цярохін, С. Славутыя адвагай на вайне. Да 580-годдзя Грунвальдскай бітвы (1410 – 1990) / С. Цярохін. – Мінск, 1991. – 77 с.

20. Чаропка, В. Удзел войска ВКЛ у Грунвальдскай бітве / В. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 2. – С. 14 – 22.

21. Чаропка, В. Бітва на рацэ Ворскле: перадумовы, ход, вынікі / В. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 3. – С. 33 – 40.

22. Юхо, Я. Уніі ВКЛ з Польшчай / Я. Юхо // Полымя. – 1972. – № 1.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Канапацкі, Ібрагім. Тахтамыш / І. Канапацкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 665.

2. Пазднякоў, Валерый. Соф’я Вітаўтаўна / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 621.

3. Грыцкевіч, Анатоль. Свідрыгайла / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 556 – 557.

4. Грыцкевіч, Анатоль. Жыгімонт Кейстутавіч / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 630.

5. Белы, Алесь. Салінскі дагавор 1398 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 538 – 539.

6. Насевіч, Вячаслаў. Бітва на Ворскле / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 334.

7. Жамойцкія паўстанні // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 623 – 624.

8. Пазднякоў, Валерый. Віленска-Радамская унія / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 410.

9. Белы, Алесь. Рацёнжскі дагавор 1404 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 512.

10. Пазднякоў, Валерый. Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1406 – 1408 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 368 – 370.

11. Жамойцкія паўстанні // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 623 – 624.

12. Сагановіч, Генадзь. Вялікая вайна 1409 – 1411 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 473 – 474.

13. Берасцейская сустрэча 1409 // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 316.

14. Бохан, Юрась. Грунвальдская бітва / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 554 – 555.

15. Сагановіч, Генадзь. Тарунскі мір 1411 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 660.

16. Юхо, Язэп. Гарадзельская унія 1413 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 495.

17. Юхо, Язэп. Гарадзельскі прывілей 1413 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 495 – 496.

18. Белы, Алесь. Мельнскі мір 1422 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 285.

19. Пазднякоў, Валерый. Гарадзенска-Троцкая унія 1432 г. / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 497 – 498.

20. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1432 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 469.

21. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1434 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 469.

## ТЭМА 6. КАЗІМІР IV І ЯГО ПАЛІТЫКА

**Змест праграмы.** Абранне Казіміра вялікім князем. Паўстанне “чорных людзей” у Смаленску, хваляванні ў Віцебску, Полацку, на Валыні, Жмудскай зямлі.

Агульназемскі прывілей 1447 г. і яго значэнне. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. “Судзебнік” Казіміра IV 1468 г.

Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Польшчай.

Усходняя палітыка Казіміра.

“Змова князёў” 1480 – 1481 гг. Спробы аддзялення ад Вялікага княства Літоўскага часткі беларускіх зямель.

### 6.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча выявілася некалькі прэтэндэнтаў на пасад вялікага князя. Свідрыгайла паспяшаўся абвясціць сябе вярхоўным князем Літвы. Іншымі прэтэндэнтамі з’яўляліся польскі кароль Уладыслаў Ягайлавіч, яго малодшы брат Казімір, а таксама сын Жыгімонта Міхал.

Кандыдатура Казіміра была найбольш прывабнай для ВКЛ, бо абранне Уладзіслава азначала аднаўленне уніі з Польшчай. Польшча ўвогуле жадала скарыстаць сітуацыю, каб скасаваць велікакняжацкі пасад у ВКЛ і стварыць там каралеўскае намесніцтва. Намеснікам якраз павінен быў стаць Казімір Ягайлавіч. Але калі Казімір прыехаў у ВКЛ, мясцовая эліта абвясціла яго вялікім князем. Паколькі Казіміру было ўсяго 13 год, то вакол яго згрупавалася кола вопытных дарадцаў(будучая “паны-рада”), сярод якіх асабліва вылучаўся віленскі ваявода Ян Гаштольд.

Абранне Казіміра выклікала моцны пратэст у абласцях ВКЛ. Найбольш значным было паўстанне “чорных людзей” у Смаленску. Мяшчане выгналі прэч велікакняжацкага намесніка і паклікалі за князя праваслаўнага Юрыя Лугвенавіча. Верагодна, ён збіраўся адарваць ад ВКЛ частку паўночна-ўсходніх земляў і стварыць незалежную дзяржаву Паўстанне было падаўлена, аднак Казімір вымушаны быў паабяцаць захаванне ў Смаленску мясцовых норм і звычаяў. Неўзабаве было пераадолена супраціўленне Жамойці, якая падтрымала Міхала Жыгімонтавіча. Пры гэтым нават не спатрэбілася ваенных дзеянняў, жамойтаў удалося пераканаць прынесці прысягу Казіміру.

У 1441 г. пад націскам групоўкі беларуска-літоўскіх паноў Казімір вымушаны быў перадаць Кіеўскае княства слуцкаму князю Алельку Уладзіміравічу. Удзел у Кіеве быў ліквідаваны толькі ў 1471 г., калі Казімір прызначыў туды свайго ваяводу.

Супраць Казіміра выступіла і Падляшша, якое не ўдалося вярнуць мірным шляхам. Толькі ў 1444 г. Падляшша было вернута ў склад ВКЛ шляхам выкупу яго ў мазавецкага князя Баляслава. Валынь напачатку падтрымала Свідрыгайлу, які паспяшаўся абвясціць сябе васалам Польскага караля. Аднак урэшце і Свідрыгайла прынёс Казіміру прысягу, быў пакінуты на Валыні і панаваў там аж да сваёй смерці (1452 г.). Казімір накіроўваў сваю палітыку на кансалідацыю дзяржавы як у тэрытарыяльным, так і ў грамадска-палітычным плане. Княжанне Казіміра было перыядам стабілізацыі і ўмацавання цэнтральнай улады.

Абранне Казіміра на пасад вялікага князя азначала разрыў уніі з Польшчай. Аднак у 1444 г. у бітве з туркамі загінуў польскі кароль Уладзіслаў, і ў наступным годзе палякі абралі Казіміра каралём польскім, спадзеючыся такім чынам аднавіць унію. Пад націскам літоўскага баярства той на працягу двух гадоў адмаўляўся прыняць каралеўскую карону. Толькі ў 1447 г. Казімір быў абвешчаны польскім каралём.

Перад ад’ездам у Кракаў ён выдаў ***прывілей 1447 г.***, які замацаваў шырокія правы баяр ВКЛ. Клапоцячыся пра захаванне лаяльнасці ў абласцях, у 1450-я гг. Казімір выдаў новыя прывілеі Полацку і Віцебску, Валынскай зямлі, Кіеўшчыне, дзе пацвярджаліся ці дараваліся ўпершыню разнастайныя вольнасці.

У 1468 г. быў выдадзены ***Судзебнік***, які стаў першым кодэксам крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права ВКЛ.

Амаль пастаянная адсутнасць Казіміра ў ВКЛ садзейнічала таму, што ўсе важнейшыя пытанні жыцця дзяржавы вырашала кола паноў радных. Рада ажыццяўляла дыпламатычныя зносіны, кіравала ваеннымі сіламі, разбірала канфлікты, ажыццяўляла зямельныя пажалаванні, што спрыяла яе хуткаму вылучэнню ў ролі значнага дзяржаўнага органа.

Нягледзячы на аднаўленне персанальнай уніі, адносіны Польшчы і ВКЛ у час праўлення Казіміра заставаліся складанымі. Ужо ў 1448 г. Казімір ініцыіраваў сумесны польска-літоўскі з’езд, дзе заклікаў вырашыць тэрытарыяльныя спрэчкі. Але ні гэты, ні наступныя з’езды не прыносілі канструктыўных рашэнняў.

Адным з істотных фактараў знешняй палітыкі у час праўлення Казіміра з’яўляліся адносіны з Маскоўскім княствам. У 1444 г. ён вёў ваенныя дзеянні супраць яго з мэтай захопу Вязьмы, але беспаспяхова. У 1449 г. паміж вялікім князем маскоўскім і Казімірам заключаны дагавор, які ўдакладніў межы ўладанняў абедзвюх дзяржаў і на пэўны час стабілізаваў адносіны паміж імі.

Стаўшы польскім каралём, Казімір мала цікавіўся ВКЛ і ўсё больш адыходзіў ад яго інтарэсаў. Гэта выклікала незадавальнне кіруючай эліты ВКЛ. У 1456 і 1461 гг., калі Польшча вяла вайну з Тэўтонскім ордэнам, паны радныя нават уздымалі пытанне аб абранні новага вялікага князя.

Незадаволенасць палітыкай Казіміра прывяла да арганізацыі супраць яго змовы ў 1481 г. (г. зв. ***змова князёў***). Змова была раскрыта, яе арганізатары пакараны смерцю.

Канец жыцця Казіміра супаў з ростам супрацьстаяння ВКЛ і Масквы. Палітычная вага апошняй імкліва павялічвалася, Масква пачала выступаць у якасці прэтэндэнта на ўсе ўсходнеславянскія землі. Усё больш небяспечным суседам рабілася і Крымскае ханства, якое аб’ядналася ў сяр. XV ст. пад уладай дынастыі Гірэяў, а ў 1466 г. стала васалам Асманскай імперыі. Памежныя ўсходнія гарады і крэпасці яшчэ пры жыцці Казіміра сталі аб’ектамі нападу з боку маскоўскіх служылых людзей. У 1492 г. Казімір памёр, і Маскоўская дзяржава афіцыйна распачала вайну супраць ВКЛ.

## 6.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Міхаіл Жыгімонтавіч** (Баляслаў; 1380-я гг. – 1451 або 1452 г.), князь ВКЛ. Сын вялікага князя літоўскага ***Жыгімонта Кейстутавіча*** і яго першай жонкі, дачкі князя Андрэя Адзінцэвіча. З 1390 г. разам з бацькам быў аддадзены Вітаўтам крыжакам як залог за падтрымку ў барацьбе за велікакняжацкі пасад. Калі Вітаўт не стрымаў слова і заключыў з Ягайлам ***Востраўскае пагадненне 1392 г.***, Міхаіл Жыгімонтавіч і іншыя заложнікі былі зняволены крыжакамі. З 1398 г. у ВКЛ, ажаніўся з Ганнай – дачкой плоцкага князя Земавіта IV. У 1427 – 1429 гг. пры двары вялікага магістра Нямецкага ордэна. З 1432 г., калі яго бацька заняў велікакняжацкі пасад, знаходзіўся пры ім, быў прызначаны камандуючым войскамі, што дзейнічалі супраць Свідрыгайлы. Атрымаў над ім перамогу ў ***Вількамірскай бітве 1435 г.***, заняў Оршу, аблажыў Віцебск і Полацк. Атрымаў ва ўладанне Слуцк, Хоўхлу, Слонім, землі на Падляшшы. Пасля забойства бацькі некаторыя феадалы, галоўным чынам на Жамойці, падтрымалі кандыдатуру Міхаіла Жыгімонтавіча на велікакняжацкі пасад, але ў 1440 г. вялікім князем абраны Казімір IV. Паводле “Хронікі Быхаўца”, Казімір, калі ўмацаваўся на троне, падараваў Міхаілу Жыгімонтавічу Бельск, Бранск на Падляшшы, Сураж, Клецк, Койданаў, Бранск на Дзясне і Старадуб. У Клецку Міхаіл Жыгімонтавіч задумаў змову супраць Казіміра, у якой удзельнічалі князі Валожынскія, але яна была раскрыта. Паводле іншых крыніц, Міхаіл Жыгімонтавіч пасля абрання Казіміра выехаў да сваякоў у Мазоўша за падтрымкай у барацьбе супраць вялікага князя, потым – у Малдову і да хана Сеід-Ахмеда. У пач. 1449 г. Міхаіл Жыгімонтавіч з татарскім войскам на кароткі час захапіў у ВКЛ Севершчыну і Кіеў. Пасля шукаў падтрымкі ў Маскве, але там быў зняволены і атручаны. [1]

**Смаленскае паўстанне 1440 г.**, выступленне жыхароў Смаленска супраць улады ВКЛ і за аднаўленне самастойнага Смаленскага княства. Пачалося вясной 1440 г., калі смаленскі ваявода А. Саковіч пачаў прыводзіць смалян да прысягі на вернасць новаму вялікаму князю літоўскаму Казіміру IV Ягелончыку. У горадзе актывізавалася групоўка баяр і "чорных людзей", якая абапіралася на падтрымку ўшчэмленых у палітычных правах буйных праваслаўных феадалаў усходніх раёнаў ВКЛ. Карыстаючыся тым, што значная частка па-пралітоўску настроеных баяр выехала ў Вільню на выбранне новага вялікага князя, частка жыхароў горада ўзняла паўстанне. Пасля перамогі над паўстаўшымі Саковіч выехаў з горада, але смаляне не скарыліся і запрасілі да сябе ваяводам дарагабужскага князя Андрэя Дзмітрыевіча, а потым "к собе оспадарем" мсціслаўскага князя Юрыя Лугвенавіча. Ён арыштаваў у Смаленску баяр, што ездзілі да Казіміра, канфіскаваў іх маёмасць, раздаў яе сваім прыхільнікам і вырашыў не падпарадкоўвацца Казіміру. Як і ў 1432 г., ВКЛ зноў апынулася на мяжы расколу на дзве дзяржавы. Казімір рашучымі дзеяннямі вырашыў задушыць мяцеж. Але пасланыя ім войскі прастаялі 3 тыдні пад Смаленскам, не наважыліся пачынаць штурм і вярнуліся назад. Аднак у новага гаспадара ўсходніх "рускіх" зямель ВКЛ Юрыя Лугвенавіча было мала сіл. Калі ў лістападзе 1440 г. сам Казімір з войскам пайшоў на Смаленск, Юрый уцёк у Маскву, а адтуль у Вялікі Ноўгарад. [2]

**Прывілей 1447 г.**, Казіміраў прывілей, агульнадзяржаўны заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены вялікім князем Казімірам IV Ягелончыкам у Вільні 02.05.1447 г. Адзін з асноўных дзяржаўных актаў, які замацаваў шырокія правы баяр ВКЛ у палітычным, сацыяльным і эканамічным жыцці дзяржавы. Складаецца з 14 артыкулаў. Прывілей пацвярджаў асабістую свабоду і недатыкальнасць баяр, гарантаваў, што за правіннасць павінен адказваць толькі сам вінаваты, а не яго жонка, бацька, слуга або іншы баярын. Баярам дазволены выезд за мяжу дзяржавы "для лепшага набыцця шчасця, або ўчынкаў рыцарскіх", але не ў "непрыяцельскую краіну". Пацверджаны прывілеі баярам на маёнткі, выдадзеныя папярэднімі вялікімі князямі, права на продаж і абмен маёнткаў. Прывілей гарантаваў баярам, што іх маёнткі не будуць канфіскаваны, а пасля смерці баярына яго сыны і дочкі "ад сваёй вотчыны не маюць аддалены быць". Дочкі, пляменніцы і ўдовы баяр маглі выходзіць замуж без ведама вялікакняжацкіх намеснікаў. Адным з найважнейшых палажэнняў прывілея было вызваленне сялян баярскіх маёнткаў ад дзяржаўных натуральных і грашовых павіннасцей, за выключэннем стацыі, пабудовы і рамонту замкаў. У прывілеі зафіксаваны дагавор вяліка-

га князя з феадаламі, што ён, як і яны, не будзе прымаць у свае маёнткі збеглых сялян, а вяртаць уцекачоў назад да свайго пана. Адным з галоўных палажэнняў прывілея была перадача вялікім князем свайго права судзіць сялян і іншых падданых самім баярам (права судовага імунітэту). З гэтага часу феадал станавіўся адзіным суддзёю сваіх падданых, што вяло да яшчэ большай іх залежнасці і ўрэшце дало магчымасць іх запрыгоніць. Прывілей гарантаваў баярам, што землі і дзяржаўныя пасады ў ВКЛ будуць атрымліваць толькі ўраджэнцы ВКЛ. Такім чынам, прывілей забараняў пранікненне польскай шляхты ў ВКЛ. Вялікі князь таксама ўрачыста абяцаў бараніць незалежнасць дзяржавы і яе тэрытарыяльную цэласнасць. [3]

**Дагавор 1449 г.**, пагадненне паміж вялікім князем літоўскім Казімірам і вялікім князем маскоўскім Васілём II Цёмным. Заключаны 31 жніўня ў разгар міжусобнай феадальнай вайны 1425 – 1453 гг. у Маскоўскім вялікім княстве. Паводле дагавора Казімір абяцаў не аказваць ніякай падтрымкі прэтэндэнту на маскоўскі прастол Дзмітрыю Шамяку і не ўмешвацца ў міжусобіцы Масквы, не прэтэндаваць на Ноўгарад і Пскоў, нават калі тыя будуць “се ... давати” Казіміру, а таксама не ўдзельнічаць у магчымых сутыкненнях Ноўгарада і Пскова з інфлянцкім ордэнам нават на іх баку. Дагавор удакладніў мяжу ўладанняў ВКЛ і Маскоўскага вялікага княства і фактычна спыніў тэрытарыяльную экспансію ВКЛ на ўсход. Адносным поспехам Казіміра была адмова Васіля II ад некаторых наўгародскіх валасцей, якія традыцыйна “цягнулі” да ВКЛ, і прызнанне за разанскім вялікім князем Іванам Фёдаравічам права пераходу на службу да Казіміра. Вынікам дагавору быў працяглы (да канца XV ст.) перыяд мірнага развіцця ВКЛ. Ён зафіксаваў адмову ВКЛ ад прэтэнзій на аб’яднанне ўсіх усходнеславянскіх зямель, што абумовіла далучэнне да Маскоўскай дзяржавы Ноўгарада (1471 г.) і Цверы (1485 г.) і ўрэшце паражэнне ВКЛ у ***вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.*** [4]

**Судзебнік 1468 г.,** Статут Казіміра, першы кодэкс крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права ВКЛ. Выдадзены вялікім князем Казімірам на сойме 29.02.1468 г. Складзены на аснове мясцовага звычаёвага права і судова-адміністрацыйнай практыкі. Складаецца з 25 артыкулаў. Устанавіў адзіныя для ўсёй дзяржавы віды пакаранняў за злачынствы супраць феадальнай уласнасці, абмяжоўваў адказнасць жонкі і дзяцей за злачынствы мужа і бацькі. У Судзебніку развіта ідэя індывідуалізацыі пакарання. Гэта было накіравана на захаванне гаспадаркі ўсёй сям’і як феадальнай падатковай адзінкі, што было ў інтарэсах феадала. У выпадку, калі жонка і дзе-

ці злодзея карысталіся крадзеным, дзейнічала норма старога звычаёвага права. Калі не было чым плаціць судовы штраф і кампенсаваць прычыненыя злачынствам страты, маглі перадаць у рабства таму, хто пацярпеў, жонку і старэйшых за 7 гадоў дзяцей асуджанага. Гэта першае ў законе вызначэнне ўзросту, з якога дзеці маглі несці адказнасць за віну бацькоў. Новым было і вызначэнне злачынства як проціпраўнага дзеяння: злачынца "ис права выступаетъ", "над право сягнул". У Судзебніку ўпершыню змешчаны артыкул, які прадугледжваў аналогію закона. Так, паводле арт. 23, за ўтойванне знаходкі вінаватага каралі як за крадзеж. Узмацненне феадальнага прыгнёту і пазбаўленне залежных сялян права свабоднага адыходу ад феадала было замацавана ў арт. 24, які прадугледжваў суровае пакаранне асоб, што садзейнічалі ўцёкам чэлядзі нявольнай і феадальна залежных сялян. У Судзебніку выявіўся і новы погляд на мэты пакарання. У звычаёвым праве галоўнай мэтай пакарання была кампенсацыя пацярпеламу прычыненай шкоды і спыненне злачыннай дзейнасці. Мэта пакарання паводле Судзебніка – застрашванне, хоць не выключаліся і маёмасныя кампенсацыі. Цялесныя пакаранні і смяротная кара прадугледжваліся нават за такія злачынствы, як крадзеж на суму "выше полукопья", г. зн. больш за 30 грошаў. У старажытным праве злачынец, прыгавораны да смяротнай кары, мог ад яе адкупіцца, яго маглі таксама перадаць у няволю пацярпеламу ці яго блізкім. Паводле Судзебніка забаранялася вызваляць злачынцу ад кары. У Судзебніку адлюстраваны таксама захоп чужых зямель феадаламі, іх міжусобіцы і зямельныя спрэчкі. Бакам у такіх выпадках прадпісвалася не рабіць самачынных нападаў і захопаў, а звяртацца ў суд. Калі ж феадал нападаў на другога феадала, то вінаватага належала разглядаць як парушальніка закону і караць. Але ў Судзебніку не ўказвалася, якое пакаранне трэба ўжываць да злачынца, бо такі прыгавор павінен быў выносіцца вялікім князем з панамі-радай. У канцы Судзебнік абавязваў усіх жыхароў трымаць у належным стане дарогі і масты. За парушэнне гэтай павіннасці ўстанаўліваўся штраф 10 рублёў.

Судзебнік даў пачатак новаму этапу ў развіцці прававой тэорыі, практыкі заканадаўчай дзейнасці і кадыфікацыі феадальнага права ВКЛ, завершаны выданнем Статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. [5]

**Змова 1481 г.,** змова князёў – нашчадкаў Уладзіміра Альгердавіча супраць вялікага князя Казіміра. Была выклікана аддаленнем гэтай старэйшай лініі Альгердавічаў (праваслаўных паводле веравызнання) ад палітычнай улады ў ВКЛ і правоў на Вільню і Кіеў (у 1471 г. пасля смерці Сямёна Алелькавіча Кіеўскае княства ператворана ў ваяводства). Змова арганізавана Міхаілам Алелькавічам, Фёдарам Іванавічам Бельскім (абодва –

унукі Уладзіміра Альгердавіча), Іванам Юр’евічам Гальшанскім (праўнук Уладзіміра Альгердавіча па маці, Ульяне Алелькаўне). Змоўшчыкі планавалі дэтранізаваць (магчыма, і забіць) Казіміра і пасадзіць на трон Міхаіла Алелькавіча. Захоп ці забойства Казіміра планавалася правесці ў час палявання. Паводле іншай версіі, для забойства змоўшчыкі збіраліся выкарыстаць вяселле Бельскага, на якое запрасілі Казіміра. На выпадак няўдачы з замахам змоўшчыкі планавалі аддзяленне ад ВКЛ усходніх зямель (да Бярэзіны) і Украіны з Кіевам і падпарадкаванне ўладзе вялікага князя маскоўскага Івана III. Магчыма, змоўшчыкі спадзяваліся на актыўную падтрымку Масквы (у 1480 г. вяліся перагаворы пра шлюб пляменніцы Міхаіла Алелькавіча Алены (...) з сынам Івана III Іванам Маладым). Змова была выкрыта, як мяркуюць, з дапамогаю кіеўскіх баяр Хадкевічаў. Бельскі ўцек у Маскву, Алелькавіч і Гальшанскі 30.08.1481 г. пакараны смерцю. [6]

## 6.3. ХРАНАЛОГІЯ

**1440 г.** – абранне Казіміра Ягайлавіча вялікім князем Літоўскім.
**1440 – 1442 гг.** – паўстанне ў Смаленску.
**1445 г.** – абранне Казіміра польскім каралём.
**1447 г.** – ад’езд Казіміра ў Польшчу. Выданне агульназемскага прывілея.
**1444 – 1449 гг.** – барацьба з Маскоўскай дзяржавай.
**1449 г.** – заключэнне мірнай дамовы паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай.
**1468 г**. – выданне Казімірам Судзебніка – першага кодэкса законаў у ВКЛ.
**1480 – 1481 –** “змова князёў” супраць Казіміра.
**1492 г.** – смерць Казіміра Ягайлавіча

## 6.4. КРЫНІЦЫ

1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов в 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

3. Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год / изд. В. Антонович и К. Козловский. – Киев : Университ. типогр, 1868.

4. Законодательные акты Великого княжества Литовского XV – XVI вв. / сб. матер. подг. к печати И. И. Яковкиным. – Л. : Соцэкгиз, 1936. – 55 с.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

6. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

7. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р исторических наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

8. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

## 6.6. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Доўнар, Т. Фарміраванне права Вялікага княства Літоўскага (XV – XVI стст.) / Т. Доўнар // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 4. – С. 21 – 31.

2. Лаппо, И. И. “Судебник” Казимира Ягайловича / И. И. Лаппо // Записки Русского научного института в Белграде. – Белоград, 1939. – Вып. 17.

3. Подозерская-Уткина, Г. Ф. Судебник Казимира Ягеллона / Г. Ф. Подозерская-Уткина. – Научное бюро ЛГУ, 1947. – № 7.

4. Старостина, И. П. Судебник Казимира 1468 г. / И. П. Старостина // Древнейшие государства на территории СССР: Материалы и исследования 1988 – 1989 гг. – М., 1991.

5. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

6. Юхо, Я. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо; рэд. Т. Ф. Есіпенка. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ:

1. Пазднякоў, Валерый. Міхаіл Жыгімонтавіч / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 316 – 317.

2. Мяцельскі, Андрэй. Смаленскае паўстанне 1440 г. / А. Мяцельскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 599 – 600.

3. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1447 г. / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 469 – 470.

4. Белы, Алесь. Дагавор 1449 г. / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 569.

5. Юхо, Язэп. Судзебнік 1468 г. / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 641 – 642.

6. Пазднякоў, Валерый. Змова 1481 г. / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 659.

# ТЭМА 7. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў XIV – XV СТСТ.

**Змест праграмы.** Этнічныя працэсы на беларускіх землях, складванне адметных рыс беларускага народа (мова, звычаі, традыцыі, характар). Этнічная самасвядомасць.

Пытанне аб паходжанні назвы "Белая Русь".

Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Дойлідства, жывапіс, скульптура. Кніжная справа. Летапісанне. Арыгінальная і перакладная літаратура.

## 7.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 7.1.1.Этнічныя працэсы на беларускіх землях у XIV – XV стст.

Уваходжанне беларускіх зямель у склад ВКЛ стварыла новыя ўмовы для развіцця беларускага этнасу, а менавіта для фарміравання беларускай народнасці.

**Народнасць** – форма моўнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай і культурнай супольнасці людзей, якая складваецца гістарычна ў выніку кансалідацыі плямён і папярэднічае ўтварэнню нацыі. Народнасць як стадыя развіцця этнасу ўласціва рабаўладальніцкай і федальнай эпохам. Асноўныя прыкметы народнасці: адносная агульнасць мовы, тэрыторыі, культуры, наяўнасць пэўных эканамічных сувязей, этнічная самасвядомасць і саманазва.

На фарміраванне беларускай народнасці аказвалі ўплыў разнастайныя **фактары**, а менавіта:

– **грамадска-палітычныя** (неабходнасць барацьбы з іншаземнай агрэсіяй, уваходжанне беларускіх земляў у склад ВКЛ, цэнтралізацыя дзяржавы, складванне сістэмы агульнага дзяржаўнага кіравання, увядзенне адзінага заканадаўства);

– **эканамічныя** (далейшае развіццё сельскай гаспадаркі, удасканаленне рамяства, пашырэнне гандлю, узрастанне ролі гарадоў, усталяванне адзінай грашовай сістэмы);

– **сацыяльныя** (далейшае развіццё феадальных адносін, працэс запрыгоньвання сялянства, кансалідацыя розных груп насельніцтва ў класы феадальнага грамадства (феадалаў, прыгонных сялян, мяшчан);

– **рэлігійныя** (распаўсюджанне каталіцызму, наяўнасць міжканфесійных супярэчнасцей, барацьба прадстаўнікоў розных канфесій за паляпшэнне свайго прававога становішча).

**Прыкметы народнасці**

**1) Тэрыторыя.** Ядро этнічнай тэрыторыі беларускай народнасці ў цэлым адпавяла арэалам рассялення крывіцкай, дрыгавіцкай і радзіміцкай этнічных супольнасцей. На фарміраванне народнасці аказалі ўплыў каланізацыйныя працэсы ў Занёманні, Падляшшы, Папрыпяцці, Паўночна-Заходняй Беларусі. Землі сучаснай Беларусі ўвайшлі ў склад ВКЛ на працягу XIII – XIV стст. У межах адной дзяржавы быў спынены працэс іх феадальнага драблення, што садзейнічала стварэнню адзінай этнічнай тэрыторыі.

**2) Мова.** На працягу XIV – XVI стст. ідзе працэс афармлення спецыфічна беларускіх моўных асаблівасцей (цвёрдае “р”, “дзеканне” і “цеканне”, “аканне” і “яканне”, прыстаўныя гукі. Фарміруецца гутарковая мова, адначасова беларуская мова набывае статус дзяржаўнай (старабеларуская, або “руськая”).

**3) Матэрыяльная і духоўная культура** спалучае ў сабе рысы мінулых эпох і новаўвядзенні, якія закранулі сферу сямейных і грамадскіх адносін, побыт, фальклор, звычаі, абрады і вераванні, мастацтва, а таксама элементы-запазычанні з іншых культур.

У цэлым у пазначаны перыяд на беларускіх землях складваецца комплекс традыцыйных прылад працы, пабудоў, начыння, адзення, музычных інструментаў, выпрацоўваюцца асноўныя віды і жанры беларускага фальклору.

**4) Самасвядомасць.** Жыхары беларускіх земляў ВКЛ адрознівалі сябе ад прадстаўнікоў іншых этнасаў як у межах сваёй дзяржавы, так і адносна замежных краін. У той жа час самасвядомасць вызначалася мноствам лакальных і канфесійных сувязей, тэрытарыяльна-этнаграфічным рэгіяналізмам. Для насельніцтва Беларусі пазначанага перыяду характэрна існаванне тэрытарыяльных назваў, як правіла, па галоўным горадзе зямлі (палачане, віцябляне, случане і інш.). Асноўнымі формамі самавызначэння насельніцтва з’яўляліся этнонімы “ліцвіны” і “русіны”, прычым арэал бытавання першай назвы ахопліваў раёны Панямоння, а “русіны” – усходнюю частку беларускіх земляў. З цягам часу назва “ліцвін” атрымала больш шырокі сэнс і паступова страціла значэннне этноніма.

### 7.1.2. Праблема паходжання назвы “Белая Русь”

Назва “Белая Русь” у розныя часы прымянялася для абазначэння розных рэгіёнаў ва Усходняй Еўропе. Самай ранняй гістарычнай крыніцай, дзе ўпершыню згадваецца Белая Русь (Alba Ruscia), з’ўляецца геаграфічны трактат ***“Апісанне земляў”*** (сярэдзіна XIII ст.) каталіцкага місіянера, які прапаведаваў у Прыбалтыцы.

У гістарычнай навуцы склалася значная колькасць версій паходжання гэтай назвы.

1) У аснове назвы – белы колер адзення ці антрапалагічны тып насельніцтва (В. Тацішчаў, А. Кіркор, Я. Карскі, М. Янчук і інш.).

2) Белай, г. зн. вольнай Руссю спачатку называліся землі Усходняй Беларусі, не залежныя ў XIII ст. ні ад Літвы, ні ад татараў (М. Драгаманаў, М. Любаўскі, А. Патабня, М. Доўнар-Запольскі).

3) Блізкая да папярэдняга пункта, але з акцэнтам на цюркскую этымалогію эпітэта "белы", як у спалучэнні "белы рускі цар", г. зн. "вялікі, магутны, незалежны". Прычым назва Белая Русь звязваецца не з усходнеславянскімі землямі ВКЛ, а з Маскоўскай дзяржавай (С. Герберштэйн, В. Тацішчаў, М. Карамзін, А. Салаўёў).

4) В. Астроўскі і Л. Падалка звязвалі этымалогію Белай Русі з пэўнымі плямёнамі ці племяннымі саюзамі аланаў – рокс–аланаў, ці аланорсаў, быццам бы "белых" – у сэнсе "вольных, незалежных" – аланаў, якія раней жылі над Дняпром і змяшаліся са славянамі.

5) Усходняя частка сённяшняй Беларусі нібыта названая Белай Руссю пасля і ў процівагу Чорнай, ахрышчанай пазней, дзе паганскія звычаі захоўваліся даўжэй (Я. Юхо, К. Тарасаў, А. Цітоў).

6) Яшчэ адзін варыянт трактоўкі эпітэта "белы" як сіноніма праваслаўя, блізкі да п. 3, звязвае яго ўзнікненне са "стратай чысціні праваслаўя" Кіевам пасля яго захопу Андрэем Багалюбскім у 1169 г. і перамяшчэннем палітычнага цэнтра Русі ва Уладзіміра-Суздальскую зямлю.

7) Наадварот, паганскім бачыцца паходжанне назвы тым (В. Ластоўскі і інш.), хто выводзіць Белую Русь ад меркаванага Белабога, якому пакланяліся балцкія і славянскія плямёны, што ў старажытнасці жылі на тэрыторыі Беларусі.

8) Паводле А. Трубачова, Р. Агеевай, І. Грэкава і інш., "белы" ў цюркаў можа значыць "заходні", прыкладам чаго лічацца белыя харваты, якія, магчыма, атрымалі такую назву дзеля таго, што насялялі крайні захад усходнеславянскага рэгіёну. Адпаведна і Белая Русь – гэта, маўляў, Заходняя Русь – з пункту гледжання цюркаў. В. Маньчак сцвярджае, што назвамі Белая, Чорная і Чырвоная Русь татары акрэслівалі адпаведна заходнюю частку Русі ў складзе ВКЛ, паўночную, падуладную Ардзе, і паўднёвую – у складзе Польшчы, і што затым такі падзел быў нібыта запазычаны заходнімі аўтарамі.

9) Яшчэ шырэй трактуе геаграфічную семантыку белага колеру Вяч. Іваноў. Паводле яго высноваў, узаемная арыентацыя Белай, Чорнай і Чырвонай Русі адлюстроўвае ўніверсальную, уласцівую большасці моў і культур сімвалічную сістэму абазначэння трыма асноўнымі колерамі краін свету.

10) Г. Ільінскі выводзіў назву ад гіпатэтычных “гарадоў бельскіх” у сярэднім цячэнні Заходняга Буга (як Бельск, Беласток і г. д.).

11) П. Крапівіну назва “Белая Русь” уяўляецца паўперакладам на славянскую мову якойсьці вельмі старажытнай назвы, якая азначае “белая вада”.

12) А. Рогалеў даводзіць, быццам назву Белая Русь даў Полацкаму княству яго заснавальнік Рагвалод у канцы X ст., маючы на ўвазе “Русь магутную і вялікую, Русь мірную, чыстую і праведную”. Хаця ў іншым творы той жа аўтар намякае, што Белай Руссю называлася нібыта яшчэ дзяржава Рурыка: у яе, апроч Ноўгарада і Белага возера, уваходзілі Полацк, Смаленск, Растоў, Мурам (іх Рурык раздаў сваім васалам), з якімі пазней, на думку Рогалева, была ў першую чаргу звязаная наша назва.[16]

### 7.1.3. Агульная характарыстыка развіцця культуры

**Архітэктура і выяўленчае мастацтва.** Манументальнае дойлідства ВКЛ з канца XIII ст. мела абарончы характар. Складаныя знешнепалітычныя абставіны абумовілі з’яўленне на тэрыторыі ВКЛ мураваных ***замкаў.*** На працягу XIV – пач. XIV стст. на заходніх рубяжах дзяржавы быў створаны абарончы пояс (замкі ў Вільні, Коўне, Троках, Medніках, Крэве, Гародні, Лідзе, Новагародку). Паступова трансфармуюцца драўляныя крэпасці-дзядзінцы старажытных гарадоў (Орша, Мазыр, Рэчыца і інш.) і ператвараюцца ў замкі, пашыраецца будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў (Іказнь, Геранёны, Радашковічы).

Распаўсюджанне каталіцызму садзейнічала пранікненню ў архітэктуру рыс заходнееўрапейскай готыкі. У культавым дойлідстве яны спалучаліся з візантыйскімі традыцыямі, што надавала архітэктуры ВКЛ самабытны выгляд. Спалучэнне ў мураваных храмах элементаў візантыйскай крыжова-купальнай сістэмы, архітэктурных формаў заходнееўрапейскай готыкі і фартыфікацыйных элементаў мясцовых абарончых збудаванняў, а таксама рыс народнага мастацтва атрымала назву беларускай готыкі. Унікальнымі помнікамі культавага дойлідства з’яўляюцца Троіцкі касцёл у Ішкалдзі (1470-я гг), Мураванкаўская царква (пач. XVI ст.), Сыковіцкая царква-крэпасць (канец XV – пач. XVI стст.).

Выяўленчае мастацтва XIII – XV стст. прадстаўлена найперш іканапісам, які развіваўся на глебе візантыйскага і старажытнарускага мастацтва. Самабытнасць і высокія мастацкія якасці помнікаў дазволілі навукоўцам гаварыць аб пачатку фарміравання беларускай школы іканапісу, што дасягнула найбольшага развіцця ў XVI – XVII стст. Найбольш вядомымі

[16] Падрабязней пра асвятленне гэтай праблемы гл. №№ 14, 34 у спісе літаратуры да дадзенай тэмы.

помнікамі беларускага іканапісу з’яўляюцца “Маці Божая Замілаванне” (канец XIV – пач. XV стст.), “Маці Божая Іерусалімская” (перш. пал. XV ст.), “Маці Божая Смаленская” (мяжа XV – XVI стст.).

Асноўныя рысы мануменальнага жывапісу XIII – XV стст. вызначаліся ўплывам візантыйскай і рамана-гатычнай традыцыі. Захаваліся помнікі манументальнага жывапісу фрагментарна, ў рэдкіх выпадках цалкам. Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы сведчаць пра існавнне размалёвак у інтэр’ерах княжацкіх і магнацкіх палацаў, найбольш актыўна яны выкарыстоўваліся ў аздабленні інтэр’еру культавых пабудоў. Самым раннім з вядомых сёння ўзораў манументальнага жывапісу з’яўляецца фрэска ў касцёле св. Станіслава і Уладзіслава ў Вільні (“Распяцце”, канец XIV ст.); вядомы таксама шэраг фрэскавых выяў з усходняй часткі Польшчы. У выглядзе манументальнага жывапісу існуе першапачатковa і партрэт (выявы Ягайлы ў замкавай капліцы ў Любліне, Вітаўта ў фрэсках Трокскага замка). З канца XV – пач. XVI стст. пачынаецца распаўсюджванне станковага партрэта, які набывае ўжо больш індывідуальна-псіхалагічныя рысы. Развіваецца таксама кніжная мініяцюра (прадстаўлена ў рукапісных помніках XIV – XV стст.). З пашырэннем на тэрыторыі Беларусі каталіцызму звязана з’яўленне поліхромнай драўлянай скульптуры. Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – “Распяцце” з Глыбоцкага р-на (XIV ст.). У XV – пач. XVI стст. пад уплывам готыкі ў касцёлах з’яўляюцца створкавыя алтары. Яны ўяўлялі сабой складаныя скульптурна-жывапісныя комплексы, аднак захаваліся толькі іх асобныя фрагменты. На мяжы позняй готыкі і Рэнесансу знаходзіцца скульптура “Св. Гжэгаж” (1470-я – 1480-я гг.), створаная полацкімі майстрамі. Інтэнсіўна развіваецца і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (размалёўка па дрэве, чаканка па металу, выраб керамікі, мастацкая апрацоўка скуры, ткацтва).

**Асвета, кніжная справа, развіццё літаратуры.** Асвета на землях ВКЛ спалучала ў сабе здабыткі народна-педагагічнай традыцыі, каштоўнасці свецкага і царкоўнага характару. Школьная адукацыя насіла ярка выражаны клерыкальны характар, школы дзейнічалі ў асноўным пры праваслаўных і каталіцкіх храмах. Разам з падрыхтоўкай святароў такія школы выконвалі і агульнаадукацыйную фунцыю.

Развіццё літаратуры грунтавалася на пісьмова-моўных традыцыях, якія існавалі ў папярэднія эпохі. Пераважала літаратура царкоўнага характару, апрача кніг Бібліі – словы, прытчы, павучанні, жыціі святых. Каштоўнымі помнікамі кніжнай справы і літаратуры з’яўляюцца ***Лаўрышаўскае, Друцкае, Полацкае, Аршанскае, Жыровіцкае евангеллі*** XIII – XV стст. З

XIV ст. старабеларуская мова набывае статус афіцыйнай, становіцца важным сродкам грамадскіх зносін, асновай культурна-гістарычных працэсаў. На старабеларускай мове складаюцца разнастайныя заканадаўчыя дакументы, актавыя і справаводчыя помнікі, летапісы і хронікі). Побач са старабеларускай значнае пашырэнне мае і лацінская мова, якая выкарыстоўваецца для зносін з краінамі Заходняй Еўропы.

Развіццё ўласнабеларускай літаратуры працякала даволі запаволена. Найбольшых поспехаў дасягнула летапісанне, якое у XV – перш. пал. XVI стст. набыло агульнадзяржаўны характар. Найважнейшымі помнікамі летапісання XV ст. з'яўляюцца ***"Летапісец вялікіх князёў літоўскіх"***, ***"Беларуска-Літоўскі летапіс"*** 1446 г., у XVI ст. былі складзены ***"Хроніка Вялікага княства Літоўскага"***, ***"Хроніка Быхаўца"***. У гэты ж час з'явіліся і першыя перакладныя творы (аповесці ***"Пакуты Хрыста"***, ***"Жыціе Аляксея, чалавека Божага"*** і інш.).

**Музычнае і тэатральнае мастацтва.** Музычнае мастацтва ўвасабляецца ў народных спеўна-інструментальных традыцыях, царкоўных песнапеннях, свецкай музыцы (сольнае і ансамблевае выкананне, велікакняжацкія капэлы). З канца XV ст. на Беларусі пашыраецца кантавая культура. Тэатральнае мастацтва ВКЛ таксама абапіралася на традыцыі народных тэатралізаваных абрадаў і гульняў, а таксама на прынцыпы еўрапейскага рэлігійнага і свецкага тэатраў.

## 7.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Белая Русь,** назва розных рэгіёнаў ва Усходняй Еўропе, якая з XVII ст. найчасцей ужывалася ў дачыненні сучаснага беларускага Падняпроўя і Падзвіння (...); з XIX ст. агульнапрынятая назва ўсіх тэрыторый, беларускіх паводле тагачаснай этнаграфічнай сітуацыі, а таксама ў форме *Беларусь* – нацыянальная назва, прынятая ідэолагамі беларускага нацыянальнага руху ў канцы XIX ст.

Упершыню зафіксавана ў лацінскай форме "Alba Ruscia" каля 1255 – 1260 гг. у геаграфічным трактаце *"Апісанне земляў"* (верагодна, у дачыненні да Наўгародскай рэспублікі). Шэраг звестак пра Белую Русь паходзіць з твораў паўднёванямецкіх паэтаў 1360-х гг. – рыфмаванай хронікі Венгрыі Г. фон Мюгельна і вершаў П. Зухенвірта пра крыжацкія наезды на Пскоў. Пад 1381 г. назва адзінкава (да 2-й паловы XVI ст. такая лакалізацыя не паўтараецца) аднесена да Полацка, "крэпасці Белай Русі" ў "Хронікі Польшчы" Яна з Чарнкова. У пач. XV ст. часта сустракаецца ў дакументах, звязаных з канцылярыяй імператара Жыгімонта Люксембургскага, у

прыватнасці, у сувязі з Канстанцкім саборам 1414 – 1418 гг. Першае датаванае пазначэнне Белай Русі ў картаграфіі – на круглай карце свету Фра Маўра (1457 г.). Да канца XV ст. абсалютная большасць упамінанняў пра Белую Русь адносіцца да тэрыторыі Наўгародскай рэспублікі; за адзіным выключэннем, усе яны лацінска- або нямецкамоўныя. Узнікненне тэрміна "Белая Русь" і яго замацаванне ў сярэдневяковай геаграфічнай наменклатуры, магчыма, звязана з памылковымі ўяўленнямі схаластаў пра міфічную краіну Албанію ("Белую"), якая "мяжуе на ўсходзе з Каспійскім морам і ўзыходзіць па ўзбярэжжы да Паўночнага акіяна" (Барталамей Англійскі, XIII ст.). У венгерскіх крыніцах XIV – XV стст. Белая Русь фігуруе як назва Галіцка-Валынскай дзяржавы. А. Латышонак лічыць такое значэнне назвы першасным, выводзячы яго ад "белых харватаў" – назвы продкаў насельніцтва Галіча, трансфармаванай у Венгрыі ў "белых русінаў" у сувязі з прэтэнзіямі каралевіча Кальмана на галіцкі трон у 1210 – 1220-х гг.; паводле яго, "Alba Ruscia" для аўтара "Апісання земляў" – таксама Галіцка-Валынская дзяржава (уключаючы Берасцейска-Дарагічынскую, Турава-Пінскую і Новагародскую землі).

З апошняй чвэрці XV ст. (лекцыі італьянскага гуманіста Пампонія Леты, паэма М. Баярда "Закаханы Раланд" і карта свету Г. Мартэла з Фларэнцыі) фіксуецца назва "Белая Русь" у дачыненні да нізоўяў Дона і Дняпра. Гэтая другая "Ruscia Alba" паслядоўна не аддзялялася ад першай, бо, паводле геаграфічных уяўленняў сярэдневякоўя, вытокі Дона знаходзіліся далёка на поўначы, побач з Ладажскім возерам. Але з 1470-х гг. назва ўжывалася пераважна ў дачыненні да Маскоўскай дзяржавы Івана III. Змяненне значэння назвы "Белая Русь", зафіксаванае італьянцамі Дж. Вольпе, Дж. Мафэі дэ Вальтэра, А. Кантарыні, было выклікана ўваходжаннем у 1471 – 1478 гг. тэрыторыі Наўгародскай рэспублікі ў склад Вялікага княства Маскоўскага. Вядомая еўрапейцам назва Ноўгарада як "Белая Русь" зрабілася сінонімам малазнаёмай Масковіі. Замацаванню ў еўрапейскай традыцыі тэрміна "Russia Alba" ў такім значэнні паспрыяла і выкарыстанне панегірыстамі маскоўскага велікакняжацкага дома эпітэту "белы" ў значэнні "вялікі", "высакародны".

(...)

Самы стары помнік усходнеславянскага паходжання, у якім упамінаецца Белая Русь – "Слово избранное от святых писаний еже на латыню", створанае, верагодна, сербам Пахоміем Лагафетам у Ноўгарадзе каля 1461 г. У ВКЛ тэрмін "Белая Русь" вядомы з канца XV ст. і ў большасці выпадкаў адносіўся да Маскоўскай дзяржавы (...), радзей – Ноўгарада. Да часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі, перш за ўсё да Полаччыны, назву "Белая Русь" пачалі трывала дастасоўваць у сяр. XVI ст. ("Гісторыя палякаў" М. Кро-

мера, 1555 г.). Чарговае пераасэнсаванне назвы, магчыма, было абумоўлена умовамі Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг., калі тэрмін "Белая Русь" ужываўся як агульная назва земляў (у першую чаргу Полацка), вяртання якіх Рэчы Паспалітай патрабавала польска-літоўскае грамадства. Да таго ж аўтары павярхоўных гісторыка-геаграфічных кампіляцый, што складаліся ў Заходняй Еўропе, часта змешвалі звесткі аб заваяванні Ноўгарада Іванам III і захопе Полацка Іванам IV у 1563 г. У значэнні "Русь Літоўская" тэрмін "Белая Русь" спачатку ўжывалі або іншаземцы (Кромер, А. Гваньіні) або ўраджэнцы ВКЛ – прадстаўнікі адукаваных пластоў грамадства заходняй арыентацыі, у т. л. С. Рысінскі, які ўпершыню свядома ўжыў тэрмін "leucorussus" (грэч.-лац. "беларус") як этнічную саманазву (1586 г.). У канцы XVI – пач. XVII стст. назва "Белая Русь" трапіла з твораў польскіх гісторыкаў і публіцыстаў у хронікі ВКЛ (М. Стрыйкоўскага, "Хроніку Літоўскую і Жамойцкую" і інш.). [1]

**"Апісанне земляў",** невялікі геаграфічны трактат 3-й чв. XIII ст. невядомага аўтара, каталіцкага місіянера, які прапаведаваў у Прыбалтыцы сярод язычнікаў у часы Міндоўга. Напісаны на лацінскай мове. У ім даецца кароткае геаграфічнае апісанне тагачаснай Еўропы, месцазнаходжанне розных краін і земляў, у т. л. Прусіі, Яцвягіі, Жамойці, Літвы, Русі; аўтар гаворыць пра звычаі прыбалтыйскіх плямён, паведамляе пра хрышчэнне і каранацыю Міндоўга і інш. Трактат – самая ранняя гістарычнаяя крыніца, у якой упершыню згадваецца Белая Русь (Alba Russia). Паводле кантэксту твора, аўтар меў на ўвазе сумежную з Літвой і Латгаліяй заходнюю частку тагачаснай Русі, г. зн. тэрыторыю сучаснай паўночна-ўсходняй часткі Беларусі. Трактат змяшчаецца ў пачатку Дублінскага рукапісу – зборніка др. пал. XIII ст. (уключае розныя творы на лацінскай мове: вершы, пропаведзі, дыдактычныя трактаты, запавет св. Францыска, прароцтвы Іахіма Флорскага, кароткі ірландскі летапіс, даведзены да 1174 г., і інш.). Помнік адкрыў і ўпершыню апублікаваў у арыгінале амерыканскі вучоны М. Колкер. Захоўваецца ў бібліятэцы Англіканскага універсітэта ў Дубліне (Ірландыя). [2]

**Летапісы беларуска-літоўскія.** Складаліся на старабеларускай мове пераважна беларускімі летапісцамі, бытавалі да XIX ст. Умоўна называюцца таксама заходнерускімі. Агульнадзяржаўныя і паўафіцыйныя паводле зместу. У іх адлюстравана гісторыя беларускага і літоўскага народаў перыяду ВКЛ. Вядомы 4 асобныя помнікі XV – XVI стст.: ***"Летапісец вялікіх князёў літоўскіх"***, ***Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.***, ***"Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага"***, ***Хроніка Быхаўца*** і гістарычная кам-

піляцыя XVII ст. “Хроніка літоўская і жамойцкая”, якая ўваходзіць у склад беларуска-ўкраінскага хранографа “Вялікая хроніка”. Паслужылі крыніцай польскіх хронік М. Стрыйкоўскага, А. Гваньіні і М. Бельскага, распаўсюджваліся таксама на Украіне і ў Расіі. Летапісы беларуска-літоўскія – каштоўныя помнікі гістарыяграфіі і грамадска-палітычнай думкі беларускага і літоўскага народаў, старабеларускай мовы і беларускай гістарычнай прозы. (...) [3]

**“Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”**, найбольш даўні помнік беларуска-літоўскага летапісання, адзін з першых твораў уласнабеларускай гістарычна-дакументальнай прозы. Напісаны на старабеларускай мове невядомым аўтарам у канцы 1420-х гг. у Смаленску. Асноўны змест – палітычная гісторыя ВКЛ ад смерці Гедзіміна (1341 г.) да канца XIV ст., галоўная ідэя – усхваленне цэнтралізатарскай палітыкі літоўска-беларускіх князёў, абгрунтаванне гістарычнай неабходнасці і заканамернасці палітычнага аб’яднання літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель у адной дзяржаве – ВКЛ. “Летапісец...” – аповесць-хроніка, складаецца з гістарычных апавяданняў пра мінулае Літвы, Беларусі і Украіны. Першая частка – аповесць пра Кейстута і яго барацьбу з Ягайлам (скончылася гвалтоўнай смерцю Кейстута). Яна напісана ў 1390-я гг. з мэтай гістарычнага абгрунтавання права Вітаўта на вялікае княжанне ў Вільні. Гэты твор свецкі паводле зместу, з займальным, драматычна напружаным сюжэтам, адметны высокім літаратурным майстэрствам, лаканічнасцю і дынамічнасцю апавядання. Другая частка “Летапісца...” больш фрагментарная, характарызуецца царкоўна-рэлігійнай афарбоўкай падзей і складаецца з кароткіх апавяданняў пра палітычнае жыццё ВКЛ апошняй чвэрці XIV ст., найбольш – пра дзейнасць Вітаўта. Помнік – сінкрэтычны твор, спалучае рысы дзелавога дакумента і твора апавядальнай прозы і грунтуецца на сапраўдных гістарычных фактах. Напісаны з новых агульнадзяржаўных пазіцый як першая спроба кароткай гісторыі ВКЛ. Ён быў важным этапам у гісторыі летапісання на Беларусі, у ім упершыню ў беларускай старажытнай літаратуры пераадолены старыя літаратурныя традыцыі – летапісная, пагадовая форма выкладу гісторыі. Поўная рэдакцыя ўключае яшчэ ***“Аповесць пра Падолле”***. Захаваўся ў розных спісах (Віленскім, Супрасльскім, Слуцкім, Красінскага, Рачынскага і інш.), летапісных зводах і гістарычных кампіляцыях. У XIV – XV стст. паслужыў асновай арыгінальнай часткі ***Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г.*** і часткова выкарыстаны польскім храністам Я. Длугашам у “Гісторыі Польшчы”. У XVI ст. увайшоў у склад Другога беларуска-літоўскага летапіснага зводу (гл. ***“Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”***) і ***Хронікі Быхаўца***, праз якія перайшоў у “Хроніку польскую, літоўскую, жамойцкую і

ўсяе Русі” М. Стрыйкоўскага. Быў вядомы таксама ў Расіі, дзе не раз перапісваўся і перарабляўся (спісы Дуброўскага, Пагодзіна і інш.). Перакладзены на польскую, нямецкую, літоўскую, лацінскую, рускую мовы. [4]

**“Пахвала Вітаўту”** (“Похвала о великом князи Витовте”, “Сказанне о великом князи Витовте”), помнік беларускай літаратуры XV ст., адзін з першых твораў беларускай свецкай панегірычнай прозы. Напісана ў Смаленску невядомым аўтарам у асяроддзі мясцовага духавенства. Вядома ў чатырох рэдакцыях: 1-я (1428 г.) змешчана ў кнізе слоў Ісака Сірына, якая перапісана ў Смаленску; 2-я (летапісная, каля 1430 г.) захавалася ў асобных спісах ***Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г.***; 3-я (новая, 1-я пал. XVI ст.) зберaглася ў спісах кароткай і пашыранай рэдакцый Другога беларуска-літоўскага летапіснага зводу – ***“Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”***; 4-я (руская скарочаная, XVI ст.) змешчана ў розных гістарычных зборніках, што бытавалі ў Расіі ў XVI – XVIII стст. “Пахвала Вітаўту” 1428 г. – прыватны дзелавы запіс-пасляслоўе да кнігі, зроблены прыхільнікам вялікага князя Вітаўта; летапісная рэдакцыя – асобны твор панегірычнага жанру, напісаны на аснове папярэдняй як своеасаблівае ідэйна-мастацкае завяршэнне Першага беларуска-літоўскага летапіснага зводу; трэцяя – аб’яднаны скарочаны тэкст летапіснай “Пахвалы Вітаўту” з уступнай часткай (апавяданне пра каранацыйны з’езд Вітаўта) ***Смаленскай хронікі***. У творы Вітаўт услаўляецца як мудры і ўсемагутны валадар, гаспадар ВКЛ, які карыстаецца высокім міжнародным аўтарытэтам. У “Пахвале Вітаўту”, створанай у час найбольшай палітычнай магутнасці князя, ідэалагічна абгрунтоўваецца яго аб’яднаўчая палітыка на ўсходнеславянскіх землях, праводзіцца погляд на ВКЛ як на літоўска-славянскую дзяржаву, якая прызнаецца адным з галоўных цэнтраў аб’яднання ўсіх усходніх славян. Напісана на падставе сапраўдных гістарычных фактаў урачыста-ўзнёслым стылем з выкарыстаннем старажытнарускіх літаратурных традыцый, кніжных выразаў і зваротаў, але без рытарычнай шматслоўнасці, проста, канкрэтна і змястоўна. [5]

**Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г,** першы агульнадзяржаўны летапісны звод ВКЛ, прысвечаны гісторыі ўсходніх славян і Літвы. У яго аснове – летапіс, складзены каля 1430 г. у Смаленску невядомай асобай духоўнага сану ў асяроддзі епіскапа, у 1432 – 1435 гг. – у акружэнні мітрапаліта Герасіма, гарачага прыхільніка агульнарускай праграмы вялікага князя ***Вітаўта***, і прадоўжаны пазней да 1446 г. Першапачатковая рэдакцыя не захавалася. У 1490-я гг. узнікла другая рэдакцыя (Нікіфараўскі летапіс,

Супрасльскі летапіс, Акадэмічны летапіс), каля 1500 г. – трэцяя, скарочаная рэдакцыя (Слуцкі летапіс). Храналагічна ахоплівае перыяд ад сяр. IX да сяр. XV стст. Звесткі па гісторыі Русі за 854 – 1427 гг. запазычаны з рускіх летапісаў (мітрапаліта Фоцiя 1420-х гг., Сафійскага Першага і Наўгародскага Чацвертага летапісаў); тэксты іх істотна скарочаны. У зводзе аб'яднаны самыя розныя гістарычныя запісы і творы, напісаныя ў Кіеве, Ноўгарадзе, Маскве, Вільні, Смаленску, у велікакняжацкай канцылярыі і ў асяроддзі духавенства, свецкім дзелавым і кніжна-славянскім стылямі, на старажытнарускай і старабеларускай мовах, што надае яму пэўную стракатасць і незавершанасць. Аднак адзінства тэмы і гістарычнай канцэпцыі, дзяржаўнага погляду на падзеі робяць летапіс адносна цэласным творам. З мясцовых твораў увайшлі Смаленская хроніка, "Пахвала Вітаўту", смаленскія пагадовыя запісы за 1432 – 1446 гг. і "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх" з "Аповесцю пра Падолле". Паводле характару гэта агульнарускі звод. Палітычная гісторыя Літвы, Беларусі, часткова Украіны XIV – 1-й пал. XV стст. пададзена ў цеснай сувязі з гісторыяй Маскоўскай Русі і пераемнасці з гісторыяй Кіеўскай Русі. Шмат увагі аддаецца апісанню гераічнай барацьбы ўсходніх славян з іншаземнымі заваёўнікамі, а таксама княжання Вітаўта, галоўнага героя арыгінальнай часткі летапісу, у якой сцвярджаецца магутнасць і высокі міжнародны аўтарытэт гэтага князя, ухваляецца яго аб'яднаўчая палітыка на Русі. Большасць звестак беларуска-літоўскай часткі летапісу унікальныя, не паўтараюцца ў іншых крыніцах таго часу. Аўтар зводу праводзіў ідэю гістарычнай еднасці ўсходніх славян і абгрунтоўваў заканамернасці іх палітычнага аб'яднання ў складзе ВКЛ, якое лічыў вядучым цэнтрам збірання ўсходнеславянскіх земляў. У летапісе выявіліся імкненні перадавых грамадскіх колаў Літвы, Беларусі і Украіны 1-й пал. XV ст.; у ім упершыню асэнсавана і раскрыта важная гістарычная роля ВКЛ ва Усходняй Еўропе. Складзены пад уплывам традыцый усходнеславянскага летапісання. Своеасаблівасць грамадска-палітычнага і культурна-духоўнага жыцця Літвы і Беларусі XV ст., надзённых ідэйна-мастацкіх задач, якія стаялі перад беларуска-літоўскімі летапісцамі, абумовілі шмат у чым адметны характар гэтага помніка. У ім спалучаны традыцыйная, пагадовая форма выкладу з прагматычным звязным апавяданнем пра мінулае, гістарычныя аповесці – з кароткімі дзелавымі запісамі, літаратура і дакумент. Летапіс – каштоўная крыніца звестак па гісторыі народаў Усходняй Еўропы, сведчанне align рознабаковых узаемасувязей рускага, беларускага, украінскага і літоўскага народаў эпохі сярэдневякоўя. Захаваў шэраг звестак па гісторыі Паўночна-Усходняй Русі XIV – 1-й трэці XV стст., якіх няма ў іншых рускіх летапісах, таму мае значэнне і для

даследавання рускага летапісання таго часу. Паслужыў крыніцай для “Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, Хронікі Быхаўца і іншых летапісных твораў у ВКЛ і Расіі XVI – XVII стст. [6]

**“Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”,** гісторыка-літаратурны твор XVI ст., у якім выкладзена гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палемона да Гедзіміна. Напісана ў 1520-я гг. на беларускай мове, відаць, у Вільні ў асяроддзі літоўскіх феадалаў. Яе другая і трэцяя рэдакцыі ўзніклі ў сярэдзіне XV ст.

У аснову хронікі пакладзена легенда пра паходжанне літоўскіх князёў і шляхты ад рымскіх арыстакратаў. Яна літаратурна апрацавана, храналагічна прывязана да пэўных этапаў еўрапейскай гісторыі (пачатак падзей аднесены да часоў Нерона, 1 ст. н. э.), набыла выгляд гістарычнай аповесці пра сапраўдныя падзеі мінулага. Крыніцамі для яе паслужылі розныя гістарычныя паданні (пра паходы Гедзіміна на Украіну, бітвы з татарамі, пра мінулае Вільні, Полацка, Навагародка, пра язычніцкія звычаі літоўцаў і інш.). ***Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.***, Іпацьеўскі летапіс, які быў выкарыстаны адвольна і тэндэнцыйна. Узвялічваецца і гераізуецца мінулае Літвы і прыніжаецца гісторыя Русі. Пададзеная з пазіцыі літоўскіх феадалаў, гісторыя ўзнікнення ВКЛ мае шмат фактычных недакладнасцей і свядомых скажэнняў і не стасуецца з сапраўднай гісторыяй. Створана з мэтай сцвердзіць вядучую ролю, пануючае становішча ў дзяржаве літоўскіх феадалаў, абудзіць пачуцці нацыянальнага гонару і патрыятызму літоўцаў. Напісана ў звязнай форме, вельмі бегла, месцамі схематычна. З літаратурнага боку найбольш цікавае ў хроніцы паэтычнае апавяданне пра заснаванне Гедзімінам Вільні, якое пабудавана на апрацаванай народнай фантазіяй тапанімічнай легендзе.

Хроніка распаўсюджвалася на Беларусі ў складзе другога аднайменнага беларуска-літоўскага летапіснага зводу, што ўзнік у выніку яе аб’яднання з ***“Летапісцам вялікіх князёў літоўскіх”*** і іншымі часткамі Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г. Зберагліся ў трох рэдакцыях: кароткай (Летапіс Красінскага), пашыранай (Альшэўскі летапіс, Патрыяршы рукапіс, Румянцаўскі летапіс і іншыя спісы) і поўнай (Летапіс Рачынскага, Еўраінаўскі летапіс). Паслужыла непасрэднай крыніцай ***Хронікі Быхаўца,*** “Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі” М. Стрыйкоўскага, “Хронікі Еўрапейскай Сарматыі” А. Гваньіні, некаторых іншых хронік і гісторый XVI – XIX стст. [7]

**Хроніка Быхаўца,** Летапіс Быхаўца, Быхаўца хроніка, трэці, найбольш поўны агульнадзяржаўны летапісны звод ВКЛ. Выяўлена ў 1820-я гг. у бібліятэцы А. Быхаўца, памешчыка з маёнтка Магілёўцы пад Ваўкавы-

скам. Пачатак і канец хронікі не зберагліся. Вядома ў адзіным спісе канца XVII – пач. XVIII стст., перапісаным лацінкай з больш даўняга, кірылічнага тэксту. Рукапіс згублены ў 2-й пал. XIX ст.

Крыніцамі Хронікі Быхаўца паслужылі ***"Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага"***, Галіцка-Валынскі летапіс, ***Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.*** Аўтар зводу перанёс пачатак падзей з I у V ст., з часоў Нерона ў эпоху Вялікага перасялення народаў, і дапоўніў легендарную гісторыю Літвы аповесцю пра Міндоўга і Войшалка (запазычана з Галіцка-Валынскага летапісу). Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. уключаны ў скарочаным выглядзе, без агульнарускай часткі і ***"Пахвалы Вітаўту"***. Асноўнымі крыніцамі арыгінальнай часткі, якая складае каля палавіны тэксту і ахоплівае падзеі пераважна XV – пач. XVI стст. паслужылі розныя гістарычныя і сямейныя паданні, успаміны відавочцаў, уласныя назіранні аўтара.

Хроніка Быхаўца прысвечана гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пач. XVI ст. Арыгінальная частка твора складаецца з асобных дакументальных запісаў і гістарычных апавяданняў пра мінулае Беларусі і Літвы, гісторыю беларуска-літоўскіх княжацкіх і магнацкіх родаў (найбольш пра Гаштольдаў і Алелькавічаў), пра значныя падзеі ўнутранага і знешнепалітычнага жыцця дзяржавы. Дамінуючая тэма – ваенна-патрыятычная. Шмат старонак аўтар прысвяціў апісанню паходаў і бітваў. Асаблівай жывасцю і літаратурнай дасканаласцю вылучаюцца апавяданні пра адзін з паходаў Альгерда на Маскву, Грунвальдскую бітву 1410 г. і забойства вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440 г. Твор абрываецца на апісанні перамогі войска ВКЛ пад камандаваннем М. Глінскага над татарамі пад Клецкам у 1506 г. Асобныя старонкі хронікі маюць выразную публіцыстычную накіраванасць. Прыкметна непрыязнае стаўленне аўтара да кіруючых колаў Польшчы, у якіх ён бачыў галоўных ворагаў палітычнай незалежнасці сваёй радзімы. Адначасова храніст высока ставіў ролю беларуска-літоўскіх феадалаў у гісторыі ВКЛ, у абароне яго дзяржаўных інтарэсаў. У Хроніцы Быхаўца выявіліся імкненні і погляды патрыятычна настроенай часткі мясцовай шляхты, заклапочанай гістарычным лёсам сваёй дзяржавы.

Мова "Хронікі" – узор старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы XVI ст. Асобныя дэталі зместу і гістарычныя рэаліі сведчаць, што асноўная частка "Хронікі Быхаўца" напісана беларусам праваслаўнага веравызнання, блізкім да князёў Алелькавічаў. Як летапісны звод завершана, відаць, у 1530-я гг.

Хроніка Быхаўца – важная крыніца па сярэдневяковай гісторыі Беларусі і Літвы, каштоўны помнік грамадска-палітычнай думкі беларускага і літоўскага народаў, беларускай мовы і літаратуры эпохі Адраджэння. Паслужыла крыніцай "Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі" М. Стрый-

коўскага, а праз яе – і апошняй (1611 г.) рэдакцыі "Хронікі Еўрапейскай Сарматыі" А. Гваньіні, "Хронікі Польшчы" М. і І. Бельскіх, шэрагу іншых хронік і гісторый XVII – XIX стст., у т. л. беларуска-ўкраінскага хранографа "Вялікая хроніка". [8]

**Жыровіцкае Евангелле,** беларускі рукапісны помнік XV ст. Да сяр. XIX ст. захоўвалася ў Жыровіцкім Успенскім манастыры. Пісана ўставам на 404 аркушах. На 376-м – 377-м аркушах па-беларуску зроблены надпіс – фундушавы запіс канцлера ВКЛ Л. Сапегі (адсюль другая назва рукапісу – "Евангелле Сапегі"). Багата аздоблена застаўкамі, мініяцюрамі з выявамі евангелістаў, шматлікімі ініцыяламі. Мініяцюры абведзены шырокімі залачонымі рамкамі, арнаментаванымі геаметрычным і раслiннымі ўзорамі. У выкананні мініяцюр адчуваецца сувязь з візантыйскай мастацкай традыцыяй. Малюнак вызначаецца пластычнасцю, выразнай індывідуалізацыяй твораў, жанравасцю задумы і мажорным каларытам (кадміева-чырвоныя, сінія, зялёныя і вохрыста-залацістыя фарбы). Зберагаецца ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы. [9]

**Лаўрышаўскае Евангелле,** помнік рукапіснага мастацтва канца XIII – пач. XIV стст. Створана для Успенскай царквы Лаўрышаўскага манастыра, дзе зберагалася да 1822 г., пасля – у А. Чартарыйскага, захоўвалася ў Пулавах, Парыжы, цяпер – у Бібліятэцы Музея Чартарыйскіх у Кракаве. Евангелле-апракас на царкоўнаславянскай мове з рысамі паўднёварускіх гаворак. Рукапіс напісаны ўставам у 2 слупкі на 183 аркушах пергаменту in folio (памер старонкі прыкладна 22 × 31 см), упрыгожаны 18 мініяцюрамі з выявамі святых Іаана, Мацвея, Лукі, Міхаіла-архангела, Іова, евангельскіх сцэн (у XIV ст. дамаляваны мініяцюры, дзе паказана размова Варлаама з Іасафатам, сюжэт з прыпавесці аб адзінарогу), адной застаўкай, ініцыяламі (для некаторых пакінуты пустыя месцы). На палях рукапісу 14 прыпісак 1-й пал. XIV – 2-й пал. XVI стст., дзе князі і паны (сярод іх Алелька Уладзіміравіч, Дзмітрый Альгердавіч, Іван Александровіч) засведчылі перадачу манастыру грошай, збожжа, дзесяціны і зямельных уладанняў. Рукапіс мае пераплёт з дошак, абцягнутых вішнёвым аксамітам. Спераду ў цэнтры на ім прымацавана бронзавая плакетка (XVII ст.) з гравіраванай выявай св. Дзмітрыя Салунскага пад архітэктурнай аркай, у кутках – трохвугольныя нарожнікі (усе дэталі маюць гнёзды з рубінамі і сапфірамі), ззаду – плакетка з гравіраваным Распяццем. На думку аднаго з першых даследчыкаў рукапісу І. Свянціцкага, Лаўрышаўскае Евангелле напісана ў пач. XIV ст. і адносіцца да паўночна-ўсходняй беларускай рэдакцыі. Апошнія даследчыкі звяз-

ваюць паходжанне Лаўрышаўскага Евангелля з землямі Галіцка-Валынскага княства (уключна з паўднёва-заходняй Беларуссю) і датуюць яго мяжой XIII – XIV стст. Не выключана, што Евангелле было створана па заказу вялікага князя Войшалка і адразу прызначалася для Лаўрышаўскага манастыра. [10]

**“Жыціе Аляксея, чалавека Божага”,** помнік беларускай перакладной агіяграфічнай літаратуры канца XV ст. Змешчана ў рукапісным зборніку разам са ***“Страсцямі Хрыстовымі”*** і ***“Аповесцю пра трох каралёў”***. Перакладзена з лацінскай мовы з выкарыстаннем чэшскіх крыніц. Шырока адлюстроўвае рысы беларускай народнай гаворкі свайго часу. Апавядае пра Аляксея, які ў імя веры пакінуў багатых бацькоў і жонку і стаў хрысціянскім падзвіжнікам. Пасля вярнуўся ў бацькоўскі дом пад выглядам жабрака і жыў так 17 гадоў. Толькі пасля яго смерці бацькі даведаліся, што гэта быў іх сын. Аповесць вядома ў чэшскім і польскім перакладах, у празаічным, вершаваным і драматургічным варыянтах. Зборнік зберагаецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. [11]

**“Аповесць пра трох каралёў”,** помнік беларускай перакладной літаратуры апакрыфічнага характару. Арыгінал твора напісаны ў XIV ст. нямецкім манахам Іаганам з Гільдэсгейма на лацінскай мове. На беларускую мову перакладзены ў 2-й пал. XV ст. Захаваўся ў 3 спісах. Найбольш ранні, Пецярбургскі, XV ст. зберагаецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў складзе рукапіснага зборніка разам з “Жыціем Аляксея, чалавека божага”, “Страсцямі Хрыстовымі”. У аснове аповесці – евангельскі эпізод пра пакланенне нованароджанаму Ісусу Хрысту трох усходніх цароў-язычнікаў, якія пасля сталі шчырымі хрысціянамі. У творы апісваецца іх падарожжа ў Святую зямлю, прырода земель Блізкага Усходу, побыт, звычаі, веравызнаўчыя і этнічныя асаблівасці розных народаў, у т. л. грэкаў, сірыйцаў, армян, грузін. Аповесць каштоўная як сведчанне духоўных запатрабаванняў пэўных слаёў беларускіх чытачоў XV – XVI стст., адна з крыніц іх гісторыка-геаграфічных уяўленняў пра краіны Блізкага Усходу. Пераклад зроблены на высокім узроўні, мова без царкоўнаславянізмаў. [12]

**“Страсці Хрыстовы”,** помнік беларускай перакладной агіяграфічнай літаратуры канца XV ст., легендарна-апакрыфічная аповесць пра Ісуса Хрыста. Змешчана ў рукапісным зборніку разам з ***“Аповесцю пра трох каралёў”*** і ***“Жыціем Аляксея, чалавека Божага”***. Перакладзена з лацінскай мовы з выкарыстаннем польскіх і чэшскіх крыніц. Пераклад зроблены каталікам, вызначаецца высокай дакладнасцю і мастацкай дасканаласцю. Мо-

ва аповесці без царкоўнаславянізмаў, поўна адлюстроўвае жывую беларускую мову таго часу. Асноўная літаратурная крыніца помніка – апакрыфічнае евангелле ад Нікадзіма. У цэнтры твора яркае, драматычна напружанае апісанне апошніх дзён жыцця, пакутніцкай смерці і ўваскрасення галоўнага героя, прарока, бога-чалавека, які быў па-здрадніцку выдадзены яго вучнем Іудам за 30 сярэбранікаў мясцовым рымскім уладам у Іерусаліме і па патрабаванні натоўпу распяты на крыжы як ерэтык і злачынец. Смерць Ісуса Хрыста пададзена з пункту погляду царкоўна-рэлігійных ідэйна-мастацкіх канцэпцый хрысціянства як гераічны подзвіг і высакародная ахвяра ў імя лепшай будучыні ўсіх людзей. У аповесці створаны таксама кранальны вобраз Багародзіцы. Яе душэўныя перажыванні, глыбокі боль за сына раскрыты ў псіхалагічна праўдзівых маналогах-плачах. [13]

**Готыка** (італ. gotiko – гоцкі, ад назвы германскага племя готаў), гатычны стыль, мастацкі стыль, пашыраны ў краінах Заходняй, Цэнтральнай, часткова Усходняй Еўропы паміж сярэдзінай XII і XVI – пач. XVII стст. Узнік на поўначы Францыі. Заснаваны на філасофска-тэалагічных ідэях сярэдневякоўя, развіцці і ўдасканаленні канструкцыйна-тэктанічнай структуры і дэкаратыўных сродкаў архітэктуры. Вызначальная роля ў развіцці готыкі належала сакральнай архітэктуры. Асноўныя элементы гатычнай канструкцыі – аконныя прасценкі мінімальнага сячэння, унутраныя апорныя слупы абмежаванага сячэння, аркі спічастай формы, нервюры скляпенняў, аркбутаны і контрфорсы. Канструкцыя мела каркасны характар. Гатычныя саборы вылучаліся вялікай вышынёй і стральчатымі вокнамі з каляровымі вітражамі. Галоўныя фасады сабораў звычайна ўпрыгожвалі ажурнымі вежамі, аздаблялі рэльефнай і круглай аб’ёмнай скульптурай. Уваходы падкрэсліваліся “перспектыўнымі” парталамі, багата ўпрыгожанымі гарэльефамі, тэматычнымі кампазіцыямі ў тымпанах і арнаментальнымі дэталямі. Над цэнтральным уваходам рабілі вялікае круглае акно-ружу. Галоўным відам выяўленчага мастацтва готыкі была скульптура, якой аздаблялі фасады сабораў і іх інтэр’еры.

У параўнанні з помнікамі класічнай французскай готыкі спецыфічную трактоўку гэты стыль атрымаў у Італіі, Іспаніі, Партугаліі. Найбольш вядомыя помнікі сакральнай готыкі – сабор Парыжскай Маці Божай, саборы ў Ам’ене, Рэймсе (Францыя), Кентэрберы, Уэльсе, Вестмінстэрскім абацтве ў Лондане (Англія), Кёльне, Фрайбургу (Германія), Празе (Чэхія), Мілане, Сіене (Італія), Бургасе (Іспанія), Кракаве, Гнезне, Познані, Гданьску (Польшча), Таліне, Тарту (Эстонія), Рызе (Латвія), Вільнюсе, Каўнасе (Літва), Львове (Украіна). У развіцці самабытных форм г. зв. “цаг-

лянай готыкі” вялікую ролю адыгралі паўночная Германія, Аўстрыя, Трансільванія, Чэхія, Прусія, Польшча. Гэтае адгалінаванне еўрапейскай готыкі атрымала таксама распаўсюджанне ў культуры ВКЛ.

У культавых гатычных пабудовах, узведзеных з цэглы, асноўнымі канструкцыйнымі элементамі, якія прымаюць цяжар скляпенняў, з’яўляюцца апорныя слупы, сцены значнай таўшчыні і контрфорсы. Заходнія і ўсходнія фасады завяршаліся франтонамі трохвугольнай формы і з прыступкавым абрысам. Для памяншэння інертнай масы франтоны ўзводзілі больш тонкімі, чым сцены асноўнага аб’ёму. Часткова з гэтай мэтай у франтонах рабілі нішы, якія затым тынкавалі або бялілі. Асноўныя дэкаратыўныя элементы – абрамленні парталаў і аконных праёмаў, разнастайныя па форме і памерах нішы, аркатура. Нярэдка завяршэнні праёмаў, парталаў, ніш мелі не спецыфічную для готыкі спічастую, а паўцыркульную форму. Інтэр’еры перакрывалі крыжовымі, зорчатымі, сеткавымі скляпеннямі. Часам ужывалі драўлянае перакрыццё інтэр’ера (касцёлы св. Мікалая, св. Ганны ў Вільні, св. Гертруды, св. Мікалая ў Коўне, св. Пятра і Паўла ў Іўі). У архітэктуры ВКЛ готыка прасочваецца ў каталіцкім (касцёлы св. Мікалая, св. Яна, францысканскі Унебаўзяцця Дзевы Марыі, бернардзінскі св. Францыска і Бернардзіна, св. Ганны ў Вільні, “фара Вітаўта”, касцёл св. Пятра і Паўла ў Коўне, касцёл Св. Тройцы ў Ішкалдзі, св. Міхала ў Гнезне і інш.) і праваслаўным (цэрквы Прачысценская, Троіцкая, Мікалаеўская ў Вільні, Богаяўленская ў Астрозе, Барысаглебская ў Новагародку, Міхайлаўская ў Сынковічах, Дабравешчанская ў Супраслі, Раства Багародзіцы ў Мураванцы і інш.) храмабудаўніцтве. Яму ўласціва гарманічнае спалучэнне готыкі і Рэнесансу, традыцый і ўплываў візантыйска-рускага стылю.

(...)

Гатычны стыль таксама атрымаў пашырэнне ў грамадзянскай і жылой архітэктуры ВКЛ. Ад першых гатычных ратуш захаваліся толькі фрагменты сцен і сутарэнняў у Вільні і Коўне. Гэта былі двухпавярховыя, прамавугольныя ў плане са стромкім гатычным дахам пабудовы, Па восі галоўнага фасада стаяла шмат’ярусная вежа. Тарцовыя сцены завяршаліся франтонамі трохвугольнай формы. Інтэр’еры перакрывалі гатычныя скляпенні. Звонку фасады аздаблялі плоскія нішы рознай формы. Дзвярныя праёмы афармлялі парталы з прафіляванай цэглы. У канцы XIII – 1-й пал. XV стст. готыка пашыраецца ў архітэктуры велікакняжацкіх замкаў (Меднікі, Крэва, Новагародак, Гародня, Вільня, Трокі). (...)

Гарадская жылая забудова готыкі прадстаўлена помнікамі Вільні і Коўна. Тут пераважалі двухпавярховыя, памерам 7 – 9 і 17 – 21 м жылыя дамы, павернутыя звычайна галоўным фасадам да вуліцы альбо гарадской

плошчы. Тарцовыя фасады завяршаліся франтонамі, упрыгожанымі нішамі. Звычайна фасадная частка аддзялялася ад франтона вузкай паласой гзымса альбо дэкаратыўнага пояса. Па прычынах функцыянальнага характару сіметрыя і рытм у размяшчэнні вокнаў часта парушаліся. У інтэр'еры прасочваецца дыферэнцыраванасць памяшканняў. (...)

Гатычнае аблічча каталіцкіх храмаў ВКЛ дапаўняла драўляная або каменная скульптура, якая змяшчалася ў іх інтэр'ерах. Яна вылучалася паліхромнай расфарбоўкай, была звязана з архітэктурнымі формамі готыкі, якія падкрэслівала падоўжанымі прапорцыямі. Захаваліся нешматлікія творы скульптуры готыкі ("Архангел Міхал" з Шарашова, "Архангел Рафал з Товіем" з Ялава, "Грыгорый" з Полацка, "Мадонна" з Вялены, "Мадонна з грушай" з Коўна, "Уваскрэслы Хрыстос" з Крэцінгі, "Ян Хрысціцель з ягнём" з Лабуноўскай капліцы ў Кейданах, рэльеф "Марыя з дзіцем і св. Ганнай" з касцёла ў Балтакю, "Марыя з дзіцем" з Лаўкжэмскага касцёла. Манументальнага гатычнага жывапісу захавалася няшмат. Вялікую гісторыкамастацкую каштоўнасць мае эпітафічная фрэскавая размалёўка "Укрыжаваны з Марыяй і св. Янам Евангелістам", выяўленая ў адной з крыптаў кафедральнага сабора св. Станіслава ў Вільні. У жывапісных і стылістычных прыёмах, пластыцы форм і твараў прасочваюцца ўплывы ранняй нямецкай готыкі. Сувязь з еўрапейскім гатычным мастацтвам мае манументальны жывапіс бернардзінскага касцёла ў Вільні. [14]

**Замак**, абарончы аб'ект, які ўяўляе сабой замкнёны комплекс абарончых, жылых і іншых спецыялізаваных пабудоў, выконвае рэзідэнцыяльныя і адміністрацыйна-публічныя функцыі. (...)

Праблема генезісу раннесярэдневяковых замкаў як сацыяльнай з'явы застаецца дыскусійнай у беларускай і літоўскай гістарыяграфіі. Лічыцца, што на ўсходнеславянскіх землях у канцы X – XII стст. у выніку дзейнасці дзяржаўных цэнтраў паўсталі памежныя замкі, а на мяжы XII – XIII стст. як вынік паглыблення феадальных адносін з'явіліся замкі-рэзідэнцыі феадалаў. Не высветлена пытанне пра прычыны адсутнасці пераемнасці паміж большасцю ўмацаваных феадальных сядзіб XII – XIII стст. і замкаў эпохі ВКЛ. На тэрыторыі Літвы вылучаецца этап драўляных замкаў (XI – пач. XV стст.); "драўляныя замкі", паводле Г. Забелы, з'яўляюцца сінонімам паняцця "позніяя гарадзішчы". Такія замкі будаваліся і аднаўляліся на працягу 1 года. Колькасць абаронцаў драўлянага замка звычайна не перавышала 100 чалавек. У большасці сваёй драўляныя замкі ў Літве ўзніклі, існавалі і зніклі на працягу XIII – XIV стст., г. зн. у перыяд барацьбы з Нямецкім ордэнам. Найбольш вядомыя замкі ў Жамойці – Імпілціс (упершы-

ню згаданы ў 1253 г.), Вялена (Велюона, 1291 г.), Бісэне (1283 г.), Мядзвягаліс (1316 г.); у Аўкштайціі – Кернава (Кярнаве; 1291 г.), Пуня (1382 г.), Мерач (Мяркіне, 1387 г.). Значным цэнтрам была Кернава, якая складалася з 4 умацаваных гарадзішчаў і была галоўнай рэзідэнцыяй Трайдзеня. Да 1340-х гг. рэйды ордэна часта прыпыняліся каля гэтага буйнога драўлянага замка і заканчваліся разарэннем ваколіц. Пазней ордэн пачаў арганізоўваць больш маштабныя паходы ў глыб тэрыторыі ВКЛ. Менавіта драўляныя замкі Літвы прынялі на сябе галоўны ўдар нямецкай экспансіі супраць ВКЛ, бо змаганне адбывалася пераважна за Жамойць.

Аблогі і бітвы XIV ст. паказалі, што супрацьстаяць сілам Ордэна драўляныя замкі не маглі. У ВКЛ пачалося будаўніцтва мураваных замкаў. (...)

Адна з выразных асаблівасцей замкавага будаўніцтва ў ВКЛ – стварэнне замкаў-кастэляў. Вельмі праўдападобна, што ў будаўніцтве кастэляў бралі ўдзел нямецкія майстры, якія прыехалі ў ВКЛ па запрашэнні вялікага князя Гедзіміна, зробленым у 1323 г. У ВКЛ вядомы 4 кастэлі: Ковенскі замак, Крэўскі замак, Лідскі замак, Медніцкі замак. (...) У беларускай гістарыяграфіі ўзвядзенне Лідскага замка датуюць 1-й чвэрцю XIV ст., Крэўскага замка – 1-й пал. XIV ст., Медніцкага замка – канцом XIII – пач. XIV стст., Ковенскага замка – канцом XIII ст. Даследчыкі знаходзяць у кастэлях ВКЛ некаторыя рысы, якія сведчаць аб недастатковай кампетэнтнасці фартыфікатараў. Упершыню замкі-кастэлі згаданы ў летапісах 1-й паловы XIV ст. (...)

Роскві́т прыватнага замкавага будаўніцтва пачаўся з канца XV ст., пасля сацыяльна-палітычнай стабілізацыі новай магнатэрыі ВКЛ. Пераважна гэта былі замкі рэгулярнага тыпу, дзе вытрымліваецца чатырохвугольны план і выкарыстоўваюцца абарончыя ўмацаванні штучнага характару ў адрозненне ад ранейшых прыродных, як, напрыклад, Геранёнскі замак (канец XV – пач. XVI стст.) і Мірскі замак (1-я палова XVI ст.). (...) Ствараліся таксама замкі нерэгулярнага тыпу са змяшанымі муравана-драўлянымі ўмацаваннямі, план якіх падпарадкаваны рэльефу мясцовасці (Іказненскі замак пач. XVI ст.).

Працягвалі існаваць дрэва-земляныя замкі ў старажытных гаспадарскіх гарадах – Верхні замак у Полацку, Менску, Берасці, Мсціславе і інш. (...) Гэтыя замкі былі адміністрацыйнымі цэнтрамі, пасля 1566 г. найчасцей у іх размяшчаліся рэзідэнцыі ваявод, а ў Менскім замку, да таго ж, пасля 1582 г. адбываліся кадэнцыі Трыбунала ВКЛ.

На працягу XVI ст. у многіх беларускіх гарадах тэрмін “замак” замацаваўся за старажытным дзядзінцам і вакольным горадам, найчасцей у варыянце Горны (Высокі) – Дольны (Ніжні) замак. Часам адбывалася пераразмеркаванне функцыі даўніх структурна-тапаграфічных частак. (...)

Імклівае развіццё артылерыі ў 2-й пал. XV – XVI стст. зрабіла малаэфектыўнымі абарончыя функцыі цалкам мураваных замкаў. Земляныя ўмацаванні набылі новую актуальнасць, але ў іншым абліччы – бастыёнаў. У сярэдзіне XVI ст. збудаваны бастыённы Заслаўскі замак, які цікавы яшчэ тым, што ілюструе працэс трансфармацыі агульнагарадскога ўмацавання ў сеньёрыяльную рэзідэнцыю. Магутнейшыя бастыённыя замкі ў 1580-х гг. ствараюць Радзівілы – Нясвіжскі і Біржанскі замкі. [15]

## 7.3. КРЫНІЦЫ


1. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларус і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с.

2. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

4. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

5. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники : Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р исторических наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

6. Полное собрание русских летописей – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

7. Старажытная беларуская літаратура (XII – XVII стст.) / уклад., прадм. і каментар Івана Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 605 с. (Беларускі кнігазбор : БК / Ін-т літ. імя Я. Купалы Нац. акад. навук Беларусі / гал. рэд. Кастусь Цвірка; [Т. 36]. Серыя 1, Мастацкая літаратура).


## 7.4. ДАСЛЕДАВАННІ


1. Ахрыменка, П. П. Старажытная беларуская літаратура: вучэб. дапаможнік для філал. фак. вну / П. П. Ахрыменка, М. Р. Ларчанка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1968. – 174 с.

2. Барвенава, Г. Гатычны касцюм Вялікага княства Літоўскага канца XIII – пачатку XVI стст. / Castrum, urbis et bellum: Зб. навук. прац // навук.

рэд.: Г. Семянчук, А. Мяцельскі. – Баранавічы : РУПП “Баранавіцкая узбуйненая друкарня”, 2002.

3. Батура, Р. К. Культура Великого княжества Литовского / Р. К. Батура, В. Т. Пашуто // Вопросы Истории. – 1977. – № 4. – С. 110 – 120.

4. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 2. Фарміраванне і развіцце нацыянальнай самасвядомасці беларусаў: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 1992 / рэд.: А. Мальдзіс, А. Анціпенка [і інш.]. – Мінск, 1993. – 403 с.

5. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 1, 2 / рэд. Ул. Конан [і інш.]. – Мінск, 1997. – 355 с.

6. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 7. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы / рэд. Л. Кулажанка, А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск, 1996. – 173 с.

7. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 18. Хрысціянства і беларуская культура: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”, Мінск, 21 – 25 мая, 4 – 7 снеж. 2000 г. / рэдкал.: Л. Уладыкоўская-Канаплянік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – 206 с.

8. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 19. Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”, Мінск, 21 – 25 мая, 4 – 7 снеж. 2000 г. / рэдкал.: Г. Цыхун (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – 305 с.

9. Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 21. Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый” (Мінск, 21 – 25 мая, 4 – 7 снеж. 2000 г.) / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – 359 с.

10. Беларускае народнае адзенне / рэд. чл.-кар. АН БССР В. К. Бандарчык. – Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 95 с.

11. Беларускае народнае жыллё / рэд. чл.-кар. АН БССР В. К. Бандарчык. – Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 128 с.

12. Беларуская кафля / аўтар тэксту і склад. В. Е. Собаль [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1989. – 159 с.

13. Беларусы. У 8 т. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіцце / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі. – Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел.навука, 2001. – 432 с.

14. Белы, Алесь. Хроніка Белай Русі = Chronicon Russiae Albae: Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы / А. Белы. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2000. – 235 с. (Бібліятэка часопіса “Беларускі Гістарычны Агляд”; № 3. Серыя “Доследы” / навук.-рэд. рада: Г. Галенчанка [і інш.]).

15. Булыка, А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV – XVIII стст. / А. М. Булыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 256 с.

16. Василенок, С. И. Фольклор и литература Белоруссии эпохи феодализма (XIV – XVIII вв.) / С. И. Василенок. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1961. – 280 с.

17. Вольскі, В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. / В. Вольскі. – Мінск : Вучпедвыд, 1958. – 166 с.

18. Галенчанка, Г. Царква і рэлігія / Г. Галенчанка // Народная асвета. – 1996. – № 3. – С. 63 – 73.

19. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры: літ.-маст. выд. / уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб; рэд. М. І. Мушынскі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 478 с. (Серыя “Спадчына”)

20. Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т. 1: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI стагоддзя / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.

21. Гісторыя беларускага тэатра. У 3 т. Т. 1: Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. / рэдкал.: У. І. Няфед (гал. рэд.) [і інш.]; Акад. навук Беларускай ССР, Ін-т мастацтвазнаўства і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.

22. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. У 2 т. Т. 1: З старажытных часоў да канца XVIII ст. / рэдкалегія: В. В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 446 с.

23. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура, XI – першая палова XVIII стагоддзя. – Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 909 с.

24. Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд: падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей вну / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 4-е выд., стэрэатып. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 349 с.

25. Гринблат, М. Я. Белорусы: Очерки происхождения и этнической истории / М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1968. – 287 с.

26. Гринблат, М. Я. К вопросу об участии литовцев в этногенезе белорусов / М. Я. Гринблат // Вопросы этнической истории народов Прибалтики. Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции. – Т. 1. – М., 1959. – С. 523 – 543.

27. Гуревич, А. Я. Категории средневековой культуры / А. Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1984. – 350 с.

28. Дадзіёмава, В. У. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў выш., навучэнцаў сярэд. спец. навуч. установ культуры і мастацтва / Бел. дзярж. акад. музыкі. Каф. бел. музыкі. Праблем. навук.-даслед. лаб. музыкі. – Мінск : Бел. дзярж. акад. музыкі, 2001. – 254 с.

29. Дорошкевич, В. И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: первая половина XVI в. / В. И. Дорошкевич. – Минск : Наука и техника, 1979. – 208 с.

30. Думін, С. У. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 204 с.

31. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII – XVIII стагоддзяў. Ювелірнае мастацтва. Мастацкі метал. Кераміка. Фаянс. Шкло. Саломка. Скура. Тканіны. Вышыўка. Карункі. Шпалеры: [Альбом] / аўт. тэксту і склад. Н. Ф. Высоцкая; рэдкал.: А. В. Аладава [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1984. – 235 с.

32. Жлутка, А. Лацінская літаратура як феномен беларускай культуры / А. Жлутка // Спадчына. – 1993. – № 2.

33. Іканапіс Беларусі XV – XVIII стагоддзяў: [Альбом] / аўт. тэксту і склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1995. – 230 с.

34. Імя тваё, Белая Русь: [Зб. арт.] / уклад. Г. М. Сагановіч. – Мінск : Полымя, 1991. – 318 с.

35. Карский, Е. Ф. Белорусы. В 3 т. Т. 1 – 3 / Е. Ф. Карский; ред. совет: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭН, 2006.

36. Карский, Е. Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам / Е. Ф. Карский. – М. : Изд-во АН СССР, 1962. – 712 с.

37. Кушнярэвіч, А. М. Культавае дойлідства Беларусі XIII – XVI стст.: Гіст. і архіт.-археал.даслед. / А. М. Кушнярэвіч, навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 148 с.

38. Кушнярэвіч, А. М. Тыпалогія гатычнага абарончага культавага дойлідства Вялікага княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч; Мін. дзярж. лінгвіст. ун-т. – Мінск : МДЛУ, 2007. – 142 с.

39. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 1: IX – XIV стст. / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 390 с.

40. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 2: XV – сярэдзіна XVIII стст. / А. І. Лакот-

ка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел. навука, 2006. – 624 с.

41. Лакотка, А. І. Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці / А. І. Лакотка; рэд. М. Ф. Піліпенка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 96 с.

42. Лаўрык, Ю. М. Найдаўнейшыя беларускія бібліятэкі: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. / Ю. М. Лаўрык // Роднае слова. – 2006. – №№ 2 – 4.

43. Лауцявичюс, Э. Бумага в Литве в XV – XVIII веках / Э. Лауцявичюс. – Вильнюс : Мокслас, 1979. – 186 с.

44. Лявонава, А. К. Старажытнабеларуская скульптура / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. М. М. Яніцкая; фота М. П. Мельнікава [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 206 с.

45. Мядзведзеў, А. М. Да пытання аб паходжанні беларусаў (па дадзеных археалогії і мовазнаўства) / А. М. Мядзведзеў // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1998. – № 13. – С. 10 – 15.

46. Очерки истории науки и культуры Беларуси: IX – начало XX вв. / П. Т. Петриков, Д. В. Карев, А. А. Гусак [и др.]. – АН Беларуси. Ин-т истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 527 с.

47. Пластыка Беларусі XII – XVIII стагоддзя / аўт. і склад. Н. Ф. Высоцкая; рэдкал.: А. В. Аладава [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1983. – 231 с.

48. Саверчанка, І. В. Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII стст. / І. В. Саверчанка; рэд. А. І. Мальдзіс; АН Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. Фонд фундам. даслед. Рэсп. Беларусь. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 252 с.

49. Свяжынскі, У. М. Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага. Т. 2 / У. М. Свяжынскі // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. – Мінск, 2003. – С. 132 – 163.

50. Спиридонов, М. Ф. Архивы шляхты Беларуси в XIV в. / М. Ф. Спиридонов // Архівы і справаводства. – 2000. – № 4. – С. 101 – 104.

51. Ткачев, М. А. Замки Белоруссии / М. А. Ткачев. – Мінск : Полымя, 1987. – 222 с.

52. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – АН БССР. Ін-т гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 142 с.

53. Ткачоў, М. А. Замкі Беларусі (XIII – XVII стст.) / М. А. Ткачоў – Беларускае добр. т-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры. – Мінск : Полымя, 1977. – 83 с.

54. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў; нав. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

55. Трусаў, А. А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI – XVIII стагоддзяў: Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А. А. Трусаў, навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Лекцыя, 2001. – 203 с.

56. Хадыка, А. Старабеларуская шляхецкая мода / А. Хадыка // Спадчына. – 1992. – № 3.

57. Церашчатава, В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI – XVIII стст. / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства,этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 181 с.

58. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых заводаў / В. А. Чамярыцкі. – АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 191 с.

59. Шакун, Л. М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / Л. М. Шакун. – 2-е выд., перапрац. – Мінск : Выд-ва "Універсітэцкае", 1984. – 319 с.

60. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 330 с.

61. Этнокультурные и этноязыковые контакты на территории Великого княжества Литовского: материалы международной научной конференции // редкол.: Ю. Будрайтис, М. В. Завьялова, Е. Л. Назарова. – М. : Новое изд-во : Дом Юргиса Балтрушайтиса, 2006. – 233 с.

62. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло: (XVI – XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 88 с.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Белы, Алесь. Белая Русь / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 306 – 308.

2. Чамярыцкі, Вячаслаў. Апісанне земляў / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 233.

3. Чамярыцкі, Вячаслаў. Летапісы беларуска-літоўскія / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 192.

4. Чамярыцкі, Вячаслаў. Летапісец вялікіх князёў літоўскіх / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 190 – 191.

5. Чамярыцкі, Вячаслаў. "Пахвала Вітаўту" / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 418 – 419.

6. Чамярыцкі, Вячаслаў. Беларуска-літоўскі летапіс 1446 / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 299 – 300.

7. Чамярыцкі, Вячаслаў. Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 720.

8. Чамярыцкі Вячаслаў. Хроніка Быхаўца / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 720.

9. Шматаў, Віктар. Жыровіцкае Евангелле / В. Шматаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 631 – 632.

10. Пазднякоў, Валерый. Лаўрышаўскае Евангелле / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 186 – 187.

11. Свяжынскі, Уладзімір. "Жыціе Аляксея, чалавека Божага" / У. Свяжынскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 635.

12. Чамярыцкі, Вячаслаў. "Аповесць пра трох каралёў" / В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 234.

13. Свяжынскі, Уладзімір. "Страсці Хрыстовы" / У. Свяжынскі, В. Чамярыцкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 637 – 638.

14. Кушнярэвіч, Алесь. Готыка / А. Кушнярэвіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 547 – 550.

15. Дзярновіч, Алег. Замак / А. Дзярновіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 646.

# ТЭМА 8. ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА І ВОЙНЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

**Змест праграмы.** Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Ідэалагічнае абгрунтаванне прэтэнзій Вялікага княства Маскоўскага на валоданне беларускімі землямі. Войны паміж суседнімі княствамі канца XV – першай паловы XVI стст., іх вынікі. Бітва на Вядрошы, абарона Смаленска, бітва пад Оршай.

Паспалітае рушанне (усеагульнае апалчэнне) як аснова вайсковай арганізацыі ВКЛ у XVI ст. Узбраенне войска. Пачатак пераходу ад паспалітага рушання да наёмнага, прафесійнага войска.

Набегі крымскіх татар і барацьба з паўднёвым агрэсарам. Бітва пад Клецкам.

Мяцеж М. Глінскага. Асоба М. Глінскага і яго роля ў кіраўніцтве дзяржавай. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны, мэта выступлення Глінскага. Галоўныя падзеі мяцяжу, яго сувязь з маскоўскім дваром. Непасрэдныя і далёкасяжныя вынікі мяцяжу.

Мерапрыемствы па ўмацаванні дзяржаўнай абароны ў 40-я – 50-я гг. XVI ст.

## 8.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### 8.1.1. Адносіны Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы ў канцы XV – першай палове XVI стст.

Канец XV – першая палова XVI стст. у знешняй палітыцы ВКЛ пазначаны абвастрэннем адносін з Маскоўскай дзяржавай. Гэта было выклікана як узрастаннем яе палітычнай ролі, так і стварэннем ідэалагічных падстаў для яе дамінавання. Пасля захопу ў 1453 г. Канстанцінопаля туркамі і гібелі апошняга яго імператара Масква стала прэтэндаваць на ролю спадкаемцы хрысціянскай імперыі. Шлюб маскоўскага князя Івана III з апошняй прадстаўніцай візантыйскага імператарскага дома Соф'яй Палеалог наблізіў Маскву да спадкаемства палітычнай ролі Візантыі. Узніненне тэорыі "Масква – трэці Рым" пасадзейнічала павелічэнню прэтэнзій Маскоўскай дзяржавы на ролю збіральніка спадчыны Кіеўскай Русі, што непазбежна прывяло да сутыкнення з ВКЛ.

Яшчэ пры Казіміры Ягайлавічу паўсамастойныя чарнігава-северскія і вярхоўскія князі перайшлі на бок Масквы. Адразу пасля яго смерці распачалася ***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.*** У ліпені 1492 г. новым вялікім князем літоўскім стаў Аляксандр Казіміравіч. Каб спыніць канфлікт з Маскоўскай дзяржавай, віленскі двор

прапанаваў шлюб маскоўскай князёўны Алены Іванаўны і Аляксандра. У выніку складаных перагавораў у 1494 г. было дасягнута пагадненне аб міры і новай мяжы паміж дзяржавамі. Вяземскае княства і вярхоўскія землі адышлі да Масквы, але дакладна мяжа так і не была вызначана, што дало падставу для новых сутычак. Таксама ВКЛ вымушана было адмовіцца ад прэтэнзій на Ноўгарад, Пскоў, Цвер, Разань, прызнаць усе ад'езды вярхоўскіх князёў. У 1495 г. Алена Іванаўна пераехала ў Вільню. Яе бацька, маскоўскі князь Іван ІІІ пагадзіўся на гэты шлюб, бо такім чынам разлічваў атрымаць доступ да унутраных справаў ВКЛ і ўмацаваць там становішча праваслаўнай царквы. Аляксандр жа бачыў у гэтым шлюбе сродак спынення супярэчнасцей з Масквой.

Аднак напрыканцы XV ст. адносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай зноў абвастрыліся. Іван ІІІ заключыў саюз з Крымскім ханствам, усталяваў добрыя адносіны з Турцыяй. Фармальнай зачэпкай для новага канфлікту стала нібыта пераследаванне праваслаўя ў ВКЛ. Распачалася ***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** Найбольш значная падзея гэтай вайны – ***Бітва на Вядрошы 1500 г.***, у якой амаль цалкам быў знішчаны чатырохтысячны конны корпус ВКЛ пад камандаваннем найвышэйшага гетмана К. І. Астрожскага. Пасля доўгіх перагавораў бакоў вайна завяршылася падпісаннем шасцігадовага перамір'я і адыходам да Маскоўскай дзяржавы значнай часткі тэрыторый ВКЛ.

У 1506 г. Аляксандр Казіміравіч памёр, і вялікім князем стаў другі сын Казіміра, Жыгімонт (вядомы як Жыгімонт І Стары). Годам раней памёр маскоўскі князь Іван ІІІ, і Вільня ва ультыматыўнай форме запатрабавала ад яго пераемніка, Васіля ІІІ, вярнуць гарады і землі, захопленыя ў папярэдняй вайне. Аднак маскоўскі ўрад патрабаванні не выканаў, і ў красавіку 1507 г. распачалася новая вайна (***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 гг.***). Сітуацыя ў ВКЛ ускладнілася пачаткам мяцяжу князя М. Глінскага, які прыняў бок Масквы. Вайна скончылася падпісаннем "вечнага міру" 19.09.1508 г., які замацоўваў ранейшыя межы паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай.

Аднак гэты "вечны мір" разглядаўся толькі як часовая перадышка. Ужо з 1510 г. бакі распачалі падрыхтоўку да новай вайны. Уласна баявыя дзеянні пачаліся ў 1512 г. (***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.***). Галоўнай мэтай Васіля ІІІ стаў Смаленск. Ён быў захоплены толькі падчас трэцяга паходу рускіх войск 31.07.1514 г. У выніку генеральнай ***Аршанскай бітвы 08.09.1514 г.*** 80-тысячнае маскоўскае войска было разбіта гетманам найвышэйшым ***К. Астрожскім.*** Аднак вайна працягвалася да 1522 г. і па выніках дасягнутага кампраміснага пе-

рамір'я, якое насіла часовы характар, Смаленск застаўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.

У 1533 г. памёр Васіль III, што абудзіла ў ВКЛ надзеі на вяртанне страчаных раней тэрыторый. Да таго ж антымаскоўскую пазіцыю ў гэты час займаў і Крым, у самой Маскве назіраўся ўнутраны разлад. Спробы ўрэгуляваць пытанне мірным шляхам поспеху не мелі, і ў 1534 г. войскі ВКЛ распачалі баявыя дзеянні (***вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1534 – 1537 гг.***). Аднак сітуацыя ў цэлым склалася неспрыяльна для ВКЛ, ніякіх значных поспехаў дасягнута не было, і ў 1537 г. ВКЛ і Маскоўская дзяржава падпісалі чарговае перамір'е, па ўмовах якога адбыліся нязначныя змены мяжы паміж дзяржавамі, але Смаленск застаўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.

### 8.1.2. Арганізацыя войска ВКЛ у XV – перш. палове XVI стст.

Да канца XIV ст. у ВКЛ існавала архаічная і найбольш масавая форма мабілізацыі – ***пагоня.*** Асновай арганізацыі ўзброеных сілаў ВКЛ у XV ст. і пазней становіцца ***паспалітае рушанне***, шляхецкае апалчэнне. Да сярэдзіны XV ст. асноўнымі катэгорыямі ваяроў з'яўляліся конныя капійнікі і стральцы (лучнікі і арбалетчыкі), а таксама з канца XIV ст. актыўна выкарыстоўвалася лёгкая татарская конніца.

Найдрабнейшай структурнай адзінкай войска было "кап'ё" (з XVI ст. – почат). У склад кожнага кап'я уваходзілі капійнік і 2 стральцы (на практыцы іх колькасць значна вагалася). Коп'і аб'ядноўваліся ў харугвы паводле тэрытарыяльнага прынцыпу або прыналежнасці буйным феадалам. У час бою харугвы рушылі наперад клінамі, наперадзе стаялі капійнікі, за імі – стральцы, якія стралялі навесам паверх галоў пярэдніх ліній. З развіццём засцерагальнага ўзбраення уведзена больш дэталёвая дыферэнцыяцыя войска – даспешныя (капійнікі), панцырныя (стральцы) і шчытнікі.

Статут ВКЛ 1529 г. патрабаваў выстаўляць аднаго паўнавартаснага вершніка з поўным рыштункам ад 8 сялянскіх службаў. Калі паны не валодалі 8 службамі, то неслі службу самі паводле магчымасці. Зборам ваяводскіх і павятовых харугваў займаліся маршалкі, харужыя і кашталяны. Праводзіўся ўлік (попіс) войска, пасля чаго ваяры паступалі ў распараджэнне гетмана. Паспалітае рушанне праіснавала да канца XVIII ст., але ўжо напачатку XVI ст. яно пачало траціць свае баявыя якасці. Крызіс, як і ў суседняй Польшчы, быў выкліканы ростам прадукцыйных сіл, пашырэннем фальваркавай сістэмы гаспадарання. Шляхта нашмат больш была заклапочана прыбыткамі, чым вайсковай службай, і ўсё больш неахвотна збіралася ў вайсковыя выправы. Яно добра праяўляла сябе ў кароткіх кампаніях, калі

зыход справы вырашаўся адной-дзвюма бітвамі, але ў доўгатэрміновых кампаніях зусім не жадала ўдзельнічаць. Да таго ж заканадаўства не прадугледжвала істотных пакаранняў за нез'яўленне ў апалчэнне. Гэтыя акалічнасці вымусілі звярнуцца да новых форм арганізацыі войска, а менавіта – да найманых аддзелаў. Уласна кажучы, найманыя атрады меліся ў войску вялікіх князёў пачынаючы з Міндоўга, шмат іх было ў войску Вітаўта і яго пераемнікаў, аб чым маюцца шматлікія паведамленні ў гістарычных крыніцах. Новым этапам арганізацыі наёмнага войска стала княжанне Аляксандра (1492 – 1506 гг.). Гэтаму якраз паспрыяла вядзенне зацяжных войнаў з Маскоўскай дзяржавай. У войскі ВКЛ актыўна пачалі прыцягвацца добраахвотнікі. Так, у 1493 г. Аляксандр даручыў свайму паслу, накіраванаму ў Польшчу, дамовіцца аб вярбоўцы платных жаўнераў. У 1500 г. Аляксандр выдаў адозву да паноў, гарадоў і ротмістраў аб тым, што ён стварае рыцарскае брацтва з мэтай барацьбы з Масквой. Гэтая адозва павінна была быць агалошана ў краінах Еўропы.

У часы Аляксандра наёмнікі ("служэбныя") пачалі выкарыстоўвацца не толькі ў ваенных дзеяннях, але і для аховы межаў, паступова ператвараючыся ў пастаяннае войска. Традыцыя сталага выкарыстання наёмнікаў працягнулася падчас панавання Жыгімонта I Старога (1506 – 1529 гг.) і Жыгімонта II Аўгуста (1529 – 1548 гг.). Так, падчас вайны 1507 – 1508 гг. ВКЛ мусіла ўтрымліваць 5000 наёмнікаў. Пасля здачы Смаленска ў 1514 г. была праведзена мабілізацыя 14 тысяч кавалерыі і 3 тысяч пяхоты (наёмных).

Значную ролю адыгрывалі найміты і ў паўднёвым накірунку, у барацьбе з татарамі. Так, у 1520-я гг. на землі Украіны было накіравана 2000 наёмнікаў.

Наёмныя роты былі разнастайныя па сваёй этнічнай прыналежнасці. Так, з канца XV ст. вялікую папулярнасць набывае швейцарская пяхота, а таксама нямецкія ландскнехты. Апошнія складалі асабістую ахову князя у канцы XV ст. (з пачатку XVI ст. – швейцарцы).

Да канца XV ст. не існавала прынцыповай розніцы паміж арганізацыяй наёмных атрадаў і паспалітага рушання. Пазней яна пачынае набываць адметнасці. Наёмнікі арганізоўваюцца ў роты на чале з ротмістрамі. Ротмістры займаліся фармаваннем рот. Конныя роты падзяляліся на ***почты***, якія ўзначальваліся таварышамі, пешыя – на дзесяткі, на чале з дзесятнікамі. Пехацінцы ў ВКЛ мелі назву ***драбы***. Аснову пешых рот складалі стральцы з арбалетамі ці агнястрэльнай зброяй. Наперадзе стральцоў размяшчаліся павезнікі і капійнікі з коп'ямі і алебардамі. Конныя роты дзяліліся на "капійнічыя" і "стрэльчыя" (у стрэльчых суадносіны капійнікаў і стральцоў былі 1:4, у капійнічых на аднаго капійніка – 2 стральцы). Маглі

быць і цалкам стрэльчыя роты. У склад почта ўваходзілі пахолкі-збраяносцы (маглі быць узброены стралковай зброяй) і пахаляты – няўзброеная абслуга). Напачатку XVI ст. сярод наёмнікаў з'яўляецца новы від кавалерыі – гусары ("рацы"), які меў венгерскае паходжанне. Гусары добра зарэкамендавалі сябе ў барацьбе з туркамі, былі прыняты ў Польшчы і ВКЛ і аказалі велізарны ўплыў на развіццё вайсковай справы ў гэтых дзяржавах. У XVI ст. у войску ВКЛ меліся і іншыя віды кавалерыі, напрыклад, ***казакі.***

### 8.1.3. Адносіны ВКЛ з Крымскім ханствам у сяр. XV – пач. XVI стст.

У канцы 1420-х гг. на тэрыторыі Крымскага паўвострава і часткова прычарнаморскага стэпу з часткі былых уладанняў Залатой Арды узнікла феадальная дзяржава – Крымскае ханства. У сярэдзіне XV ст. тут усталявалася дынастыя Гірэяў. У канцы XV – пач. XVI стст. адносіны з Масквой, ВКЛ і Польшчай у Крымскага ханства былі нестабільнымі. У 1470-я гг. пачаліся набегі татараў на Падолле, паўднёвы ўсход Польшчы, Валынь, Кіеўшчыну, беларускія землі. У 1497 г. татарскія конніцы спустошылі Мазыршчыну, у 1500 г. спалілі Брэст і Камянец, у 1501 г. уварваліся на Палессе, у 1502 г. спустошылі Тураўшчыну, у 1503 г. – ваколіцы Капыля, Клецка, Нясвіжа, Слуцка. Увосень 1503 г. 3 тыс. татар дайшлі да Навагрудка, але былі разгромлены ля Давыд-Гарадка. У 1505 г. адбыўся новы татарскі набег, пяцітысячнае войска пераправілася праз Дняпро каля Лоева, рушыла да Мінска, Слуцка, Навагрудка, асобныя атрады – да Вільні, Віцебска, Друцка, Лагойска, Полацка. Гэтыя набегі мелі вынікам спусташэнне значнай часткі беларускіх земляў, вывад дзесяткаў тысяч чалавек у палон, пачатак эпідэмічных захворванняў.

Увесну 1506 г. на беларускія землі ўварвалася 12-тысячнае татарскае войска, якое спынілася каля Клецка. Адсюль татарскія загоны рабавалі і палілі ваколіцы Ашмян, Ваўкавыска, Гродна, Крэва, Ліды, Навагрудка, Слуцка. Вялікі князь Аляксандр даручыў арганізацыю адпору гетману С. Кішку і маршалку дворнаму М. Глінскаму. У Лідзе сабралася прыкладна шасцісямітысячнае войска ВКЛ. Яно некалькі дзён стаяла каля Навагрудка, а затым рушыла пад Клецк, дзе знаходзіўся галоўны татарскі лагер. Па дарозе Кішка захварэў, і камандаванне прыняў М. Глінскі. 05.08.1506 г. адбылася ***Клецкая бітва***, у якой татарскае войска было разбіта. У 1507 г. татары заключылі саюз з ВКЛ і Польшчай, а ўжо у 1508 г. зноў уварваліся на тэрыторыю Беларусі. Адносіны працягвалі заставацца нестабільнымі на працягу наступных дзесяцігоддзяў, калі заключаныя саюзы перыядычна парушаліся татарскімі набегамі. З 1530-х гг. у сувязі са зменай знешнепалітычнага курсу Крымкага ханства напады на ВКЛ сталі больш рэдкімі.

Усяго з 1474 па 1569 гг. было ажыццёўлена 75 нападаў татар на ВКЛ, з іх 12 – непасрэдна на Беларусь. Каб пазбегнуць нападаў, ВКЛ сплочвала ардыншчыну. Сяляне Падняпроўскіх велікакняжацкіх валасцей павінны былі таксама падтрымліваць у парадку замкі, несці дазорную службу на магчымых напрамках нападу татар. Напады татар з'яўляліся фактарам, які істотна тармазіў сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх земляў.

### 8.1.4. Мяцеж М. Глінскага

Пасля перамогі над татарамі пад Клецкам **Міхаіл Глінскі** карыстаўся вялікім уплывам на ўнутры- і знешнепалітычныя справы ВКЛ. Ён з'яўляўся прыбліжаным князя Аляксандра, аднак абраны ў тым жа годзе новы вялікі князь Жыгімонт І Стары аддаліў ад сябе Глінскага, імкнучыся пазбавіцца залежнасці ад магнацкіх груповак. Пачаткам мяцяжу М. Глінскага стаў яго асабісты канфлікт з троцкім ваяводам Я. Заберазінскім. Глінскі паскардзіўся каралю, што Заберазінскі рыхтуе яго забойства, але Жыгімонт І пакінуў скаргу без увагі. Глінскі арганізаваў атрад са сваіх васалаў і сваякоў і напаў у пачатку лютага 1508 г. на дом Заберазінскага ля Гародні, забіў гаспадара. Затым Глінскі рушыў на Наваградак, пазней – у Тураў. Маскоўскі князь, які вёў з ВКЛ вайну, скарыстаў выступленне Глінскага і заключыў з ім у красавіку 1508 г. пагадненне аб сумесных дзеяннях і аб перадачы занятых на Беларусі замкаў непасрэдна Глінскаму. Шэрагі мяцежнікаў налічвалі да гэтага часу каля 2 тыс. чалавек, аднак асаблівай падтрымкі сярод шляхты мяцеж не знайшоў. Паўстанцы фактычна сталі дапаможным войскам маскоўскіх сілаў. Пад Бабруйскам атрад Глінскага злучыўся з сіламі ваяводы Шамячыча. Спробы захапіць Менск, Слуцк, Слонім, Новагародак асаблівага поспеху не мелі. Пасля таго, як выступілі галоўныя сілы войска ВКЛ, Глінскі адступіў ад Оршы, дзе размяшчался галоўная маскоўская армія. У ліпені Глінскі хацеў даць рашаючую бітву, каб з перамогай вярнуцца ў цэнтральную Беларусь. Але Васіль ІІІ рызыкаваць не захацеў, маючы ў тыле незаняты Смаленск. Маскоўскія войскі адышлі да Мсціслава і Крычава, а Глінскі адступіў у Старадуб, потым вярнуўся ў Мазыр, дзе хацеў працягваць барацьбу. Калі ж у верасні 1508 г. Масква і ВКЛ заключылі мір і на Палессе для падаўлення мяцяжу рушыла войска К. Астрожскага, Глінскі перабраўся ў Маскву, дзе атрымаў ва ўдзелы Малаяраславец і Баброўск. Уладанні яго на тэрыторыі ВКЛ былі канфіскаваны.

## 8.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Аляксандр** (у ВКЛ Аляксандр ІІ; 05.08.1461 г., г. Кракаў – 19.08.1506 г.), вялікі князь літоўскі [1492 – 1506 гг.], кароль польскі [1501 – 1506 гг.].

4-ы сын ***Казіміра IV*** ад Альжбеты Габсбург. Атрымаў адукацыю пад кіраўніцтвам гісторыка Я. Длугаша. Яшчэ ў 1484 г. быў вызначаны бацькам спадчыннікам трона ў ВКЛ. У 1491 г. прыбыў на сталы побыт у Вільню. Пасля смерці Казіміра Аляксандр быў абраны вялікім князем літоўскім на сойме ў Вільні, а польскі сейм абраў каралём яго старэйшага брата Яна Ольбрахта [1492 – 1501 гг.]. Адразу пасля абрання Аляксандр выдаў агульназемскі ***Прывілей 1492 г.***, якім значна пашырыў правы баяр ВКЛ. Улада вялікага князя абмяжоўвалася на карысць паноў-рады, без згоды якіх вялікі князь не меў цяпер права прымаць важныя дзяржаўныя рашэнні. Вялікі князь не меў права адмяняць пастановы рады. У знешняй палітыцы галоўнымі былі адносіны з Маскоўскім вялікім княствам, якое перад гэтым пазбавілася татара-мангольскага прыгнёту і прад'яўляла прэтэнзіі на ўсходнія тэрыторыі ВКЛ, а потым і на ўсю дзяржаву. Пасля ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.*** была страчана Вязьма і канчаткова – Вярхоўскія княствы. Мірны дагавор быў замацаваны ў 1495 г. шлюбам Аляксандра з князёўнай ***Аленай Іванаўнай***, дачкой вялікага князя маскоўскага Івана III (...). Аднак пачалася наступная ***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** Пасля смерці Яна Ольбрахта польскі сейм выбраў Аляксандра каралём, і персанальная унія ВКЛ з Польшчай была адноўлена. (...) ***Мельніцкая унія 1501 г.*** паміж абедзвюма дзяржавамі не была ажыццёўлена. Пасля абрання Аляксандр выдаў ***Мельніцкі прывілей 1501 г.*** У 1503 г. Аляксандр заключыў з Іванам III перамір'е, саступіўшы Маскоўскай дзяржаве гарады Чарнігаў, Гомель, Старадуб, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Мцэнск і інш. У наступныя гады ўдалося спыніць напады крымскіх татараў і нанесці ім сур'ёзнае паражэнне ў ***Клецкай бітве 1506 г.*** У Польшчы Аляксандр зацвердзіў Радамскую канстытуцыю 1505 г, якая прызнавала за сеймам права выдаваць законы, а кароль не меў права зацвярджаць законы без згоды сенатараў і шляхецкіх дэпутатаў. Аляксандр памёр у Вільні і быў пахаваны ў кафедральным касцёле св. Станіслава. [1]

**Алена Іванаўна** (19.05.1476 г., Масква – 20.01.1513 г.), вялікая княгіня ВКЛ з 1495 г., каралева польская з 1501 г.; жонка вялікага князя ВКЛ і караля польскага ***Аляксандра***. Старэйшая дачка вялікага князя маскоўскага ***Васіля III***, які разлічваў праз шлюб Алены Іванаўны атрымаць доступ да спраў ВКЛ, умацаваць там становішча праваслаўнай царквы. Аляксандр бачыў у шлюбе сродак спынення палітычнага і ваеннага наступу Маскоўскай дзяржавы на ВКЛ. Заручыны адбыліся 06.02.1494 г. у Маскве ў адсутнасці Аляксандра, а вянчанне – 15.02.1495 г. у Віленскім кафедральным

касцёле святога Станіслава паводле каталіцкага і праваслаўнага абрадаў. Адносіны з мужам у Алены Іванаўны склаліся добрыя, аднак яе цвёрдая прыхільнасць да праваслаўя выклікала расчараванне каталіцкага акружэння вялікага князя. Яе пастаянна ўгаворвалі змяніць веру, але Алена Іванаўна была няўмольнай, падтрымлівала праваслаўную царкву ў ВКЛ. (...) Садзейнічала заключэнню міру з Маскоўскай дзяржавай у 1503 г. У 1501 – 1503 гг. атрымала ад мужа маёнткі ў Віленскім і Троцкім ваяводствах, каля Менска і Гародні, Браслаў, Магілёў, Княжыцы, Смаляны, Цяцерын, Папову Гару. Новы вялікі князь ВКЛ Жыгімонт Стары ў 1506 г. падараваў ёй Бельск, Сараж і Бранск на Падляшшы. Пахавана ў Віленскім Прачысценскім саборы. [2]

**Астрожскі Канстанцін Іванавіч** (каля 1460 – паміж 15 і 25.08.1530 гг.), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. З роду князёў Астрожскіх. Найвышэйшы гетман ВКЛ у 1497 – 1500 гг. і з 1507 г., адначасова маршалак Валынскай зямлі ў 1507 – 1522 гг., кашталян віленскі ў 1511 –1522 гг., ваявода троцкі з 1522 г.; староста брацлаўскі ў 1497 – 1500 гг. і з 1507 г., вінніцкі ў 1497 – 1500 гг. і з 1507, луцкі з 1507 г. Верагодна, у 1486 – 1490 гг. удзельнічаў у адбіцці татарскіх нападаў, у ***вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.*** У 1496 г. абараняў Роўна ад татараў, у 1497 г. адбіваў татарскі напад на Валынь, у час чарнаморскага паходу караля Польшчы Яна Ольбрахта разбіў каля Ачакава войска хана Махмет-Гірэя. За атрыманыя перамогі ў канцы 1497 г. прызначаны найвышэйшым гетманам ВКЛ. У пачатку ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** узначаліў войска ВКЛ, якое рушыла да г. Дарагабуж, пацярпеў паражэнне ў ***бітве на Вядрошы 1500 г.*** і трапіў у палон. На прапанову перайсці на маскоўскую службу ў 1506 г. прысягнуў вялікаму князю маскоўскаму, аднак атрыманую свабоду выкарыстаў для ўцёкаў і ў верасні 1507 г. прыбыў у Вільню. Змагаўся супраць мяцяжу Глінскіх 1508 г., у 1508 – 1512 гг. – супраць татарскіх нападаў, атрымаў перамогу ў ***Вішнявецкай бітве 1512 г.*** У ***вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.*** разбіў каля Оршы рускі корпус (восень 1513 г.), атрымаў перамогу ў ***Аршанскай бітве 1514 г.*** У 1517 г. ваяваў на Пскоўшчыне. Вясной 1518 г. пасол ад паноў-рады ВКЛ у Польшчу. 02.18.1519 г. разбіты татарамі пад Сакалем, летам 1524 г. адбіваў іх напад на паўднёвыя землі ВКЛ, атрымаў перамогу ў ***бітве на Альшаніцы 1527 г.*** (...) Карыстаўся вялікім аўтарытэтам у вялікіх князёў ВКЛ Аляксандра і Жыгімонта Старога, дзякуючы чаму стаў першым у ВКЛ праваслаўным, які заняў прызначаныя для католікаў пасады кашталяна віленскага і ваяводы троцкага.

Быў галоўным апекуном праваслаўнай царквы ВКЛ. (…) Дзякуючы Астрожскаму фактычна была адменена забарона на пабудову праваслаўных цэркваў у дзяржаўных уладаннях ВКЛ. У 1511 г. атрымаў дазвол на перабудову Віленскага Прачысценскага сабора, у 1514 г. – на пабудову ў Вільні цэркваў Св. Тройцы і св. Мікалая (Перанясенскай) у гонар бітвы пад Оршай, пабудаваў цэрквы ў Дубне (1492 г.), Смалявічах (каля 1520 г.). Рабіў падараванні цэрквам Вільні, Навагародка, Турава, Дзярманскаму і Межырэцкаму манастырам, Кіева-Пячэрскаму манастыру. У 1511 г. дамогся ад Жыгімонта Старога пацвярджэння праваслаўнай царкве ВКЛ права на незалежны суд і забароны свецкім асобам прызначаць на царкоўныя пасады. Кіраваў маёнткамі Кіеўскай мітраполіі пасля смерці мітрапаліта Іосіфа II Солтана (1521 г.). Валодаў вялікімі зямельнымі маёнткамі на Валыні (Астрог і інш.), атрымаў ад вялікага князя Дубну, Красілаў, Здзецел (Дзятлава, 1498 г.), Тураў (1508 г.), Балажэвічы, Шастовічы і Капцэвічы ў Мазырскім пав. (1512 г.), Дарагабуж на Валыні (1514 г.), Смаляны (1522 г.), Копысь і інш. Як пасаг атрымаў ад жонкі частку Гальшан і Глуска, Смалявічы і Жыцін на Меншчыне, Шашолы і Свіраны ў Літве, як спадчыну – Славенск каля Ашмян, Лемніцу і Палонну каля Оршы, купіў Тарасаў каля Менска (1516 г.), Азяраны і воз. Свіцязь (1516 г.), Нізгалаў і Сушу на Полаччыне (1526 г.). У 1528 выстаўляў у войска са сваіх маёнткаў 426 коннікаў. У шлюбе з Таццянай, дачкой князя С. Ю. Гальшанскага, меў сына Іллю, у шлюбе з Аляксандрай, дачкой князя С. М. Алелькавіча, – сына Васіля і дачку Соф'ю. Сучаснікі высока цанілі Астрожскага як палкаводца, пасля смерці называлі яго “другім Ганібалам”, “рускім Сцыпіёнам”, сцвярджалі, што выйграў 64 бітвы. Пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры. [3]

**Іван III Васілевіч** (Иван III Васильевич; 22.01.1440 г., Масква – 27.10.1505 г.), вялікі князь маскоўскі [1462 – 1505 гг.]. Старэйшы сын Васіля II Цёмнага. Імкнуўся да ўмацавання і цэнтралізацыі Маскоўскай дзяржавы. У час яго праўлення выйшаў Судзебнік 1497 г., мэтай якога было ўнясенне аднастайнасці ў ажыццяўленне правасуддзя і кіравання ва ўсёй дзяржаве, пачаў складвацца цэнтралізаваны апарат улады, павялічылася значэнне памеснага землеўладання і дваранства. Пазіцыі ўдзельных князёў былі моцна аслаблены. У знешняй палітыцы актыўна праводзіў палітыку “збірання рускіх зямель” вакол Масквы. Да Маскоўскага княства далучаны Яраслаўскае і Растоўскае княствы, Цвярское вялікае княства, Вяцкая і частка разанскіх зямель, захоплена Наўгародская феадальная рэспубліка, якая шукала зблізжэння з ВКЛ. У выніку шлюбу з прадстаўніцай роду візантыйскіх імператараў Соф'яй Палеалог і надання сабе тытула “государя всея Руси”

пачаў прэтэндаваць на ролю спадкаемца візантыйскіх імператараў і ўладароў былой Кіеўскай Русі, на беларускія і ўкраінскія землі, што знаходзіліся ў складзе ВКЛ. У час распачатых Іванам III ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.*** і ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** да Маскоўскага княства адышоў шэраг тэрыторый ВКЛ з гарадамі Чарнігавам, Ноўгарад-Северскім, Бранскам, Любечам, Гомелем, Старадубам, Мцэнскам, Бельскам і інш. Пры Іване III канчаткова скасавана залежнасць Масквы ад Залатой Арды (1480 г.). У той жа час ён падтрымліваў добрыя адносіны з Крымскім ханствам і заахвочваў крымскіх татараў да наездаў на паўднёвыя землі ВКЛ. [4]

**Васіль III Іванавіч** (Василий III Иванович; 25.02.1479 г., Масква – 04.12.1533 г.), вялікі князь маскоўскі [1505 – 1533 гг.]. Сын Івана III і Соф'і Палеалог. Завяршыў аб'яднанне расійскіх зямель вакол Масквы. У 1510 г. пад уладу Васіля III перайшоў Пскоў. Пасля смерці вялікага князя літоўскага Аляксандра (1506 г.), які быў жанаты з сястрою Васіля III ***Аленай Іванаўнай***, дамагаўся, каб яго выбралі вялікім князем ВКЛ. Атрымаўшы адмову, пачаў рыхтавацца да вайны з ВКЛ. ***Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 гг.*** скончылася безвынікова, аднак на службу да Васіля III перайшла групоўка князёў Глінскіх. У час ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствамЛітоўскім 1512 – 1522 г.*** 01.08.1514 г. з дапамогай ***М. Л. Глінскага*** ўзяў Смаленск, але 8 верасня ў ***Аршанскай бітве 1514 г.*** маскоўскае войска было разбіта. Паводле перамір'я 1522 г. Смаленск застаўся за Масквою. Другім шлюбам жанаты з Аленай Васілеўнай Глінскай, пляменніцай М. Л. Глінскага (1526 г.), з якой меў сына ***Івана IV*** Грознага. [5]

**Жыгімонт I** Стары (у ВКЛ Жыгімонт II; 01.01.1467 г., Казяніцы Радамскага пав., Польшча – 01.04.1548 г.), вялікі князь літоўскі і кароль польскі [1506 – 1548 гг.]. Сын *Казіміра IV*, унук *Ягайлы*. Атрымаў добрую адукацыю, валодаў некалькімі мовамі. Атрымаў у Сілезіі ад старэйшага брата, караля Чэхіі і Венгрыі Уладзіслава II, Глогаўскае (1498 г.) і Апаўскае (1501 г.) княствы, у 1504 г. прызначаны каралеўскім намеснікам Сілезіі, потым Лужыцы. Пасля смерці вялікага князя літоўскага Аляксандра абраны панамі-радай на велікакняжацкі пасад (20.10.1506 г.) Нягледзячы на апазіцыю малапольскіх сенатараў абраны і польскім каралём (08.12.1506 г.). Адмовіўся ад сілезскіх княстваў, залежных ад чэшскага караля. Унутраная палітыка Жыгімонта I была накіравана на ўмацаванне дзяржаўнай улады, аднак вайсковыя і фінансавыя рэформы, спробы рэдукцыі (вяртання) каронных ма-

ёнткаў, захопленых магнатамі, не мелі вялікага поспеху. У 1537 г. супраць Жыгімонта I і магнатаў сярэдняя шляхта Польшчы ўзняла феадальны мяцеж (“Курыная вайна”). Шляхта ВКЛ юрыдычна дамаглася роўных правоў з магнатамі: быў уведзены адзіны кодэкс законаў для дзяржавы – ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г.*** Жыгімонт I праводзіў актыўную знешнюю палітыку. Быў вымушаны весці абарончыя войны з Маскоўскай дзяржавай (***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 гг.***, ***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.***, ***вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1534 – 1537 гг.***), у выніку якіх быў страчаны Смаленск. Для адбіцця нападаў крымскіх татараў на Украіне была створана памежная варта з мясцовых жыхароў – ***казакі.*** У час перамогі Рэфармацыі ў Прусіі Жыгімонт I згадзіўся на секулярызацыю Тэўтонскага ордэна і ўтварэнне на яго тэрыторыі васальнага ў адносінах да Польшчы Прускага герцагства на чале са сваім пляменнікам Альбрэхтам. Пры Жыгімонце I пасля загадкавай смерці апошніх удзельных мазавецкіх князёў Мазавецкае княства было ўз’яднана з Польшчай (1526 г., канчаткова ў 1529 г.). Праводзячы антыгабсбургскую палітыку, Жыгімонт I заключыў саюзы з Францыяй (1524 г.) і Турцыяй (1533 г.). У 1531 г. у барацьбе за Пакуцце Польшча атрымала перамогу над малдаўскім князем Пятром Рарэшам. Актыўную ролю адыгрывала ў палітыцы другая жонка (з 1518 г.) Жыгімонта I ***Бона,*** якая намагалася замацаваць кароны ВКЛ і Польшчы за сваім сынам ***Жыгімонтам II Аўгустам***, дзеля чаго было праведзена яго абранне намінальным другім вялікім князем і каралём (1529 г.). У час панавання Жыгімонта I шырока распаўсюдзілася ў Польшчы і ВКЛ Рэфармацыя ў розных яе плынях, што садзейнічала далейшаму ўздыму гуманізма і пісьменства. [6]

**Глінскі, Міхаіл Львовіч** (мянушка Мажны; каля 1470 – 24.09.1534 гг.) (...) Маладым вучыўся ў Еўропе, быў у Германіі, Італіі, Іспаніі. Служыў у войску імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміляна I, вызначыўся выключнымі здольнасцямі і заслужыў асаблівую прыхільнасць імператара. Перайшоў у каталіцтва. У канцы 1490-х гг. вярнуўся ў ВКЛ і хутка стаў набліжанай асобай вялікага князя Аляксандра. Намеснік уцянскі (1498 г.), маршалак дворны ў 1500 – 1506 г., намеснік мерацкі ў 1501 – 1505 гг., бельскі ў 1505 – 1506 г. Атрымаў ад вялікага князя ВКЛ буйныя маёнткі Райгорад і Ганязь на Падляшшы, Мажэйкава (пад Лідай), Тураў і інш. (...). Імклівае ўзвышэнне Глінскіх выклікала востры канфлікт паміж імі і старой літоўскай знаццю: Радзівіламі, Кезгайламі і асабліва з Янам Юр’евічам Забярэзінскім, асабістым ворагам Глінскіх. У 1506 г. Глінскі ўзначаліў

войска ВКЛ, якое атрымала перамогу над татарамі ў ***Клецкай бітве 1506 г.*** Пасля смерці вялікага князя Аляксандра сярод знаці ўзнікла занепакоенасць, што, вярнуўшыся на чале пераможнага войска, Глінскі паспрабуе захапіць уладу. Аднак ён прызнаў новага вялікага князя ВКЛ Жыгімонта Старога і прынёс яму прысягу. Нягледзячы на гэта, трапіў у няміласць да новага гаспадара. Абвастрыўся канфлікт з Забярэзінскім. На пачатку 1508 г. Глінскі арганізаваў наезд на маёнтак Забярэзінскага, забіў яго, пасля чаго з'ехаў у свой замак Тураў. У хуткім часе, падбухтораны пасламі вялікага князя маскоўскага Васіля III, узняў мяцеж супраць Жыгімонта Старога, захапіў Мазыр і Бабруйск, з дапамогай маскоўскага войска ўчыніў аблогу Менска і Слуцка, спрабаваў утварыць на ўсходніх землях ВКЛ самастойнае княства з цэнтрам у Кіеве. Мяцеж не падтрымала большасць шляхты, і Глінскі вымушаны быў паводле ўмоў мірнага пагаднення паміж Жыгімонтам Старым і Васілем III разам з родзічамі і прыхільнікамі пакінуць ВКЛ і з'ехаць у Маскву. Усе яго ўладанні ў ВКЛ былі канфіскаваны. У Расіі атрымаў Малаяраславец і Бароўск. У час ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.*** у 1514 г. з войскам Васіля III удзельнічаў ва ўзяцці Смаленска, разлічваючы, што горад будзе перададзены яму. Не атрымаўшы Смаленска, пачаў тайныя перагаворы з Жыгімонтам Старым пра вяртанне ў ВКЛ, але быў кінуты рускімі ў турму, дзе знаходзіўся да 1527 г. (паводле іншых звестак – да 1526 г.). Па просьбе пляменніцы Алены, жонкі Васіля III, атрымаў волю і ў прыдачу Юр'евец, Старадуб і Рапалоў. Стаў ваяводам. Пасля смерці Васіля III у 1533 г. увайшоў у склад Вялікай думы пры Алене – рэгентшы яе малалетняга сына Івана IV. У хуткім часе ўзнік канфлікт паміж Глінскім і фаварытам Алены князем І. Ф. Целяпнёвым-Абаленскім, а таксама баярамі Шуйскімі. Глінскага ў 1534 г. кінулі ў турму, дзе ён і памёр. [7]

**Іван IV** Васілевіч Грозны (Иван IV Васильевич Грозный; 25.08.1530, Масква – 18.03.1584 гг.), вялікі князь маскоўскі і ўсяе Русі [з 1533 г.], першы рускі цар [1547 – 1584 гг.]. З дынастыі Рурыкавічаў. Сын вялікага князя ***Васіля III*** Іванавіча і княгіні Алены Васілеўны Глінскай. У 7 гадоў застаўся круглым сіратой, выхоўваўся ва ўмовах баярскага кіравання, якое вызначалася зацятай барацьбой груповак Бельскіх, Шуйскіх і Глінскіх. Гэта наклала адбітак на фарміраванне ў яго характары падазронасці, скрытнасці і жорсткасці. У 1549 – 1560 гг. правёў рэформы цэнтральнага і мясцовага кіравання, арміі, суда, фінансаў і інш. Галоўнай мэтай унутранай палітыкі бачыў барацьбу з буйнымі феадаламі, умацаванне самаўладдзя і цэнтралізацыю дзяржавы, для дасягнення чаго абапіраўся пераважна на

служылае дваранства. Праводзіў палітыку тэрору і рэпрэсій, якая дасягнула свайго апагею ў часы апрычніны (1565 – 1572 гг.). Пры ім узмацнілася запрыгоньванне сялянства. У знешняй палітыцы прытрымліваўся курсу на пашырэнне межаў дзяржавы: у 1550-я гг. захапіў Казанскае і Астраханскае ханствы; у залежнасць ад Масквы трапілі Сібірскае ханства і Вялікая Нагайская арда. Распачаў Інфлянцкую вайну 1558 – 1582 гг. за Інфлянты, якія папрасілі дапамогі ў ВКЛ, пасля чаго ў 1562 г. на чале 30-тысячнага войска ўварваўся ў межы Беларусі. Няўдалая і безвыніковая вайна разам з апрычнінай моцна аслабілі дзяржаву, прынеслі страшэннае спусташэнне не толькі на акупіраваныя тэрыторыі, але і на землі самой Масковіі, вычарпаўшы амаль усе яе людскія і матэрыяльныя рэсурсы. [8]

**Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 гг.**, вайна Маскоўскай дзяржавы за г. зв. "отчину" – усходнеславянскія землі, што былі ў складзе ВКЛ. Ёй папярэднічалі парубежныя канфлікты, якія пачасціліся з 1486 г., калі ваяводы ***Івана III*** напалі і разрабавалі Любуцк, Мцэнск і Вяземскае княства. 18.05.1492 г. Іван III накіраваў да караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра IV пасла з праграмай тэрытарыяльных дамаганняў, аднак той вярнуўся назад, даведаўшыся пра раптоўную смерць Казіміра (07.06.1492 г.). Склалася спрыяльная сітуацыя для вайны. У жніўні 1492 г. войска на чале з Ф. Целяпнёвым-Абаленскім, накіраванае на Любуцк і Мцэнск, папаліла гарады, а баяр і жыхароў забрала ў палон. Восенню маскоўскія ваяводы занялі Хлепень і Рагачоў. У гэты час у Маскву перабеглі князі з парубежных раёнаў ВКЛ – С. Ф. Варатынскі, М. Р. Мязецкі, А. і В. Бялёўскія, А. Ю. Вяземскі, што дазволіла Івану III без цяжкасцей авалодаць землямі ў вярхоўях Акі. Пры дапамозе князёў-перабежчыкаў былі заняты Мязецк, Сярпейск, Масальск, спалены Апакаў, пазней войска князя Д. В. Шчэні захапіла Вязьму. Рыхтуючыся да пашырэння ваенных дзеянняў, вялікі князь маскоўскі сабраў войска ў Вялікіх Луках, Ноўгарадзе, Пскове і Цверы, заклікаў крымскага хана Менглі-Гірэя нанесці ўдар па ВКЛ з поўдня. У 1493 г. маскоўскае пасольства наведала князя Конрада Мазавецкага і магістра Тэўтонскага ордэна з прапановай утварыць супраць Ягелонаў ваенны альянс. ВКЛ не было гатова да абароны, таму вялікі князь Аляксандр накіраваў у Крым, Заволжскую Арду і да свайго брата польскага караля Яна Альбрэхта паслоў з просьбай аб дапамозе. Каб спыніць агрэсію, віленскі двор прапанаваў выдаць дачку Івана III Алену замуж за вялікага князя Аляксандра. Гэта паслужыла пачаткам перагавораў, у час якіх маскоўскі ўрад імкнуўся заняць як мага больш тэрыторыі ВКЛ. "Вялікае пасольства" вялікага князя Аляк-

сандра, у склад якога ўваходзілі троцкі ваявода П. Я. Мантыгірдавіч, жамойцкі стараста С. Я. Кезгайла, Войтка Яновіч і пісар Ф. Грыгор'еў, прыбыло ў Маскву 17.01.1494 г. У выніку складаных перагавораў было дасягнута пагадненне аб новай мяжы паміж дзяржавамі. Да Маскоўскай дзяржавы адышлі Вяземскае княства і землі ў басейне Верхняй Акі, дзе дакладная мяжа не была вызначана, што пакідала падставы для будучых канфліктаў. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на Ноўгарад Вялікі, Пскоў, Цвер, Разань, прызнала ўсе "ад'езды" вярхоўскіх князёў. Пасольства ВКЛ правяло таксама перагаворы аб сватанні Аляксандра да дачкі Івана III і, атрымаўшы станоўчы адказ, прадстаўляла вялікага князя на заручынах. [9]

**Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 г.**, вайна Маскоўскай дзяржавы за ўсходнеславянскія землі, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ. У канцы 1490-х гг. адносіны паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ настолькі абвастрыліся, што новы канфлікт з-за ўсходніх зямель ВКЛ стаў непазбежны. Рыхтуючыся да нападу, вялікі князь маскоўскі Іван III заключыў ваенны саюз з Крымскім ханствам, устанавіў добрыя адносіны з Турцыяй. Фармальнай зачэпкай для пачатку вайны сталі чуткі аб ганеннях на праваслаўнае насельніцтва ў ВКЛ і пераход парубежных князёў пад уладу Масквы. Ужо ў маі 1499 г. пад'ячы Ф. Шастакоў, які знаходзіўся пры вялікай княгіні ***Алене Іванаўне*** ў Вільні, даслаў тайны ліст вялікаму князю маскоўскаму, у якім паведамляў, што княгіню і іншых праваслаўных быццам бы сілай прымушаюць прымаць каталіцтва (сама Алена ніколі не пісала пра гэта бацьку). Вясною 1500 г. з ВКЛ на службу да Івана III перайшлі князі С. І. Бельскі, В. І. Шамячыч, С. І. Мажайскі і іншыя вярхоўскія і чарнігава-северскія князі разам з "дварамі", баярамі і слугамі. У красавіку 1500 г. у Маскву прыехала пасольства вялікага князя літоўскага Аляксандра на чале са смаленскім намеснікам С. Кішкам, якое імкнулася зняць напружанне паміж дзяржавамі. Аляксандр пайшоў на кампраміс і ўпершыню звяртаўся да Івана III як да "государя всея Руси", патрабуючы вярнуць "здрадцаў" (князёў-перабежчыкаў) і не чыніць больш крыўдаў на межах. Але вялікі князь маскоўскі ўсю віну пераклаў на Аляксандра і, выслаўшы назад паслоў, накіраваў у ВКЛ свае войска (03.05.1500 г. ваявода Я. Захар'ін з палкамі рушыў да Бранска). Толькі пасля гэтага ў Вільню быў адпраўлены ганец І. Целяшоў з граматай, у якой абвяшчалася, што Іван III "за христианство хочет стояти" і пачынае вайну. Войска Захар'іна тым часам авалодала Бранскам, заняло Пуціўль, Мцэнск, Сярпейск, Старадуб, Гомель, Любеч, Ноўгарад-Северскі, Рыльск. На бок Масквы перайшлі князі Масальскія і Трубяцкія. 2-я групоўка войск на чале з Ю. Захар'іным была

накіравана да Смаленска, на Дарагабуж. 3-я групоўка стаяла напагатове ў Вялікіх Луках, а 4-я – у рэзерве ў Цверы. У канцы чэрвеня да Смаленска падышоў конны корпус ВКЛ пад камандаваннем найвышэйшага гетмана К. І. Астрожскага. 14.07.1500 г. чатырохтысячны атрад коннікаў найвышэйшага гетмана атакаваў на р. Вядроша пад Дарагабужам аб'яднаныя сілы маскоўскіх ваявод (40 тыс. чал.) і ў жорсткай шасцігадзіннай бітве быў амаль цалкам знішчаны (***Бітва на Вядрошы 1500 г.***). Іван ІІІ патрабаваў ад крымскага хана Менглі-Гірэя зрабіць абяцаны напад на ВКЛ і ўдарыць у напрамку Слуцк-Тураў-Пінск-Менск. Не падрыхтаваны да вайны вялікі князь Аляксандр шукаў дапамогі праз дыпламатаў. Летам і восенню 1500 г. паслы ВКЛ спрабавалі адгаварыць Менглі-Гірэя ад ваеннага саюзу з Масквой, яны пабывалі таксама ў Малдове, Заволжскай ардзе, Лівонскім ордэне, у братоў Аляксандра – польскага караля Яна Ольбрахта і караля венграў і чэхаў Уладзіслава. 21.02.1501 г. паслы з Вільні і Кракава разам прыбылі ў Маскву і спрабавалі пераканаць Івана ІІІ спыніць ваенныя дзеяннні, але беспаспяхова. У маі 1500 г. Маскоўскае войска зноў рушыла на ВКЛ, а ў чэрвені з Поўдня ударылі крымскія татары. На баку ВКЛ у вайну ўступілі толькі Заволжская арда і Лівонскі ордэн, магістр якога Вальтэр фон Плетэнберг у маі 1501 г. распачаў ваенныя дзеянні. Пасля смерці Яна Ольбрахта вялікі князь Аляксандр быў выбраны польскім каралём і выехаў у Польшчу. Адначасова з прыняццем акта ***Мельніцкай уніі 1501 г.*** аднаўлялася унія паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам. Адсутнасць манарха і спадзяванні на хуткую дапамогу палякаў абумовілі пасіўнасць войск ВКЛ. У 2-й палове 1501 г. Іван ІІІ накіраваў ва Ўсходнюю Беларусь аб'яднаныя сілы, якія 04.11.1501 г. разбілі пад Мсціславам групу войск князёў М. Заслаўскага і А. Дашковіча. Летам 1502 г. маскоўскае войска імкнулася захапіць Смаленск, але вымушана было адступіць. Яно заняло і спаліла Оршу, разрабавала мсціслаўскія воласці, а таксама землі на Віцебшчыне і Полаччыне. Восенню таго ж года "воевати в Литовскую землю" хадзілі ваяводы з Ноўгарада, Ржэва і Северскай зямлі. У лютым 1503 г. Іван ІІІ зноў паслаў на Беларусь "князей і воевод многих со многими людми". Толькі заключэнне уніі з Польшчай і падтрымка ВКЛ Лівонскім ордэнам схілілі Івана ІІІ да перагавораў. Спыніць вайну заклікала бацьку і вялікая княгіня і каралева Алена Іванаўна. 04.03.1503 г. у Маскву прыбыло пасольства Аляксандра. Пасля вострых спрэчак былі падрыхтаваны "перамірныя граматы" (зацверджаны 2 красавіка), якія абвяшчалі шасцігадовае перамір'е (1503 – 1509 гг.) і вызначалі новыя межы паміж дзяржавамі. Да Масквы адышлі вялікія тэрыторыі ВКЛ з гарадамі Белы, Бранск, Веліж, Гомель, Дарагабуж, Дрокаў,

Карачаў, Любеч, Любуцк, Масальск, Мглін, Мцэнск, Мязецк, Невель, Ноўгарад-Северскі, Папова Гара, Почап, Пуціўль, Радагошч, Рыльск, Серанск, Старадуб, Сярпейск, Трубчэўск, Хоцім, Чарнігаў і інш. [10]

**Бітва на Вядрошы 1500 г**. Адбылася 14 ліпеня на р. Вядроша ў ходзе ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** Вясной 1500 г. вялікі маскоўскі князь Іван III накіраваў пасла ў ВКЛ з тым, каб той абвясціў вайну. Следам за паслом рушыла маскоўскае войска. Баявыя дзеянні пачаліся ўздоўж усёй дзяржаўнай мяжы. “Воровским обычаем” маскоўскія ваяводы авалодалі Бранскам, Пуціўлем, Гомелем, іншымі гарадамі. На пачатку вайны вялікі князь літоўскі Аляксандр накіраваў гетмана К. І. Астрожскага да Смаленска “стеречи границы”, а сам з рэшткамі войск пайшоў праз Менск на Барысаў. У Смаленску да Астрожскага далучыўся гарнізон пад камандаю С. П. Кішкі, пасля чаго чатырох-пяцітысячнае войска ВКЛ рушыла пад Дарагабуж, дзе стаяў маскоўскі ваявода Ю. Захар’іч. Ад перабежчыка Астрожскі даведаўся, што да Захар’іча падышла падмога, пасля чаго маскоўскае войска павялічылася да 20 – 40 тыс. воінаў. Паводле Хронікі Быхаўца, Астрожскі цвёрда вырашыў ісці на бітву: “Малоль многоль Москвич будет, только вземши Бога на помочь битися с ними, а не бившися с ними назад не вернутися”. На пачатку бітвы Астрожскі разбіў авангард маскоўскага войска на левым беразе ракі Вядроша, пасля чаго перайшоў раку і атакаваў галоўныя сілы ворага, якімі кіраваў Д. В. Шчаня. Зыход шасцігадзіннай бітвы прадвызначыла флангавая атака засаднага маскоўскага палка. Харугвы Астрожскага пачалі адступаць і былі разбіты. Маскоўскія воіны знішчылі мост цераз р. Трасна і дабівалі войска ВКЛ на яе левым беразе. Уцёкамі ўратаваўся толькі Кішка з чатырма ротмістрамі і з некалькімі сотнямі воінаў. Сам Астрожскі з многімі князямі і воінамі трапіў у палон. У выніку бітвы ВКЛ страціла лепшае войска і апынулася ў цяжкім ваенна-палітычным становішчы. [11]

**Мельніцкая унія 1501 г.**, дзяржаўны саюз паміж Польшчай і ВКЛ. Акт Мельніцкай уніі падпісаны 23.10.1501 г. у г. Мельнік (Падляшскае ваяв.) пры абранні вялікага князя літоўскага ***Аляксандра*** на каралеўскі пасад Польшчы. Акту папярэднічаў дагавор, заключаны дэлегацыямі польскага сойма з аднаго боку і Аляксандра і Рады ВКЛ з другога ў г. Пётркаў у час бескаралеўя. Мельніцкая унія аднаўляла дзяржаўную унію, якая перапынілася ў 1492 г. пры абранні братоў Яна Ольбрахта і Аляксандра на пасады Польшчы і ВКЛ. Польскія магнаты зрабілі чарговую спробу аб’яднаць 2

дзяржавы пад кіраўніцтвам Польшчы, карыстаючыся ваеннымі няўдачамі ВКЛ у час ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 гг.*** Мельніцкая унія прадугледжвала, што ў будучым выбараў вялікага князя літоўскага ў Вільні не будзе, але агульны манарх (кароль) будзе выбірацца пажыццёва на агульным сойме дэлегатаў абедзвюх дзяржаў у Пётркаве. Гэта азначала ліквідацыю спадчыннага атрымання пасада ў дынастыі Ягелонаў у ВКЛ і перадачу лёсу выбараў у рукі польскіх паноў, якіх на агульным сойме была б большасць (крыху пазней палажэнні пра выбары караля зафіксаваў ***Мельніцкі прывілей 1501 г.***). Прадугледжвалася ўстанаўленне агульнай грашовай сістэмы, правядзенне агульнай унутранай і знешняй палітыкі. Захоўваліся асобныя дзяржаўныя пасады і суды, але новыя члены Рады і службовыя асобы мусілі прысягаць каралю. Фактычна Мельніцкая унія вяла да ліквідацыі дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ. Акт Мельніцкай уніі падпісалі Аляксандр і 27 прадстаўнікоў ВКЛ, але з умовай, што сойм ВКЛ зацвердзіць яго. Гэта стала падставай для адмовы ад Мельніцкай уніі, бо значная большасць літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх баяр, як і сам Аляксандр (бо ліквідавалася спадчыннасць трона), была супраць ліквідацыі суверэнітэту ВКЛ. У выніку шырокай апазіцыі сойм ВКЛ у 1505 г. не зацвердзіў акт Мельніцкай уніі, і ён не набыў сілы. Планы польскіх магнатаў і шляхты ўдалося здзейніць у выніку заключэння ***Люблінскай уніі 1569 г.*** [12]

**Клецкая бітва 1506 г.** Адбылася 5 жніўня каля г. Клецк паміж войскам ВКЛ пад камандаваннем князя ***М. Л. Глінскага*** і крымскімі татарамі на чале з царэвічамі Біці і Бурнашом. Мэтай татарскага нападу, арганізаванага ханам Менглі-Гірэем, акрамя захопу палонных, маёмасці і жывёлы, быў націск на ўрад ВКЛ, каб прымусіць яго пазбавіцца ад ганаровага вязня, былога хана Вялікай Арды і смяротнага ворага крымчакоў Шах-Ахмата (забіць яго ці выдаць жывым у Крым). Крымскае войска (каля 4 тыс. Чалавек пры 10 тыс. коней) пад Чарнігавам пераправілася цераз Дзясну, а пад Лоевам – цераз Дняпро. Адсюль татары рушылі на Слуцк, пасля на Клецк, дзе прыкладна 20 – 22 ліпеня сталі кашом (лагерам) і распусцілі атрады для збору палону. Асобныя іх чамбулы дасягалі Менска. Цяжка хворы вялікі князь Аляксандр 27 ліпеня ў Лідзе склікаў паспалітае рушанне і перадаў камандаванне гетману С. П. Кішку і маршалку дворнаму Глінскаму. 29 ліпеня ў Лідзе сабраліся некаторыя павятовыя харугвы, 31 ліпеня яны дайшлі да Навагародка. Тут да 3 жніўня войска ВКЛ вырасла да 7 тыс. чалавек (у асноўным харугвы Гарадзенскага, Навагародскага і Менскага паветаў, а таксама наёмная кавалерыя, польская гвардыя Аляксандра і нешматлікая артылерыя). Атрымаўшы інфармацыю ад языкоў, 3 жніўня войска шпарка ру-

шыла на Клецк. У час маршу было разбіта некалькі дробных татарскіх атрадаў, аднак Кішка занямог, і паны паставілі на чале войска Глінскага. 5 жніўня войска ВКЛ выйшла на левы бераг р. Лань насупраць Клецка і спусцілася крыху ніжэй, да дарогі на Пінск. Наносячы ўдар з паўднёвага захаду, Глінскі разлічваў адрэзаць татарам шляхі да ўцёкаў, прыціснуць іх да водных перашкод і разбіць. Абапал грэблі, па якой ішла дарога Клецк-Пінск, былі збудаваны 2 гаці. Першым на правы бераг Лані пераправіўся невялікі атрад вялікага маршалка Я. Ю. Забярэзінскага, але быў хутка разбіты. Пасля ўдарылі асноўныя сілы. Спачатку рушыла правая калона, адразаючы татарам шлях да адступлення, а калі тыя ўсе сілы кінулі супраць яе, цераз Лань пераправілася левая калона з самім Глінскім і ўдарыла ў фланг татарам. Жорсткая бітва скончылася ўцёкамі татараў, шмат іх патанула ў р. Цапра. Рэшту гналі далей, білі пад Капылём, Слуцкам, Петрыкавам, Оўручам, Жытомірам. Яшчэ некалькі дзён войска ВКЛ перахоплівала асобныя татарскія атрады, якія вялі пад Клецк палон з навакольных мясцін. Пераможцам дасталіся шматлікія коні татараў. Было вызвалена шмат палонных (40 тыс, паводле сведчанняў сучаснікаў, відаць, перабольшаных), узята ў палон 2 – 3 тыс. татараў. Клецкая бітва стала самым значным паражэннем крымскіх татараў у Беларусі і паклала канец іх буйным набегам за Прыпяць. [13]

**Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 гг.**, вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ за ўсходнеславянскія землі. Віленскі сойм у лютым 1507 г. прыняў рашэнне аб вяртанні зямель, страчаных у час папярэдніх (1492 – 1494 гг., 1500 – 1503 гг.) войнаў Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ. У сакавіку – красавіку 1507 г. пасольства Жыгімонта І Старога ў Маскве ва ультыматыўнай форме запатрабавала вярнуць гарады і землі, захопленыя Іванам ІІІ. Маскоўскі ўрад не прыняў патрабаванняў і заявіў аб гатоўнасці пачаць вайну супраць ВКЛ. Ужо ў красавіку 1507 г. вялікі князь Васіль ІІІ накіраваў конныя палкі на Полацк і Смаленск. Абмінуўшы фартэцыі, ваяводы зайшлі глыбока на тэрыторыю Беларусі, толькі тады з Кракава ў ВКЛ выехаў Жыгімонт І, які загадаў гетману найвышэйшаму С. П. Кішку сабраць земскую службу (да 14 тыс. чал.) каля Менска. У чэрвені, калі паспалітае рушанне сабралася, маскоўскія ваяводы пакінулі межы ВКЛ. Кішка накіраваў войска да Друцка, адкуль пасылаў невялікія атрады ваяваць на парубежныя маскоўскія землі. У хуткім часе паспалітае рушанне было распушчана. Крымскія татары, якія абяцалі дапамогу Жыгімонту, не зрабілі намечаныя напады на Пуціўль і Чарнігаў. У кастрычніку – лістападзе 1507 г. Васіль ІІІ зноў накіраваў войскі ваявод В. Холмскага і Я. Захар'іна ў Падняпроўе. Яны асадзілі Крычаў і Мсціслаў,

але гарады мужна абараняліся. Калі на дапамогу асаджаным стала падыходзіць паспалітае рушанне, ваяводы вярнуліся ў свае землі. Другі этап вайны звязаны з бунтам, узнятым у студзені 1508 г. на Беларусі М. Л. Глінскім. Сабраўшы каля 2 тысяч чалавек, Глінскі авалодаў Туравам, Мазыром, спрабаваў захапіць і іншыя гарады, але не меў падтрымкі насельніцтва. Вясной да бунтаўшчыкоў з'явіўся маскоўскі ўпаўнаважаны Губа Маклакаў, які дамовіўся пра сумесныя ваенныя дзеянні і перадачу занятых на Беларусі гарадоў непасрэдна Глінскаму. Васіль III накіраваў войска на чале з В. І. Шамячычам на Слуцк да Глінскага, палкі Д. Шчэні з Вялікіх Лук і Я. Захар'іна з Масквы – на Смаленск, а 3-е войска – на Полацк. У маі 1508 г. аб'яднаныя сілы Глінскага і Шамячыча трымалі ў аблозе Менск і спусташалі яго наваколле, рабілі рэйды ажно да Слоніма. У гэты час каля Ліды збіралася паспалітае рушанне ВКЛ, а з Польшчы падыходзіла пяцітысячнае войска. Аб'яднаўшы сілы (агульная колькасць 15 – 16 тыс. чалавек), Жыгімонт І даручыў камандаванне імі гетману найвышэйшаму К. І. Астрожскаму. У пачатку чэрвеня пры набліжэнні аб'яднанага войска ВКЛ ваявода Шамячыч і Глінскі пакінулі Менск і адступілі на ўсход, а ў сярэдзіне ліпеня, таксама не прыняўшы бою, адступіла буйная групоўка маскоўскага войска, якая трымала ў аблозе Оршу. У жніўні 1508 г. Астрожскі і М. Фірлей з атрадамі конніцы напалі на Северскую зямлю, а Кішка з невялікім атрадам рушыў у напрамку Масквы і захапіў Дарагабуж і Таропец, аднак ваяводы Васіля III ударам у адказ вярнулі гэтыя гарады. Астрожскі з Фірлеем таксама мусілі вярнуцца ў свае землі. Вайна скончылася безвынікова. 19.09.1508 г. падпісана пагадненне аб "вечным міры", якое замацоўвала межы, што склаліся паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ у выніку папярэдніх войнаў. Абодва манархі абавязаліся разам выступаць супраць "всех недругов", у т. л. і крымскіх татараў. Князі Глінскія атрымалі права свабодна выехаць у Маскоўскую дзяржаву. [14]

**Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.**, вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ за ўсходнеславянскія землі. "Вечны мір" 1508 г., якім скончылася ***вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 гг.***, маскоўскі ўрад разглядаў як часовую перадышку. З 1510 г. Васіль III займаўся непасрэднай падрыхтоўкай смаленскай кампаніі. Яго дыпламаты заручыліся падтрымкай Лівонскага ордэна. Вайна пачалася паходам на Смаленск, прымеркаваным на зіму 1512 – 1513 гг. У лістападзе 1512 г. выступіла войска князя І. М. Рапніна-Абаленскага і канюшага І. А.Чаляднiна, якое, спаліўшы пасады Смаленска, павінна было накіравацца да Оршы і Друцка, а на злучэнне з ім з

Вялікіх Лук рухалася войска князя В. С.Адоеўскага. У снежні 1512 г. на Смаленск рушылі галоўныя сілы з Масквы на чале з Васілём III. Пасля шасцітыднёвай аблогі маскоўскае войска, якое пацярпела значныя страты, вярнулася дадому. У чэрвені 1513 г. пачаўся другі паход на Смаленск. Да восені пад горадам была сканцэнтравана 80-тысячная маскоўская армія з вялікай колькасцю гармат і 2 тыс. пішчалей. Каля 24 тыс. ратнікаў ваявалі на Полаччыне, 8 тыс. чалавек – пад Віцебскам, а 14-тысячная групоўка аблажыла Оршу. Жыхары Смаленска зноў адбілі напад маскоўскіх войск, і Васіль III у лістападзе 1513 г. адвёў свае палкі назад. У лютым 1514 г. прынята рашэнне аб трэцім паходзе на Смаленск. Тады ж у выніку перагавораў паміж Маскоўскай дзяржавай і Свяшчэннай Рымскай імперыяй з'явіўся план ваеннай кааліцыі супраць ВКЛ і Кароны Польскай, у якую планавалася ўключыць яшчэ 5 еўрапейскіх краін. Паводле праекта ў выпадку перамогі членаў кааліцыі імператар Максімілян I прызнаваў права Масквы на беларускія і ўкраінскія землі, а Васіль III – права Вены на некаторыя польскія тэрыторыі. У канцы мая 1514 г. пачаўся трэці паход на Смаленск, у якім удзельнічала каля 80 тыс. маскоўскіх ратнікаў. 31 ліпеня пасля няспыннага абстрэлу з 300 гармат Смаленск капітуляваў. Імкнучыся выкарыстаць гэты поспех, ваяводы Васіля III хутка рухаліся ў глыб Беларусі. Яны захапілі Мсціслаў, Крычаў, Дуброўну, перайшлі Дняпро і Друць і толькі каля Бярэзіны сутыкнуліся з перадавымі атрадамі 35-тысячнай арміі Жыгімонта I Старага. 08.09.1514 г. у час генеральнай бітвы пад Оршай гетман найвышэйшы К. І. Астрожскі дашчэнту разбіў 80-тысячнае маскоўскае войска (***Аршанская бітва 1514 г.***). Усходняя Беларусь была вызвалена ад непрыяцеля. Астрожскі аблажыў Смаленск, але авалодаць горадам у яго не хапіла сіл. Перамога пад Оршай была ўдала выкарыстана ў дыпламатычных колах. Максімілян I адмовіўся ад блока з Масквой, у выніку чаго кааліцыя распалася. На Венскім з'ездзе 1515 г. Ягелоны і Габсбургі прыйшлі да поўнага паразумення. Максімілян I заняў прыхільныя да Жыгімонта I Старога пазіцыі і абяцаў дапамагаць яму ў прымірэнні з Васілём III. На працягу 3 гадоў пасля перамогі пад Оршай ваенныя дзеянні вяліся стрымана. Гэта былі асобныя рэйды ў глыб чужой гэрыторыі. Вясной 1515 г. маскоўскае войска з Пскова хадзіла на Рослаў, спаліла Браслаў і Друю, харугвы ВКЛ на чале з А. Дашкевічам і А. Нёміровічам пры падтрымцы крымскіх татар напалі на Северскую зямлю. У тым жа годзе маскоўскія ваяводы хадзілі на Полацк, Віцебск і Мсціслаў, а войска ВКЛ – на Вялікія Лукі. У 1516 г. абодва бакі абмежаваліся дробнымі парубежнымі рэйдамі. У 1517 г. войска Астрожскага з Полацка рушыла на Пскоўшчыну і аблажыла Апочку, асобныя ха-

ругвы хадзілі да Варонеча, Краснага, Веллі і Пскова, аднак у цэлым кампанія скончылася няўдала. Летам 1517 г. у Маскву прыбыло пасольства Жыгімонта І Старога, якое пры пасрэдніцтве імператарскага ўпаўнаважанага С. Герберштэйна спрабавала дамовіцца пра спыненне вайны, але пазіцыі абодвух бакоў былі ўзаемна непрымальныя, і ваенныя дзеянні актывізаваліся. Летам 1518 г. Васіль ІІІ накіраваў на Беларусь свае войскі з Вялікіх Лук на Полацк, з Белага – на Віцебск, са Смаленска і Старадуба – у Падняпроўе. Пад Полацкам маскоўскае войска было разгромлена і адступіла, у іншых месцах яно даходзіла да Слуцка, Менска, Навагародка. У 1519 г. у вайну на баку Маскоўскай дзяржавы ўступіў Тэўтонскі ордэн. У ліпені 1519 г. на Кіеўшчыну і Валынь уварвалася 40-тысячнае крымскае войска і разбіла конніцу Астрожскага пад Сокалам. Выкарыстаўшы цяжкі для ВКЛ момант, Васіль ІІІ зноў ударыў па Беларусі з Вялікіх Лук, Смаленска і Старадуба. Накіроўваючыся да Вільні, яго войскі па дарозе палілі гарады і вёскі, бралі ў палон жыхароў і дайшлі да Крэва, Ашмян, Меднікаў, а праз месяц вярнуліся дадому. Апошняй акцыяй Васіля ІІІ у гэтай вайне стаў рэйд ваяводы В. Гадунова ў лютым 1520 г. на Полацк і Віцебск. Перамогі над тэўтонцамі і пагадненне, падпісанае Жыгімонтам І Старым з Крымскім ханствам, схілілі Васіля ІІІ да перагавораў. Летам 1520 г. пасольства ВКЛ дамовілася ў Маскве пра спыненне ваенных дзеянняў. Для падпісання мірнага пагаднення “вялікае пасольства” на чале з полацкім ваяводам П. Кішкам прыбыло ў Маскву ў 1522 г. Пагадненне мела кампрамісны характар і прадугледжвала перамір’е тэрмінам на 5 гадоў (пасля чаго меркавалася падпісаць “вечны мір”), Смаленск застаўся ў Маскоўскай дзяржаве, шматлікі “маскоўскі палон” – у ВКЛ. [15]

**Аршанская бітва 1514 г.**, адна з буйнейшых бітваў ***вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 гг.*** Адбылася 08.09.1514 г. пад Оршай. Неўзабаве пасля капітуляцыі Смаленска перад маскоўскімі войскамі (жнівень 1514 г.) вялікі князь маскоўскі Васіль ІІІ паслаў 80-тысячнае коннае войска з баяр і “людзей вайсковых” на чале з князем М. І. Булгакавым-Голіцай і І. А. Чалянднінам у напрамку Оршы і Друцка. Вялікі князь ВКЛ і кароль польскі Жыгімонт Стары сабраў войскі абедзвюх сваіх дзяржаў: апалчэнне ВКЛ пад камандаваннем найвышэйшага гетмана ***К. І. Астрожскага*** (16 тыс. коннікаў), 14 тыс. польскіх коннікаў, 3 тыс. наёмнай пяхоты, атрады паноў з Малой Польшчы і шляхціцаў-добраахвотнікаў з Вялікай Польшчы (2500 коннікаў). Жыгімонт застаўся ў Барысаве з 4 – 5 тыс. войска, а асноўныя сілы (больш за 30 тыс. чалавек) на чале з Астрожскім пайшлі пад Оршу. Атрадамі войск камандавалі Ю. Радзі-

віл, Ю. С. Алелькавіч, Я. Свярчоўскі і інш., значную яго колькасць складалі беларускія воіны (летапісы і хронікі называюць войска “літоўскім”). Першы бой адбыўся 27.08.1514 г. на левым беразе Бярэзіны ў час пераправы атрадаў ВКЛ. У гэтым баі разбіта некалькі маскоўскіх палкоў. Потым атрады І. Б. Сапегі нанеслі паражэнне маскоўскім войскам на р. Друць. Рускае войска пераправілася на левы бераг Дняпра і стала паміж Оршай і Дуброўнай на р. Крапіўне. Тут, недалёка ад Аршанскага замка, і адбылася вырашальная бітва. Частка беларуска-літоўскай і польскай конніцы без страт пераправілася цераз Дняпро. Вышэй па цячэнні ад месца пераправы конніцы праз патаемна наведзены наплаўны мост раку перайшлі пяхота, конніца і артылерыя. Пасля кароткай прамовы Астрожскі павёў у атаку конніцу і пяхоту на расцягнутыя парадкі маскоўскага войска. Пачалася жорсткая бітва з палкамі Булгакава-Голіцы. Чаляднін у бой не ўступіў, а калі ўдар абрынуўся і на яго палкі, ад бою ўхіліўся ўжо Булгакаў-Голіца. Хітрым манеўрам пад выглядам адступлення Астрожскі ўцягнуў праціўніка ў пагоню і вывеў яго пад агонь сваіх замаскіраваных гармат. Пасля гэтага ён зноў нанёс удар па палках Булгакава-Голіцы і разграміў іх, а частку воінаў узяў у палон. Таксама былі разгромлены і палкі Чаляднiна. У маскоўскім войску пачалася паніка. Многія з уцекачоў загінулі ў Дняпры і Крапіўне (апошняя была запруджана целамі). Месца бітвы было ўслана забітымі. Дакументальныя звесткі пра страты супярэчлівыя; паводле рускіх летапісаў, хронік і звестак С. Геберштэйна, страты маскоўскага войска склалі каля 40 тыс. чалавек забітымі. У палон трапілі Булгакаў-Голіца, Чаляднін і яшчэ 8 ваявод, 17 іншых военачальнікаў, 2 тыс. “дзяцей баярскіх” і больш за 2 тыс. воінаў. Пераможцам раздалі 20 тыс. трафейных коней і палавіну абозу. Васіль III заявіў, што для яго тыя, хто трапіў у палон, мёртвыя. Дзесяткі гадоў заставаліся палонныя ў Вільні і ў розных гаспадарскіх дварах і валасцях. Чаляднін памёр у Вільні праз некалькі гадоў, Булгакаў-Голіца вярнуўся на радзіму ў 1552 г.

Перамога ў Аршанскай бітве дала магчымасць адваяваць Дуброўну, Мсціслаў і Крычаў. Смаленск узяць не ўдалося, аднак пасля бітвы да 1518 г. не адбывалася ўварванняў маскоўскіх войск у ВКЛ (за выключэннем асобных набегаў). Апісанне бітвы з вершаванымі ўстаўкамі, прысвечанымі ёй, змешчана ў хроніцы М. Стрыйкоўскага. На тэму Аршанскай бітвы ў 1520-х – 1530-х гг. напісана батальная карціна (аўтар невядомы; зберагаецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве) – першая ва Усходняй Еўропе. [16]

**Вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1534 – 1537 гг.**, вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай за ўсходнеславянскія землі. Вестка пра смерць вялікага князя маскоўскага Васіля III

(1533 г.) абудзіла ў ВКЛ надзеі на рэванш і на вяртанне страчаных раней тэрыторый у выніку войнаў Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ канца XV – пач. XVI стст. Для вяртання гэтых зямель склалася спрыяльная сітуацыя: з канца 1533 г. Крым займаў антымаскоўскую пазіцыю, у самой Маскве выспяваў унутраны разлад (праўда, чуткі пра гэта даходзілі да Вільні занадта перабольшаныя). Калі пасольства малалетняга Івана IV выказала надзею на працяг міру, вялікі князь Жыгімонт І Стары адказаў, што мір можна падпісаць на ўмовах вяртання на межы, якія мелі дзяржавы ў час княжання Івана III (1462 – 1505 гг.). Нежаданне Масквы прыняць гэтую прапанову азначала непазбежнасць новай вайны. Рашэнне пачаць яе прыняў Віленскі вальны сойм, які ўхваліў ваенны падатак на 3 гады. Паводле універсала вялікага князя ВКЛ паспалітае рушанне краіны (каля 24 тыс. чалавек) мусіла сабрацца ў пачатку красавіка 1534 г. пад Менскам. Вялікія спадзяванні ўскладаліся на дапамогу крымскіх татараў і на бунты ў самой Маскве. Аднак антымаскоўскую акцыю татараў сарвала ўнутраная барацьба ў Крыме, а маскоўскі ўрад здолеў перамагчы апазіцыю і добра падрыхтавацца да вайны. У пачатку жніўня 1534 г. вялікі гетман ВКЛ Ю. Радзівіл прывёў 20-тысячнае войска пад Магілёў, адтуль корпус на чале з І. Вішнявецкім быў накіраваны на Смаленск, а корпус А. Неміровіча – у Северскую зямлю, але першы не змог авалодаць смаленскай фартэцыяй, а другі захапіў толькі Радагошч, хоць трымаў у аблозе Почап, Старадуб, Чарнігаў. Вярнуўшыся, войска раз’ехалася. Зімой на Беларусь ад Старадуба, Смаленска і Пскова раптоўна ўварваліся маскоўскія ваяводы, якія амаль не сустрэлі адпору, папалілі і зруйнавалі неўмацаваныя гарадкі, дайшлі да Браслава і Навагародка і да вясны вярнуліся ў свае межы. Да наступнай ваеннай кампаніі ВКЛ, акрамя ўласнай земскай службы, наняло за свае грошы 5 тыс. жаўнераў у Польшчы і адтуль жа атрымала дапамогу – 1 тыс. коннікаў і 500 чалавек пяхоты. Кароннае войска злучылася з паспалітым рушаннем ВКЛ у канцы мая 1535 г. пад Рэчыцай. У ліпені ўсе сілы рушылі ў Северскую зямлю, 16 ліпеня яны занялі Гомель, жыхары якога самі адкрылі вароты, пазней – Почап і Радагошч. 29 жніўня пасля месячнай аблогі быў узяты адзін з галоўных гарадоў Северскай зямлі – Старадуб. У чэрвені 1535 г. маскоўскія войскі зноў уварваліся на Беларусь. Адна іх групоўка вяла ваенныя дзеянні на Полаччыне, другая – на Мсціслаўшчыне, дзе спаліла Крычаў, Дуброўну, Оршу. Каб звесці на нішто дапамогу з Польшчы, пасля падбухторвання маскоўскіх паслоў з Поўдня Карону атакаваў валашскі гаспадар. Неўзабаве войска ВКЛ пакінула тэрыторыю Северскай зямлі і вярнулася ў свае межы, захаваўшы за сабой толькі Гомель. Так безвынікова скончыўся чарговы год вайны. На полацкай зямлі маскоўскія ваяводы збудавалі новыя замкі – За-

валочча і Себеж, на сваёй – Веліж. У канцы зімы 1536 г. невялікія сілы ВКЛ няўдала спрабавалі захапіць Себеж. Летам гэтага ж года маскоўскія войскі вялі ваенныя дзеянні ў Падняпроўі, але былі разгромлены пад Крычавам. На гэтым ваенныя дзеянні спыніліся. Масква, занятая барацьбой з татарамі, хацела замірэння. Вільня, ад якой вайна патрабавала вялікіх гаспадарча-фінансавых намаганняў, – таксама. Пасля спрэчак аб месцы перагавораў Жыгімонт I Стары згадзіўся прысланць да шасцігадовага Івана IV сваё "вялікае пасольства", якое з'явілася ў Маскве 12.01.1537 г. Праз 2 дні пачаліся цяжкія і доўгія перагаворы. Абодва бакі спачатку высвятлялі, хто распачаў вайну, выстаўлялі тэрытарыяльныя дамаганні (Масква патрабавала Кіеў і Полацк, Вільня – Ноўгарад і Пскоў). Паслы ВКЛ дамагаліся вяртання ўсёй Северскай зямлі і разбурэння новазбудаваных замкаў – Себежа, Завалочча і Веліжа, а маскоўскі бок настойваў на даваеннай мяжы і прасіў абмяняць усіх палонных. Вільня згаджалася аддаць усіх палонных за адзін г. Чарнігаў, аднак Масква не прыняла прапановы. Толькі ў лютым 1537 г. на кампрамісных умовах было дасягнута пагадненне: Гомель з усёй зямлёй заставаўся ў складзе ВКЛ. Себеж і Завалочча перадаваліся Маскоўскай дзяржаве, астатнюю мяжу пакідалі нязменнай. Падпісаны трактат прадугледжваў пяцігадовае перамір'е (да 25.03.1542 г.), свабоду гандлю. [17]

**Пагоня,** ваенная павіннасць у ВКЛ. Згадваецца ў ***прывілеі 1387 г.*** караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы: "У тым выпадку, калі прыйдзецца перасследаваць ворагаў, непрыяцеляў нашых, якія б збягалі з нашай літоўскай зямлі, то дзеля гэтага роду перасследавання, якое па-народнаму завецца пагоняй, абавязаны адпраўляцца не толькі рыцары, але і кожны мужчына, якога б ён ні быў паходжання або стану, толькі б ён быў здольны насіць зброю". У лацінскім тэксце акта слова "пагоня" прыведзена ў форме "pogonia", што сведчыць пра існаванне гэтай павіннасці на славянскіх землях ВКЛ. [18]

**Паспалітае рушанне**, шляхецкае апалчэнне ў ВКЛ. Ахоплівала ўсіх землеўладальнікаў. Велічыня зямельнага надзелу вызначала памер вайсковай павіннасці (земскай службы). Ад кожных 8, а з 1566 г. – 10 службаў (у службе 2 дымы) землеўладальнік абавязаны быў выставіць 1 узброенага і добра экіпіраванага конніка. Коннікі складалі почат (узброены атрад) землеўладальніка. Землеўласнік, які меў менш як 8 – 10 службаў, ішоў служыць сам. Ад службы вызваляліся толькі хворыя, непаўналетнія або занятыя на дзяржаўных пасадах. У XVI – XVII стст. асноўную частку паспалітага рушання складала шляхта. У войска ўваходзілі таксама прывілеяваныя сяляне (напр., ***асочнікі***, ***панцырныя баяры***, ***путныя баяры***, мяшчане, якія

валодалі зямлёй (***конныя мяшчане***), казакі, татары, пяцігорцы і інш. Ухвалу (пастанову) аб скліканні паспалітага рушання мог прыняць толькі вальны сойм. Тэрмін земскай службы вызначаўся на сойміках. Кіраваў паспалітым рушаннем найвышэйшы, з XVII ст. вялікі ***гетман*** ВКЛ, аднак нярэдка камандаванне прымаў кароль і вялікі князь літоўскі, які мог дзяліць войска на часткі і нават пасылаць яго за межы княства. Паспалітае рушанне з тэрыторыі ўсёй дзяржавы склікалася ў 1528, 1563, 1566, 1567, 1620, 1651, 1654 і іншыя гады. Зыходзячы з колькасці і складу насельніцтва, ВКЛ магло збіраць у 1-й пал. XVI ст. каля 40 тыс. чалавек апалчэнцаў. Аднак мабілізацыі звычайна былі няпоўныя. У 1528 г. да попісу з'явілася 19 844 чалавек земскай службы, у т. л. 11 214 шляхты, 7754 чал. панскіх початаў, 724 татараў, 149 мяшчан. У 1567 г. было сабрана 28 026 апалчэнцаў (24 392 коннікі і 3664 пехацінцы). У ходзе Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг., у час полацкай кампаніі 1579 г. у 30-тысячным войску ВКЛ шляхецкае апалчэнне і панскія початы складалі адпаведна 11 і 10 тыс. чал. У 1580 г. у час выправы на Вялікія Лукі ў 25-тысячным войску ВКЛ наёмнікі складалі каля 20 %, астатнія – апалчэнцы. Такім чынам, паспалітае рушанне было асновай узброеных сіл дзяржавы. [19]

**Попісы войска,** попісы шляхты, вайсковыя мерапрыемствы ў ВКЛ па рэгістрацыі і падліку ўзброеных ненайманых сіл дзяржавы. Першы попіс, матэрыялы якога захаваліся, праведзены згодна з ухвалай Віленскага сойма 1528 г. (...) Статут ВКЛ 1529 г. у раздзеле "О обороне земской" апісаў абавязкі шляхты па ўдзеле ў попісах, зазначыў, што дробная шляхта, якая не мае вялікіх уладанняў або падданых наогул, павінна асабіста адпраўляцца ў войска. Вызначыў, каб шляхціцы ставалі на попісы толькі пад сваёй павятой харугвай; асобы, якія служаць панам-радам ці ўраднікам, павінны замяніцца з чалавекам "войны не повинным"; якія служаць князям ці панам і маюць гаспадарскія маёнткі, павінны пакінуць свайго пана і ставаць пад павятовай харугвай. Матэрыялы попісу 1534 г., звязанага з ***вайной Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1534 – 1537 гг.***, не захаваліся. Віленскі сойм 1563 г. пастанавіў, каб шляхта выстаўляла ў войска конніка з 10 службаў. У 1565 г. у час ***Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг.*** адбыўся попіс "у полі" з мэтай улічыць шляхту, што сабралася на вайну. Статут ВКЛ 1566 г. вызначыў, што шляхта збіраецца ў войска па павятовых харугвах, пад кіраўніцтвам ***маршалкаў***, у цэнтральных паветах ваяводстваў – ***кашталянаў.*** Уласна харугва (сцяг) выдавалася з гаспадарскага скарбу. [20]

**Кап'ё,** дробная арганізацыйная адзінка ў сярэдневяковых рыцарскіх арміях. Складалася з аднаго цяжкаўзброенага рыцара, забяспечанага дрэўкавай зброяй і спецыялізаванага выключна ў рукапашным баі, і некалькіх лягчэйшых стральцоў, да якіх мог дадавацца збраяносец рыцара, што вёў яго запаснога каня. Колькасны склад кап'я залежаў ад фінансавых магчымасцяў феадалаў. Сустракаліся коп'і толькі з аднаго капійніка ці нават з адных стральцоў. У ВКЛ коп'і фіксуюцца з канца XIV ст., з канца XV ст. фігуруюць у крыніцах як початы. [21]

**Конь,** баявая адзінка ў войску ВКЛ у XIII – XV стст. Складалася з конніка, яго збраяносца і пахолкаў (слуг), якія дапамагалі конніку рыхтавацца да бою, а часта і ў баі. Уся група адпавядала баявой адзінцы ў Заходняй Еўропе – рыцарскаму кап'ю. Конь вёў бой самастойна і ў складзе атрада. З XVI ст. коні замяняюцца коннымі атрадамі (початамі) з аднолькавым узбраеннем. [22]

**Почат,** вайсковае фарміраванне, на чале якога выступаў на земскую службу (ці на агляд) буйны землеўладальнік. Складаўся з асабіста залежных або нанятых феадалам для службы людзей. [23]

**Харугва** (ад манг. оронго – знак, сцяг), у сярэдневяковай Польшчы і ВКЛ – асноўная арганізацыйна-тактычная адзінка рыцарскай (шляхецкай) кавалерыі. Да XV ст. складалася з ***коней (копій)*** – рыцараў са сваімі збраяносцамі і пахолкамі. Існавалі харугвы земскія, у склад якіх уваходзіла рыцарства пэўнай зямлі, родавыя, якія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў аднаго роду, і надворныя, што выконвалі ролю гвардыі манархаў і магнатаў. З XVI ст. у шляхецкай кавалерыі харугвай пачалі называць былую ***роту***. Звычайна складалася з 30 – 200 чалавек на чале з афіцэрам у рангу ад харужага да палкоўніка. У харугву ўваходзілі капійнікі і стральцы, пазней з'явіліся харугвы гусарскія, панцырныя, пяцігорскія, лёгкія (татарскія, валошскія). Да сярэдзіны XVIII ст. харугвы фарміраваліся таварыскай сістэмай (таварыш – шляхціц, які выстаўляў почат – некалькіх пахолкаў, потым 1 – 2 початавых; у лёгкай кавалерыі шляхціцы служылі галоўным чынам без суправаджэння). У XVI – XVII стст. харугвамі часам называлі пяхотныя роты польскага і венгерскага тыпу. [24]

**Рота,** асноўная арганізацыйная і тактычная адзінка наёмнай пяхоты ў Польшчы і ВКЛ у XVI – XVII стст. Налічвала 80 – 300 чал. У кавалерыі роце адпавядала ***харугва***, часам так называлі роту у пяхоце польскага або венгерскага строю. У замежных арміях адзінкі тыпу роты называлі "кампаніі", гэты тэрмін замацаваўся і ў войску Рэчы Паспалітай XVII – XVIII стст. [25]

**Кавалерыя** (франц. cavalerie ад лац. caballus – конь), конніца, род сухапутных войск, у якім для перамяшчэння і дзеянняў у баі выкарыстоўваўся верхавы конь. У часы ўтварэння ВКЛ (XIII – XIV стст.) кавалерыя паступова ператварылася ў асноўны род войска. Яе ўзбраенне і арганізацыя на працягу XIV ст. зазналі моцны заходні ўплыў. У канцы стагоддзя ў кавалерыі вылучыліся капійнікі, асноўнай зброяй якіх было кап’ё, і конныя стральцы з арбалета (стральцы-арбалетчыкі). У канцы XIV – пач. XV стст. у сувязі са з’яўленнем у ВКЛ служылых татараў вялікае пашырэнне атрымалі коннікі, узброеныя “па-татарску” – лукам. Акрамя наступальнай зброі, вершнікі мелі засцерагальнае ўзбраенне: кольчатыя панцыры, даспехі і шлемы, а капійнікі таксама шчыты. У канцы XV – пач. XVI стст. ва ўзбраенні кавалерыі адбыліся змены, што прывялі да ўтварэння значнай колькасці яе відаў. Са з’яўленнем суцэльнакаванага даспеха капійнікі падзяляліся на “даспешных” і “шчытовых”. Апошнія, атрымаўшы на пач. XVI ст. назву ***гусараў***, пакрысе выцеснілі “даспешных” і занялі месца цяжкай кавалерыі. Асноўнай наступальнай зброяй гусараў было масіўнае доўгае кап’ё – “дрэва”. Коп’і ўжывалі таксама коннікі, узброеныя “па-кашубску” (назва паходзіць ад вершнікаў-кашубаў, Польшча), аднак гэта былі больш кароткія рагаціны ці вошчапы, што разам з адсутнасцю шчыта і неабавязковасцю засцерагальнага ўзбраення рабіла падобных кавалерыстаў лёгкімі і мабільнымі. У гэты час арбалет як галоўная зброя стральцоў выцясняецца ручніцамі і аркебузамі. З сярэдзіны XVI ст. кавалерысты, забяспечаныя ручной агнястрэльнай зброяй, называліся ўзброенымі “па-нямецку”, “па-бруншвіску” або “па-рэйтарску”. Аснову стралковай кавалерыі ў XVI ст. складалі вершнікі, экіпіраваныя “па-татарску”, або, як часцей гаварылі, “па-казацку”. Уніфікацыя ва ўзбраенні вытрымлівалася не заўсёды, што надавала кавалерыі яшчэ большую тыпалагічную стракатасць. Асабліва гэта было характэрна для ***паспалітага рушання***, якое складалася з кавалерыйскіх харугваў, што выстаўляліся ад кожнага павета; мабілізацыйныя магчымасці паветаў абумоўлівалі колькасны склад харугвы. Узбраенне апалчэнца залежала ад яго заможнасці. Найлепш экіпіраванымі былі початы (атрады) буйных землеўладальнікаў.

З XV ст. у ВКЛ усё часцей выкарыстоўвалі наёмнікаў, напачатку іншаземнага паходжання, а з XVI ст. – і ўраджэнцаў дзяржавы. Наёмныя вершнікі арганізоўваліся ў роты, на чале якіх стаялі ротмістры. Роты складаліся з початаў, якія ўзначальвалі таварышы. (...) [26]

**Капійнік,** воін, асноўным відам наступальнага ўзбраення ў якога была дрэўкавая зброя. Адзін з асноўных відаў кавалерыі ВКЛ. Размяшчаліся

наперадзе шыхта і служылі для праломвання шыхтоў непрыяцеля. Таму, як правіла, забяспечваліся найбольш надзейным засцерагальным узбраеннем, з 2-й пал XIV ст. – пласцінавым даспехам (“зброяй бляхавай”). Тыповым аксесуарам цяжкіх капійнікаў да пачатку XVI ст. стаў поўны, ці капійнічы, даспех. Практыкавалася таксама накрыццё даспехам баявых коней. Каб вытрымаць цяжкога рыцара ў поўным узбраенні і павялічыць ударны эфект патрабаваліся спецыяльныя капійнічыя коні – рослыя, масіўныя, дужыя. Для забеспячэння ўстойлівай пасадкі на кані служылі адмысловыя сёдлы з высокімі лукамі, у якіх вершнік сядзеў з выпрастанымі нагамі. Капійнікі выкарыстоўвалі доўгія (да 4 м) і тоўстыя коп’і (“дрэвы”), а таксама клінковую зброю, сякеры і інш. Капійнік з’яўляуся асновай дробнай арганізацыйна-тактычнай адзінкі – ***кап’я,*** куды ўваходзіла таксама некалькі лягчэйшых стральцоў. Апроч цяжкіх, выкарыстоўваліся і аблегчаныя варыянты капійнікаў, у т. л. ***гусары,*** якія на працягу XVI ст. сталі асноўным відам капійнічай кавалерыі. З канца XV ст. у складзе пяхотных наёмных рот у ВКЛ з’явіліся пешыя капійнікі. Яны выкарыстоўвалі капійнічыя даспехі і дрэўкавую зброю розных тыпаў – пікі, ошчапы, рагаціны, алебарды і інш. [27]

**Гусары** (венг. husz – дваццаць + ar – падатак), від конніцы ў еўрапейскіх дзяржавах у XV – пач. XX стст. Упершыню гусары з’явіліся ў Венгрыі пры каралю Мацею Корвіне, які ў 1458 г. спецыяльным указам стварыў асобнае дваранскае апалчэнне для змагання з туркамі. Кожныя 20 дваран абавязаны былі выставіць у войска аднаго добра ўзброенага конніка. У Польшчы фіксуюць стварэнне вайсковых часцей паводле “звычаю гусарскага”. Праз нейкі час гусары з’явіліся і ў ВКЛ. Першапачаткова гэта была лёгкая конніца, але ўжо з сярэдзіны XVI ст. – цяжкаўзброеная кавалерыя, якая прызначалася для франтальнага ўдару з мэтай разбурыць непрыяцельскі строй. Набіраліся гусары з заможнай шляхты. Мелі адборных коней і лепшую зброю – прылбіцы, панцыр, тарчы і дзіды, часам шышакі і агнястрэльную зброю. У XVII ст. у гусараў быў больш багаты рыштунак: металічны каптан (ці кіраса), шышак, нарукаўі, дзіда, шабля, канчар (рапіра), 1 – 2 пісталеты, чакан ці баявы малаток. Існавалі асобныя харугвы “крылатых гусар”. Крылы мацаваліся за спінаю да металічных даспехаў конніка або да тыльнай часткі сядла і прызначаліся перш за ўсё для псіхалагічнага ўздзеяння на непрыяцеля. Часта шышак гусара і нагалоўе каня аздабляліся чорнымі пёрамі. У ВКЛ харугвы гусараў існавалі да канца XVIII ст. Гэта конніца мела высокія баявыя якасці, скарыстоўвалася пераважна ў войнах з Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй. Першай вялікай бітвай на Беларусі, у якой удзельнічалі гусарскія харугвы, была ***Аршанская бітва 1514 г.*** [28]

**Казакі,** від лёгкай кавалерыі ў войску ВКЛ, (...) які прыйшоў на змену *гусарам* пасля трансфармацыі апошніх у цяжкаўзброеную конніцу. Узнікненне казацкай кавалерыі адносіцца да XVI ст., а найбольшага росквіту яна дасягнула ў час войнаў 1-й пал. XVII ст. У XVI ст. казацкі рыштунак складаўся з панцыра, шышака, шаблі, сагайдака і рагаціны або сякеры. У XVII ст. засцерагальны рыштунак казацкай кавалерыі значна скараціўся або адсутнічаў зусім, замест сагайдака распаўсюджанне атрымалі пісталеты, па-ранейшаму на ўзбраенні засталіся шабля і рагаціна. Асноўнай базай для камплектавання казацкай конніцы была дробная шляхта, якая не мела дастаткова сродкаў, каб узброіцца па-гусарску. Паводле рашэння соймікаў з 1654 г. кожны павет ВКЛ павінен быў выстаўляць па 4 харугвы, адна з якіх мусіла быць узброена па-казацку. Казацкая кавалерыя існавала да XVIII ст., саступіўшы месца створаным у 1770-я гг. палкам пярэдняй варты, частка якіх на Беларусі атрымала назву пяцігорскіх. [29]

**Драбы,** назва пехацінцаў у ВКЛ, пераважна ў XVI ст. Першапачаткова драбы вербаваліся толькі на прынцыпах найму, найчасцей за мяжой – у Польшчы, Чэхіі, Германіі і г. д. З 2-й пал. XV ст. вядомы 2 катэгорыі драбаў – павезнікі, узброеныя вялікімі пяхотнымі шчытамі, і стральцы, забяспечаныя арбалетамі ці ручной агнястрэльнай зброяй. У канцы XV ст. да іх далучыліся капійнікі ў пласціністых даспехах, узброеныя коп’ямі ці алебардамі. У 1560-х гг. драбы з’явіліся ў складзе паспалітага рушання. На Віленскім сойме 1563 г. і Гарадзенскім сойме 1567 г. прыняты пастановы, паводле якіх у початах землеўладальнікаў на 2 “ездных” (коннікаў) мусіў прыпадаць адзін драб “з ручницею и з мечом, албо с кордом, або теж з рогатиною а з сокерою”. Аднак на практыцы поўнай уніфікацыі ўзбраення драбаў паспалітага рушання дасягнуць не ўдалося. У часы панавання Стафана Баторыя была праведзена вайсковая рэформа. Замест ранейшых катэгорый драбаў уведзена пяхота, арганізаваная на венгерскі і нямецкі ўзор. Першая ўзбройвалася шаблямі, сякеркамі і кнотавымі ручніцамі (афіцэры мелі замест іх кароткія коп’і), другая – доўгімі пікамі ці кнотавымі мушкетамі. У гэты час выкарыстоўвалася і замежная пяхота – уласна нямецкая, забяспечаная пікамі, мушкетамі і двуручнымі мячамі; венгерская, дзе ўжываліся ручніцы і пікі, і інш. [30]

## 8.3. ХРАНАЛОГІЯ

**1492 г.** – абранне вялікім князем Аляксандра Казіміравіча.

**1492 – 1494 гг.** – вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

**1495 г.** – шлюб Аляксандра Казіміравіча і Алены Іванаўны, маскоўскай князёўны.

**1500 – 1503 гг.** – вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

**1500 г.** – паражэнне войск ВКЛ у бітве з маскоўскімі войскамі на р. Вядрошы.

**1501 г.** – падпісанне акту Мельніцкай уніі аб дзяржаўным саюзе Польшчы і ВКЛ (не быў зацверджаны Соймам ВКЛ).

**1506 г.** – перамога войска ВКЛ пад камандаваннем Міхаіла Глінскага над татарамі ў бітве пад Клецкам.

**1506 г.** – смерць вялікага князя Аляксандра. Абранне вялікім князем Жыгімонта І Старога.

**1507 – 1508 гг.** – вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім. Мяцеж у ВКЛ Міхаіла Глінскага.

**1512 – 1522 гг.** – вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

**1514 г., 31 ліпеня** – захоп маскоўскімі войскамі Смаленска.

**1514 г., 8 верасня** – перамога войск ВКЛ пад камандаваннем К. І. Астрожскага над маскоўскімі войскамі ў Аршанскай бітве.

**1534 – 1537 гг.** – вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай.

## 8.4. КРЫНІЦЫ

1. “Выписка из посольских книг” о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1497 – 1572 гг. / подг. к печати Б. Н. Морозов; под ред. С. О. Шмидта. М.; Варшава : Археогр. центр, 1997. (Серия “Памятники истории Восточной Европы. Источники XV – XVII вв.” Т. 2 = Monumenta historica res gestas Europae Orientalis illustrantia. Fontes XV – XVII saec. Vol. 2)

2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. У 4 т. Т. 1: IX – XVIII стст. / скл.: В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск : выд. АН БССР, 1936. – 638 с.

3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Мінск : Амалфея, 2000. – 672 с.

4. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кніга публічных спраў 1 / падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 442 с.

5. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

6. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р исторических наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

7. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

## 8.6. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Александров, Д. Н. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII – XVI веках / Д. Н. Александров, Д. М. Володихин; Академия естественных наук Российской Федерации, Секция "Российская энциклопедия". – М. : Аванта, 1994. – 133 с.

2. Асіноўскі, С. Справа вялікай смеласці і розуму вышэйшага / С. Асіноўскі // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 4. – С. 2 – 8.

3. Блінец, А. Бітва пад Клецкам / А. Блінец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 4. – С. 28 – 31.

4. Борзаковский, В. С. История Тверского княжества / В. С. Борзаковский. – СПб. : И. Г. Мартынов, 1876. – 271 с.

5. Бохан, Ю. М. Арганізацыя найманых аддзелаў у Вялікім княстве Літоўскім у XV – XVI стст. // Спадчына. – 2002. – № 4.

6. Бохан, Ю. М. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385 – 1576 / Ю. М. Бохан. – Мінск :Беларусь, 2003. – 87 с.

7. Бохан, Ю. М. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV – XVI стст. / Ю. М. Бохан. – Мінск : Ін-т гісторыі НАНБ, 2004. – 91 с.

8. Бохан, Ю. Пласцінкавыя даспехі у ВКЛ у другой палове XIV – XVI стст. / Ю. Бохан // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1996. – № 4. – С. 44 – 49.

9. Бохан, Ю. М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI стст. / Ю. М. Бохан. – Мінск : УП "Экаперспектыва", 2002. – 335 с.

10. Бычкова, М. Е. Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя / М. Е. Бычкова; Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории. – М. : Изд. центр ИРИ, 1996. – 173 с.

11. Волков, В. Войны и войска Московского государства / В. Волков. – М. : Эксмо : Алгоритм, 2004. – 571 с.

12. Граля, И. Литва и Русь в 1534 – 1536 гг. Новые документы / И. Граля, Ю. М. Эскин // Вестник МГУ. Серия VIII. История. – 1999. – № 4. – С. 65 – 76.

13. Граля, И. Свои люди – сочтемся: Православная элита Великого княжества Литовского и Москва в XVI веке / И. Граля // Родина. – 2001. – №№ 1, 2. – С. 68 – 71.

14. Грыцкевіч, А. Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 г. / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1992. – № 6. – С. 2 – 11.

15. Грыцкевіч, А. Гісторыя геапалітыкі Беларусі. Гл. I: Геапалітыка Беларуска-Літоўскай дзяржавы у XIII – XVI стст. / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 85 – 92.

16. Дзярновіч, А. І. “...in nostra Livonia”: Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносінаў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Лівоніяй у канцы XV – першай палове XVI стст.: Сістэматызацыя і актавы аналіз. Т. 1 / А. І. Дзярновіч; навук. рэд. Г. Я. Галенчанка; Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т гісторыі. – Мінск : Athenaeum, 2003. – 373 с.

17. Дзярновіч, А. І. Метрыка ВКЛ аб адносінах Вялікага княства Літоўскага і Святой Рымскай імперыі / А. І. Дзярновіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4 (12). – С. 90 – 99.

18. Зимин, А. А. Служилые князья в русском государстве конца XV – первой трети XVI вв. / А. А. Зимин // Дворянство и крепостной строй в России. Тематический сборник статей, посвященный памяти Алексея Андреевича Новосельского. – М. : Наука, 1975. – С. 138 – 154.

19. Зимин, А. А. Суздальские и ростовские князья во второй половине XV – первой трети XVI вв. / А. А. Зимин // Вспомогательные исторические дисциплины. – Вып. 7. – 1976. – С. 51 – 76.

20. Зимин, А. А. Феодальная знать Тверского и Рязанского великих княжеств и московское боярство конца XV – первой трети XVI вв. / А. А. Зимин // История СССР. – 1973. – № 3. – С. 45 – 69.

21. Карпов, Г. Ф. История борьбы Московского государства с Польско-Литовским. 1462 – 1508. Ч. 1, 2 / Г. Ф. Карпов. – М. : Унив. тип. (Катков и К°), 1867.

22. Кондрашенков, А. А. Борьба за смоленские земли в первой четверти XVI века / А. А. Кондрашенков // Край Смоленский. – 1999. – №№ 1 – 3. – С. 3 – 24.

23. Линниченко, И. А. Известия о взаимоотношениях России и Польши / И. А. Линниченко // Записки университета св. Владимира в Киеве. – К., 1882. – Кн. 9. – С. 219 – 229.

24. Літвін, В. Клецкая бітва / В. Літвін // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 2. – С. 17 – 18.

25. Милованов, В. Беларусь в начале нового времени (первая четверть XVI в.) / В. Милованов // Преподавание истории в школе. – 2001. – № 1. – С. 78 – 85.

26. Рудзкі, Э. Алена Маскоўская – жонка вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка / Э. Рудзкі // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 55 – 64.

27. Сагановіч, Г. М. Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі / Г. М. Сагановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 68 с.

28. Семянчук, А. Роля рымскай легенды ў фармаванні дзяржаўнай ідэалогіі Вялікага княства Літоўскага / А. Семянчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – № 18. – Białystok, 2002. – С. 178 – 184.

29. Сідарэнка, Б. "Старадубская вайна": Вайна ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай (1534 – 1537 гг.) / Б. Сідарэнка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 1. – С. 37 – 46.

30. Сідарэнка, Б. Усходняя палітыка ВКЛ у першай трэці XVI стагоддзя / Б. Сідарэнка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 40 – 45.

31. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін. У 2 ч. Ч. 1: Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2003. – 280 с.

32. Шеков, А. В. Верховские княжества (Краткий очерк политической истории, XIII – середина XVI вв.) / А. В. Шеков. – Тула, 1993.

33. Юрганов, А. Л. Политическая борьба в годы правления Елены Глинской (1533 – 1538): автореферат дис. ... кандидата исторических наук: 07.00.02 / Моск. гос. ист.-архив. ин-т. – М., 1987. – 19 с.

34. Шэйфер, В. А. Узаемаадносіны Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы ў канцы XV – першай трэці XVI стст. у ацэнцы пачынальнікаў найноўшай беларускай гістарыяграфіі // Веснік ГрДУ. Сер. 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія і сацыялогія. – 2003. – № 2 (20). – С. 3 – 6.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ.

1. Грыцкевіч, Анатоль. Аляксандр / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 224 – 225.

2. Князева, Вольга. Алена Іванаўна / В. Князева // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 219.

3. Пазднякоў, Валерый. Астрожскі Канстанцін Іванавіч / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 260 – 261.

4. Бохан, Юрась. Іван III / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 662.

5. Васіль III Іванавіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 392.

6. Грыцкевіч, Анатоль. Жыгімонт I / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 627 – 628.

7. Насевіч, Вячаслаў. Глінскія / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 535 – 536.

8. Бохан, Юрась. Іван IV / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 662 – 663.

9. Сагановіч, Генадзь. Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1492 – 1494 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 370.

10. Сагановіч, Генадзь. Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500 – 1503 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 370 – 371.

11. Сагановіч, Генадзь. Бітва на Вядрошы / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 334.

12. Грыцкевіч, Анатоль. Мельніцкая унія 1501 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 285.

13. Пазднякоў, Валерый. Клецкая бітва 1506 / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 107.

14. Сагановіч, Генадзь. Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507 – 1508 // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 371.

15. Сагановіч, Генадзь. Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512 – 1522 / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 371 – 372.

16. Грыцкевіч, Анатоль. Аршанская бітва / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 249 – 251.

17. Белы, Алесь. Вайна Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай 1534 – 1537 / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 367.

18. Пагоня // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 381 – 382.

19. Сагановіч, Генадзь. Паспалітае рушэнне / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 405 – 406.

20. Вяроўкін-Шэлюта, Уладзіслаў. Попісы войска / У. Вяроўкін-Шэлюта // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 460 – 461.

21. Бохан, Юрась. Кап'ё / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 40.

22. Грыцкевіч, Анатоль. Конь / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 132.

23. Почат // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 461.
24. Харугва // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 713.
25. Рота // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 513.
26. Бохан, Юрась. Кавалерыя / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 682.
27. Бохан, Юрась. Капійнік / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 40 – 41.
28. Сагановіч, Генадзь. Гусары / Г. Сагановіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 562.
29. Чаропка, Станіслаў. Казакі / С. Чаропка // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 9 – 11.
30. Бохан, Юрась. Драбы / Ю. Бохан // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 596 – 597.

# ТЭМА 9. ЭВАЛЮЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Змест праграмы.** Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне правоў паноў-рады. Увядзенне павятовага сойміка і рэформа вялікага вальнага сойма. Мясцовае кіраванне: ваяводскі, павятовы, гарадскі і валасны ўзроўні. Адметныя рысы мясцовага кіравання ў Полацкай і Віцебскай землях. Суды і заканадаўства. Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага.

## 9.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЛЫ

З сярэдзіны XV ст. распачынаецца працэс заканадаўчага афармлення паўнамоцтваў Рады ВКЛ. Паводле Казіміравага прывілея 1447 г. пацвярджалася права вышэйшых колаў баярства выбіраць новага манарха пасля яго смерці. Судзебнік 1468 г. быў выдадзены ім таксама сумесна з панамірадаю. З прычыны пастаяннай адсутнасці Казіміра ў ВКЛ паны-рада фактычна ажыццяўлялі кіраўніцтва дзяржаваю. Тады ж больш выразна акрэсліўся і склад Рады. У др. пал. XV ст. у яе ўваходзілі вышэйшыя духоўныя і свецкія вяльможы, велікакняжацкія намеснікі, удзельныя князі.

Пасля свайго абрання на велікакняжацкі пасад Аляксандр Казіміравіч выдае агульназемскі **прывілей (06.08.1492 г.)** у Вільні. Гэты прывілей меў характар феадальнай канстытуцыі, замацоўваў асновы дзяржаўнага і грамадскага ладу,ануючае становішча баярскага саслоўя. Менавіта дадзены заканадаўчы акт упершыню юрыдычна аформіў паўнамоцтвы Рады ВКЛ.

Абраны пасля смерці Аляксандра вялікі князь **Жыгімонт I Стары** таксама выдаў у **1506 г. агульназемскі прывілей** у Гродне. Ён змяшчаў пацвярджэнне ўсіх ранейшых правоў і вольнасцей, грамат, выдадзеных феадалам, мяшчанам, іншым асобам, землям і валасцям. Прывілей замацоўваў норму, паводле якой усе дзяржаўныя пастановы вялікі князь мог выдаваць толькі пасля абмеркавання з Радай.

Напачатку XVI ст. у лік асноўных паўнамоцтваў Рады ўваходзілі дыпламатычныя стасункі дзяржавы, абарона, фінансавыя пытанні, кантроль раздачы земляў і пасад, судовыя функцыі, а таксама выбар вялікага князя.

З канца XV ст. у ВКЛ павялічваецца роля і другога дзяржаўнага органа – ***Сойма ВКЛ.*** Першапачаткова (на працягу XV ст.) збіранне сойма не мела заканадаўчай рэгламентацыі. Сістэматычнае скліканне агульнадзяржаўных соймаў пачалося з узнікненнем праблем, што патрабавалі выра-

шэння з удзелам прадстаўнікоў рыцарства (галоўным чынам ваенных, адносін з іншымі дзяржавамі, увядзення новых падаткаў) з усіх зямель. У 1512 г было ўведзена патрабаванне прысутнасці на сойме 2 дэпутатаў ад павета. Паступова гэтая практыка ўсё больш замацоўвалася, хаця да сярэдзіны XVI ст. удзел у сходах маглі прымаць і іншыя шляхціцы. Часцей за ўсё шляхту павета прадстаўлялі мясцовыя ўраднікі, перш за ўсё харунжыя.

Далейшае пашырэнне правоў шляхты і пераўтварэнне яе з класа ваеннаабавязаных землеўладальнікаў у прывілеяванае саслоўе, а таксама адміністрацыйная рэформа 1565 – 1566 гг. выклікалі рэформу сойма. Паводле ***Статута 1566 г.*** ён станавіўся двухпалатным. У склад сойма ў гэты час уваходзілі ўсе паны радныя, асобныя князі і паны па персанальных запрашэннях, прадстаўнікі павятовай шляхты (па 2 ад павета). Аднак дамінуючая роля належала буйным землеўласнікам, мяшчанства і сялянства свайго прадстаўніцтва на сойме не мелі. Толькі у 1568 г. мяшчане Вільні атрымалі права пасылаць у соймы бурмістраў, калі там вырашаліся пытанні, што тычыліся сталіцы. 2 палаты складалі паны-рада і рыцарскае (шляхецкае) колы. Кожная палата абмяркоўвала справы асобна, а затым сумесна прыходзілі да згоды.

У канцы XV – перш. пал. XVI стст. адбываецца фарміраванне такога мясцовага саслоўна-прадстаўнічага органа ВКЛ, як ***павятовы соймік.*** У сярэдзіне 1560-х гг. парадак склікання павятовых соймікаў быў рэгламентаваны заканадаўча.

Эвалюцыя мясцовага кіравання ў канцы XV – перш. палове XVI стст. выражалася ў больш выразнай дыферэнцыяцыі і заканадаўчым афармленні функцый службовых асоб. Так, ***ваявода*** ў XVI ст. становіцца кіраўніком і прадстаўніком мясцовага рыцарства. На пасаду ваяводы прызначаліся ўраджэнцы ВКЛ, якія належалі да шляхецкага стану і вызначыліся неабходнымі якасцямі. Адной з галоўных задач было захаванне правапарадку ў ваяводстве. У час паспалітага рушання ваяводы збіралі пад харугвы ваяводства апалчэнне з паветаў і вялі яго да месца збору ўсяго апалчэння, камандавалі сваёй харугвай.

Ваяводы валодалі вышэйшай судова-адміністрацыйнай уладай, загадвалі гаспадаркай на замкавых землях, ажыццяўлялі агульнае кіраўніцтва дзейнасці іншыхураднікаў. У некаторых выпадках ваявода мог дзейнічаць ад імя вялікага князя (зямельныя падараванні, рэгуляцыя шляхецкіх зямельных здзелак. Таксама ён меў права ўсталёўваць цэны на рамесныя вырабы, наглядаць за мерамі і вагамі. Арганізоўваў дзейнасць ваяводскага суда, які да рэформы сойма 1560-х гг. разглядаў самыя розныя справы (скаргі падданых вялікага князя на суды дзяржаўцаў і цівуноў, зямельныя і іншыя

маёмасныя спрэчкі, справы аб выкананні дзяржаўна-земскіх павіннасцей, зборы падаткаў, крымінальныя справы і інш. Суд ваяводы мог быць судом 1-й ці 2-й інстанцыі і разглядаў часам як суд 1-й інстанцыі нават справы гаспадарскіх сялян. У адпаведнасці з соймавай ухвалай 1544 г. ваяводскі суд стаў абавязковым судом 2-й інстанцыі ў адносінах да судоў старастаў і дзяржаўцаў, у 1551 г. – судом 2-й інстанцыі ў адносінах да суда падваяводы. Пасля рэформаў сярэдзіны 1560-х гг. Ваяводы ўзначалілі ***гродскія суды*** з дакладна вызначанай кампетэнцыяй у цэнтральных паветах сваіх ваяводстваў.

На час сваёй адсутнасці ў ваяводстве ваявода прызначаў намесніка (***падваяводу***), якому перадаваў усю сваю ўладу, у т. л. судовую. У адпаведнасці са Статутамі 1566 г. і 1588 г. абавязкам ваяводы было прызначэнне гродскага суддзі і гродскага пісара, зацвярджэнне на пасадах павятовых возных.

Змены мясцовага кіравання на павятовым узроўні былі звязаны з адміністрацыйнай рэформай 1560-х гг. З гэтага часу ўсе землеўладальнікі на тэрыторыі павета падлягалі юрысдыкцыі павятовых органаў улады: грамадскія справы разглядаліся земскім судом, крымінальныя – гродскім, справы аб памежных спрэчках – падкаморскім; ваенна-мабілізацыйнымі справамі ведаў харужы, у час вайны шляхецкае апалчэнне павета знаходзілся пад кіраўніцтвам маршалка павятовага. Акрамя таго, шляхта кожнага павета збіралася на павятовыя соймікі, дзе выбіраліся дэпутаты на вальны сойм. Структура павятовага кіравання была заканадаўча замацавана ў Статутах 1566 і 1588 гг.

Валасное кіраванне ў пазначаны перыяд таксама зведвала пэўныя змены. Найперш, яшчэ з канца XIV ст. ішоў працэс актыўнага разбурэння валасцей, яны цалкам або часткова перадаваліся ў вотчыну шляхце. На сярэдзіну XVI ст. шляхецкае землеўладанне амаль не закранула воласці толькі на ўсходзе Беларусі. Урад імкнуўся звузіць правы валаснога самакіравання: прадстаўнікі адміністрацыі атрымалі дазвол непасрэдна збіраць падаткі на тэрыторыі воласці, сяляне страцілі права на выбар старцаў.

Пасля правядзення валочнай памеры на змену старцам і дзесяцкім прыйшлі войты, якіх ужо зацвярждалі ўласнікі воласці. У падпарадкаванні войтаў знаходзілася некалькі вёсак, што ўтваралі войтаўства. Войт наглядаў за парадкам, выкананнем павіннасцей, сачыў за непарушнасцю межаў уладання, распараджаўся засяленнем пустых земляў, адказваў за пажарную бяспеку, стан дарог і мастоў, назіраў за выкананнем рэлігійных абрадаў і інш.

Развіццё гарадскога самакіравання было абумоўлена далейшым распаўсюджваннем магдэбургскага права ў ВКЛ. Некаторыя гарады на працягу XVI ст. атрымалі права выбіраць войта, што пацвярджалася прывілеямі вялікага князя (Камянец, Кобрын, Пружаны). У гэты ж час павялічылася роля гараджан пры выбары Рады і бурмістра. Сход гараджан прапаноўваў некалькі кандыдатур, з якіх войт зацвярджаў 1 – 2 чалавек.

Некаторыя вобласці ВКЛ вылучаліся пэўнымі адметнасцямі мясцовага кіравання, што было звязана з іх адметным статусам у дзяржаве. Так, Полацкая і Віцебская землі (з пачатку XVI ст. – ваяводствы) карысталіся своеасаблівымі прававымі сістэмамі (***Полацкае права***, ***Віцебскае права***).

Істотныя змены зведала ў XVI ст. і судовая сістэма ВКЛ. Менавіта ў гэты перыяд найбольш выразна акрэсліліся паўнамоцтвы і функцыі 2 судовых сістэм – саслоўнай і агульнай.

Па-ранейшаму вышэйшым агульным судом у ВКЛ заставаўся велікакняжацкі суд. Аднак на працягу XVI ст. былі ўведзены абмежаванні падсуднасці гэтаму суду. Так, паводле Статута 1529 г. прадпісвалася разглядаць справы спачатку ў мясцовых судах. Другі і трэці статуты канчаткова ўвялі інстанцыйны парадак разгляду спраў. Гаспадарскаму суду па 1-й інстанцыі былі падсудны справы па дзяржаўных злачынствах, паісках для шляхты па выпатрабаванні дзяржаўных маёнткаў і зямель, аб шляхецкай прыналежнасці, паісках, што кранал інтарэсы дзяржаўнага скараба, па скаргах на незаконныя дзеянні службовых асоб. Да ўтварэння Трыбунала ВКЛ яму таксама былі падсудны ўсе справы па апеляцыях на пастановы вышэйшых судоў.

Функцыі старажытнага замкавага суда ў сярэдзіне XVI ст. пераходзяць да агульнага ***гродскага суда*** (які некаторы час працягвае называцца замкавым) і саслоўнага ***земскага суда.*** У 1581 г. быў створаны найвышэйшы саслоўны суд – ***Трыбунал ВКЛ.***

Для вырашэння пазямельных спрэчак феадалаў у 1565 г. у кожным павеце быў створаны ***падкаморскі суд***, зацверджаны статутам 1566 г.

У гарадах працягвалі дзейнічаць ***войтаўскія***, ***войтаўска-лаўніцкія***, ***бурмістарска-радзецкія*** суды. Працягваў сваё існаванне і сялянскі ***копны суд***, які ў XVI ст. быў замацаваны заканадаўча як адзін з інстытутаў судовай сістэмы. У артыкуле 9 раздзела 14 Статута 1588 г. пазначаецца: “А на Русі і там, дзе здаўна копы бывалі, там павінны праходзіць копныя суды і цяпер тым жа звычаем, як і раней бывалі. А ў тых месцах, дзе дасюль копы не бывалі, павінны копы такім жа чынам і парадкам збірацца і суды адбывацца, як гэта на Русі было і ёсць”.[17]

Эвалюцыя заканадаўчай сістэмы ВКЛ узыходзіць да часоў звычаёвага права і першых старажытнарускіх помнікаў пісьмовага права – Рускай праўды, Смаленскай гандлёвай праўды, грамат Гедзіміна і інш. У ВКЛ першымі помнікамі заканадаўства з’яўляюцца агульназемскія прывілеі 1387, 1413, 1432, 1447, 1492, 1506 гг., Полацкія і Віцебскія валасныя прывілеі XIV – XVI стст., прывілеі гарадам і асобным групам насельніцтва. Адначасова з сярэдзіны XV ст. пачынаецца працэс кадыфікацыі права, першай спробай чаго з’яўляецца Судзебнік 1468 г. Якасна новы этап развіцця заканадаўства ўвасобіўся ў падрыхтоўцы і ўвядзенні ў дзеянне ***Статутаў ВКЛ 1529***, ***1566*** і ***1588 гг.***

---

[17] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – С. 200.

## 9.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Прывілей 1492 г.,** Аляксандраў прывілей, агульнадзяржаўны заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены вялікім князем Аляксандрам у Вільні 06.08.1492 г. пасля абрання яго на велікакняжацкі пасад. (...) Складаецца з 33 артыкулаў. У першых 12 артыкулах пацвярджаліся з частковымі зменамі ўсе прывілеі баярству, выдадзеныя папярэднімі вялікімі князямі. У арт. 13 (як і ў ***прывілеі 1447 г.***) замацаваны асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі дзяржавы: захаванне незалежнасці, добрасуседскія адносіны з іншымі дзяржавамі, захаванне папярэдніх саюзаў і пагадненняў. Важнай уступкай буйным феадалам было юрыдычнае афармленне вялікіх паўнамоцтваў ***Рады Вялікага княства Літоўскага***, куды ўваходзілі вышэйшыя саноўнікі дзяржавы і радавітая знаць, сваякі князя. Прывілей устанавіў, што вялікі князь не мае права адмяняць або змяняць законы, пастановы і судовыя рашэнні, прынятыя разам з Радай. Яе пастановы, прынятыя большасцю галасоў, павінны былі выконвацца вялікім князем. Рада дзейнічала пад кіраўніцтвам вялікага князя, але ў выпадку яго адсутнасці самастойна вырашала пытанні агульнадзяржаўнага значэння. Прывілей вызначыў асновы адміністрацыйнага, цывільнага і крымінальнага права. Службовым асобам было забаронена вымагаць у падначаленых падачкі звыш устаноўленых плацяжоў. У арт. 16 – 20 акрэслены прынцыпы прызначэння і пазбаўлення дзяржаўных пасад, ніхто не мог быць пазбаўлены пасады без віны, даказанай у працэсе публічнага разгляду. Прывілей пацвердзіў абавязковы характар мясцовых прававых звычаяў. Дзяржаўныя пасады і зямельныя ўладанні мелі права атрымліваць толькі ўраджэнцы ВКЛ – польскай шляхце гэта забаранялася. У прывілеі абвяшчалася неабходнасць вынясення справядлівых судовых рашэнняў, забараняліся хабары і судзейская неаб'ектыўнасць, устанаўліваліся пэўныя тэрміны разгляду спраў. [1]

**Прывілей 1506 г.**, агульнадзяржаўны заканадаўчы акт ВКЛ, выдадзены вялікім князем Жыгімонтам I Старым у Гародні 07.12.1506 г. пасля абрання яго на велікакняжацкі пасад. Складаецца з 7 артыкулаў. Прывілей пацвердзіў "усе правы, вольнасці і граматы", выдадзеныя цэрквам, духоўным і свецкім феадалам, "гарадам, мяшчанам, жыхарам і наогул асобам усіх саслоўяў і стану". Такім чынам былі замацаваны юрыдычныя нормы, запісаныя ў прывілеях асобным землям (княствам), валасцям і гарадам ВКЛ. Прывілей 1506 г. пацвярджаў асноўныя палажэнні ***прывілея 1492 г.*** Новым быў запіс аб праве падданых падаваць чалабітныя і скаргі на дзеянні адміністрацыі. Падкрэслівалася, што абранне вялікага князя адбылося

са згоды ўсіх падданых і жыхароў дзяржавы, хоць яно праводзілася на з’ездзе (сойме) баяр. Такім чынам, выбаршчыкі фармальна прадстаўлялі ўсё грамадства і лічылі сябе выразнікамі волі ўсяго народа, таму прывілей адрасаваны ўсяму насельніцтву ВКЛ. (...). Выданнем прывілея 1506 г. завяршыўся этап развіцця беларускага дзяржаўнага права ў выглядзе прывілеяў. Наступныя агульнадзяржаўныя прывілеі 1529, 1547 і 1551 гг. толькі паўаралі і пацвярджалі палажэнні папярэдніх прывілеяў. На новым этапе развіцця беларускага права адбывалася кадыфікацыя юрыдычных норм у выглядзе Статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. [2]

**Гродскі суд,** павятовы суд для шляхты, мяшчан і сялян у ВКЛ у XVI – XVIII стст. Разглядаў справы пра найбольш цяжкія крымінальныя злачынствы асоб, якія былі затрыманы на месцы злачынства (“па гарачым учынку”) ці не паспелі схавацца ў сваім доме; цывільныя справы аб выпатрабаванні чэлядзі нявольнай і залежных сялян. Суд сведчыў здзелкі, копіі дакументаў, забяспечваў доказы, вёў актавыя кнігі, выконваў прыгаворы і рашэнні іншых судоў. Знаходзіўся першапачаткова ў замку (гродзе), адкуль і пайшла назва. Дзейнічаў у 2 складах – вышэйшым (як 1-я і 2-я інстанцыі) і ніжэйшым (толькі 1-я інстанцыя). Галоўным суддзёй звычайна быў ваявода, стараста або дзяржаўца. Калі галоўны суддзя адсутнічаў, яго замяняў падстараста. У пасяджэннях суда ўдзельнічаў гараднічы. У вышэйшы гродскі суд уваходзілі галоўны суддзя і прадстаўнікі феадалаў. Ніжэйшы складаўся з намесніка галоўнага суддзі, шляхціцаў і пісара. Рэгламент работы суда ўключаны ў артыкулы 4-га раздзела Статута ВКЛ 1588 г. Суддзі абавязкова павінны былі ведаць беларускую мову, інакш не выбіраліся шляхтай на пасаду. [3]

**Земскі суд,** павятовы шляхецкі суд у ВКЛ у XVI – XVIII стст. разглядаў крымінальныя і грамадзянскія справы, выконваў натарыяльныя акты, запісваў скаргі на незаконныя дзеянні службовых асоб павета. Выбіраўся павятовай шляхтай з мясцовых шляхціцаў (хрысціян), якія ведалі права, мелі маёнткі. Сесіі земскага суда збіраліся 3 разы на год. Судаводства вялося на падставе Бельскага прывілея 1564 г. і Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг. да сярэдзіны XVII ст. на беларускай, потым на польскай мове. На Беларусі і ў Літве дзейнічаў да 1831 г. [4]

**Падкаморскі суд,** судова-арбітражны орган у ВКЛ у XVI – XVIII стст. па разглядзе памежных зямельных спрэчак феадалаў. Утвораны ў 1565 г. у кожным павеце, зацверджаны Статутам ВКЛ 1566 г. Суд ажыццяўляла адна асоба – *падкаморы,* які наймаў сабе памочнікаў – аднаго або двух *каморнікаў,* грабароў, пісара. Судовая справа накіроўвалася ў падкаморскі суд

*земскім судом* або *гродскім судом* адпаведнага павета. Падкаморы дасылаў позвы бакам з пазначэннем тэрміну, калі яны павінны былі з'явіцца на спрэчнай тэрыторыі. Справа разглядалася на месцы. Падкаморы асабіста вывучаў дакументы, аглядаў межавыя знакі, прыводзіў да прысягі і дапытваў сведак, пазначаў новыя межы ўладанняў умоўнымі знакамі. Сваё рашэнне (гранічны ліст) пад уласным подпісам і пячаткай перадаваў у земскі або гродскі суд. Апеляцыі на рашэнні падкаморскага суда падаваліся ў Трыбунал ВКЛ. Актавыя кнігі падкаморскага суда захоўваліся ў падкаморага і замацоўваліся яго пячаткай, пасля яго смерці перадаваліся ў земскі суд. Іскі бакоў аб праве землеўладання не былі кампетэнцыяй падкаморскага суда і разглядаліся земскім судом, а спрэчкі аб межах паміж землеўладаннямі шляхты і вялікага князя – камісарскім судом. (...) [5]

**Трыбунал Вялікага княства Літоўскага,** Галоўны Літоўскі Трыбунал, Галоўны суд, вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ. Створаны паводле закона 01.03.1581 г. "Трыбунал абываціелям Вялікага княства Літоўскага", пачаў дзейнічаць з 1582 г. Складаўся з суддзяў, якія штогод выбіраліся шляхтай на дэпутацкіх ***сойміках*** (па 2 суддзі-дэпутаты ад павета або ваяводства, калі яно не падзялялася на паветы). Выбранымі маглі быць толькі ўраджэнцы ВКЛ, шляхціцы, якія мелі ўласныя маёнткі, дасведчаныя ў праве і мясцовых звычаях. Суддзі выбіралі маршалка (старшыню) Трыбунала. Абавязкі пісараў выконвалі пісары земскага суда таго горада, дзе адбываўся Трыбунал. Сесіі Трыбунала – кадэнцыі – напачатку праводзіліся ў Вільні і Троках (для тэрыторыі Віленскага, Троцкага ваяводстваў, Жамойці), Навагародку і Менску (для астатняй тэрыторыі ВКЛ), з 1588 г. – штогод у Вільні і папераменна праз год у Навагародку і Менску, з 1755 г. – штогод у Вільні і Гродне. Кадэнцыя магла працягвацца, як правіла, не больш за 12 тыдняў, пасля чаго суддзі пераязджалі ў чарговы горад. Справы ў Трыбунале разглядаліся калегіяй з 2 – 7 суддзяў. Калі справа была больш важнай, Трыбунал засядаў у поўным складзе, за выключэннем суддзяў з тых паветаў, з якіх былі ісцец і адказчык. Для разгляду спраў аб царкоўнай маёмасці ўтваралася калегія з 3 трыбунальскіх суддзяў і 3 духоўных асоб, якіх вызначаў епіскап, а калі яны не прыходзілі да згоды, то справу вырашаў каралеўскі суд. Трыбуналу былі падсудны апеляцыйныя скаргі на выракі і дэкрэты (пастановы) ***земскіх судоў***, ***замкавых судоў (гродскіх)***, ***падкаморскіх судоў***, а таксама панскіх судоў у адносінах да шляхціцаў, якія служылі ў паноў, прыгавораных да пакарання смерцю, цяжкага турэмнага зняволення або вялікага грашовага пакарання. Па 1-й інстанцыі Трыбуналу былі падсудны "вси справы прошлые, которых мы господар и продки наши не отсудили есмо, и вси справы пришлые, которые кольвек на суд наш господарский припадати бы

мели” (г. зн. былога ***гаспадарскага суда***), за выключэннем спраў “столу и скарбу нашому господарскому належачые и добр наших, которые судови нашому господарскому зоставуем подле Статуту”. Асобную катэгорыю спраў у Трыбунале складалі скаргі на незаконныя дзеянні і злоўжыванні мясцовых службовых асоб і суддзяў. Трыбунал меў права судзіць асоб, якія зневажалі трыбунальскіх суддзяў. Справы ў Трыбунале разглядаліся адкрыта з удзелам бакоў, іх адвакатаў (пракуратараў), кожнаму ўдзельніку працэсу дазвалялася мець пры сабе не больш як 2 сваіх прыяцеляў. Забаранялася прыходзіць у суд са зброяй, акрамя шаблі, мяча і шпагі. Судовыя пастановы (дэкрэты) прымаліся большасцю галасоў суддзяў, якія разглядалі справу ў дарадчым пакоі. Рашэнні Трыбунала выконваліся павятовымі судамі. Акрамя разгляду спраў, Трыбунал выконваў натарыяльныя абавязкі: завяраў завяшчанні, сведчыў дагаворы куплі-продажу маёнткаў, пазыкі і інш. [6]

**Віцебскае права**, сістэма юрыдычных норм, якая замацавала аўтаномныя правы віцебскай зямлі ў складзе ВКЛ, а таксама рэгламентавала прававое становішча насельнікаў гэтай зямлі. Зафіксавана прывілеем 1503 г. вялікага князя літоўскага Аляксандра, выдадзеным у сувязі з тым, што ранейшыя віцебскія прывілеі вялікіх князёў ВКЛ былі ўкрадзены. Нормы віцебскага права выпрацаваны яшчэ ў часы Віцебскага княства. Князі, якія ўступалі на віцебскі прастол, абавязаны былі выказаць згоду правіць паводле віцебскага права, што фіксавалася дагаворам. Пасля далучэння Віцебскага княства да ВКЛ нормы віцебскага права без значных змен гарантаваліся вялікімі князямі ВКЛ. Многія нормы прывілея 1503 г. замацавалі статут Віцебскай зямлі як адасобленай аўтаномнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Напрыклад, ваяводу можна было прызначыць толькі са згоды віцяблян, судзіць і караць апошніх належала ў Віцебску. Значнае месца ў прывілеі адведзена нормам, якія забяспечвалі маёмасныя і іншыя правы віцяблян. Віцебскае права мела істотнае значэнне ў прававой рэгламентацыі жыцця мясцовага насельніцтва. Прывілей 1503 г. разам з іншымі абласнымі прывілеямі стаў крыніцай Статутаў ВКЛ. [7]

**Полацкае права**, сістэма звычаёвага і пісанага права, якая дзейнічала на тэрыторыі Полацкага княства (пазней Полацкай зямлі, Полацкага ваяводства). Асноўныя нормы полацкага права змешчаны ў Полацкім земскім прывілеі, які з’яўляўся гарантыяй захавання мясцовых традыцый і рэгіянальнай аўтаноміі. Рэгуляваў адносіны паміж вялікім князем літоўскім (яго намеснікам) і палачанамі, вызначаў прававое становішча насельніцтва. Упершыню нададзены Полацкай зямлі Вітаўтам паміж 1392 і 1399 гг. неўзабаве пасля ліквідацыі Полацкага ўдзельнага княства. Пазней пацверджа-

ны Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам (1430-я гг.), Казімірам Ягелончыкам (2 разы: да і пасля 1447 г.), Аляксандрам Ягелончыкам (1492 – 1498 гг.), Жыгімонтам Старым (1511 г., самы ранні прывілей Полацкай зямлі, тэкст якога захаваўся), Жыгімонтам Аўгустам (1547 г.), Стафанам Баторыем (1580 г.), Жыгімонтам III Вазам (1593 г.), Уладзіславам IV (1634 г.), Янам Казімірам (1649 г.).

Пасля ўключэння ў склад ВКЛ Полацкае княства захавала шырокую аўтаномію. Пытанні ўнутранага жыцця, знешнепалітычных і гандлёвых кантактаў Полацка па-ранейшаму знаходзіліся ў кампетэнцыі мясцовага веча. (...) Адносіны паміж палачанамі і полацкімі князямі, як і ў далітоўскую эпоху, рэгуляваліся пры дапамозе дамовы – "ряда". Князь даваў палачанам гарантыі недатыкальнасці полацкіх цэркваў і іх маёмасці, вотчынных і набытых маёнткаў палачан, браў на сябе абавязкі прытрымлівацца шэрагу правіл пры ажыццяўленні судовай улады (не мяняць ранейшыя судовыя рашэнні, не караць чалавека па даносу без правядзення следства, не верыць паказанням, атрыманым у выніку катаванняў, і паказанням халопаў, не пазбаўляць волі на час следства асобу, за якую паручыліся палачане) і інш. У святле захаваных крыніц нават прыблізна ўзнавіць поўны тэкст дамовы палачан са сваімі князямі немагчыма.

У 1392 г. Вітаўт ліквідаваў Полацкае княства і пачаў кіраваць Полацкай зямлёй праз намеснікаў. Знешнепалітычная дзейнасць Полацка была значна абмежавана, але ва ўнутраным жыцці былога княства практычна нічога не змянілася: усе істотныя пытанні па-ранейшаму вырашаліся на вечы, якое паступова ператваралася ў мясцовы Сойм. У 1392 – 1399 гг. Вітаўт замацаваў палітычна-прававыя традыцыі і аўтаномны статус Полацкай зямлі прывілем, які быў кампрамісам паміж вялікім князем літоўскім і пазбаўленым дзяржаўнасці ў выглядзе ўдзельнага княства полацкім грамадствам. Пры падрыхтоўцы тэксту прывілея ў якасці крыніц былі, відаць, выкарыстаны полацкае звычаёвае права, нарматыўныя дагаворы – дамовы ("ряды") палачан са сваімі князямі, нарматыўныя прававыя акты – княжацкія ўставы і іншы судовы прэцэдэнт. Прывілей Вітаўта гарантаваў палачанам недатыкальнасць полацкіх цэркваў і царкоўных земляў, вотчынных і набытых згодна з правам маёнткаў, вымарачнай маёмасці (яе лёсам распараджаліся самі палачане), звальненне ад мытных збораў на тэрыторыі ВКЛ, права на свабодны выбар месца жыхарства. Вялікі князь абавязваўся не перадаваць асабіста вольных палачан пад юрысдыкцыю іншых прыватных асоб і не забіраць іх коней "вь подводы", не караць палачан па даносу без правядзення следства, не мяняць свае ўласныя ранейшыя судовыя выракі і рашэнні судоў сваіх папярэднікаў прымаць ад палачан "чоломь-

битье". Палачанін не мог быць выкліканы на суд вялікага князя па-за межы Полацкай зямлі. Некаторыя справы (напрыклад, пакаранне чалавека, які прывёз у Рыгу на продаж няякасны воск) былі пакінуты ў кампетэнцыі самых палачан. Значна абмежавана была ўлада гаспадарскага намесніка, пазней ваяводы). Адразу пасля прызначэння на пасаду і прыезду ў Полацк намеснік павінен быў прысягнуць палачанам у тым, што будзе ажыццяўляць свае ўладныя паўнамоцтвы згодна з правам. Ён мог судзіць палачан толькі ў Полацку ў прысутнасці паўнапраўных прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. Палачане мелі права патрабаваць ад вялікага князя замены непажаданага ім намесніка на іншага. Палажэнні прывілея абараняялі насельніцтва Полаччыны ад незаконных паборaў з боку намесніка і вызначалі фіксаваныя памеры судовых пошлін. Крымінальным правам і працэсам прадугледжвалася, што пакараць можна толькі асобу, віна якой даказана ў судзе. Доказам не маглі лічыцца паказанні, атрыманыя шляхам катаванняў, і паказанні несвабодных. Чалавека, за якога паручыліся годныя даверу асобы, нельга было на час следства пазбавіць волі. Скрадзеная маёмасць вярталася пацярпеламу. У выпадку немажлівасці выплаты кошту пацярпеламу перадаваўся сам злодзей. Палачане павінны былі выконваць вайсковую службу ў войску ВКЛ, аднак вялікі князь не мог выкарыстоўваць іх для гарнізоннай службы ў замках па-за межамі Полацкай зямлі.

У канцы XIV ст., калі Полацкая зямля атрымала ад Вітаўта свой першы прывілей, на землях беларускага Падзвіння яшчэ не існавала падзелу грамадства на саслоўі з іх асобнымі саслоўнымі правамі. Полацкім правам карысталіся ўсе сацыяльныя групы паўнапраўнага насельніцтва, якое ў пісьмовых крыніцах выступае пад агульнай назвай "полочане". Не карысталіся полацкім правам несвабодныя жыхары Полацкай зямлі і немцы з Рыгі, якія часова ці стала жылі ў Полацку (апошнія карысталіся нямецкім правам і знаходзіліся пад юрысдыкцыяй уладаў Рыгі). У XV ст. у сувязі са зменамі ў структуры полацкага грамадства многія пастановы старажытнай часткі прывілея набылі новае гучанне: сацыяльна бязлікія "полочане" паступова замяняліся на полацкіх баяр, мяшчан, путных слуг і інш. У тэксце прывілея з'явіўся шэраг новых норм, якія рэгулявалі адносіны паміж саслоўямі. Да надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.) і вылучэння мяшчанскай абшчыны са складу "зямлі" полацкае права захоўвала свой агульназемскі характар. Нават у 1511 г. атрымальнікамі Полацкага земскага прывілея былі названы "бояре полоцкие и мешчане, и вес город, вся земля Полоцкая".

У 1430-я гг. Полацкі земскі прывілей пацвердзілі і ўнеслі ў яго склад шэраг новых палажэнняў Свідрыгайла і Жыгімонт Кейстутавіч. Казімір Ягелончык двойчы пацвярджаў Полацкі земскі прывілей: да і пасля 1447 г.

(на думку М. Любаўскага і Я. Якубоўскага – у 1451 г.). Падчас пацверджання дакумента ў 1451 г. у яго склад быў унесены амаль даслоўны пераказ шэрагу пастаноў агульназемскага ***прывілея 1447 г.***, якія распаўсюджвалі на полацкіх баяр і мяшчан прынцыпы публічнага разгляду судовых справаў і выключна асабістай адказнасці за злачынствы, надавалі ім правы вольна распараджацца сваімі маёнткамі і судзіць сваіх падданых, абаранялі маёмасныя правы ўдоваў. Вялікі князь адмяняў рэгулярны збор сярэбшчыны з падданых полацкіх землеўладальнікаў і адмаўляўся ад выкарыстання іх працы на гаспадарскіх дварах. (...) У 1492 – 1498 гг. Полацкі земскі прывілей быў пацвержаны Аляксандрам Ягелончыкам. Пры гэтым у склад дакумента былі ўнесены 2 новыя нормы, якія дазвалялі духоўным і свецкім феадалам мець падданых на сваіх уласных землях у Полацку, вызначалі адносіны падданых баяр і духавенства да сваіх гаспадароў і мяшчанскай абшчыны. Падчас пацверджання прывілея Жыгімонтам Старым у 1511 г. у яго склад унесены палажэнні пра перадачу важніцы і прыбыткаў з яе полацкім баярам і мяшчанам, парадак эксплуатацыі бабровых гонаў, забарону мяшчанам браць дрэва ў баярскіх лясах без згоды гаспадароў, вызваленне пражываючых у Полацку падданых баяр і духавенства ад устаноўленых магістратам падаткаў. Вярхоўныя ўлады абавязваліся не дасылаць у Полацк складзеныя з наёмнікаў залогі без згоды палачан. Пры пацверджанні Полацкага земскага прывілея Стафанам Баторыем у 1580 г. у яго змест унесена палажэнне аб тым, што полацкія гродскі і земскі суды ў сваёй дзейнасці павінны кіравацца нормамі Статутаў ВКЛ.

У XVI ст. у сувязі з увядзеннем у дзеянне Статутаў ВКЛ сфера ўжытку полацкага права значна скарацілася. Пасля ўвядзення Статута ВКЛ 1566 г. Полацкі земскі прывілей канчаткова страціў свой агульназемскі характар і трансфармаваўся ў прывілей полацкай шляхты. [8]

**Бельскі прывілей 1564 г.** Абвешчаны вялікім князем ВКЛ Жыгімонтам Аўгустам 01.07.1564 г. на сойме ў г. Бельск Падляшскага ваяводства. Адзін з юрыдычных актаў, што ўдасканальвалі прававыя нормы ***Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 г.*** Апублікаваны ў час падрыхтоўкі ***Статута Вялікага княства Літоўскага 1566 г.*** пасля настойлівых просьбаў шляхты, якая намагалася пашырыць свае саслоўныя і палітычныя правы. Меў на мэце ўтварэнне выбарных шляхецкіх саслоўных судоў, аддзяленне на месцах судовых органаў ад велікакняжацкай адміністрацыі. Абвяшчаў роўнасць шляхты перад судом і законам. Вялікі князь гарантаваў неўмяшанне адміністрацыі (ваявод і старастаў) у судовыя справы шляхты і абяцаў у хуткім часе выдаць на сойме новы статут, у якім праду-

гледжвалася ўтварэнне судоў, што выбіраліся шляхтай. Асобна агаворвалася, што правы царквы і духоўных судоў (каталіцкіх і праваслаўных) захоўваюць сваю сілу на падставе даўніх прывілеяў, якія мелі каталіцкія біскупы і праваслаўныя ўладыкі. У складанай палітычнай сітуацыі ў час Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг. на абмежаванне сваёй улады і прэрагатыў у судовых адносінах пайшлі не толькі вялікі князь, але і паны-рада і старасты (пераважна магнаты). Яны былі вымушаны адмовіцца ад сваіх судовых правоў і даходаў дзеля кансалідацыі саслоўя феадалаў. Усе палажэнні Бельскага прывілея былі ўзяты з праекта новага статута. Аднак у Статуце ВКЛ 1566 г. яны сфармуляваны больш поўна і дакладна. Дапаможны, службовы характар Бельскага прывілея выявіўся ў тым, што ў Статуце 1566 г. ён змешчаны як уводны закон і склаў з ім адзіны прававы акт. [9]

**Віленскі прывілей 1565 г.**, нарматыўны прававы акт, які стварыў інстытут перадсоймавых соймікаў. Выдадзены вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Аўгустам 30.12.1565 г. на Віленскім сойме 1565 – 1566 гг. па просьбе шляхты. Соймікі павінны былі збірацца ў ваяводствах і паветах перад *вальным соймам*, мелі права абмяркоўваць справы соймаў, выбіраць павятовых паслоў і даваць ім інструкцыі. Разам з арт. 5, 6 і 12 раздзела 3 Статута ВКЛ 1566 г. прывілей аформіў дэ-юрэ інстытут вальнага сойма з вызначанай сістэмай прадстаўніцтва. У тэксце прывілея яшчэ не сустракаецца тэрмін “соймік”, замест яго ўжываюцца словазлучэнні “соймы малые”, “соймы поветовые”, “сьезды поветовые”, хоць у просьбе шляхты ўжыты менавіта тэрмін “соймік”. Прывілей не вызначаў пэўную арганізацыю сойміка і абмежаваўся сцвярджэннем. што соймікі маюць адбывацца “тым же прикладом и порядком, яко на таких соймех поветовых справа, поступок и обычай заховівается в панстве нашом Коруне Польской”. Вызначалася, аднак, што элекцыйныя з’езды павінны збірацца “в тых же поветех на местцах головнейших”. У Статуце ВКЛ 1566 г. адзначалася, што элекцыйныя з’езды павінны адбывацца ў замку ці гаспадарскім двары, “которий на посородку того повету будеть”, з чаго вынікае, што гэты замак ці двор не абавязкова павінен быць адміністрацыйным цэнтрам “обывателем... всим паном радам нашим, князем, паном врядником земским и дворным, и всим станом народу шляхетского и стану рыцерского, где хто в котором повете оселость мает”, аднак дакладна не вызначаўся поўны склад удзельнікаў сойміка. Як адзначаецца ў навуковай літаратуры, удзельнічаць у працы сойміка мелі права асобы хрысціянскага веравызнання, якія карысталіся суверэннымі правамі на сваіх землях пад сюзерэнітэтам вялікага князя. [10]

**Соймік,** сеймік, у ВКЛ у XVI – XVIII стст. сход шляхты павета (зямлі, ваяводства), дзейнасць якога рэгламентавалася нормамі права; форма самарэалізацыі шляхецкай супольнасці павета і дзяржаўна-прававы інстытут, дзякуючы якому шляхецкая супольнасць была здольна прымаць рашэнні. Генетычна ўзыходзіць да веча і з'ездаў баяр-шляхты пэўнай зямлі. У 1511 г. Жыгімонт I Стары ўпершыню заклікаў намеснікаў памежных зямель склікаць шляхту па паветах і прапанаваў выбраць па 2 прадстаўнікі ад павета для ўдзелу ў сойме. Паступова гэтая практыка ўкаранілася, але шляхце не забаранялася прымаць удзел у сходах Сойма і пагалоўна. На вайсковым з'ездзе ў Менску ў лістападзе 1564 г. адбыліся сходы шляхты некаторых паветаў, на якіх былі абраны кандыдаты на земскія судовыя пасады, а на Віленскім сойме 1565 – 1566 гг. шляхта ўсёй дзяржавы звярнулася да Жыгімонта II Аўгуста з прапановай увесці ў ВКЛ на ўзор Польскага каралеўства павятовыя соймікі. ***Віленскі прывілей 1565 г.*** устанавіў павятовыя перадсоймавыя соймікі ў ВКЛ як курыю для абрання паслоў на сойм (па 2 паслы ад павета). Статут ВКЛ 1566 г. вызначыў час перадсоймавых соймікаў – не пазней як за 4 тыдні да сойма, а паводле Статута ВКЛ 1588 г. – 6 тыдняў. Для апавяшчэння павятовай шляхты пра пытанні, якія выносіліся на разгляд Сойма, вялікі князь пасылаў у паветы легатаў (гаспадарскіх паслоў) з соймавымі лістамі, якія павінны былі ўручацца ***гродскаму суду*** не пазней чым за 2 тыдні да пачатку сойміка. Стараста або яго намеснік павінен быў пасланы з гэтымі лістамі возных да ўсіх тых, каму дасылаліся раней соймавыя лісты з гаспадарскай канцылярыі. Астатняя шляхта апавяшчалася пра сойм па цэрквах, касцёлах, на таргах. Як правіла, шляхта збіралася на соймікі ў павятовых цэнтрах. Працягласць сойміка вызначалася рэцэсам (пастановай) Гарадзенскага сойма 1567 г. у 3 дні, Статутам ВКЛ 1588 г. – да 4 дзён, соймавай канстытуцыяй 1764 г. – 3 дні. Рашэнні на сойміку павінны былі прымацца аднагалосна ("одностайным зданьем"). (...). Пасяджэннямі сойміка кіраваў найвышэйшы па пасадзе ўраднік або павятовы ***маршалак***. Рэцэс Гарадзенскага сойма 1567 г. прадугледжваў матэрыяльную адказнасцьураднікаў за адсутнасць на сойміку без "причин слушных", што скасавана Статутам ВКЛ 1588 г. Шляхціцы, якія валодалі маёнткамі ў розных паветах, маглі прысутнічаць на любым з павятовых соймікаў, дзе мелі зямельную ўласнасць. На перадсоймавым сойміку павятовая шляхта павінна была заслухаць легата вялікага князя аб скліканні сойма і пытаннях, якія выносіліся на яго абмеркаванне, выбраць 2 паслоў і скласці для іх інструкцыю. Паводле Статута ВКЛ пасля соймаў, але не пазней як праз 4 тыдні, павінны былі збірацца пасоймавыя, або рэляцыйныя соймікі. Пасля прыезду з сойма паслы папярэджвалі ваяводу або

павятовага судовага старасту пра сваё вяртанне, тыя або іх намеснікі апавяшчалі павятовую шляхту пра час склікання соймікаў. На гэтых сойміках паслы паведамлялі пра сваю дзейнасць на сойме і апавяшчалі соймавыя ўхвалы. З канца XVI ст. рэляцыйныя соймікі прымалі ўхвалы па рэалізацыі соймавых канстытуцый, а таксама па справах, якія на соймах перадаваліся на вырашэнне "панов-брати" (пра згоду на падатковыя соймавыя ўхвалы, пра выбранне павятовых *паборцаў* і інш. [11]

**Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г.,** Першы Статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феадальнага права, які дзейнічаў у ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. Падрыхтаваны на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясцовага звычаёвага права, пастаноў судовых і дзяржаўных устаноў, ***Судзебніка 1468 г.***, прывілеяў. Статут склала камісія пад кантролем канцлера ВКЛ А. Гаштольда (ёсць меркаванні, што ў складанні і рэдагаванні Статута прымаў удзел Ф. Скарына). Пры распрацоўцы Статута 1529 г. упершыню вырашаны шэраг складаных тэарэтычных і практычных задач: выпрацавана сістэма і структура размяшчэння прававых норм у залежнасці ад іх зместу, уключаны тыповыя і абагульненыя нормы; дадзена дакладная рэдакцыя кожнага артыкула; уведзена шмат новых прававых норм, у якіх адлюстраваны тагачасныя таварна-грашовыя адносіны; уключаны нормы дзяржаўнага, адміністрайцыйнага, грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і іншых галін права. Складальнікі Статута не прытрымліваліся сістэмы кадыфікацыі, прынятай у рымскім праве, а выпрацоўвалі сваю. У яе аснове закладзены новыя прынцыпы: суверэннасць дзяржавы (насуперак сярэдневяковаму касмапалітызму), адзінства права, прыярытэт пісанага права. Статут уключаў нормы агульнага права і спецыяльныя нормы, якія забяспечвалі прывілеі пануючаму класу або яго групам. Гэтыя нормы былі не выключэннем, а састаўной часткай у сістэме Статута 1529 г., хоць і супярэчылі яго асноўным прынцыпам.

Статут уведзены ў дзеянне 29.09.1529 г. Складаецца з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў. Пазней у яго ўнесены дапаўненні, у выніку колькасць артыкулаў павялічылася да 283. У 1-м – 3-м раздзелах змешчаны ў асноўным нормы дзяржаўнага права і прынцыповыя палажэнні іншых галін права, у 4-м і 5-м – шлюбна-сямейнае, апякунскае і спадчыннае, у 6-м – судова-працэсуальнае, у 7-м – крымінальнае, у 8-м – зямельнае, у 9-м – лясное і паляўнічае, у 10-м – цывільнае, у 11-м – 13-м – крымінальнае і крымінальна-працэсуальнае права. У статуце 1529 г. юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча класаў, саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы не-

каторых органаў дзяржаўнага кіравання і суда. Абвяшчалася правіла, паводле якога ўсе асобы, "як убогія, так і багатыя", павінны былі судзіцца па нормах, выкладзеных у Статуце. Вялікі князь абавязаўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць чужаземцаў на дзяржаўныя пасады ВКЛ, не даваць ім маёнткаў, не адбіраць у мясцовых феадалаў пасады і маёмасці без суда, прытрымлівацца ўсіх старых законаў і звычаяў. Асаблівая ўвага ў Статуце аддавалася судова-працэсуальнаму праву. Абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, фармальнай роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачанага на абарону з удзелам адваката. Адначасова ў Статуце абвяшчалася захаванне прывілеяў і льгот для феадалаў, што на практыцы замацоўвала бяспраўе простых людзей і захоўвала паўнату праваў толькі для феадалаў. Аднак у перыяд феадалізму нават такое абвяшчэнне ідэі правапарадку было значным крокам наперад. Ідэі гуманізму паўплывалі на нормы крымінальнага і цывільнага права, выкладзеныя ў Статуце 1529 г. і наступных Статутах. Так, у Статуце 1529 г. (арт. 7 раздз. 1) абвяшчалася, што ніхто не павінен адказваць за чужую віну, а крымінальнае пакаранне трэба прызначаць толькі асобам, віна якіх устаноўлена судом. У арт. 27 раздз. 7 прадугледжаны тэрмін крымінальнага праследавання: за найбольш цяжкае злачынства – 10 гадоў, менш цяжкае – 3 гады. У арт. 7 раздз. 11 зроблена спроба абмежаваць халопства. Вольны чалавек за здзейсненае злачынства не павінен быў аддавацца ў вечную няволю. У Статуце даволі поўна выкладзены нормы, якія забяспечвалі права ўласнасці феадалаў. Шмат увагі аддавалася шлюбна-сямейнаму праву. Змяшчаліся нормы, якія вызначалі маёмасныя правы жанчын і дзяцей, парадак выдачы дзяўчат замуж. Абвяшчалася абяцанне вялікага князя не выдаваць замуж прымусова. Падрабязна рэгламентаваўся парадак прызначэння апекуноў непаўналетнім дзецям, якія засталіся без бацькоў. Статут напісаны на беларускай мове, мае важнае значэнне як помнік прававой культуры і мовы беларускага народа, дае магчымасць вывучаць лексіку і стыль, дзяржаўна-прававую тэрміналогію таго часу. Нормы дзяржаўнага права, выкладзеныя ў Статуце, у сваёй сукупнасці складалі своеасаблівую феадальную канстытуцыю, у якой упершыню вызначаліся структура і характар дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, замацоўваліся асноўныя правы і прывілеі пануючага класа і саслоўя шляхты. Статут 1529 г. адыграў значную ролю ў далейшай кадыфікацыі і сістэматызацыі права. Як і ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г.***, паслужыў базай і крыніцай для распрацоўкі ***Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.*** [12]

**Статут Вялікага княства Літоўскага 1566,** Другі статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феадальнага права, які дзейнічаў у Бела-

русі і Літве ў 1566 – 1588 гг, а на Правабярэжнай Украіне і ў XVII – XVIII стст. Асноўныя крыніцы Статута 1566 г.: агульназемскія і абласныя прывілеі, ***Судзебнік 1468 г.***, ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г.*** і некаторыя нормы звычаёвага права; выкарыстаны таксама нормы царкоўнага (рымска-каталіцкага і грэка-праваслаўнага) права. У ім былі спалучаны тэарэтычныя распрацоўкі мясцовага права з практычнай дзейнасцю і тэарэтычнымі асновамі рымскага і заходнееўрапейскага права. Для падрыхтоўкі Статута ў 1551 г. меркавалася стварыць камісію з 10 чалавек (5 католікаў, 5 праваслаўных), але былі вызначаны імёны толькі 5 католікаў. Невядома, ці была створана такая камісія, бо з тэксту ***Бельскага прывілея 1564 г.*** вынікае, што праект Статута рыхтавала іншая камісія: “особы певные, рады наши, маршалкове, врадники земские, хоружие и иные особы ряду и народу шляхецкого, доктори прав чужоземскмх которые заседши не одно поправили тот старый, але теж новым кшалтом некоторые розделы звлаща судовый, за засаженьем новым обычаем суду и порадку судового то становили и написали”. Працай гэтай камісіі кіраваў канцлер М. Радзівіл Чорны, у ёй удзельнічаў маршалак дворны А. В. Валовіч, відаць, П. Раізій, А. Ратундус і інш. Праект Статута аддадзены сойму на папярэдні разгляд у 1561 г., зацверджаны толькі 01.07.1564 г., меркавалася ўвесці яго ў дзеянне з 11.11.1564 г. Аднак з-за спрэчак па асобных артыкулах набыў законную сілу з 01.03.1566 г., некаторыя змены ўнесены ў яго прывілеем 01.07.1566 г. У Статут былі ўпісаны ***Віленскі прывілей 1563 г.***, ***Бельскі прывілей 1564 г.***, ***Віленскі прывілей 1565 г.*** У Статуце 1566 г. захавана з невялікімі. зменамі структура Статута 1529 г. У ім 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Першыя 3 раздзелы ахопліваюць нормы дзяржаўнага, ваеннага, адміністрацыйнага права, 4-ы – судовы лад і судовы працэс, 5-ы і 6-ы – сямейнае і апякунскае права, 7-ы – 9-ы – цывільнае права, 10-ы – лясное і паляўнічае права, 11-ы – 14-ы – крымінальнае права. Найбольш істотныя змены ўнесены ў нормы дзяржаўнага, судова-працэсуальнага і цывільнага права. Статут 1566 г. замацаваў асноўныя прынцыпы права: адзінства права для грамадзян, хоць яно не было роўным для ўсіх, дзяржаўны суверэнітэт (насуперак царкоўнаму касмапалітызму), абмежаванне ўлады гаспадара (вялікага князя), прыярытэт пісанага права. Упершыню намячалася аддзяленне суда ад органаў улады і кіравання. Для гэтага ствараліся ***земскія суды*** і ***падкаморскія суды.*** Больш падрабязна рэгламентавалася кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады і кіравання, якія былі заснаваны на агульных прынцыпах феадальнага права: стварэння льгот і перавага для класа феадалаў і саслоўя шляхты, недапушчэнне простых людзей у органы кіравання, замацаванне прававой няроўнасці розных сацыяльных груп насельніцтва. Складальнікі Статута на-

далі яго нормам аднастайную і сучасную, на той час, форму і прававую тэрміналогію (беларускую), зразумелую для большасці насельніцтва, што спрыяла ўмацаванню павагі да закона і дзяржавы.

Кіраўніком дзяржавы і галоўнай асобай ва ўсёй сістэме дзяржаўных органаў прызнаваўся вялікі князь, які ў Статуце называецца "господарем". Яго прававое становішча тыповае для абмежаванага феадальнага манарха, але былі і некаторыя асаблівасці. Паўнамоцтвы вялікага князя грунтаваліся на выбарным пачатку, яны рэгламентаваліся прававымі нормамі Статута 1566 г. Ён не меў права без рашэння Сойма пачынаць вайну, устанаўліваць падаткі на ваенныя патрэбы (арт. 2 раздз. 2), выдаваць законы (арт. 12 раздз. 3). Вялікі князь абавязваўся "всих князей и панов-рад, як духовных, так и свецких, и всех врядников земских и дворных, панов хоруговных, шляхту, рыцарство, мещане и всих людей посполитых у Великом князстве Литовском... заховати при свободах и вольностях" (арт. 2 раздз. 3). Важнае значэнне меў артыкул, які забараняў даваць маёнткі, пасады, чыны і званні чужаземцам, у т. л. ураджэнцам Польшчы (арт. 9 раздз. 3). Статут 1566 г. заканадаўча замацаваў прывілеі і галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве. Паводле арт. 5 раздз. 3, на вальны (агульны) сойм запрашаліся князі, паны, маршалкі і іншыя службовыя асобы. Інтарэсы буйных феадалаў забяспечваў арт. 10 гэтага ж раздзела, паводле якога, у адпаведнасці з даўнімі звычаямі, захоўваліся і ўсе прывілеі, пасады, чыны і званні феадалаў. У Статуце 1566 г. акрэслены пераход ад феадальнага права ўласнасці да буржуазнага. Арт. 1 раздз. 7 даваў усім феадалам права вольна распараджацца сваімі маёнткамі. Паўней выкладзены і нормы спадчыннага права (раздз. 8). Істотныя змены ўнесены ў крымінальнае права. Суб'ектам злачынства прызнаваўся толькі чалавек. Непаўналетнія маглі быць пакараны толькі пасля 14 гадоў (арт. 8 раздз. 14). Абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці (арт. 2 раздз. 14). Крымінальнае пакаранне павінна было ажыццяўляцца толькі паводле суда, а асоба, якая абвінавaціла каго-небудзь у злачынстве і не даказала яго віны, павінна была быць пакарана так, як мог быць пакараны абвінавачаны ёю (арт. 2 раздз. 1). [13]

**Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.**, Трэці статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феадальнага права, які дзейнічаў у ВКЛ з 1589 г., а пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі – у Віцебскай і Магілеўскай губернях да 1831 г., у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерні да 1840 г. Пасля таго як быў прыняты ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г***, кадыфікацыйная работа не спынілася. Ужо на Берасцейскім сойме 1566 г. было папраўлена некалькі артыкулаў. Праз 2 гады

Гарадзенскі сойм унёс папраўкі ў некаторыя артыкулы і стварыў камісію для дапрацоўкі Статута. Камісія для выпраўлення Статута была выбрана і на Люблінскім сойме 1569 г. Крыніцамі для распрацоўкі Статута 1588 г. былі Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг., соймавыя пастановы 1573, 1578, 1580 і 1584 гг., прывілеі, пастановы павятовых соймікаў. Да канца 1584 г. работа над Статутам была скончана, але ў сувязі з тым што ён ігнараваў акт Люблінскай уніі 1569 г., прадстаўнікі Польшчы не дапускалі яго зацвярджэння на агульным сойме Рэчы Паспалітай. Каб захаваць велікакняжацкі трон, Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут сваім прывілеем 28.01.1588 г.

Статут 1588 г. падрыхтаваны на высокім тэарэтычным узроўні кваліфікаванымі прававедамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А. Б. Валовіча і падканцлера Л. І. Сапегі. У Статут увайшлі нормы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. Ён абагульніў тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з якіх апярэджвалі свой час. У Статуце знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). Статут 1588 г. мае 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. У 1-м – 4-м раздзелах змешчаны нормы дзяржаўнага права і судовага ладу, у 5-м – 10-м і часткова ў 13-м – шлюбна-сямейнага, зямельнага і цывільнага права, у 11-м – 12-м, 14-м і часткова ў 13-м – крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права. Ідэі Рэфармацыі і верацярпімасці замацаваны ў арт. 3 раздз. 3, паводле якога вялікаму князю і ўсім дзяржаўным органам прадпісана забяспечваць спакой усіх жыхароў дзяржавы, незалежна ад таго, якога вучэння яны прытрымліваюцца ў хрысціянскім веравызнанні (акт Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.). Ідэі гуманізму адбіліся і на нормах крымінальнага, цывільнага права. Так, у пэўнай ступені гарантаваліся маёмасныя і асабістыя правы мяшчан. Кожны вольны чалавек мог пры жаданні выехаць за мяжу, калі гэта рабілася не на шкоду сваёй краіне. Статут юрыдычна замацоўваў тыя фактычныя адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569 г., але абавязваў урад вярнуць адлучаныя ад княства землі, забараняў прызначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлёй “чужаземцаў і загранічнікаў”, у т. л. і падданых Польшчы, захаваў адасобленасць дзяржаўных устаноў, арміі, заканадаўства, эканомікі і фінансаў ВКЛ. Уладаром дзяржавы прызнаваўся вялікі князь, названы ў Статуце “господарем”. Але многія яго паўнамоцтвы былі абмежаваны, і выконваць іх ён мог толькі са згоды Сойма, вышэйшых дзяржаўных службовых асоб. Статут замацаваў феадальны грамадскі лад, наяўнасць 2 асноўных класаў: феадалаў і феадальна залежных сялян. Асаб-

ліва былі вылучаны князі, паны радныя і паны харугоўныя, якія мелі права судзіць не толькі простых людзей, але і залежную ад іх шляхту, даваць ёй у часовае карыстанне землі, маёнткі, а таксама адбіраць гэтыя маёнткі, нягледзячы на даўнасць уладання імі (арт. 30 раздз. 3). Статут рэгламентаваў таксама некаторыя правы і абавязкі простых людзей і прадстаўнікоў этнічных груп (сялян, слуг, чэлядзі, мяшчан, рамеснікаў, яўрэяў, татараў). Ён абараняў інтарэсы буйных і сярэдніх феадалаў і ўзмацняў іх прывілеяванае становішча, канчаткова запрыгоніў сялян. Для шляхты Статут прадугледжваў адказнасць за забойства простага чалавека, забараняў перадачу ў няволю вольнага чалавека за даўгі або злачынства, абмяжоўваў пакаранне непаўналетніх. Хоць Статут дэклараваў, што ўсе простыя людзі разам з феадаламі ўдзельнічаюць у выбранні гаспадара (раздз. 3 арт. 2), аднак простых людзей не дапускалі ў Сойм, а іх удзел у палітычным жыцці абмяжоўваўся выключна мясцовымі валаснымі справамі. Статут 1588 г. закончыў кадыфікацыю права ў ВКЛ. Гэта выдатны помнік беларускай мовы і юрыдычнай думкі феадальнай эпохі. [14]

## 9.3. КРЫНІЦЫ


1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

3. Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год / изд. В. Антонович и К. Козловский. – Киев : Университ. типогр., 1868.

4. Законодательные акты Великого княжества Литовского XV – XVI вв. / сборник материалов подг. к печати И. И. Яковкиным. – Л. : Соцэкгиз, 1936. – 55 с.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

6. Малиновский, И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. Малиновский. – Томск : Паровая типо-литография П. И. Макушина, 1901. – XX, 508, CLX с.

7. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

8. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р истор. наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

9. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

10. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Текст, перевод и словарь-комментарий / под. ред. академика К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 253 с.

11. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 350 с.

12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

13. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – 207 с.

14. Трибунал обывателям Великого князства Литовского на сойме варшавском даный року 1581 // Временник Московского общества истории и древностей российских. – Кн. 25. – М, 1857. – Отд. II. – С. 1 – 22.

## 9.4. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Амплеева, Т. Ю. Первый литовский статут: учеб. пособие / Т. Ю. Амплеева; Ин-т защиты предпринимателя. – М. : Ин-т защиты предпринимателя, 1999. – 171 с.

2. Варонін, В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. – Сш. 1 (8). – Чэрвень, 1998.

3. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV – XVI вв.: Старина и борьба за старину / А. С. Грушевский. – Киев, 1918.

4. Дворниченко, А. Ю. Русские земли Великого княжества Литовского. Очерки истории общины, сословий, государственности (до начала XVI в.) / А. Ю. Дворниченко. – СПб., 1993.

5. Доўнар, Т. Калі шляхціц мог загаўкаць па-сабачы / Т. Доўнар // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 37 – 40.

6. Доўнар, Т. Фарміраванне права Вялікага княства Літоўскага (XV – XVI стст.) / Т. Доўнар // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 4. – С. 21 – 31.

7. Доўнар, Ю. Судовая рэформа ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. / Ю. Доўнар // Юстиция Беларуси. – 2004. – № 10. – С. 19 – 20.

8. Иванов, Г. Статут Великого княжества Литовского 1529 года – документ, обращенный в будущее / Г. Иванов // Вестник Академии МВД РБ. – 2001. – № 1. – С. 132 – 134.

9. Лазутка, С. А. Літоўскія статуты (1529, 1566, 1588), іх стваральнікі і эпоха / С. А. Лазутка // Край. Polonica-Albaruthenica-Lithuanica. – 2001. – №№ 1, 2.

10. Лазутка, С. Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Виликоните, Э. Гудавичюс. – Вильнюс : Марги раштай, 2004. – 521 с.

11. Леонтович, Ф. И. К истории административного строя Литовского государства: I. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства. II. Панский двор в Литовском государстве / Ф. И. Леонтович. – Варшава : тип. Варшавск. учеб. окр., 1899. – 104 с.

12. Леонтович, Ф. И. Областное управление в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Юридические записки, издаваемые Демидовским юридическим лицеем. – 1908. – Вып. 2; 1909. – Вып. 1, 2; 1910. – Вып. 1.

13. Леонтович, Ф. И. Очерки истории литовско-русского права: Образование территории Литовского государства / Ф. И. Леонтович. – СПб. : тип. В. С. Балашева и К°, 1894. – 393 с.

14. Леонтович, Ф. И. Правоспособность литовско-русской шляхты / Ф. И. Леонтович // Журнал министерства народного просвещения. – 1908. – №№ 3, 5 – 7; 1909. – № 2, 3.

15. Леонтович, Ф. И. Рада великих князей литовских / Ф. И. Леонтович // Журнал министерства народного просвещения. – 1907. – №№ 9, 10.

16. Леонтович, Ф. И. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства и его причины / Ф. И. Леонтович. – СПб. : тип. В. С. Балашева и К°, 1895. – 56 с.

17. Леонтович, Ф. И. Суд господарей и их советников в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Журнал Министерства юстиции. – 1909. – №№ 6, 7.

18. Леонтович, Ф. И. Центральные судебные учреждения в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Журнал Министерства юстиции. – 1910. – № 2.

19. Любавский, М. К. К вопросу об удельных князьях и местном управлении в Литовско-Русском государстве / М. К. Любавский. – СПб., 1894.

20. Любавский, М. К. Литовско-Русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства / М. К. Любавский. – М., 1900. – 850, 232, LXXII с.

21. Любавский, М. К. О распределении владений и об отношениях между великими и другими князьями Гедиминова рода в XIV и XV вв. /

М. К. Любавский // Известия Исторического общества при Московском университете. – М., 1896. – С. 68 – 97.

22. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута: Ист. очерки / М. К. Любавский. – М. : Унив. тип., 1892. – 998 с.

23. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 / Н. А. Максимейко. – Харьков : тип. А. Дарре, 1902. – 205 с.

24. Малиновский, И. А. Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. В 2 ч. Ч. 2: Рада Великого княжества Литовского / И. А. Малиновский. – Вып. 1, 2. – Томск, 1904. – 1912.

25. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва в XV – XVI вв: Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития / В. И. Пичета. – М : Изд-во АН СССР, 1961. – С. 183 – 212.

26. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

27. Юхо, Я. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо; рэд. Т. Ф. Есіпенка. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

28. Юхо, Я. А “...каждому засобно и на потом будучим”/ Я. А. Юхо // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 2. – С. 2 – 6.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1492 г. / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 470.

2. Грыцкевіч, Анатоль. Прывілей 1506 г. / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 470.

3. Грыцкевіч, Анатоль. Гродскі суд / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 553.

4. Юхо, Язэп. Земскі суд / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 656.

5. Пазднякоў, Валерый. Падкаморскі суд / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 383.

6. Юхо, Язэп. Трыбунал Вялікага княства Літоўскага / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 673 – 674.

7. Юхо, Язэп. Віцебскае права / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 452.

8. Макараў, Максім. Полацкае права / М. Макараў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 449 – 450.

9. Грыцкевіч, Анатоль. Бельскі прывілей 1564 / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 310.
10. Радаман, Андрэй. Віленскі прывілей 1565 / А. Радаман // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 434 – 435.
11. Радаман, Андрэй. Соймік / А. Радаман // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 616 – 617.
12. Юхо, Язэп. Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 630 – 632.
13. Юхо, Язэп. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 632 – 633.
14. Юхо, Язэп. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 633 – 634.

# ТЭМА 10. АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Змест праграмы**. Утварэнне першых ваяводстваў. Колькасць і прыкладныя межы. Віленскі сойм 1565 – 1566 гг. і яго рашэнні. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і вайсковая рэформы. Адміністрацыйныя функцыі ваяводскіх і павятовых цэнтраў (гаспадарчыя, вайсковыя, судовыя).

## 10.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Асноўнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ВКЛ на працягу яго гісторыі з’яўляліся ***землі***, ***княствы***, ***намесніцтвы***, ***ваяводствы***, ***валасці***, ***паветы***.

Як вядома, тэрытарыяльнае ядро ВКЛ склалі першапачаткова 3 зямлі – Жамойцкая, Літоўская і Новагародская. Затым да яго далучыліся Полацкае, Віцебскае, Менскае, Пінскае і іншыя княствы. Часам тэрміны “зямля” і “княства” ўжываюцца як сінонімы (напрыклад, адносна Полацкага княства). У канцы XIV – пач. XVI стст частка княстваў ператворана ў намесніцтвы, ваяводствы і паветы, частка раздроблена на асобныя маёнткі. Падзел на княствы быў афіцыйна скасаваны паводле рэформы сярэдзіны XVI ст.

У выніку падпарадкавання ўдзельных княстваў цэнтральнай уладзе пры Вітаўце ўтвараюцца ***намесніцтвы*** на чале з намеснікамі – прадстаўнікамі вялікага князя, якія канцэнтравалі ў сваіх руках адміністрацыйную, судовую і фінансавую ўладу.

Напачатку XV ст. побач з існаваннем намесніцтваў узнікаюць і ***ваяводствы.*** Першымі ваяводствамі становяцца Віленскае і Троцкае княствы. У 1471 г. на тэрыторыі Кіеўскага княства створана Кіеўскае ваяводства.

Напачатку XV ст. праводзіцца рэформа, у выніку якой адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ быў набліжаны да польскага. Павялічылася колькасць ваяводстваў. У 1504 г. у ваяводства была ператворана Полацкая зямля, у 1507 г. са складу Віленскага вылучана Новагародскае ваяводства, у 1508 г. ваяводствам стала Смаленская зямля.

У выніку адміністрацыйнай рэформы 1565 – 1566 гг. тэрыторыя ВКЛ была падзелена на 13 ваяводстваў, сярод іх – Берасцейскае, Мсціслаўскае, Менскае, Валынскае, Брацлаўскае, Віленскае, Троцкае, Новагародскае, Падляшскае, Кіеўскае, Віцебскае, Валынскае, Полацкае.

***Валасць*** уяўляла сабой тэрыторыю, што належала дзяржаве (у адрозненне ад вотчыны – прыватнага ўладання), населеную сялянамі-даннікамі, аб’яднанымі ў тэрытарыяльную абшчыну. Валаць ахоплівала 10 – 30 і больш

сельскіх паселішчаў. Цэнтрам воласці з'яўляўся горад ці замак. З канца XIV ст. на землях ВКЛ пачалося разбурэнне валасцей, іх тэрыторыі пераходзілі ў вотчыннае землеўладанне. Да сярэдзіны XVI ст. воласці засталіся практычна толькі на ўсходзе Беларусі.

Тэрмін "***павет***" пачынае ўжывацца з пачатку XVI ст. спачатку як сінонім воласці, у перш. пал. XVI ст. пад паветам разумеюць буйную воласць, у т. л. скасаванае ўдзельнае княства, тэрыторыя якой належыць дзяржаве. Адначасова тэрмін "павет" мог разумецца і як сінонім намесніцтва. У гэты час статус павета нявызначаны. Больш дакладнае вызначэнне статусу павета як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі адбылося падчас рэформы сярэдзіны 1560-х гг. Паветы пачалі лічыцца састаўной часткай ваяводстваў, намесніцтвы і воласці, што не набылі статус павета, уваходзілі ў іх склад у якасці звычайных маёнткаў.

Такім чынам, сутнасць рэформы 1565 – 1566 гг., праведзенай пры Жыгімонце II Аўгусце – падзел тэрыторыі ВКЛ на 13 ваяводстваў, у кожнае з якіх уваходзіла пэўная колькасць паветаў (усяго 29), у асноўным 2 – 5 паветаў. Пры гэтым Полацкае і Мсціслаўскае ваяводства паветаў не мелі.

## 10.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Княства,** дзяржаўнае ўтварэнне з пэўным узроўнем суверэнітэту ці аўтаноміі, якім кіраваў князь; феадальнае ўладанне князя. (...) У XII – XIV стст. існавалі: Ваўкавыскае, Віцебскае, Галіцка-Валынскае, Гарадзенскае, Давыд-Гарадоцкае, Друцкае, Ізяслаўскае, Капыльскае, Кіеўскае, Клецкае, Кобрынскае, Крэўскае, Лагожскае, Лукомскае, Менскае, Мсціслаўскае, Навагародскае, Полацкае, Свіслацкае, Слуцкае, Смаленскае, Тураўскае, Уладзіміра-Валынскае, Чарнігаўскае княствы. З канца XIV да 1-й пал. XVI ст. частка іхператворана ў намесніцтвы, ваяводствы і паветы, частка раздрабнілася на асобныя маёнткі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа 1565 – 1566 гг. афіцыйна скасавала княствы як тэрытарыяльныя адзінкі ВКЛ, але назва "княствы" працягвала традыцыйна ўжывацца ў XVII – XVIII стст. у дачыненні да Клецкага, Капыльскага і Слуцкага княстваў, якія захавалі адносную тэрытарыяльную кампактнасць, хоць фактычна былі вялізнымі магнацкімі вотчынамі. [1]

**Намесніцтва,** у ВКЛ адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якой кіравалі ***намеснікі*** вялікага князя. Большасць намесніцтваў утворана ў XIV – XV стст. у выніку скасавання ўдзельных княстваў і падпарадкавання іх велікакняжацкай уладзе. Намесніцтвамі называлі таксама дзяржаўныя воласці,

што ўзнікалі пры падзеле былых княстваў. Самыя буйныя намесніцтвы з пачатку XVI ст. сталі ***ваяводствамі***, астатнія – ***старастваммі*** і ***дзяржавамі***. [2]

**Ваяводства,** адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ у XV – XVIII стст. Узнікла як ваенна-адміністрацыйная акруга, уведзена паводле ***Гарадзельскага прывілея 1413 г.***, калі на аснове былых княстваў былі ўтвораны Віленскае ваяводства і Троцкае ваяводства. У Віленскае ваяводства ўвайшла тэрыторыя паўночна-ўсходніх літоўскіх зямель і большая частка заходніх, цэнтральных і ўсходніх зямель Беларусі. У вайсковых адносінах віленскаму ваяводу падпарадкоўваліся намеснік навагародскі, а таксама фактычна аўтаномныя Слуцкае княства, Клецкае княства (да 1521 г.) і Мсціслаўскае княства (да 1529 г.), якія фармальна ўваходзілі ў Віленскае ваяводства. Троцкае ваяводства ў XV – пач. XVI стст. уключала цэнтральныя і паўднёвыя часткі Літвы і значную частку заходніх і паўднёвых зямель Беларусі. У Троцкае ваяводства ўваходзілі Кобрынскае і Пінскае княствы. На ўсходзе Беларусі Троцкае ваяводства мела невялікія ўчасткі тэрыторыі пасярод Віленскага ваяводства – 28 сёл Бабруйскай воласці з Мышкавічамі, Парычамі і Шацілкавічамі – г. зв. “троцкая палова”, а г. Бабруйск і 18 сёл – “віленская палова”. Троцкаму ваяводу падначальваліся намеснікі берасцейскі, бельскі, дарагічынскі і мельніцкі. Палавіна тэрыторыі Троцкага ваяводства прыпадала на беларускія землі. У 1471 г. Кіеўскае княства пераўтворана ў Кіеўскае ваяводства. Астатняя тэрыторыя Беларусі ў XV ст. у склад ваяводстваў не ўваходзіла, захоўваючы статус аўтаномных зямель. У пач. XVI ст. у ВКЛ праведзены рэформы, якія далі магчымасць уніфікаваць яго адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Форма і структура яго былі набліжаны да адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу саюзнага Польскага каралеўства. У 1504 г. Полацкая зямля пераўтворана ў Полацкае ваяводства без паветаў (фармальна лічылася адным паветам). У студзені 1507 г. са складу Віленскага ваяводства вылучана Навагародскае ваяводства, у 1508 г. Смаленская зямля пераўтворана ў Смаленскае ваяводства, а ў 1513 г. Бельскі, Дарагічынскі і Мельніцкі паветы, вылучаныя з Троцкага ваяводства, аб’яднаны ў Падляшскае ваяводства. Аднак утварэнне новых ваяводстваў у пач. XVI ст. па сутнасці не змяніла спосабаў кіравання дзяржавай: прадстаўніком велікакняжацкай улады і военачальнікам феадальнага апалчэння ў ваяводстве заставаўся ***ваявода***, які ажыццяўляў таксама судова-адміністрацыйныя функцыі. Шэраг зямель у ВКЛ захоўваў аўтаномію на аснове зацвярджэння ў граматах вялікімі князямі літоўскімі даўніх традыцый кіравання (“мы старыну не рухаем”). Мясцовыя баяры і князі захоўвалі сваё пануючае становішча, што было палітычнай уступкай беларускім і укра-

інскім феадалам. Жыхарам Віцебскай і Полацкай зямель пацвярджалася права мець намесніка або ваяводу "па іх волі". Да адміністрацыйных рэформ 1565 – 1566 гг. у ваяводскіх соймах прымалі ўдзел усе феадалы, толькі ў шэрагу выпадкаў у іх удзельнічалі самыя ўплывовыя гараджане галоўнага горада ваяводства. Пасля рэформы шляхта атрымала большую магчымасць уплываць на справы мясцовага кіраўніцтва на павятовых або ваяводскіх (дзе не было паветаў) сойміках. Рэформа таксама ўстанавіла межы ваяводстваў і паветаў, якія захаваліся (за невялікімі выключэннямі) да 2-й пал. XVIII ст. Віленскі сойм падзяліў ВКЛ на 29 паветаў, якія ўвайшлі ў 13 ваяводстваў. Створаны Берасцейскае, Мсціслаўскае, Менскае, Валынскае і Брацлаўскае ваяводствы. Пасля рэформы Віленскае ваяводства складалася з 5 паветаў (Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Вількамірскі і Лідскі), Троцкае – з 4 (Гарадзенскі, Ковенскі, Троцкі і Упіцкі), Навагародскае – з 3 (Ваўкавыскі, Навагародскі, Слонімскі), Падляшскае – з 3 (Бельскі, Дарагічынскі, Мельніцкі), Кіеўскае – з 2 (Кіеўскі і Мазырскі), Віцебскае – з 2 (Аршанскі і Віцебскі), Берасцейскае – з 2 (Берасцейскі і Пінскі), Менскае – з 2 (Менскі і Рэчыцкі), Валынскае – з 3 (Крэменецкі, Луцкі і Уладзімірскі), Брацлаўскае – з 3 (Брацлаўскі, Вінніцкі і Звянігарадскі паветы). Полацкае і Мсціслаўскае ваяводствы былі без паветаў. У складзе Навагародскага павета захавалася як асобная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка (са значнымі рысамі феадальнага ўдзельнага княства) Слуцкае княства, якое было пад уладай князёў Алелькавічаў. Фармальна працягвала існаваць Смаленскае ваяводства, хоць Смаленск у 1514 г. далучаны да Расіі. Яно падзялялася на 2 паветы – Смаленскі і Старадубскі. Пасля 1654 г. смаленская шляхта была паселена на тэрыторыі ад Браслава да Вільні, у якой збіраліся соймікі абодвух паветаў. Істотныя тэрытарыяльныя змены ў ВКЛ адбыліся ў 1569 г. напярэдадні Люблінскай уніі. Са згоды мясцовай шляхты далучаны да Польшчы Падляскае (05.03.1569 г.), Валынскае (26.05.1569 г.), Брацлаўскае (01.06.1569 г.), Кіеўскае (05.06.1569 г.) ваяводствы. Мазырскі павет быў уключаны ў Менскае ваяводства. У выніку гэтага колькасць ваяводстваў у ВКЛ зменшылася да 9, а паветаў да 22 (з іх 16 на тэрыторыі Беларусі). [3]

**Павет,** адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ. Тэрмін польскага паходжання, пачаў ужывацца ў ВКЛ з XV ст. спачатку як сінонім старажытнарускага тэрміна ***воласць***. У 1-й пал. XVI ст. пад паветам звычайна разумелі буйную воласць, цэнтрам якой быў горад або замак, што належаў дзяржаве, у т. л. скасаванае ўдзельнае княства. Першапачаткова не меў афіцыйнага статуса і органаў кіравання. Буйныя землеўласнікі (паны) на тэрыторыі павета падпарадкоўваліся ваяводу, дробныя (баяры-шляхта) – на-

месніку павятовага цэнтра. Часам пад паветам разумелі толькі тэрыторыю, падкантрольную намесніку; у гэтым сэнсе павет быў сінонімам ***намесніцтва***. Упершыню статус павета афіцыйна акрэслены ў выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565 – 1566 гг. Паветы ўваходзілі ў склад ***ваяводстваў***. Усе намесніцтвы і воласці, якія не атрымалі статус павета, увайшлі ў іх склад у якасці звычайных маёнткаў. З гэтага часу ўсе землеўладальнікі на тэрыторыі павета падлягалі юрысдыкцыі павятовых органаў улады: грамадскія справы разглядаў земскі суд, крымінальныя – гродскі, справы аб межах маёнткаў – падкаморы; ваенна-мабілізацыйнымі справамі ведаў харужы. У час вайны шляхецкае апалчэнне (харугва) знаходзілася пад кіраўніцтвам ***маршалка***, а калі цэнтр павета адначасова быў цэнтрам ваяводства – пад кіраўніцтвам кашталяна. Павятовая шляхта збіралася на соймікі, дзе выбірала дэлегатаў на агульнадзяржаўны вальны сойм і ў Трыбунал ВКЛ. Структура павятовага кіравання замацавана Статутамі ВКЛ 1566 і 1588 гг. Аднак тэрмін “павет” зрэдку ўжываўся ў першапачатковым сэнсе як вызначэнне гістарычнай воласці з цэнтрам у горадзе, які неабавязкова меў павятовыя ўстановы. [4]

## 10.3. КРЫНІЦЫ


1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: канд. ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

3. Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год / изд. В. Антонович и К. Козловский. – Киев : Университ. типогр., 1868.

4. Законодательные акты Великого княжества Литовского XV – XVI вв. / сб. материалов подг. к печати И. И. Яковкиным. – Л. : Соцэкгиз, 1936. – 55 с.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

6. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

7. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р истор. наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

8. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР. Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

9. Малиновский, И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. Малиновский. – Томск : Паровая типо-литография П. И. Макушина, 1901. – XX, 508, CLX с.

10. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Текст, перевод и словарь-комментарий / под. ред. академика К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 253 с.

11. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 350 с.

12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

13. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – 207 с.

14. Трибунал обывателям Великого князства Литовского на сойме варшавском даный року 1581 // Временник Московского общества истории и древностей российских. Кн. 25. – М., 1857. – Отд. II. – С. 1 – 22.

## 10.4. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Варонін, В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. / В. Варонін // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. Сш. 1 (8). – Чэрвень, 1998.

2. Владимирский-Буданов, М. Ф. Очерки по истории литовско-русского права. Ч. 1, 2 / М. Ф. Владимирский-Буданов. – Киев, 1889, 1890.

3. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV – XVI вв.: Старина и борьба за старину / А. С. Грушевский. – Киев, 1918.

4. Дворниченко, А. Ю. Русские земли Великого княжества Литовского. Очерки истории общины, сословий, государственности (до начала XVI в.) / А. Ю. Дворниченко. – СПб., 1993.

5. Доўнар, Ю. Судовая рэформа ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. / Ю. Доўнар // Юстиция Беларуси. – 2004. – № 10. – С. 19 – 20.

6. Леонтович, Ф. И. К истории административного строя Литовского государства: I. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства. II. Панский двор в Литовском государстве / Ф. И. Леонтович. – Варшава : тип. Варшавск. учеб. окр., 1899. – 104 с.

7. Леонтович, Ф. И. Областное управление в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Юридические записки, издаваемые Демидовским юридическим лицеем. – 1908. – Вып. 2; 1909. – Вып. 1, 2; 1910. – Вып. 1.

8. Леонтович, Ф. И. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства и его причины / Ф. И. Леонтович. – СПб. : тип. В. С. Балашева и К°, 1895. – 56 с.

9. Леонтович, Ф. И. Центральные судебные учреждения в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Журнал Министерства юстиции. – 1910. – № 2.

10. Любавский, М. К. К вопросу об удельных князьях и местном управлении в Литовско-Русском государстве / М. К. Любавский. – СПб., 1894.

11. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешей жизнью государства / М. К. Любавский. – М., 1900. – 850, 232, LXXII с.

12. Любавский, М. К. О распределении владений и об отношениях между великими и другими князьями Гедиминова рода в XIV и XV вв. / М. К. Любавский // Известия Исторического общества при Московском университете. – М., 1896. – С. 68 – 97.

13. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута: Ист. очерки / М. К. Любавский. – М. : Унив. тип., 1892. – 998 с.

14. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 / Н. А. Максимейко. – Харьков : тип. А. Дарре, 1902. – 205 с.

15. Малиновский, И. А. Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. В 2 ч. Ч. 2: Рада Великого княжества Литовского. Вып. 1, 2 / И. А. Максимейко. – Томск, 1904, 1912.

16. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва в XV – XVI вв: Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития. – М : Изд-во АН СССР, 1961. – С. 183 – 212.

17. Юхо, Я. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / А. Я. Юхо; рэд. Т. Ф. Есіпенка. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

18. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. Ч. 1 / Я А. Юхо. Рэсп. ін-т выш. шк. Бел. дзярж. ун-та. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 349 с.

19. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

20. Юхо, Я. А "...каждому засобно и на потом будучим" / Я. А. Юхо // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 3. – С. 2 – 6.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ


1. Насевіч, Вячаслаў. Княства / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 116.

2. Насевіч, Вячаслаў. Намесніцтва / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 344.

3. Грыцкевіч, Анатоль. Ваяводства / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 399 – 400.

4. Насевіч, Вячаслаў. Павет / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 381.

# ТЭМА 11. ЗМЕНЫ ВА ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ДЗЯРЖАВЫ Ў 20-я – 60-я гг. XVI СТ.

**Змест праграмы**. Пераўтварэнне шляхты ў карпаратыўнае саслоўе і вылучэнне шляхецкай палітычнай праграмы. Палітыка верацярпімасці ў практыцы палітычнага жыцця ВКЛ. Афіцыйная адмена Гарадзельскага прывілея. Супярэчнасці паміж магнатэрыяй і асноўнай часткай шляхецкага саслоўя ў барацьбе за шляхецкія вольнасці. Рэформы сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. і Статут 1566 г. як вынік рэалізацыі шляхецкай палітычнай праграмы.

## 11.1. ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ:

Асноўную масу беларускіх федалаў складалі нашчадкі ўдзельных князёў Полацкага, Тураўскага і Смаленскага княстваў, баяраў і дружыннікаў гэтых княстваў, да якіх у XIV ст. далучыліся літоўскія (а ў XV ст. і жамойцкія) нобілі і дружыннікі. Некаторая частка апошніх асела ў адміністрацыйных цэнтрах Беларусі і атрымала тут маёнткі. Ужо да канца XIV ст. асноўная маса феадалаў (акрамя князёў) у ВКЛ называлася **баярамі**. Гэтая назва захавалася да XVI ст. Пачынаючы ад Гарадзельскага прывілея 1413 г. у дзяржаўных актах разам з назвай “баяры” ўсё часцей сустракаецца **“баяры-шляхта”** або **“шляхта”** (паводле польскага ўзору). У XV – XVI стст. у Берасцейскай зямлі і на Падляшшы феадалы таксама называліся **“зямяне”**. Гэтая назва ўжываецца ў Статуце ВКЛ 1529 г. для феадалаў усёй дзяржавы таксама, як і “баяры” і “шляхта”. Але з другой чвэрці XVI ст. назва **“шляхта”** стала займае месца ў дзяржаўных актах для вызначэння феадальнага саслоўя.

Працэс фарміравання правоў і прывілеяў феадальнага саслоўя ў ВКЛ насіў напачатку досыць абмежаваны характар. Прывілей Ягайлы 1387 г. адрасаваўся літоўскім князям і баярам, што прынялі каталіцтва. Гарадзельскі прывілей, які зафіксаваў уваход каталіцкіх родаў ВКЛ у польскае гербавае брацтва, вёў да далейшага замацавання прывілеяванага статусу новага саслоўя ў асяроддзі ўласна літоўскага этнасу і ва ўзаемаадносінах з праваслаўнай шляхтай. Паволе гэтага прывілею, толькі католікі мелі права займаць дзяржаўныя пасады. Нераўнапраўнае становішча праваслаўнай часткі феадалаў ВКЛ было выкарыстана Свідрыгайлам Альгердавічам падчас яго барацьбы з Жыгімонтам Кейстутавічам у 1430-я гг. Перамога ў гэтай барацьбе Жыгімонта была ў многім абумоўлена выданнем ***прывілея 1432 г.***, які прадаставіў шляхецкія правы праваслаўным і тым самым пазбавіў Свідрыгайлу істотнай часткі яго прыхільнікаў. ***Прывілей 1447 г.*** замацаваў шы-

рокія правы феадальнага саслоўя, якія неаднаразова былі пацверджаны ў наступных агульназемскіх прывілеях. ***Віленскі прывілей 1563 г.*** афіцыйна ўраўнаваў у палітычных правах праваслаўных і каталікаў.

У гэты ж час доступ у шляхецкае саслоўе становіцца ўсё больш складаным. У XV – пач. XVI стст. да ліку шляхты імкнуцца далучыцца многія ваеннаслужылыя людзі, якія займаюць прамежкавы статус паміж феадаламі і сялянамі. У асобных выпадках у склад шляхты траплялі і прадстаўнікі мяшчан і незапрыгоненых сялян – пахожых. Аднак з XVI ст. пачынаюць уводзіцца пэўныя абмежаванні. Так, у 1522 г. прынята "Устава о выводе шляхецтва з прымовою", паводле якой для доказу шляхецтва ў спрэчных выпадках патрабаваліся сведчанні двух шляхціцаў-сваякоў або старажытныя граматы. У Статуце 1529 г. зафіксавана адасабленне ад шляхты ваенных слуг. Да сярэдзіны XVI ст. доступ у шляхецкае саслоўе прадстаўнікам іншых саслоўяў быў магчымы толькі ў выключных выпадках – у выглядзе спецыяльных наданняў шляхецтва за асобыя заслугі праз ***набілітацыю*** ваеннаслужылых людзей (у ВКЛ вядома з часоў Вітаўта, напач. XVI ст. – звыклая з'ява). Пасля рэформ сярэдзіны XVI ст. шляхецтва магло надавацца толькі Соймам. Атрыманне шляхецтва было магчыма праз ***адопцыю*** – прыём у геральдычны род прадстаўнікоў іншага саслоўя з наданнем ім права карыстацца гербам або ўсынаўленне шляхціцам нешляхціца. Менавіта шляхам адопцыі ў 1413 г. літоўскія феадалы былі ўключаны ў гербавае брацтва.

За некалькі дзесяцігоддзяў саслоўе феадалаў у ВКЛ набыло многія правы і прывілеі, якіх польская шляхта дамагалася стагоддзямі. Аднак ВКЛ не поўнасцю паўтарыла польскі варыянт эвалюцыі статусу шляхты. Асноўная прычына гэтага – намаганні вялікіх князёў захаваць сваю ўладу ў вялікай поліэтнічнай дзяржаве, неаднароднай у тэрытарыяльным і юрыдычным планах. Вярхоўная ўлада была зацікаўлена ў падтрымцы з боку найбольш уплывовых прадстаўнікоў пануючага саслоўя, шчодра расплочвалася з імі пажалаваннямі з каралеўскага дамену, прызначэннем на важнейшыя пасады, прадастаўленнем розных прывілеяў. Таму з другой паловы XV ст. пачынаецца фарміраванне новай феадальнай эліты – буйных уласнікаў-паноў, якія істотна пацяснілі родавую княскую арыстакратыю.

У кастрычніку 1506 г. вялікім князем быў абраны ***Жыгімонт I Стары.*** Менш як праз два месяцы ён быў абраны і польскім каралём. Унутраная яго палітыка вылучалася спробамі рэфармавання ў розных сферах жыцця Польшчы і ВКЛ. Менавіта пры Жыгімонце I быў уведзены ў дзеянне Статут 1529 г. Ён спрабаваў упарадкаваць кіраванне каралеўскай маёмасцю, збор гандлёвых і судовых пошлін, правесці рэфармаванне фінансавай сістэмы. Таксама ён ажыццявіў спробу рэдукцыі – вяртання кара-

леўскіх маёнткаў, захопленых магнатамі, паспрабаваў абкласці падаткам шляхецкія маёнткі. Была таксама прадпрынята спроба стварэння пастаяннага войска замест паспалітага рушання. Усе гэтыя дзеянні былі яўнай пагрозай для шляхецкіх правоў і вольнасцей і для той ролі, якую іграла шляхта ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы. У 1537 г. супраць Жыгімонта і магнатаў выступіла сярэдняя польская шляхта (“Курыная вайна”). Паспалітае рушанне, што было сабрана пад Львовам для пахода на Малдавію, адмовілася падпарадкавацца каралю і патрабавала змены дзяржаўнай палітыкі. Быў дасягнуты кампраміс – шляхта дабілася пацвярджэння права вольнай элекцыі караля, парушанага ў 1529 г. гвалтоўным прызначэннем Жыгімонта II Аўгуста ў якасці пераемніка Жыгімонта I Старога. Узамен шляхта пагадзілася на абкладанне падаткам яе маёнткаў.

У 1548 г. Жыгімонт I памёр, і, згодна з гарантыямі 1529 г., каралём і вялікім князем стаў яго сын ***Жыгімонт II Аўгуст.*** Фактычнае кіраванне ў ВКЛ ён ажыццяўляў яшчэ з Брэсцкага сойму 1544 г. У 1547 г. Жыгімонт II узяў шлюб з Барбарай Радзівіл, у выніку пануючае становішча ў ВКЛ набыў менавіта гэты магнацкі род і яго прадстаўнікі – Мікалай Радзівіл Чорны і Мікалай Радзівіл Руды. Увогуле ўсю ўладу ў ВКЛ у перш. пал. XVI ст. канцэнтравала досыць вузкае кола магнатаў. У той жа час у суседняй Польшчы шляхта актыўна дамагалася пашырэння свайго удзелу ў грамадска-палітычным жыцці. Так, у 1505 г. у Польшчы была прынята канстытуцыя nihil novi (“нічога новага”), якая забараняла прымаць новыя законы без згоды кароннага Сейма. У пачатку праўлення Жыгімонта II адбыўся досыць востры канфлікт з польскай шляхтай. Манарх доўга не пагаджаўся прыняць праграму “экзекуцыі правоў”, якая распаўсюджвалася яшчэ з 20-х гг. XVI ст. (выканання ўсіх прынятых пастаноў, што тычыліся правоў шляхты). Пасля таго як Сейм у 1559 г. адмовіўся зацвердзіць падаткі на вядзенне Лівонскай вайны, Жыгімонт II 4 гады не склікаў яго ўвогуле. Экзекуцыйны рух тым часам набыў вялікія памеры. Экзекуцыяністы выступалі супраць магнатаў і дабіваліся пашырэння сваіх правоў і аслаблення панавання буйных паноў.

Гледзячы на рух польскай шляхты, шляхта ВКЛ таксама ўсё актыўней уключаецца ў рух за свае правы. Пачынаючы з Берасцейскага сойму 1544 г., на якім Жыгімонт Стары канчаткова перадаваў уладу ў ВКЛ свайму сыну, шляхта пераходзіць у арганізаваны наступ. Найчасцей яе патрабаванні заключаліся ў вызваленні ад падаткаў, змяншэнні судовых і канцылярскіх пошлін, стварэнні агульнага выбарнага суда, а таксама змяншэнні ўплыву магнатэрыі. Паступова шляхецкія просьбы афармляюцца ў свайго роду палітычную праграму, галоўная мэта якой – пераразмеракаванне палітычнай улады ў ВКЛ.

Хаця Сойм фармальна ўжо набыў заканадаўчыя функцыі, на справе ён уяўляў не прадстаўнічы орган, а хутчэй пашыраны склад Рады. Згодна са Статутам 1529 г., галоўная роля на ім належала панам радным. Таму адна з галоўных задач шляхты – дабіцца абавязковага ўдзелу сваіх паслоў у паседжаннях Сойма. А для гэтага неабходны былі змены ў Статуце, таму ўсё часцей гучаць патрабаванні яго "паправы". Адной з мэтаў паправы павінна было стаць наданне аднолькавага прававога статусу ўсяму шляхецкаму стану.

Крокам да пашырэння правоў шляхты, яе ўдзелу ў палітычным жыцці сталі рэформы 1564 – 1566 гг., што наблізілі грамадска-палітычны лад ВКЛ да польскага.

Пад націскам шляхты магнаты адракліся ў 1564 г. ад свайго асобага статуса ў судовых справах, такім чынам фармальна зраўняўшыся з астатнім рыцарствам. Паводле польскага ўзору ўводзілася новая сістэма судаводства. Уся дзяржава была падзелена на 30 паветаў, у кожным з якіх уводзіліся ***земскі***, ***гродскі і падкаморскі*** суды.

У 1564 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў Бельскі прывілей, згодна з якім у Княстве на ўзор Кароны Польскай уводзілася дзейнасць ***павятовых соймікаў***. Шляхта ВКЛ атрымала як асабістыя, так і палітычныя правы. Каб карыстацца большаю часткаю сваіх палітычных правоў, яна павінна была належаць да таго альбо іншага павета. На першым месцы сярод палітычных правоў было права выбару караля Польшчы і вялікага князя літоўскага. Тым самым шляхта магла рэалізаваць свае знешнепалітычныя інтарэсы.

Увядзенне соймікаў давала шляхце магчымасць непасрэдна ўдзельнічаць у палітычных справах, як знешніх, так і ўнутраных.

Судова-адміністрацыйныя рэфомры сярэдзіны 1560-х гг. сталі вырашальнымі у супрацьстаянні шляхты і паноў. Арыстакратыя страціла магчымасць кантраляваць палітычнае жыццё дзяржавы. Завяршэннем працэсу пераўтварэння стала прыняцце Статута 1566 г., які замацаваў поспехі барацьбы шляхты супраць магнацкай алігархіі. Менавіта ў ім сцвердзілся ідэя "шляхецкага народа" – рыцарства, высакародных землеўласнікаў, якія служаць дзяржаве. Вальны сойм станавіўся двухпалатным, і прадстаўнікі павятовай шляхты займелі на ім такі ж важны для прыняцця рашэнняў голас, як і паны радныя.

## 11.2. ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Жыгімонт II Аўгуст** (у ВКЛ Жыгімонт III Аўгуст; 01.08.1520, Кракаў – 07.07.1572), вялікі князь літоўскі і кароль польскі [1548 – 1572 гг., фармальна з 1529 г.]. Сын ***Жыгімонта I Старога*** і Боны Сфорца. У 1522 г. Сойм

ВКЛ даў гарантыю Жыгімонту I, што пасля яго смерці Жыгімонт II Аўгуст будзе абраны вялікім князем. У 1526 г. пасля смерці апошніх мазавецкіх князёў Бона намагалася перадаць мазавецкі ўдзел Жыгімонту II Аўгусту, але Мазавецкае княства было далучана да Кароны. На сойме ВКЛ у кастрычніку 1529 г. Жыгімонт II Аўгуст абраны вялікім князем пры жыцці бацькі (г. зн. другім вялікім князем). 18.12.1529 г. на польскім сойме Жыгімонт I дамогся абрання сына польскім каралём (каранаваны 20.02.1530 г.). Рэальная ўлада засталася ў руках бацькі. Для ўстанаўлення сяброўскіх адносін са Свяшчэннай Рымскай імперыяй Жыгімонт I у 1543 г. арганізаваў шлюб Жыгімонта II Аўгуста з эрцгерцагіняй Лізаветай, дачкой наследніка імператарскага трона Фердынанда (памерла ў 1545 г.). У 1544 г. Жыгімонт II Аўгуст фактычна пачаў кіраванне ў ВКЛ, куды Жыгімонт I не прыязджаў, але захаваў сваё вяршэнства з правам кантролю за расходамі з велікакняжацкага скарбу. У 1547 г. Жыгімонт II Аўгуст ажаніўся з Барбарай Радзівіл. У выніку шлюбу браты Барбары М. Радзівіл Руды і М. Радзівіл Чорны занялі кіруючае становішча ў ВКЛ, пэўны час Жыгімонт II Аўгуст знаходзіўся пад іх уплывам. Супраць шлюбу былі Жыгімонт I, Бона і значная частка польскіх магнатаў. Пасля смерці бацькі ў 1548 г. Жыгімонт II Аўгуст стаў паўнапраўным вялікім князем і каралём. Заключыў тайны трактат аб узаемнай дапамозе з каралём Чэхіі і Венгрыі Фердынандам Габсбургам. Гэты саюз быў прадоўжаны, калі пасля смерці Барбары (1551 г.) Жыгімонт II Аўгуст ажаніўся з эрцгерцагіняй Кацярынай, сястрой сваёй першай жонкі. У далейшым адышоў ад саюзу з Габсбургамі. Знешняя палітыка Жыгімонта II Аўгуста была накіравана на захаванне мірных адносін з суседнімі краінамі. Прусія заставалася васальнай дзяржавай у дачыненні да польскага караля. Адносіны са Швецыяй палепшыліся, калі там у 1568 г. трон заняў Юхан III, швагер Жыгімонт II Аўгуста. Інфлянцкая вайна 1558 – 1582 гг. паказала існаванне небяспекі з боку Маскоўскай дзяржавы і падштурхнула да заключэння Люблінскай уніі 1569 г., стварэння Рэчы Паспалітай. Унутраная палітыка Жыгімонта II Аўгуста была накіравана на ўзмацненне правоў сярэдняй шляхты. На сойме 1562 – 1563 гг. падтрымаў рэформу скарбу, судоў і войска ("экзекуцыя правоў") і вяртанне каралеўскай уладзе каронных зямель, якія былі раздадзены магнатам з 1504 г. У выніку рэформ былі павялічаны грашовыя сродкі для дзяржаўных выдаткаў і самога караля. Садзейнічаў правядзенню валочнай памеры ў Літве і Беларусі. Пачаў будаўніцтва ваенна-марскога флоту Польшчы і стварыў Марскую камісію. У час праўлення Жыгімонта II Аўгуста ў ВКЛ і Польшчы пашырылася Рэфармацыя ў розных яе галінах. Праводзіў палітыку талерантнасці ў адносінах да ўсіх канфесій. ***Віленскім прывілеем 1563 г.*** канчаткова

ўраўнаваў палітычныя правы праваслаўнай шляхты ВКЛ з каталіцкай. Зацвердзіў ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г.*** У апошнія гады свайго праўлення пад націскам кіраўніцтва каталіцкай царквы згадзіўся на допуск езуітаў у Польшчу (1564 г.) і ВКЛ (1569 г.), што стала пачаткам контррэфармацыі ў гэтых краінах. Быў мецэнатам, падтрымліваў мастакоў, архітэктараў, музыкаў, акцёраў. Праўленне Жыгімонта ІІ Аўгуста было перыядам росквіту культуры эпохі Адраджэння ў ВКЛ. Памёр Жыгімонт ІІ Аўгуст удаўцом, бяздзетным. На ім скончылася мужчынская лінія дынастыі Ягелонаў. У сваім палітычным тэстаменце раіў шляхце прытрымлівацца саюзу з Францыяй і абраць на каралеўскі трон французскага прынца. Гэта было выканана на элекцыйным сойме 1573 г., калі быў абраны Генрык Валезы. [1]

**Адопцыя** (ад лац. adoptio – усынаўленне, прыём). 1) У праве ВКЛ назва ўсынаўлення, прызнання пазашлюбнага дзіцяці (*бенкарта*) законным. 2) Прыём шляхціцам да свайго роду няшляхціца з прадастаўленнем яму права карыстацца гербам гэтага роду, г. зв. “адопцыя праз герб” (“adoptio per arma”). У ходзе заключэння ***Гарадзельскай уніі 1413 г.*** шляхам адопцыі шматлікія роды літоўскага баярства парадніліся з польскімі родамі і атрымалі іх гербы. У XVI ст. польскія роды адаптавалі яшчэ некалькі дзесяткаў родаў з ВКЛ. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1601 г. забараніла шляхце самавольна надаваць свае гербы няшляхце, што паўторана на каранацыйным сойме 1633 г., аднак яшчэ і ў XVIII ст. набожныя шляхціцы адаптавалі яўрэяў, даючы ім свае гербы і нават прозвішчы, калі тыя згаджаліся прыняць хрысціянства. [2]

**Набілітацыя** (ад лац. nobilitas – знаць), наданне шляхецтва асобе простага стану. У Заходняй Еўропе вядома з XIII ст., у ВКЛ – з часоў вялікага князя Вітаўта [1392 – 1430 гг.]. Вядомы акт набілітацыі ў 1436 г. польскім каралём Уладзіславам III літвіна Івана Слушкі з наданнем яму герба “Волга” (у далейшым род Слушкаў карыстаўся гербам “Астоя”). З пач. XVI ст. набілітацыі ў ВКЛ сталі звычайнай з’яваю. У Статут ВКЛ 1566 г. быў унесены спецыяльны артыкул “О простых людех, кгдыж повышеня чести и станов за годностями заслугами могут меть”. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. на сойме 1578 г. прынята канстытуцыя, каб кароль “плебеяў” не ўзводзіў у шляхецтва, адно толькі на сойме па прадстаўленні Рады ВКЛ ці ў войску за мужнасць. Гэта паўплывала на фармулёўку артыкула ў Статуце ВКЛ 1588 г. “О непривлащенье вольностей шляхетских людем простого стану”. Паводле яго набілітацыя праводзілася толькі “за явными значными и рицерскими послугами, мужством, оказаным против неприятелей нашим”. [3]

**Бона Сфорца** (Bona Sforza; 02.02.1494 г. Віджэвана, Італія – 1557 г.), каралева польская і вялікая княгіня літоўская, 2-я жонка **Жыгімонта I Старога** (з 1518 г.), маці ***Жыгімонта II Аўгуста***. Імкнулася павялічыць палітычную ўладу караля і вялікага князя шляхам умацавання яе эканамічнай асновы. Значна павялічыла зямельную ўласнасць дынастыі Ягелонаў, абараняла дзяржаўныя землі ад незаконнага прысваення іх феадаламі, асабліва магнатамі, у выніку пажалаванняў, падараванняў і купляў сканцэнтравала ў сваіх руках толькі на Беларусі воласці: Аболецкую Аршанскага павета, Азярышчанскую Віцебскага, Клецкую Навагародскага, Кобрынскую, Шарашоўскую Берасцейскага, Пінскую Пінскага, Рагачоўскую Рэчыцкага павета і інш. Выкупляла дзяржаўныя ўладанні, якія былі ў закладзе ў магнатаў (Гарадзенскае стараства і інш.). У судовым парадку вярнула ў склад гаспадарскіх (велікакняжацкіх) уладанняў многія захопленыя феадаламі дзяржаўныя землі. Каб павялічыць свае даходы, у некаторых маёнтках (напрыклад, Клецкім і Пінскім стараствах) у 1522 – 1555 гг. рэарганізавала сістэму эксплуатацыі сялянства на аснове ўвядзення новых форм землекарыстання і абкладання сялян павіннасцямі. Садзейнічала асваенню сялянамі лясоў і ператварэнню іх у сельскагаспадарчыя ўгоддзі, узнікненню некаторых населеных пунктаў на Беларусі. Прынцыпы Боны па павелічэнні даходаў са сваіх маёнткаў шляхам узмацнення эксплуатацыі сялянства выкарыстаны пры ажыццяўленні аграрнай рэформы (валочной памеры) у ВКЛ. Садзейнічала перасяленню польскіх шляхціцаў у ВКЛ, умацоўвала пазіцыі каталіцкага касцёла. У 1556 г. выехала на радзіму ў Італію, вывезла з сабой шмат каштоўнасцей. Яе маёнткі перайшлі да Жыгімонта II Аўгуста. [4]

**Віленскі прывілей 1563 г.**, заканадаўчы акт, якім фармальна былі ўраўнаваны ў палітычных правах праваслаўныя феадалы ВКЛ з феадаламі-католікамі. Выдадзены на беларускай мове Жыгімонтам II Аўгустам 07.06.1563 г. на Віленскім сойме. Тэкст прывілея ў якасці прэамбулы ўвайшоў у ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г.*** У прывілеі сцвярджалася, што "...иж от того часу не только тые панове, шляхта и бояре, або потомкове их, всих земль наших того всего паньства нашого, дарованья привилев и наданья всих вольностей и прав земских уживати и с них ся веселити мають, которые суть поддани костелу римскому и которых те жь предкове клейноты и гербы в Чоруне Польской приймовали, але те ж и вси инные стану рыцерского и шляхетского, яко литовского, так и русского народа, одно бы были веры хрестиянское и те жь которых предкове клейнотов альбо гербов с Коруны Польское не брали, одинако и заровно того всего вечными часы уживати и с тых вольностей веселитися мають,

яко перед тым здавна и до того часу, тых всих вольностей стан рыцерсккй шляхетский обоего народу, так литовского, яко и руского, уживали и с того ся веселили”. Далей у прывілеі запісана, што праваслаўныя шляхціцы, як і каталікі, могуць займаць розныя дзяржаўныя пасады. Прывілей засведчыў, што дыскрымінацыйныя адносна праваслаўнай шляхты ВКЛ нормы ***Гарадзельскага прывілея 1413 г.*** фактычна і раней не дзейнічалі (асабліва пасля прыняіцця ***прывілея 1434 г.*** і ***прывілея 1447 г.***). Таму Віленскі прывілей 1563 г. меў не столькі практычнае значэнне, колькі фармальнае, і быў выдадзены з мэтай палітычнай кансалідацыі шляхты пасля няўдач у Інфлянцкай вайне 1553 – 1582 гг., у час правядзення валочнай памеры, напярэдадні заключэння Люблінскай уніі 1569 г. [5]

## 11.3. КРЫНІЦЫ


1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. док. и материалов. В 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост.: кандидат ист. наук З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – 516 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск : Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

3. Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год / изд. В. Антонович и К. Козловский. – Киев : Университ. типогр., 1868.

4. Законодательные акты Великого княжества Литовского XV – XVI вв. / сб. материалов подг. к печати И. И. Яковкиным. – Л. : Соцэкгиз, 1936. – 55 с.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

6. Малиновский, И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. Малиновский. – Томск : Паровая типо-литография П. И. Макушина, 1901. – XX, 508, CLX с.

7. Полное собрание русских летописей. Т. 17: Западнорусские летописи / изд. С. Пташицкий. – СПб., 1907.

8. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., ред. и авт. предисл. д-р исторических наук Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 234 с.

9. Полное собрание русских летописей. – (АН СССР, Ин-т истории СССР). – Т. 35: Белорусско-литовские летописи / сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 306 с.

10. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Текст, перевод и словарь-комментарий / под. ред. академика К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 253 с.

11. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 350 с.

12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

13. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2005. – 207 с.

14. Трибунал обывателям Великого князства Литовского на сойме варшавском даный року 1581 // Временник Московского общества истории и древностей российских. Кн. 25. – М., 1857. – Отд. II. – С. 1 – 22.

## 11.4. ДАСЛЕДАВАННІ

1. Грушевский, А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV – XVI вв.: Старина и борьба за старину / А. С. Грушевский. – Киев, 1918.

2. Грицкевич, А. П. Распределение магнатских и шляхетских владений в Белоруссии по их величине и этнической принадлежности владельцев (XVI в.) / А. П. Грицкевич // Вопросы истории. Межведомственный сборник. – Вып. 5. – Минск, 1978. – С. 94 – 105.

3. Грицкевич, А. П. Формирование феодального сословия в Великом княжестве Литовском и его правовые основы (XV – XVI) / А.П. Грицкевич // Первый Литовский статут / Вильнюс. гос. ун-т им. В. Капсукаса. Ин-т истории АН ЛССР; редкол.: С. Лазутко (отв. ред.) [и др.]. – Вильнюс : Минтис, 1983.

4. Грыцкевіч, А. П. Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – № 1.

5. Дворниченко, А. Ю. Русские земли Великого княжества Литовского. Очерки истории общины, сословий, государственности (до начала XVI в.). – СПб., 1993.

6. Доўнар, Ю. Судовая рэформа у Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. / Ю. Доўнар // Юстиция Беларуси. – 2004. – № 10. – С. 19 – 20.

7. Думин, С. В. Татарские царевичи в Великом княжестве Литовском (XV – XVI вв.) / С. В. Думин // Древнейшие государства на территории СССР. Материалы и исследования 1987 г. – М., 1988. – С. 106 – 113.

8. Думин, С. В. Татарские князья в Великом княжестве Литовском – Т. 20 / С. В. Думин // Acta Baltico-Slavica. – Wrocław etc., 1991.

9. Лазутка, С. А. Літоўскія статуты (1529, 1566, 1588), іх стваральнікі і эпоха / С. А. Лазутка // Край. – Polonica-Albaruthenica-Lithuanica. – 2001. – №№ 1, 2.

10. Леонтович, Ф. И. Правоспособность литовско-русской шляхты / Ф. И. Леонтович // Журнал министерства народного просвещения. – 1908. – №№ 3, 5 – 7; 1909. – №№ 2, 3.

11. Леонтович, Ф. И. Рада великих князей литовских / Ф. И. Леонтович // Журнал министерства народного просвещения. – 1907. – №№ 9, 10.

12. Любавский, М. К. К вопросу об удельных князьях и местном управлении в Литовско-Русском государстве / М. К. Любавский. – СПб., 1894.

13. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства / М. К. Любавский. – М., 1900. – 850, 232, LXXII с.

14. Любавский, М. К. О распределении владений и об отношениях между великими и другими князьями Гедиминова рода в XIV и XV вв. / М. К. Любавский // Известия Исторического общества при Московском университете. – М., 1896. – С. 68 – 97.

15. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва в XV – XVI вв: Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития / В. И. Пичета. – М. : Изд-во АН СССР, 1961. – С. 183 – 212.

16. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. Ч. 1 / Я. А. Юхо. – Рэсп. ін-т выш. шк. Бел. дзярж. ун-та. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 349 с.

17. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

18. Юхо, Я. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо; рэд. Т. Ф. Есіпенка. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

19. Юхо, Я. “...каждому засобно и на потом будучим” / Я. Юхо // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 2. – С. 2 – 6.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ДАВЕДАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Грыцкевіч, Анатоль. Жыгімонт II Аўгуст / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 628 – 629.

2. Пазднякоў, Валерый. Адопцыя / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 206.

3. Вяроўкін-Шэлюта, Уладзіслаў. Набілітацыя / У. Вяроўкін-Шэлюта // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 336.

4. Спірыдонаў, Міхаіл. Бона / М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 337.

5. Юхо, Язэп. Віленскі прывілей 1563 г. / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 1. – С. 434.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................................ 3
РАБОЧАЯ ПРАГРАМА ....................................................................... 3
РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА
ДА ЎСЯГО КУРСА ............................................................................. 8
ТЭМА 1. Утварэнне і ўмацаванне Вялікага княства Літоўскага ......... 14
ТЭМА 2. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага .................... 55
ТЭМА 3. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ................. 77
ТЭМА 4. Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей
у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XIV ст. ................................ 115
ТЭМА 5. Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка ...... 130
ТЭМА 6. Казімір IV і яго палітыка ................................................. 153
ТЭМА 7. Культура Беларусі ў XIV – XV стст. ............................... 161
ТЭМА 8. Знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага
ў першай палове XVI ст. .................................................................. 187
ТЭМА 9. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага княства
Літоўскага ........................................................................................ 222
ТЭМА 10. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел
Вялікага княства Літоўскага ............................................................ 245
ТЭМА 11. Змены ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы
ў 20-я – 60-я гг. XVI ст. ................................................................... 253

*Вучэбнае выданне*

Мішына Вера Іванаўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XVI стст.)

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасцей
1-21 03 01-01 "Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)",
1-02 01 02 "Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць"
гісторыка-філалагічнага факультэта

У дзвюх частках

**Частка 1**

Рэдактар *Н. М. Важэніна*

Дызайн вокладкі *В. А. Вінаградавай*

Падпісана да друку 04.01.10. Фармат 60х84 1/16. Гарнітура Таймс. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. л. 15,78. Ум.-выд. л. 15,94. Тыраж 50 экз. Заказ 9.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт"

ЛИ № 02330/0548568 ад 26.06.2009 ЛП № 02330/0494256 ад 27.05.2009

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29